Вобраз Луцыя Томан стварае ў развіцці ўніз: малады патрыцый з-за прагі славы спачатку здраджвае свайму роду, бацьку, рэспубліканскай ідэі, потым сваёй нявесце Таркваце і каханцы Валерыі. У імкненні ўвайсці ў імператарскую сям'ю становіцца вінаватым у смерці Макрона і яго жонкі Эніі. Кульмінацыяй разлажэння яго як асобы становіцца выступленне ў судзе на баку абвінавачвання супраць акцёра Фабія Скаўра, які напісаў п'есу пра сіракузскага тырана Фаларыда. Спектакль выклікаў хваляванні рымскага плебсу, а тыран Фаларыд быў успрыняты як аналогія на сапраўдны твар Калігулы. Абаронцай Фабія на судзе выступаў Сенека, але яму не ўдалося паўплываць на сенатараў і Калігулу. Скаўр быў асуджаны на смерць адсячэннем галавы і не дачакаўшыся выканання прысуду ў турме скончыў жыццё самагубствам. Даведаўшыся пра гэта, забіла сябе і яго каханая дзяўчына Квірына.

У сваім рамане аўтар стварае вельмі верны вобраз той эпохі, выкарыстоўваючы традыцыйныя сродкі рэалістычнага раману. Перад намі паўстае панарама арыстакратычнага і плебейскага Рыма часоў Ціберыя і Калігулы. Быт, звычаі, норавы, ідэі, салоўі, палітычная барацьба і яе спосабы — усё гэта аўтар апісвае чытачу, выкарыстоўваючы шматлікія рэаліі таго часу.

Структурна раман падзяляецца на дзве лініі, звязаныя з галоўнымі вымышленымі героямі, Луцыям і Фабіям. Загарнуўшы апошнюю старонку рамана, можна сказаць, што гэта героі-антыподы. Не толькі таму, што адзін з іх прадстаўляе рымскі патрыцыят, а другі — рымскі плебс. Дарэчы, да таго, як стаць акцёрам, Фабій Скаўр быў рабом, а потым вольнаадпушчаным. Развіццё іх як асоб адбываецца ў розным накірунку. Луцый Курыён з рэспубліканца пераўтвараецца ў тырана і забойцу (у прамым і пераносным сэнсе), які ідзе да славы і ўлады любымі шляхамі. Фабій Скаўр, які яшчэ на шляху ў Рым з Сіцыліі быў абыякавым да рэспублікі, у канцы рамана становіцца прыхільнікам улады народа і ярым супраціўнікам тыраніі. За свае погляды ён памірае і не шкадуе пра гэта. Ён адмаўляецца ад прапановы Луцыя ўславіць у сваіх п'есах Калігулу і нагадвае яму пра яго былое рэспубліканскае мінулае і здраду яму, чаго апошні Фабію ніколі не даруе. Здрада Луцыя Курыёна і бунтарства Фабія Скаўра паказаны ў кантрасце. Гэта перш за ўсё маральны кантраст. Подласць арыстакрата і высакародства былога раба. Ёзаф Томан спрабуе данесці чытачу, што гэта перш за ўсё людзі і іх учынкі не залежаць ад багацця альбо саслоўнага статусу. У турме Фабій кажыць свайму бацьку, які прыйшоў яго наведаць:

«*— Все напрасно, отец. Их власть крепнет день ото дня, мы черви по сравнению с ними, они нас раздавят, задушат. И едва падет голова одного тирана, как приходит другой, еще более жестокий. Мы проиграли навсегда… Ты спрашивал, отец, жалею ли я. Нет, не жалею, ни о чем не жалею. Если бы это не случилось сейчас, это произошло бы в другой раз… Сенека однажды сказал, что жизнь подобна театральному действию. Неважно, было ли оно длинное, важно, хорошо ли оно было сыграно. И видишь, отец, я тысячи раз говорил Квирине, что мне всегда хотелось сыграть настоящую трагическую роль. — Он судорожно засмеялся. — Только никто из нас не подумал, что мой противник принудит меня к иному концу пьесы…»* [2, с. 503—504].

Раман без перабольшвання можна вызначыць як псіхалагічны, паколькі вобразы і характары герояў падаюцца ў эвалюцыі, дынаміцы. Глыбокі псіхалагізм увасабляецца праз шматлікія ўнутраныя маналогі, разважанні персанажаў, а таксама праз аўтарскія рэмаркі. І выдуманыя, і гістарычныя персанажы раскрываюцца ў развіцці характараў. Той жа імператар Ціберый апісваецца як вельмі складаная, дваістая асоба. У чэшскага раманіста яго вобраз — не аднамерны статычны партрэт жорсткага тырана. Усе пакуты, жахі, якія перажывае Ціберый-чалавек і Ціберый-правіцель, раскрываюцца ў маналогах і дыялогах. Вобразу Ціберыя надаюцца трагічныя рысы: гэта чалавек, які помсціць за свае жыццёвыя расчараванні і вышэй за ўсё ў жыцці ставіць сваю гістарычную місію — супрацьстаяць рэспубліцы, утрымаць веліч імперыі.

Такім жа дваістым намаляваны ў творы і вобраз філосафа Сенекі. Безумоўна, ён інтэлектуал, стоік, які імкнецца жыць па сваіх законах, спакойна працаваць. Аднак яго маральныя прынцыпы аказваюцца ў канфрантацыі з рэальным жыццём. Пацвярджэннем гэтага становіцца суд над акцерам, які Сенека прайграў і амаль сам не страціў уласнае жыццё. У сваім лісце сенатару-рэспубліканцу Ульпію ў ноч перад магчымай смерцю ён напісаў: «*И я, проповедник высших привилегий человеческого духа, я, сторонник глубочайшего уважения к честности и образованности, я понял, что великий дух может одинаково обитать в теле патриция, вольноотпущеннока и раба. Ибо что есть патриций, вольноотопущенник и раб? Это только названия, порожденные честолюбием и несправедливостью. Разве я не утверждал всегда, что люди по природе своей равны?*

Итак, единственный истинный римлянин, которого я знаю в Риме, кроме тебя, — бывший раб» [2, с. 497–498].

Вобразы рэспубліканцаў (сенатара Ульпія, бацькі Луцыя) паказаны як увасабленне высокіх маральных якасцяў. Але астатнія ўдзельнікі змовы апісваюцца сквапнымі драпежнікамі, якія змагаюцца за свае фінансавыя інтарэсы. Магчыма, такім чынам Ёзаф Томан паказаў супяэчлівасць гістарычнага развіцця і супярэчлівасць многіх ідэй, увасабленне якіх у практычнае жыццё часта траснсфармуе гэтыя ідэі. Дарэчы, па Томану, прычынай гэтага амаль заўсёды становяцца матэрыяльныя, фінанасавыя абставіны.

Стварыць псіхалагічна выверaныя і запамінальныя вобразы Ёзафу Тому дапамагае пейзаж, які вельмі шырока ўводзіцца ў тэкст рамана «Пасля нас хоць патоп». Ён падаецца як пэўная паралель да псіхалагічнага стану герояў.

Ідэйная праблематыка твора ўпісаная ў вобразы герояў, а таксама ў шэраг дыялагічных сцэн. Асабліва трэба адзначыць дыялогі Ціберыя і Сенекі, сэнсава і эмацыянальна насычаныя. Стары імператар выклікае на Капры філосафа, каб паразмаўляць з ім і пачуць праўду, якую яму баяцца казаць астатнія, а магчыма, каб у нечым апраўдацца перад сабой і гісторыяй. Менавіта такую канцэпцыю вобраза Ціберыя падае ў рамане чэшскі пісьменнік. Ціберый разважае з Сенекай:

«*— Тиран, который купается в человеческой крови… — Он запнулся и сухо рассмеялся: — Вот как. И все-таки во всем Риме только ты и я, только мы не хотим, чтобы на гладиаторских играх напрасно лилась человеческая кровь. И поэтому я не хочу войны, несмотря на то, что проливаю кровь. И буду проливать, надеюсь, что не даром. Я должен делать это, дорогой мой.*

Сенека отважился:

— Умеренность — это благороднейшее свойство правителя… Гуманность — это закон вселенной…

Тиберий распалился:

— Твоя гуманность, философ, обнимает весь мир, и от этого-то она жидковата. Твои вселенские законы — это пар над морем. Ты витаешь в облаках, а я должен ходить по земле.

— Дух человечности превыше всего…

— Нет. Материя, — резко перебил его император. — И душа материальна, Эпикур знал об этом больше, чем вы, стоики. Ты весь в абстракциях. Разглагольствуешь о том, что человек должен быть совершенным. И только это тебе важно, а там пусть будет, что будет. И тут-то и есть разница: ты живешь ради своих идей, в то время как я живу ради Рима. Но благоразумный Сенека ищет, как бы не запачкать свое совершенство грязью… — Голос Тиберия раздраженно возвысился. — А я хочу принести пользу Риму, даже если для этого мне придется пачкать руки в крови!» [2, с. 184].

У рамане шмат каларытных сцэн з жыцця старажытнага Рыма: старонкі, дзе апісваюцца гульні гладыятараў у цырку, баі з жывёламі, прадстаўленні акцёраў. У раман арганічна уваходзяць некалькі ўстаўных п’ес, якія разыгрывае трупа Фабія Скаўра. Ёзаф Томан уключае вершаваныя п’есы амаль цалкам. Яны спрыяюць разуменню праблемнага поля рамана і ствараюць дадатковае асвятленне для шэрагу цэнтральных вобразаў.

Трэба адзначыць дыферэнцыраванасць мовы герояў у рамане. Гаворка і дыялогі прадстаўнікоў арыстакратыі падаюцца нармаванай літаратурнай мовай, з устаўкамі паэтызмаў, вершаваных радкоў старажытных аўтараў, тэрмінамі тых часоў, а рымскі плебс шырока выкарыстоўвае ў Томана вульгарызмы, нелітаратурныя выразы, што дадае пэўнай лексічнай і сінтаксічнай выразнасці персанажам і твору ў цэлым. Напрыклад, Луцый Курыён неаднойчы цытуе словы з сачыненняў Катула, Цібула, Праперцыя. Імператар Ціберый на Капры часта слухае пад лютню антычную лірыку. Самі лірычныя творы прыводзяцца Томанам у тэксце свайго рамана са спасылкай на пэўную крыніцу. Прыгажуня Валерыя, дачка імператарскага прыбліжанага (але былога раба) Макрона, каб паказаць сваю адукаванасць і вытанчанасць, неаднойчы цытуе грэчаскіх

аўтараў, спадзеючыся, што ніхто не ўспомніць яе былое жыццё прастытуткі ў рымскіх лупанарах для матросаў і патрыцыяў. У рамане аўтар выкарыстоўвае песні, якія спявалі рымскія легіянеры. Устаўляе ў раман сапраўдныя вулічныя песні рымскага плебсу.

Ствараецца не толькі яскравая візуальная карцінка, багатая на дэталі, падрабязнасці, колеры. Нават пахі апісваюцца Томанам вельмі часта і дапамагаюць стварыць уражанне прысутнасці і рэальнасці падзей. Без перабольшвання можна сцвярджаць, што раман «гучыць». Гэта сведчанне таго, што рэалістычная раманная паэтыка чэшскага пісьменніка ўзбагачаецца рознымі прыёмамі, уласцівымі раману другой паловы XX ст.

Асобна хочацца сказаць пра надзвычай удалы пераклад рамана на рускую мову, выкананы І. Холадавай, якім мы карысталіся нараўне з арыгіналам. Аднак, трэба адзначыць, што перакладчык расставіў свае акцэнты. Гаворка пра самую моцную пазіцыю кнігі — назву твора. У арыгінале раман называецца «Пасля нас хоць патоп», а імя Калігулы не згадваецца ў загалоўку. І. Холадава выносіць імя спадчынніка Ціберыя наперад, такім чынам пераносячы ўвагу менавіта на гэтага героя і гэту гістарычную асобу, у той час, як Ёзаф Томан бачыць яго ў шэрагу іншых персанажаў першага раду.

Адметнымі рысамі томанаўскай гістарычнай прозы з'яўляюцца схільнасць да экзотыкі і рамантычных кантрастаў, пастаноўка маральных і грамадска-палітычных пытанняў сучаснасці на гістарычным матэрыяле. Чэшскі пісьменнік марыць пра ідэал гарманічнага чалавецтва. Значную ўвагу Томан надае праблеме асобы і псіхалагічнай абмалёўцы чалавека. У той жа момант ён заўсёды стварае вельмі яскравы сацыяльны і псіхалагічны каларыт у сваіх раманах, надаючы гэтаму вялікую ўвагу. Тэксты томанаўскіх гістарычных раманаў багатыя на літаратурныя ўстаўкі і цытаты з часоў дзеяння раманаў, што ўзбагачае паэтыку чэшскага пісьменніка і з'яўляецца адметнай рысай яго мастацкага свету.

Літаратура

1. Dokoupil, B. Český historický roman 1945–1965 / B. Dokoupil. — Praha, 1987. — 245 s.
2. Slovník české prozy 1945–1994. — Ostrava: Sfinga, 1994. — 490 s.
3. Toman, J. Po nás potopa / J. Toman. — Praha: Čs. Spisovatel, 1963. — 514 s.
4. Томан, Й. Калигула или После нас хоть потоп / Й. Томан. — Киев: МП «Луч», 1993. — 526 с.

Віра Просалова (Донецьк)

УКРАЇНСЬКІ ПОЕТИЧНІ ВЕРСІЇ КАРТИНИ АРНОЛЬДА БЕКЛІНА «ОСТРІВ МЕРТВИХ»

Малярство — так говорить народна мудрість — також
зрозуміле лише знавцям, хоча бачити його може й осел.
Ульріх Вайсштайн

Картина «Острів мертвих» (1880) відомого швейцарського художника Арнольда Бекліна до цих пір хвилює глядачів, лишаючись таємничою і нерозгаданою — як суворе попередження майбутніх катаклізмів, появи зон відчуження. Зображений художником похмурий острів одним нагадує про потойбічний світ, іншим — про загибель цивілізації, багатьом — про вічний спочинок на занедбаному цвинтарі, тобто стимулює різночитання, породжує все нові спроби індивідуально-авторської інтерпретації візуально сприйнятих образів. Недарма деталі цієї картини швидко підхопили художники — як неодмінну передумову успіху у глядачів. Це стосується, зокрема, кипарисів, що сприймалися як символ трауру та смутку і швидко «перекочували» до інших полотен. Для художника Валентина Сєрова ці дерева навіть шуміли якось по-особливому, «по-беклінівськи».

Картина відомого швейцарського художника мала справді неабиякий вплив і не лише на майстрів пензля (з-поміж них Ісаак Левітан, Сальвадор Далі, Микола Реріх), а й на композиторів (Сергій Рахманінов), письменників (Володимир Маяковський, Масако Бандо, Богдан Лепкий, Петро Карманський, Роджер Желязни), кінорежисерів (Андрій Тарковський, Андрій Кончаловський, Олег Ковалов). Звичайно, інтерпретаторів цього образотворчого полотна було значно більше, ніж перераховано, однак ми не ставимо за мету — охопити весь спектр мистецьких прочитань цього образотворчого полотна, що мало кілька варіантів, які, з одного боку, підтверджували зацікавлення глядачів, спроможних його придбати для себе, як це зробив, наприклад, Адольф Гітлер, інтуїтивно відчувши прогностичний потенціал картини, а з іншого — глибину передбачень майстра, що забезпечили їй популярність.

Мета цієї статті — зіставити вірші українських поетів Б. Лепкого («Острів смерті») та П. Карманського («Острів») із їх джерелом, тобто з відомою картиною Арнольда Бекліна «Острів мертвих», виявити відмінності поетичних інтерпретацій живописного полотна, що будувалося за законами іншої семіотичної системи. «Візуальні форми — лінії, кольори, пропорції — також здатні до артикуляції, як і слова, — вважає Сюзанна Лангер, — проте радикальна відміна полягає в тому, що візуальні форми не дискурсивні й закони цієї артикуляції інші, ніж закони синтаксису» [1, с. 22]. У статті враховуємо особливості перекодування візуальних образів словесними засобами, а також ту обставину, що один зі згаданих поетів-інтерпретаторів — Богдан Лепкий —

планував стати професійним художником, вступивши до Академії мистецтв у Відні. Рецепція образотворчого полотна митцем-професіоналом має свою специфіку, адже дозволяє збагнути особливості композиційного вирішення теми, породжує бажання вступити з малярем у полеміку, перевершити його тощо. Шкала емоційних реакцій цим переліком, звичайно, не вичерпується і може сягати найнесподіваніших відтінків, аж до нівеляції самої естетичної сутності артефакту.

«Подеколи гра стає винятково віртуозною, бо фактично автор тексту, головний диспонент правил, ставлячи інтертекстуальні маркери, тобто вказуючи назви мистецьких творів, їх авторів чи упізнавані елементи, оперує утопічною в плані мови обіцянкою доступу до твору мистецтва, — вважає Леся Генералюк. — Читач розуміє, що засвоєння візуального твору мистецтва через вербальний текст нездійсниме, але, оскільки "екфрастична надія" відіграє свою роль, він погоджується бути учасником цієї парадоксальної гри. Щоправда, іноді більше від предмету опису читача цікавить сам текст, який завдяки підключенню суміжних мистецтв розширює і асоціативні канали, і загальнокультурну сферу рецепції» [2, с. 60]. Майстерно описаний поетом мистецький артефакт може привертати увагу читача своїми іманентними властивостями, а не лише раритетнісю першоджерела, зацікавлювати авторським баченням цього мистецького феномена.

Українські поети, яким довелося стати очевидцями жахіть першої світової війни, шукали відповіді на питання, що хвилювали їх сучасників, у художньому досвіді людства, світовій культурі. У картині А. Бекліна їх приваблював насамперед оповитий млою острів, що непорушно височів удалині, звідси і назви віршів: «Острів смерті» у Б. Лепкого та «Острів» — у П. Кармансього. Важливою цільовою настановою авторів було виявлення свого бачення образотворчого полотна, що збуджувало їхню уяву, актуалізувало життєвий та естетичний досвід. «Безумовно, рецепція — це якоюсь мірою й автопортрет, де роль дзеркала, — вважає Ольга.Червінська, — відіграє чужий текст» [3, с. 43]. У цьому випадку йдеться про текст картини, що привертає увагу поетів. Словесне відтворення образотворчого полотна — не просто наслідок рецепції, а спосіб привернення уваги саме до цього мистецького явища як цікавого, значимого, важливого в історії культури. Це, крім того, спосіб відтворення свого бачення візуально сприйнятих образів, перекодування їх засобами художньої літератури. Б. Лепкий у підзаголовку вірша — «до образу Бекліна» — вказував на інтермедіальний зв'язок із першоджерелом, П. Карманський, очевидно, розраховував на читацьку ерудицію, не експлікуючи безпосередньо зв'язку з полотном.

Роль поетів-інтерпретаторів відомої картини можна порівняти з функцією виявлення прихованих смислів, відкриття нового у відомому, адже репродукції цієї картини, випущені великим тиражем, набули неабиякої популярності. «Митець не створює, а відкриває те, що існує до нього, вічне, — підкреслював Ю. Лотман. — Функція його при створенні тексту нагадує роль проявника у створенні фотозображення. Однак роль ця не пасивна: митець — людина, яка своєю моральною активністю доводить право виступати в ролі посередника,

«проявника», через якого вічні й заздалегідь встановлені значення повинні з'явитися світу» [4, с. 165].

І для Б. Лепкого, і для П. Карманського картина була джерелом вражень, імпульсом до поетичних рефлексій. Поети згадували у віршах лише окремі деталі образотворчого полотна: *«Дрімає серед хвиль спокійний та грізний, // Стремить верхами гір над чорний океан»* [5, с. 94], *«Він (тобто острів. — В. П.) все стоїть, грізний спокоєм сірих скель, // І спить спокійним сном, закутаний в імлі» (П. Карманський); «Серед моря скала, // Чорний ліс там росте…»* [6, с. 500]. Статика образотворчого полотна набула у віршах динамічного висвітлення завдяки дієсловам на позначення дії («дрімає», «стремить», «стоїть», «росте»), тобто трансплантація образів картини підпорядковувалася законам художньої літератури як виду мистецтва, здатному передавати динаміку. Зміна часових планів — *минулого // теперішнього // майбутнього* — надавала словам Б. Лепкого прогностичного характеру:

Хто терпів за життя,
Най собі відпічне [6, с. 500].

Відтворення літературою елементів зображальних видів мистецтва відбувається, як правило, шляхом вербального відтворення візуальних вражень, композиції картини, її дальнього і переднього планів тощо. Текст, що будується за законами іншої семіотичної системи (йдеться про живопис), при відтворенні засобами художньої літератури втрачає свої живописно-пластичні властивості. На відміну від зображальних мистецтв — у літературних творах передається невидиме візуальне. І. Франко, порівнюючи творчу діяльність маляра і письменника, підкреслював: «Маляр дає нам враження кольорів, поет викликає тільки спомини кольорів; маляр апелює безпосередньо до змислу, поет — до уяви» [7, с. 414]. Б. Лепкий, зокрема, як інтерпретатор картини Бекліна апелював не так до зорових вражень, як до інших відчуттів: тактильних (хвилі в нього «зимні», весло «хрустальне»), аудіальних *(«Хто роботу зробив, // Хто відбув свою путь, // Хто свій день пережив, // Най чимскорше йде в путь»)*. Як художник він неодноразово акцентував зображальний план своїх віршів такими жанровими дефініціями, як «малюнок» («Осіння ніч на селі», «Гість»), «картинка» («Картинка»).

У процесі уважного сприймання образотворчого полотна можна виділяти в ньому окремі фрагменти, кадри. На думку Анрі Бергсона, процес сприймання, формування думки загалом відбувається за кінематографічним принципом нанизування та кадрування. Маляр у процесі реалізації творчого задуму монтує деталі, розташовує на полотні, подаючи різними планами. Виокремленням в образотворчому полотні більших чи менших кадрів, розташуванням їх у часі і просторі можна надати йому динаміки, привести в рух застиглі деталі. «Мистецтво живопису — це не тільки мистецтво побудови кадру, а й мистецтво монтажу» [8, с. 11], — підкреслює Г. Клочек.

У картині «Острів мертвих» виділяються такі кадри: маленького човника з труною посеред річки Стікс, поданої крупним планом постаті перевізника в царство мертвих — Харона, похмурого острова, що видніється вдалині, та вирубаних з обох боків скелі могильних склепів, над якими нависли в'язи (в іншому варіанті полотна — кипариси). Увага глядача фокусується на

зображеній у центрі картини постаті в білому, що з'явилася завдяки проханню вдови фінансиста Георга фон Берна, яка, відвідавши майстерню художника, не приховувала свого захоплення і вмовила його намалювати для неї подібну картину. Б. Лепкий, реагуючи на беклінівську інтерпретацію, акцентує:

... На скалі смерті храм, —
Одинокий пором
Доїжджає до брам [6, с. 501].

Пором перевозить до місця вічного спочинку, де немає руху, де панує вічний спокій. Картина А. Бекліна була для Б. Лепкого джерелом поетичних рефлексій, приводом до висловлення свого розуміння неминучості життєвого кінця. Це його філософія, його бачення візуально сприйнятих образів.

У диптиху П. Карманського «Острів» помітні інші узагальнення, зумовлені асоціативним сприйняттям образу. Ототожнення острова з поневоленим народом, який безжально шматують чужинці, підтверджує своєрідність рецепції, актуалізацію поетом національних проблем:

І хоть з усіх боків хижацькі дикі орди
Гризуть твоє нідро з нахабністю вовків,
Ти б'єш їх по лиці страшним бичем погорди
І величчю терпінь тривожиш ворогів [5, с. 95].

Поети-інтерпретатори ніби заново відкривали артефакт, відчитуючи в ньому несподівані нюанси. У вірші Б. Лепкого наголошувалося, що острів — це «смерті храм», у диптиху П. Карманського акцентувалося, що це застиглий від страждань народ, якому лишилися на згадку лише сни про волю. У таємничому образі острова відчитувалися різні смисли: вічного спочинку чи вигаслого вулкану-народу *(«Народе мій, се ти!.. Закаменілий з болю, // Дрімаєш від віків, як вигаслий вулкан»)*. Взаємини автора-інтерпретатора та читача в обох випадках ґрунтувалися на елементах довіри, адже в іншому разі читач би відмовився від послуг цього інтерпретатора, віддавши перевагу спогляданню репродукцій.

Словесна презентація артефакту відкривала простір для експлікації різних смислових відтінків, на які впливали такі чинники: сам артефакт, ставлення спостерігача до його творця, емоційний стан реципієнта, його життєвий досвід, культурна компетенція тощо. Унікальний життєвий досвід поетів-інтерпретаторів картини, безумовно, позначився на рецепції.

На основі зіставлення двох ліричних творів із першоджерелом виявлено, що для обох авторів образотворче полотно було імпульсом для поетичних рефлексій, стимулом до самовираження. Поети-сучасники Б. Лепкий і П. Карманський продемонстрували своє бачення артефакту, актуалізували свій власний життєвий досвід. Індивідуально-авторське бачення картини стимулювало засвоєння мистецьких цінностей, дозволяло зіставляти різні кути зору на полотно: філософсько-екзистенційний у Б. Лепкого та національно-державницький у П. Карманського, якому похмурий острів нагадував становище поневоленого народу.

Описові елементи не набули у віршах «Острів смерті» та «Острів» яскравого вираження. Подані окремими штрихами, ці елементи не відбивали всього розмаїття кадрів, лише чорну кольорову гаму, що виразно домінувала у

віршах. Автори переважно згадували острів, ліс (чи дерева), пором чи човен, надаючи їм індивідуально-авторського тлумачення.

Інтерпретаторські спроби українських авторів підтверджували зацікавлення картиною, її важливе значення для історії культури. Трансляція засобами художнього слова смислу малярського полотна відбувалася крізь призму суб'єктивного сприйняття автора вербального тексту, який саме так сприймав мистецький артефакт, таким відкривав його читачеві, здійснюючи інтерпретацію інтерпретації.

Література

1. Цитую за: Левчук, Л. Естетика ХХ століття: навчальний посібник для студентів гуманітарних спеціальностей вищих закладів освіти / Л. Левчук. — К.: Либідь, 1997. — 224 с.
2. Генералюк, Л. Екфразис у контексті correspondans des arts / Л. Генералюк // Наукові записки. Серія: Філологічні науки. — Кіровоград: РВВ КДПУ ім. В. Винниченка, 2013. — С. 52−77.
3. Червінська, О. В. Рецептивна поетика. Історико-методологічні та теоретичні засади: Навч. посібник / О. В. Червінська. — Чернівці: Рута, 2001. — 56 с.
4. Лотман, Ю. М. Статьи по семиотике культуры и искусства / Ю. М. Лотман; сост. Р. Г. Григорьева; пред. С. М. Даниэля / Юрий Лотман. — СПб.: Академический проект, 2002. — 544 с.
5. Карманський, П. Острів / П. Карманський // Розсипані перли: Поети «Молодої Музи» / Упоряд., автор передм. та приміт. М. М. Ільницький. — К.: Дніпро, 1991. — С. 94–95.
6. Лепкий, Б. Острів смерті / Б. Лепкий // Розсипані перли: Поети «Молодої Музи» / Упоряд., автор передм. та приміт. М. М. Ільницький. — К.: Дніпро, 1991. — С. 500–501.
7. Франко, І. Я. Краса і секрети творчості / І. Франко; Упорядк. та приміт. Р. Т. Гром'яка, Ф. Д. Пустової / І. Я. Франко. — К.: Мистецтво, 1980. — 500 с.
8. Клочек, Г. «Кінематографізм» Тараса Шевченка в контексті інтерактивних стосунків літератури й кіно / Г. Клочек // Наукові записки. Художня література і кінематограф: проблеми інтерактивності. — Вип. 10. — Серія: Філологічні науки. — Кіровоград: РВЦ КДПУ ім. В. Винниченка, 2012. — С. 3–15.

Марына Рагачэўская (Мінск)

«АЦЯЛЕСНЕНАЯ СВЯДОМАСЦЬ» У ТВОРАХ ПРА ВАЙНУ: НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ РЭЦЭПТЫЎНАГА АНАЛІЗУ ТЭКСТА (НА ПРЫКЛАДЗЕ «ДАРОГІ ПРЫВІДАЎ» П. БАРКЕР І «ЦЫНКАВЫЯ ХЛОПЧЫКІ» С. АЛЕКСІЕВІЧ)

> Я вам больше не про войну, а про человека рассказываю. Про того человека, про которого в наших книжках мало пишут. Боятся его… Прячут… Про человека биологического… Без идеи…
>
> *С. Алексиевич. Цинковые мальчики*

Тэма вайны ў мастацкай літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў прайшла значныя ідэйныя і наратыўныя трансфармацыі. Змяніліся ідэалагічныя каноны, пашырылася кола праблем, зрушыліся жорсткія прывязкі да праўды паказу падзеяў. Аб вайне як аб з'яве пераважна сацыяльна-гістарычнага і маральна-патрыятычнага кшталту ў свой час перасталі пісаць яшчэ амерыканскія

пісьменнікі: Э. Джоўнс, Н. Мэйлер, К. Вонегут ды інш. У сучасных раманах на ваенную тэматыку прасочваецца тэндэнцыя з'яўлення жаночай кропкі погляду, жаночага голасу, што не было характэрным у часы пасля другой сусветнай вайны*.

Парадаксальна, аднак жаночы голас у творах аб вайне гучаў у брытанскай славеснасці ў сувязі з Першай сусветнай: Вера Брытан (1893–1970), Рэбека Уэст (1892–1983), Вірджынія Вулф (1882–1941). Гэтая вайна стала для Велікабрытаніі той Вялікай вайной, што назаўсёды парушыла масавую свядомасць, паўздзейнічала на лёс мільёнаў людзей на многія дзесяцігоддзі. Менавіта характар і палітычныя ўмовы ўдзелу краіны ў Першай сусветнай вайне аказаліся вельмі падобнымі да ўмоваў, у якіх беларускія вайскоўцы ішлі ў Афганістан. У абодвух выпадках матывы былі задэкларацыя ідэалогіяй: вайна вызвалення брацкай краіны, вайна гонару і дапамогі, вайна за Радзіму, вайна дзеля таго, каб «выканаць абавязак перад Каралём і краінай»** [1, с. 101]. І ў абодвух выпадках палітычныя амбіцыі захлыснулі памеры стратаў. Маштабы трагедыі ў абедзвюх войнах павінны былі спыніць адпраўку войскаў у чужыя землі.

Першая сусветная залажыла асновы эстэтычнага светапогляду, згодна з якім, дваццатае стагоддзе — век траўмы, і менавіта зараз мы пажынаем плады пост-траўматычнага стану ў культуры. Дэкартаўскі імператыў «Я мыслю, і гэта значыць я існую» змяняецца, па словах Дж. Гартмана на «Я сцякаю крывёй, і гэта значыць я існую» [2, с. 537]. У сувязі з асэнсаваннем войнаў як падзеяў у першую чаргу адказных за стан масавай псіхічнай траўмы, асабліва вызначаюцца творы пісьменніц, якія прапануюць глыбінна-псіхалагічны погляд на свядомасць суб'екта, акцэнтуючы цялесны бок успрыняцця вайны. Такі псіхалагізм вызначае раман «Дарога прывідаў» («The Ghost Road», 1995) англійскай пісьменніцы Пэт Баркер (нар. 1943) і аповесць «Цынкавыя хлопчыкі» («Цинковые мальчики», 1989) беларускай аўтаркі Святланы Алексіевіч (нар. 1948). Тэма цялеснасці, а таксама свядомасці, што можа быць спазнаная праз гэтую цялеснасць, узнікла ў кантэксце эстэтыкі другой паловы XX ст., калі праблема чалавечага цела набыла свой асобны аксіялагічны статус. Акрамя шматлікіх навуковых прац у замежжы, прысвечанае названай праблеме даследаванне было праведзена расійскай навукоўцай І. М. Быхоўскай («Homo somaticos: аксиология человеческого тела», 2000). У беларускай крытыцы таксама існуе праца нашага сучасніка Ю. Барысевіча, у якой у прыватнасці сцвярджаецца: «Цела дазволіць кожнаму стацца амаль такім жа шматаблічным, якім пакуль можа быць хіба што Бог…» [3, с. 82].

Гэтая ідэя абагаўлення цела і яго ўшанавання агучана адным з галоўных герояў трылогіі П. Баркер, доктарам-псіхатэрапеўтам У. Х. Рыверсам, рэальнай

*У сусветнай літаратуры наогул склалася тэндэнцыя апісання вайны аўтарамі-мужчынамі. Так, Дж. Осцін (1775–1817), сучасніца вайны з Напалеонам, поўнасцю ігнаруе гэты факт; Э. Дзікінсан (1830–1886) не ўзгадвае падзеі Грамадзянскай вайны паміж Паўночнымі і Паўднёвымі штатамі.

**Пераклад цытат з англійскай мовы тут і далей наш. — *М. Р.*

гістарычнай асобай: «Гэта нагадвае сярэднявечнае выпрабаванне боем, разумееш. У рэшце рэшт маральныя і палітычныя ісціны павінны даказвацца *на целе*, таму што гэтая маса нерваў, мышцаў і крыві — гэта ўсё, чым мы з'яўляемся» [4, с. 112]. Так і ў аповесці «Цынкавыя хлопчыкі» аўтар заяўляе аб сваім мастацкім намеры: «Мне интересно и тело, человеческое тело, как связь между природой и историей, между животным и речью. Все физические подробности важны: как меняется кровь на солнце, человек перед уходом...» [5]. Акцэнтаванне сувязі цялеснага і псіхічнага вызначае гарызонт чакання (згодна з рэцэптыўнай крытыкай), у асаблівасці ўспрыняцце цела і псіхічнай траўмы ў тэкстах, што малююць падзеі, аддаленыя адна ад адной у часе на амаль што 70 год.

Пры параўнанні гэтых двух твораў выяўляюцца цікавыя і нечаканыя паралелі. Абедзве пісьменніцы распавядаюць пра адну з войнаў, якія выпалі на долю іх народа і адазваліся вялікім болем у душах многіх пакаленняў, абодва творы пабудаваны на прынцыпе дакументальнасці ў большай ці ў меншай ступені, і абодва з'яўляюцца часткай трылогіі: «Адраджэнне» («Regeneration») П. Баркер і трылогіі без назвы пра вайну савецкіх вайскоўцаў у Афганістане С. Алексіевіч. Апошняя свядома прытрымліваецца прынцыпу «немастацкасці», можа, як раз менавіта таму, што «жизнь немыслимо художественна сама по себе, и, как это ни жестоко звучит — особенно художественно человеческое страдание. Темная сторона искусства» [5]. Аповесць «Цынкавыя хлопчыкі» — гэта ланцуг прыватных успамінаў-аповедаў, інтэрв'ю без удзелу журналіста. Рэдкія ўмяшанні аўтара ў свой твор — гэта кароткія звесткі аб тым, дзе і як праходзілі размовы, звесткі пра наведванне «гарачай кропкі», некалькі сціслых, але вельмі глыбокіх філасофскіх думак, а таксама парадак падачы «споведзяў», дзе жалоба маці ідзе ўслед за цяжкімі ўспамінамі салдата, які выжыў, а затым можа паўстаць аповед афіцэра ці медсупрацоўніка. Такім чынам, можна сказаць, што кампазіцыя аповесці адпавядае прынцыпу «мазаікі» — нібыта няма ніякага ўзору і адначасова — усе фрагменты звязаны паміж сабой.

Падобным чынам пабудаваны і раман «Дарога прывідаў»: гэта ўспаміны і разважанні доктара У. Х. Рыверса, які дапамагае душэўна траўміраваным вайскоўцам адрадзіць псіхічны стан пасля шоку, або так званага «ваеннага неўрозу», дзённік лейтэнанта Білі Прайара, які згіне ўсяго за дзень да Камп'енскага перамір'я. Гэта псеўдадакумент, заснаваны, тым не менш, на фактах. П. Баркер у аўтарскай даведцы прызнае цеснае перапляценне факту і мастацкага вымыслу [6, с. 251], што аднак не робіць твор займальным раманам пра прыгоды і подзвігі. Дыялогі персанажаў — гэта мова простых салдат, як і ўнутраныя маналогі. Як і ў С. Алексіевіч, якая сцвярджае: «Мне нравится язык разговорной речи, он ничем не обременен, выпущен на волю. Все гуляет и празднует: синтаксис, интонация, акценты, и — восстанавливается в точности чувство. А я слежу за чувством, а не за событием» [5] — у рамане П. Баркер таксама ствараецца атмасфера вызваленага пачуцця, нібы на споведзі, калі ўсё набалелае і цяжкае для вымаўлення нарэшце знаходзіць свайго «светара», якім для брытанскіх салдат стаў доктар Рыверс, лекар чалавечых душаў. Абодва творы — пра глыбокую сутнасць чалавечай псіхікі на вайне, абодва паказваюць

пакуты цела, абодва апелююць да Бібіліі ў пошуках адказу на пытанне: чаму чалавек здольны так здзекваццa над іншым чалавекам, нават над сваім блізкім?

Біблія аб'ядноўвае творы пошукам адказу на пытанне: «Сколько в человеке человека?» [5]. П. Баркер яшчэ ў першым рамане трылогіі вуснамі аднаго з персанажаў таксама агучвае біблейскі выраз пра зло: «…Намер сэрца чалавечага — зло ад юнацтва яго»* [6, с. 183]. Біблейскае слова «намер», што перададзена ў англійскім варыянце Біблії як «уяўленне» (*imagination*), утанаўлівае «абмежаванні» ў інтэрпрэтацыі вайны як толькі гістарычнай, сацыяльна абумоўленай падзеі, што мае аб'ектыўныя прычыны. Свядомасць, якая ўспрымае гэты твор, пераключаецца на канцэпт уяўлення, а ён і вымушае пераасэнсаваць паняцце цывілізацыі. У рамане беларускай пісьменніцы ўзгадваюцца пакуты Іова: «А другой умирает с душою огорченною [не вкусив добра]**» [5].

З дапамогай рэцэптыўнай метадалогіі аналізу і інтэрпрэтацыі стала магчымым выявіць некалькі ўзроўняў мастацкага пабудавання і ўнутранага функцыянавання двух твораў — матэрыяльны, фармальны, эфікатыўны і фінальны, — якія неадназначна выводзяць на паверх да чытацкага асэнсавання падсвядомыя і псіхасаматычныя праявы самасвядомасці герояў. Эфікатыўны ўзровень — наратыўныя методыкі — высвятляе ўжо закрануты вышэй асэнсаваны дакументалізм, спавядальнасць, «вызваленасць» і свабоду выказвання. Асаблівай увагі заслугоўвае так званы фармальны ўзровень, або непасрэдна той мастацкі матэрыял, які найбольш уздзейнічае на наша суб'ектыўнае ўспрыняцце тэкста: гэта сюжэт, дзеянні, вобразы персанажаў.

Аповесць «Цынкавыя хлопчыкі» выяўляе яскравую і нават цэльную карціну афганскай вайны: партыя загадала ісці «вучыць жыць» афганскі народ, камсамол адказаў «ёсць», сумленнне адазвалася гатоўнасцю, выхаванае з дзяцінства пачуццё абавязку, мужнасці, патрыятызму адгукнулася, і хлапчук ці нават дзяўчына — на вайне. Нават калі баяўся і не хацеў — загад, мараль і страх перад агульнай знявагай за баязлівасць стваралі складаную павуціну матывацыі. Вынік жа адзін: жорсткае расчараванне, глыбокая траўма псіхікі і для тых, хто выжыў, і для блізкіх загінуўшых. Вобраз вайны паўстае перш за ўсё праз знявечаныя чалавечыя целы — шок, які ніколі не пакіне свядомасць і памяць. Тое ж вынікае і на старонках рамана П. Баркер.

Для многіх чытачоў С. Алексіевіч твор стаў сапраўдным адкрыццём, у поўным сэнсе слова эпіфаніяй. Менавіта таму і адбыўся так званы «суд над цынкавымі хлопчыкамі», калі некалькі напалоханых уладамі ўдзельнікаў інтэрв'ю, імёны якіх нават былі зменены, апратэставалі свае ж словы і абвінавацілі С. Алексіевіч у «паклёпе, антыпатрыятызме і ачарніцельстве». Так тады лічылі многія. Падкрэслім, што рэцэпцыя твора адразу пасля яго надрукавання і некалькі дзесяцігоддзяў пазней розная. Цяпер для новых пакаленняў «Афган» — вайна бацькоў і нават дзядоў, як і для нашага пакалення некалі паўставала Другая сусветная. Вастрыня прытупілася, праблемнае поле

*Быццё 8:21.
**Іоў 21:23, 25.

нібыта згубіла надзённасць. Нязменным застаецца толькі псіхалагізм, што мэтанакіравана ставіць адбітак на чытацкім успрыняцці.

Раман П. Баркер на нашай культурнай глебе і наогул можа падацца далёкім гістарычным даследаваннем. Аднак ўзятыя разам, у адной звязцы гэтыя творы даводзяць да свядомасці сучасніка нейкую ўзмоцненую, узброеную універсальнымі псіхалагічнымі рэаліямі і падвоеную праўду аб вайне, якая таму і двойчы праўда, што паўстае незалежна, праз розныя дакументы, гістарычныя падзеі, геаграфію і час. І гэта праўда ўзмоцнена тым, што тэкст П. Баркер нечакана набывае ва ўспрыняцці чытача новую актуальнасць, набліжаецца да нас у часе праз тэкст С. Алексіевіч. Адзіная праўда ў век траўмы — гэта тое, што Цела, а не Дух становіцца каштоўнасцю, органы набываюць ідэйны змест, ахвяра цела не апраўдвае амбіцыі дзяржавы ні ў Першай сусветнай, ні ў Афганскай вайне. Чалавек варты жыць перш за ўсё ў целе. Гэтая думка падказана абсалютным дамінаваннем вобразаў скалечанага цела, што нават не патрабуе цытавання ні з аднаго з тэкстаў, паколькі яны перанасычаныя апісаннямі параненых, трупаў, крыві, абгарэлых і пазбаўленых рук, ног, мужчынскіх органаў, зроку, нюху целаў — жывых і мёртвых.

П. Баркер таксама неадступна звяртаецца да ідэі траўмы, якая на пачатку стагоддзя не прызнавалася медыцынай у Брытаніі, таму што траўмай лічылася рана фізіялагічная. Аднак вайна даказала, што нават у адсутнасці ранення ці калецтва цела здольна пакутаваць з прычыны псіхічных выпрабаванняў: воіны адчуваюць пахі, якіх няма, губляюць здольнасць размаўляць, набываюць невытлумачальны параліч і іншыя немачы. Менавіта таму, што не траўма псіхікі, а істэрыя была пакладзена ў аснову тэрапіі, доктар Рыверс і адчувае неадэкватнасць метаду электрычнага шоку, што практыкуе яго калега.

Цікавымі могуць падацца заўважаныя менавіта на гэтым фоне «лакуны» ў тэксце С. Алексіевіч, у прыватнасці, амаль поўная адсутнасць якой-небудзь псіхалагічнай дапамогі, поўнае ігнараванне «ваеннай траўмы», «неўрозу» і іншых вострых псіхічных парушэнняў. Без тэкста П. Баркер вызначэнне дадзенай лакуны і яе асэнсаванне стала бы немагчымым. У сувязі з перажываннем траўматычнага стану свядомасці, псіхікі, асэнсоўваючы роўны па цяжары ўдар як на салдат Першай сусветнай, так і на воінаў-інтэрнацыяналістаў, рэцэптыўны падыход вымушае звярнуць увагу на адносіны грамадства, дзяржавы, афіцыйных ваенных і медыцынскіх установаў да траўміраванай псіхікі. Па-першае, такія выпадкі былі прадугледжаны ў Велікабрытаніі 70 год таму, прыкладам чаго з’яўляецца апісанне ваеннага неўралагічнана Крэглокхартскага шпіталя ў Шатландыі, дзе афіцэры і нават простыя салдаты атрымлівалі псіхатэрапеўтычную дапамогу ў выніку фенамена, што тады называўся «shell shock», у перакладзе — «нервовае змардаванне ў ваенных умовах». Калі мы зазірнём у савецкія рэаліі на 70 год пазней, то даведваемся аб наступным: «В госпитале поставили диагноз: легкое нервное потрясение» [5]; альбо «Пошла к врачам. Верните мне сына! Спасите! Все рассказала… Проверяли его, смотрели, но кроме радикулита у него ничего не нашли» [5]; «было много сумасшедших» [5]; «“У вас все нормально”, — сказал мне врач»; «Первые полгода я не могла уснуть ночью. А когда засыпала, снились трупы обстрелы ... Записалась на

прием к невропатологу. Он выслушал и удивился: “Вы что, так много трупов видели?”» [5].

Жанчыны-пісьменніцы выкрылі беспадстаўнасць канцэпту «мужнасць». У П. Баркер доктар Рыверс робіць горкую выснову аб тым, што бацькі маладых салдат, нібыта біблейскі Аўраам, свядома і нават з імпэтам ахвяруюць сваіх сыноў, але толькі не Богу, а нейкай ліхой сіле. Выраз, які абагульняе погляд бацькоў на вайну, належыць бацьку Білі Прайара: «*Мой бацька, ён моцна верыў у вайну»* [1, с. 171]. Мужнасць у рамане П. Баркер паволі праходзіць этапы перастварэння ў свядомасці і салдат, і грамадства: аказваецца, нават прафесія псіхатэрапеўта патрабуе мужнасці, а тым больш здольнасць сказаць праўду аб вайне, на якую вырашаюцца адзінкі. Мужнасць больш не павінна прыкрывацца ваеннай формай, да якой жанчыны адносяцца з захапленнем. І як піша С. Алексіевіч, «мужчина в военной форме всегда нравился женщинам… Так было сто лет назад, двести… и сегодня так» [5]. Усе ўдзельнікі размоваў пра «Афган» прынеслі з сабою новае перакананне: мужнасць, яна спазнаецца не праз вайну: «Война не делает человека лучше. Только хуже. Это однозначно» [5].

У абодвух творах памяць паўстае не як абеліск, не як сімвал выкананага абавязку, а як адвечная туга па страчаным сыне, браце, мужы, бацьку. Памяць не хоча заставацца толькі памяццю: маці брытанскіх салдат прыходзяць на спірытычныя сеансы, каб пачуць голас сына, выклікаюць духаў, роўна як і паленезійскія шаманы, якіх апісвае ў сваіх успамінах Рыверс. Маці беларускіх хлапчукоў начуюць на могілках, размаўляюць з сынамі праз кветкі на магілцы. «*Прывіды ўсюды. Нават жывыя былі прывідамі, толькі ў працэсе стварэння»* [1, с. 46]. Так, памяць сакральная, але яна не падмяняе каштоўнасці фізічнага існавання.

Чытач непрыкметна перажывае глыбокую эмпатыю, і гарызонт яго чакання нейкай сюжэтнай завершанасці, выніковасці парушаецца адкрыццямі асабістага цялеснага самаадчування персанажаў. Нядаўна ў сувязі з распаўсюджаннем тэорыі траўмы ў якасці вызначальнай рысы сучаснай культурнай свядомасці ў крытычным абароце з’явіўся трапны выраз: «інтэрнацыяналізацыя эмпатыі» [7, с. 207], які ўжыты ў сувязі з разглядам эстэтыкі творчасці П. Баркер. Сапраўды, сумеснае перажыванне траўматычнага вопыту заўсёды высвечвае універсальнае, агульначалавечае, нівелюе канкрэтныя ідэалагічныя фактары, абвяшчае найперш каштоўнасць цела, жыцця ў целе, свядомасці ў целе, а не на могілкавых абелісках.

Гістарычна-культурны кантэкст страчвае ў разгледжаных раманах першараднасць. На яго месца вылучаецца самакаштоўнасць жыцця чалавека ў целе, якую вычварна засланяе маска маральнага і грамадзянскага абавязку, зніш-чаючы боскі дар чалавеку жыцця як незаменнай каштоўнасці.

Літаратура

1. Barker, P. The Ghost Road / P. Barker. — New York: Plume, 1996. — 278 p.
2. Hartman, G. H. On Traumatic Knowledge and Literary Studies / G. H. Hartman // New Literary History. — 1995. — № 26/3. — P. 537−555.
3. Барысевіч, Ю. Alter Nemo / Ю. Барысевіч. — Мінск: Логвінаў, 2003. — 144 с.

4. Barker, P. The Eye in the Door / P. Barker. — N. Y.: Plume, 1995. — 280 p.
5. Алексиевич, С. Цинковые мальчики / С. Алексиевич // Библиотека Максима Мошкова [Электронный ресурс]. — 2006. — Режим доступа: http://lib.ru/NEWPROZA/ALEKSIEWICH/aleksiewich.txt_Ascii.txt. — Дата доступа: 30.09.2013.
6. Barker, P. Regeneration / P. Barker. — New York: Plume, 1993. — 252 p.
7. Banita, G. Plotting Justice: Narrative Ethics and Literary Culture after 9/11 / G. Banita. — Nebraska: University of Nebraska Press, 2012. — 375 p.

Інна Ліпницька (Київ)

РЕЦЕПЦІЯ МАНДРІВНОГО СЮЖЕТУ ПРО ЗАПРОДАЖ ДУШІ ЧОРТОВІ У БАЛАДІ П. ГУЛАКА-АРТЕМОВСЬКОГО «ТВАРДОВСЬКИЙ»

Питання трансформації світових сюжетів у національну літературу є одним з актуальних у сучасному літературознавстві. Увагу дослідників привертає рецепція, функціонування та специфіка модифікацій мандрівних тем, образів, сюжетів, мотивів, міфів у літературах різних народів. У цьому сенсі цікавими є міжлітературні взаємини кінця XVIII — початку XIX ст. — доби, пов'язаної із становленням романтизму, складними процесами макроструктурної перебудови художнього мислення, витворення нового типу словесності. Показовими є міжмистецькі комунікації слов'янських літератур, інспіровані важливими надзавданнями — якнайшвидше наблизити «свою» культурну свідомість до «іншої», більш пріоритетної в історико-культурному просторі. Такі процеси характерні для літератур, розвиток яких дещо «затримувався» через їх колоніальне становище (українська, білоруська, чеська, словацька, болгарська тощо). Пріоритетним стає уявлення, що національна свідомість здатна до історико-культурного «прориву», який надасть нові горизонти художнього мислення і дозволить стати в один ряд з «найбільш розвиненими» літературами. У цьому руслі розвивається українська література початку XIX ст., провідною рисою якої стає відкритість щодо культур інших народів, зокрема слов'янських, та народного естетичного досвіду, що сприяло виробленню в національному мистецтві слова самобутньої художньої дикції, імперативу національної ідентичності.

Метою доповіді є осмислення специфіки трансформації та художнього моделювання мандрівного сюжету про продаж (запродаж, заклання) душі чорту в преромантичній баладі П. Гулака-Артемовського «Твардовський». У своєму дослідженні ми спираємося на дві позиції. Перша пов'язана з твердженням А. Нямцу та Л. Комарніцької про інтеграцію традиційних структур у нову літературу, де останні виступають своєрідними ідейно-естетичними каталізаторами, суттєво трансформуючи причинно-наслідкові зв'язки і мотивацію того, що відбувається в реальній або художньо змодельованій дійсності, надаючи йому універсального онтологічного звучання [5]. Друга базується на розумінні того, що архаїчний сюжет договору з дияволом (запродаж душі чорту та ін.) згідно попереднього твердження, інтегруючись у національні літератури, модифікується та опрацьовується відповідно специфіки тієї чи іншої культури і

епохи. Відповідно поведінка диявола і людини в договірних ситуаціях, корелюється домінуючим світоглядом певного місця і часу.

Наукова рецепція балади П. Гулака-Артемовського має широку амплітуду в українському, польському та російському літературознавстві, представлена зокрема в працях С. Козака, А. Петляк, В. Жирмунського, І. Айзенштока, Г. Вервеса, П. Волинського, Б. Деркача, В. Івашківа, Т. Комаринця, Д. Наливайка, Є. Нахліка, І. Пільгука, П. Федченка, М. Яценка та ін. Однак позиції відомих дослідників ґрунтуються на висновках, що твір українського поета є або переробкою відомої балади польського романтика А.Міцкевича «Пані Твардовська», або її переспівом, або вільним перекладом. Лише М. Яценко зазначив, що балада «Твардовський» — оригінальний твір [2, с. 12]. Продовжуючи цю думку науковця, спробуємо довести, що преромантична балада П. Гулака-Артемовського — це авторський інваріант мандрівного сюжету.

Сюжет договору людини із дияволом має свою історію у європейських літературах, найвідоміша рецепція пов'язана з образом Фауста, актуалізується у слов'янських літературах [1; 3]. Харизматичний образ чорнокнижника, шляхтича Твардовського — польського Фауста, котрий залагоджує свої справи за допомогою нечистої сили, стає особливо популярним на зорі становлення романтизму, джерелом натхнення більшості польських митців цієї доби — А. Міцкевича, Я. Н. Камінського Ю. І. Крашевського, Ю. Корсака, Г. Зелінського, Ю. Шуйського та ін. В російській літературі цей сюжет знаходить свою інтерпретацію в казках Левшина, поемі В. Жуковського «Дванадцять сплячих дів», яку автор наповнює містичними візіями, зміщуючи акцент на спокутування гріха грішника, який через заклання душі бісу, прирікає себе на муки, сповнені зловісним очікуванням кари. Така рецепція відомого сюжету кардинально різниться від польської та української інтерпретацій. Осмислення «диявольського контракту» як гріха зради людини собі і своєму народові лежить в основі оповідання «Сорочинський ярмарок» М. Гоголя. Найвідомішою інтерпретацією архаїчного сюжету в білоруській літературі є твір «Шляхтич Завальня, или Беларусь в фантастичных повествованиях» Я. Барщевського, що вибудовується на фольклорних переказах, казках, легендах.

Звернення у світовій художній літературі до образу Твардовського, його функціонування протягом XVII–XIX стст. на європейському просторі, що охоплює Німеччину, Польщу, Україну, дає підстави відносити цей образ та його трансформації до категорії традиційного сюжетно-образного матеріалу. Це один з «вічних образів» світової літератури, представлений також в українській народнопоетичній та писемній формах художнього слова. Разом з тим, одним із найпопулярніших демонологічних персонажів у світовій та українській літературах стає той, від кого веде родовід уся нечиста сила — чорт, адже у добу романтизму цей образ і загалом нечиста сила стали улюбленими персонажами світової літератури, що спричинило своєрідний «демонологічний» дискурс.

Особлива увага романтиків прикута до підсвідомого людини, до нерозгаданих таємниць буття, в ракурсі яких тема договору трактується як спокуса, що сходить зовні та переосмислюється в аспекті діалектики боротьби

між добром і злом в душі людини. Тепер розуміння абсолютного зла, притаманне попередній літературній традиції, стає відносним, портрет лиходія мікшується або й зовсім втрачає риси зла. Саме таким постає чорт у баладі «Пані Твардовська» А. Міцкевича, котрий скористався декількома джерелами для створення своєї балади — «Народною книгою» Й. Шпіса та німецькою літературною обробкою цього сюжету, польськими народними переказами про польського Фауста пана Твардовського та їх національною рецепцією. Поза тим його балада є цілком оригінальним твором. Відомий сюжет продажу душі чорту, А. Міцкевич опрацював у романтико-гумористичному стилі, спираючись не лише на народний варіант переказу про Твардовського, але й використавши народну мову. Цікавою є інтерпретація автором перемоги героя над чортом. В інтерпретації Міцкевича вона стала можливою завдяки неординарним здібностям пана Твардовського. Автор наділяє персонажа ідеальними рисами книжного героя (шляхтича-лицаря) — честь, вірність слову, та популярного в національному епосі народного героя Лешка Попелюша — хитрість, винахідливість.

Балада А. Міцкевича була відома в українських літературних колах, і П. Гулак-Артемовський, який цікавився польською культурою, перекладав твори польської літератури, не міг не зацікавитися цим новим для літературної традиції інтерпретуванням відомого сюжету і мандрівного образу. Окрім того, як і на теренах Польщі, легенда про чорнокнижника Твардовського у ХУІІІ ст. була досить поширеною в українській усній народній творчості. «Герой баллады и его союз с бесом, известны не менее в Польше и за Днепром, как и в Малороссии и Украйне: рассказы об удальстве Твардовского, об его приключениях слушаются с неослабным любопытством, и простолюдины поселяне в досужные часы», — зауважував редактор журналу «Вестник Европы» М. Каченовский у передмові до першої публікації балади П. Гулака-Артемовського [2, с. 12]. Підвердженням цього є зауваження М. Драгоманова щодо фольклористичних записів сюжету про продаж душі чорту та образу Твардовського у збірниках П. Чубинського та дослідженнях О. Кістяківського [3], а також художні рецепції сюжету початку ХІХ ст. Зразком художньої обробки мандрівного сюжету є віршована казка П. Білецького-Носенка «Невозможноє, чого сам біс не здужа зробить», баладах І.Срезневського «Корній Овара», Л. Боровиковського «Ледащо», А. Метлинського «Підземна церква» та ін. Своєрідною трансформацією архетипного сюжету про заклання душі нечистому й фольклорно-літературного образу Твардовського є преромантична балада українського письменника П. Гулака-Артемовського, літературна діяльність якого перебувала в орбіті новацій національного мистецтва слова.

Добра гуманітарна освіта, глибокі знання класичного мистецтва, пародійна шкільна субкультура, знання національної міфології та новітніх тенденцій у європейській літературі, зокрема польській, стало основою інтерпретації відомого сюжету П. Гулаком-Артемовським.

Беручи за основу відомий фольклорно-літературний сюжет, український поет концептуально його змінює, навіть визначає жанр цього твору як «малороссийская баллада». Такий підхід до протосюжету підтверджується власною

програмою П. Гулака-Артемовського, в якій він заперечує «дух слепой подражательности», котрий «велит нам отрекаться от духа обычаев, характера, простоты нравов и самого языка почтенных предков наших» [6, с. IX]. Поет надає мандрівному сюжету національного колориту, знайшовши оригінальні художні рішення: фабула розгортається в українському просторі, події оцінюються з позицій народної моралі, наповнившись духом національної історії, подробицями народного побуту, назвами гідронімів і топонімів тощо.

П. Гулак-Артемовський у своїй баладі спирався не стільки на німецько-польські літературні обробки образу Фауста-Твардовського, скільки на травестійні канони української літератури, зокрема «Енеїди» І. Котляревського. Саме тому героєм його твору є не пан чи шляхтич, а герой національного епосу — козак. Козак, наділений справжніми чеснотами, був героєм ще барокової літератури, в бурлескному гумористичному плані постає цей образ в анонімному творі кінця ХУІІІ ст. «Марко Пекельний», герой якого має амбівалентне звучання: з одного боку, характеризується негативно (ледар, п'яниця, грубіян, волоцюга, розпусник), а з іншого — здатний, якщо необхідно, виявити сміливість, дотепність, розважливість та рішучість, зокрема, коли йдеться про викурювання чортів з пекла; героїзований він у козацьких літописах та «Історії Русів», в яких підноситься до образу доблесного лицаря. Героєм першого художнього твору нової української літератури «Енеїди» І. Котляревського став оспіваний в усній народній поетичній творчості образ українського козака, котрий, відчуваючи відповідальність перед людьми й Богом за свій вибір, виявляє найкращі людські якості — гідність, мужність, силу волі, відвагу, кмітливість, вірність батьківщині і слову, уособлює уявлення про справжнього героя-богатиря. Логічно, що саме цей образ і обирає для своєї балади Гулак-Артемовський. Причому у баладі постає герой, котрий не просто знається з нечистою силою, не боїться її, а швидше використовує у власних інтересах. В українських переказах такою здатністю володіли козаки-характерники.

Балада П. Гулака-Артемовського імпонувала А. Міцкевичу більше, ніж його власний твір, оскільки українська версія більше відповідала естетичним надзавданням романтизму: передачі духу нації, специфіки її світобачення, оптимістичного погляду на життя, іронічного ставлення до реалій дійсності, була наповнена народним звичаєвим матеріалом, народною лексикою і фразеологією.

П. Гулак-Артемовський прагне не стільки описати те, що відбувається з героєм, скільки відтворити картинку народного життя. Відомий український етнограф П. Чубинський у своїх записах підкреслював, що по селах до корчми «сходяться в години дозвілля чоловіки і жінки і заводять дружні бесіди із знайомими і приятелями. Сюди сходяться більше з метою людей подивитись і себе показати. В корчму приходять музиканти, збираються парубки і дівчата, для яких у дні свят музика єдина забава». Читаємо у баладі Гулака-Артемовського: *«Нуте, хлопці! — швидко, шпарко! // Музики, заграйте! // Гей, шинкарю, гей, шинкарко, // Горілки давайте!» // Ріжуть скрипки і бандури, Дівчата гопцюють; // Хлопці, піт аж ллється з шкури, // Коло їх гарцюють. // Бряжчать чарки, люльки шкварчать, // Шумує горілка; // Стук, гармидер,*

свистять, кричать, // Голосить сопілка» [2, с. 53]. У дусі національної традиції бурлеску автор передає атмосферу гуляння, де насолоджується життям не лише герой, але й усі, хто з певних причин в цей час перебуває поряд з ним. Та й загалом українська балада насичена веселими епізодами з життя народу, створеними з надзвичайним гумором. Сміх у баладі має також національний характер, спирається на національну сміхову культуру. Сміх є й основним засобом естетичної оцінки образу чорта, виписаного в народно-поетичній традиції. Порівняймо портрет чорта у виконанні П. Гулака-Артемовського та опис його зовнішності з народних переказів:

Ніс — карлючка, рот свинячий *Гиря вся в щетині;* *ніжки курячі, собачий* *хвіст, ріжки цапині* [2, с. 55].	«*Чорта представляють собі як чорного чоловіка з крючкуватим носом, із двома рогами, з кігтями на руках, ліктях, колінах і ногах… Чорт має собачу морду, загнений хвіст. Кігті на руках і ногах, а роги закриває щільно круглим капелюхом із широкими крисами*» [7, с. 185].

Звертаючись до фольклорної поетики і народної мови, письменник вдало застосовує стильові прийоми (символи, гіперболізовані метафори, звукописи, емоційний розмовний діалог тощо), просторічну лексику. Балада написана коломийковим віршем. Мова її емоційно насичена, вона відбиток чуттєвого переживання дійсності.

Балада «Твардовський» П. Гулака-Артемовського — це ще один аргумент на користь утвердження культурної автономії українського життя, де модифікований мандрівний мотив виступає важливим елементом творення образу самобутнього українського світу.

Спираючись на сюжетний каркас польської балади, П. Гулак-Артемовський, створює цілком оригінальний твір, тісно пов’язаний з національною міфологією, етнографією, травестійною традицією, новітніми тендерціями в літературі, започаткувавши один із канонів національного героя романтичної літератури. Таким чином, балада П. Гулака-Артемовського «Твардовський» є не перекладом чи переспівом твору А. Міцкевича, а інтерпретацією мандрівного сюжету відповідно до національної традиції.

Література

1. Багно, В. Е. Договор человека с дьяволом в «Повести о Савве Грудцыне» и в европейской литературной традиции / В. Е. Багно// ТОДЛ Института русской литературы им. А. С. Пушкина АН СССР. — Т. XL. — Л., 1985. — С. 364−372.
2. Гулак-Артемовський, П. Поетичні твори. Повісті та оповідання / П. Гулак-Артемовський, Є. Гребінка. — К., 1984. — 606 с.
3. Драгоманов, М. П. Малоруские предания и рассказы / М. П. Драгоманов. — К., 1876. — 436 с.
4. Журавель, О. Д. Сюжет о договоре человека с дияволом в древнерусской литературе. — Новосибирск, 1996. — 234 с.
5. Нямцу, А. Є. Традиційні образи у літературному контексті / А. Є. Нямцу, Л. М. Комарніцька // Наукові праці Кам’янець-Подільського національного університету імені Івана Огієнка: Філологічні науки. Випуск 24. — Кам’янець-Подільський: Аксіома, 2010. — 480 с.
6. Речи, произнесенные в торжественном собрании императорского Харьковского университета. — Харьков, 1828. — XXXII с.

7. Чубинский, П. Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-Русский край / П. Чубинский. — СПб., 1872. — Т. 1. — 224 с.

Віта Ягушкіна (Донецьк)

ХУДОЖНЯ РЕЦЕПЦІЯ ІСТОРИЧНИХ БАЛАД У ЛІРО-ЕПОСІ М. КОСТОМАРОВА

Балада посідає почесне місце серед пісенних жанрів українського фольклору. Популярність її зумовлена жанровими ознаками: головними героями постають звичайні люди, які потрапляють у складні життєві ситуації, напружений розвиток дії та трагічна розв'язка, що не лишає байдужих. Розробляючи класифікацію українських балад, О. І. Дей поряд із баладами про кохання та дошлюбні взаємини, сімейні драми виділяє історичні балади, що охоплювали «сферу історичного життя народу — його боротьбу з ханськими кримсько-татарськими та султано-турецькими завойовниками» [2, с. 30]. Саме цей цикл про героїв, захисників рідної землі від іноземних поневолювачів, викликає зацікавлення в поетів-романтиків, у творах яких артикулювалися патріотичні ідеї.

Ще у студентські роки М. Костомаров виявив зацікавлення історією та фольклором. Автор зізнавався, що «полюбив історію більш за все, і з того часу із захватом вдався до читання і вивчення історичних книжок» [7, с. 443]. З першими зразками народної пісенності, які вразили його поетичною довершеністю, він познайомився у збірниках М. Цертелєва «Опыт собрания старинных малороссийских песней», М. Максимовича «Малоросійські пісні» та І. Срезневського «Запорозька старовина». Ці дві обставини спонукали його до особистих спроб у жанрі літературної балади.

Хоча аналізу художньої спадщини М. Костомарова присвячено чимало літературознавчих досліджень, проте біографічний компонент у них переважно витісняє літературознавчий аналіз. Ю. Пінчук, зокрема, дає загальну характеристику поетичному доробку письменника: «Художні твори М. І. Костомарова збагатили українську літературу волелюбними мотивами й нотами громадського протесту. Це пов'язано із творами, уособленням яких є «Запорожская старина» Ізмаїла Срезневського» [9, с. 55]. Дослідник наголошує на історико-етнографічній спрямованості творів М. Костомарова, проте поетичний доробок лишає поза увагою, що характерно і для сучасних досліджень. Звертаючись до балад письменника, Я. Козачок наголошує, що «поєднання контамінованих народнопісенних рядків з авторськими творить достатньо гармонійну сув'язь, де кожен елемент є позитивним тлом для іншого» [5, с. 11]. Проблемам поетики трансферентності у творах письменника присвячує статтю Р. Крохмальний, у ній автор зосереджує увагу на рецепції народнопісенних образів та символів М. Костомаровим [8]. З урахуванням зазначених досліджень простежимо специфіку рецепції функціональних елементів історичних балад у ліро-епосі письменника на рівні мотивів, образів та мовних компонентів поетики.

Досліджуючи рецепцію історичних балад, враховуємо думку Г. Яусса, який розмежовує поняття впливу (як явища монологічного характеру) та художньої рецепції як «діалогу між сучасним і минулим суб'єктами, в якому минулий суб'єкт знову може «сказати щось» теперішньому, коли теперішній суб'єкт у минулій мові добачає імпліцитну відповідь як відповідь на запитання, яке він знайшов тепер і поставив» [11, с. 517]. Рецепція у М. Костомарова — це процес сприйняття поетичних прийомів історичних балад із метою вирішення власних художніх завдань. Г. Клочек виділяє три групи прийомів (художніх засобів), які складають поетику художнього твору: мовні (зображально-виражальні засоби), сюжетні (генерують художній зміст шляхом побудови причинно-наслідкових дій і подій) і композиційні (розміщення художнього матеріалу). Дослідник підкреслює, що «усі прийоми, що належать до однієї групи, в межах одного твору чи однієї поетикальної системи гармонують, взаємоузгоджують свої зусилля — між ними виникають системні зв'язки» [5, с. 17], що становлять цілісність твору.

У баладах М. Костомарова сприйняття поетичних прийомів історичних балад простежується на рівні мотивів, образів, зображально-виражальних засобів. Так, у вірші «Могила» автор відображає трагічні наслідки війни. Завдяки епістрофі (кільце) письменник створює притаманну поетам-романтикам дихотомію двох світів — «гідного захоплення минулого і нікчемного сучасного» [3, с. 168]. Когерентом (від лат. cohaerens — «той, що пов'язує») у баладі М. Костомарова постає образ-символ могили, яка викликає у розповідача спогади минулого: «*Старая година // Переднім на згадки // Про прежні порядки // Високі купки по собі зоставляє*» [6, с. 66]. Козацькі могили, які в народних історичних баладах постають «символами брами безсмертя та реальним об'єктом глибокої пошани до тих, хто там похований» [8, с. 45], письменник змальовує в дещо іронічному ключі, підкреслюючи своє ставлення до зображуваних подій.

Характеризуючи козацьке військо, М. Костомаров вдається до гіперболізації, притаманної народним баладам: «*Незліченна стая неслась вояків, // Як мак при дорозі, шапки їх біліли, // Списи гримотіли, шаблі брязкотіли*» [6, с. 66]. Таке перебільшення дозволяє створити романтично-узагальнений образ козацтва, осмислити тему колишньої козацької слави.

Образ козацького ватажка в баладі М. Костомарова романтично-абсграгований, поєднує напівміфічні та напівісторичні риси: «***Як сніг в завірюху**, // Так кінь його летить; **Як сонце в засуху**, // Лице його горить*» [6, с. 66]. У характеристиці персонажа письменник також вдається до гіперболізації, яка досягається завдяки зображенню природних явищ (завірюха, засуха, вечірня зоря, посиві море). Подібні художні засоби зустрічаються в народних історичних баладах: «*Морозенко та козаченько, // Як мак, розпускався, // Ой Морозенко та козаченько // В неволю попався*» [1, с. 251]. Якщо в народних творах оспівуються історичні персонажі (Морозенко, Довбуш та ін.), то у М. Костомарова ім'я ватажка не важливе, він створює узагальнений образ, бо його метою була естетизація козаків, поетизація їх прагнення до волі, вірності власному народу. В авторських баладах козаки постають месниками,

проте письменник засуджує надмірну жорстокість, порівнюючи образ ватажка з Каїном.

Розв'язкою автор акцентує наслідки невиправданої жорстокості козаків. М. Костомаров підкреслює ідею минущості людської слави, закликає до відповідальності за свої вчинки, особливо, якщо вони призводять до невиправданих людських жертв.

Своєрідно образ козака та козацької слави трактуються М. Костомаровим у баладі «Кінь». Письменник інакше тлумачить взаємини козака з конем. У народних баладах кінь — вірний товариш, що супроводжує козака в походах, приносить звістку про смерть свого господаря його родині: «*Не стій, коню, надо мною, // Бачу ж я щироньку твою! // Біжи степом та гаями, // Долинами, байраками // До моєї родиноньки, // До вірної дружиноньки!*» [1, с. 262]. У баладі М. Костомаров також подає діалог козака з конем, притаманний народнопісенним історичним творам. Довірливі почуття козака до коня в письменника передаються через демінутивні (пестливі) сполуки, притаманні народним пісням: «коненьку», «мій конику», «водиці напийся» і под. У зверненні головного героя до свого коня простежується їх духовний зв'язок: тварина передчуває лихі наміри козака, а тому відмовляється їсти та пити.

М. Костомаров своєрідно інтерпретує козацькі ідеали: сучасне протиставляється минулому, як низьке високому. Образ козака-нащадка змальовується в негативному ключі. Автор засуджує наміри головного героя: «*Не добре чинити, свій рід боронити // Зібрався панич-неборак: // Шляхи засідати, людей розбивати // Поперся в глибокий байрак*» [6, с. 59]. Аби підкреслити своє негативне ставлення, письменник вдається до вульгаризмів, не притаманних народним баладам.

Кінь, вірний козацьким ідеалам, символ вірності та волі, не хоче коритися козакові, а тому несе його в лісок і стає причиною загибелі хлопця. М. Костомаров подає морально-дидактичний висновок: «*Був пан колись добрий, чесний та хоробрий // Лукавий на лихо підвів! // Був кінь колись вірний, в послузі незмінний // В розбої служить не схотів!..*» [6, с. 60]. Для письменника козацька честь вища за вірність, тому він виправдовує зраду коня, підкреслюючи традиційні риси цього образу.

Образ козака, козацької смерті у традиційному ключі зображується у баладі М. Костомарова «Заліг, заліг козаченько». Козак, який помирає, просить товариша передати родині останню волю. Для хлопця мати та Україна однаково важливі, тому, приносячи в жертву своє життя, головний герой просить матір не клясти і не лаяти його, адже він гине, захищаючи країну. У баладі постають образи України, матері й коханої дівчини, кожна з яких має виняткове значення в житті козака. Автор вдається до характерної для народних балад троїстості: «***Рідна мати**, рідна мати! // **Рідна Україна**! // Зостається на Вкраїні // **Молода дівчина***» [6, с. 66]. Повторами М. Костомаров передає смуток головного героя, що не може захищати дорогих йому людей, жаль за рідними, яких він більше не побачить.

Козак розуміє, що його смерть стане глибокою психологічною травмою для коханої, тому наказує товаришу сказати дівчині, що він її зрадив. У

зверненні до дівчини простежується рецепція поширеного в народних думах мотиву одруження зі смертю: «*Бодай вона мене зрадить, // Як її я зрадив: // Обіщавсь її любити — // Смерть собі принадив*» [6, с. 100]. Хлопець не хоче, аби його кохана очікувала на нього все життя, просить її шукати собі іншого, бо розуміє, що не зможе повернутися до дівчини. Сила почуттів героя передається за допомогою протиставлення коханої та смерті: «*Над* ***рум'яноє личенько*** *// І* ***білую руку*** *// Злюбив, шельма, цілувати //* ***Гостру каменюку***» [6, с. 101]. Автор співчуває героєві, підкреслюючи трагічність його долі, зумовленої війною.

Не лише війна ставала на заваді козаку. Своєрідно зображується життєва трагедія головного героя у баладі «Ой ішов козак, ой ійшов бурлак», у якій мотив нещасливої долі тісно пов'язаний із мотивом сирітства, і це поєднання постає сюжетним прийомом, поширеним у народних баладах. Зображення бурлаки в народних баладах відрізняється від образу козака, який має родину, за якою сумує; товаришів, які разом із ним захищають країну; вірного коня, який буде сумувати за козаком, принесе про нього звістку родині. Бурлака в народних піснях зазвичай постає самотнім: «*Ніхто не заплаче // По білому тілу ... Ні отець, ні мати, // Ні брат, ні сестриця, // Ні жона його*» [1, с. 266]. Трагедія людини-бурлаки знаходиться в іншій аксіологічній площині, метою його життя постає пошук долі (родини) в чужому краї. Цю ідею осмислює М. Костомаров у баладі «Ой ішов козак, ой ійшов бурлак». Трагічність долі бурлаки передається синонімічними повторами: «*Ой нема в його* ***роду-племені****, //* ***Ні батька, ні неньки****, // Затомилося, зажурилося // Козацьке серденько*» [6, с. 101]. Тяжка доля козака без роду та племені не дає йому можливості одружитися з дівчиною, яка йому сподобалась, адже він не може її забезпечити, а тому змушений покинути. Відмовившись від кохання, козак відцурався людей, усамітнився серед природи. Він стримує свої почуття, йдучи від дівчини, і лише на лоні природи може дати їм волю. Бажання до усамітнення можна розглядати як певний чернечий аскетизм та прагнення перенести життєві випробування завдяки підтримці провіденційних сил.

Трагізм образу козака поглиблюється тим, що він бажає своєї смерті, але з іншого боку, як віруюча людина, не може переступити релігійні догми і скінчити життя самогубством. У розв'язці твору акцентуються філософські сентенції: «*Гірко жить тому, хто на світоньку // Із щастям не знався; // Гірше жить тому, хто пізнав його // Й зараз відцурався*» [6, с. 101]. У проаналізованій баладі М. Костомаров розкриває одну із важливих проблем, зумовлену соціальною нерівністю, бідністю сироти.

Мотив козацької долі інтерпретується М. Костомаровим і у баладі «Зірка». Автор звертається до вірування про доленосну зірку кожної людини. У зав'язці твору зображено щасливого козака напередодні одруження: «*Вранці у їх весіллячко — // Кінець дожиданню, // Завтра піп їм руки зв'яже // На вічне кохання*» [6, с. 130]. У баладі акцентується мінливість людської долі через порівняння нещасливої долі із зіркою. У «Словнику символів культури України» підкреслюється, що за народним віруванням «кожна людина при народженні нібито отримує свою зірку, що й стає на небі» [10, с. 41]. Герой балади шукає долі на чужині, але не знаходить. У творі передаються сум за

близькими, почуття приреченості, самотності, загубленості у світі. Тому розв'язка твору виявляється песимістичною, підкреслюється відчай козака, який втратив свою долю і вже не зможе її повернути.

Рецепція історичних балад мала значну вагу в формуванні художності ліро-епічних творів М. Костомарова. Вдаючись до традиційних образів, автор передає трагізм життєвих колізій героїв. Письменник художньо інтерпретує поширені в народних баладах мотиви смерті козака на чужині, вірності, сирітства, наголошуючи на значенні соціальних умов у долі героїв.

Важливу функцію в естетизації козаків, поетизації їх прагнення до волі у віршах М. Костомарова виконують зображально-виражальні засоби народних балад: порівняння, гіперболи, ампліфікації, демінутивні сполуки. Естетизація минулого дозволяє М. Костомарову акцентувати зміну аксіологічних орієнтирів у суспільстві.

Література

1. Балади / упоряд. і прим. О. І. Дея та А. Ю. Ясинчук. — К.: Дніпро, 1987. — 319 с.
2. Дей, О. І. Українська народна балада / О. І. Дей. — К.: Наук. думка, 1986. — 264 с.
3. Єременко, О. Р. Українська балада XIX століття (історія жанру) / О. Р. Єременко. — Суми: ВВП «Мрія-1», 2004. — 216 с.
4. Клочек, Г. Енергія художнього слова: зб. ст. / Г. Клочек. — Кіровоград: Редакційно-видавничий відділ Кіровоград. держав. пед. ун-ту ім. В. Винниченка, 2007. — 448 с.
5. Козачок, Я. В. Українська ідея: з вузької стежки на широку дорогу (художня і науково-публіцистична творчість Миколи Костомарова): монографія / Я. Козачок. — К.: НАУ, 2004. — 352 с.
6. Костомаров, М. І. Твори: у 2 т. / М. І. Костомаров.— К.: Наук. думка, 1990. — Т. 1. — 637 с.
7. Костомаров, Н. И. Автобиография; Бунт Стеньки Разина / Н. И. Костомаров; авт. очерка и сост. коммент. Ю. А. Пинчук; АН Украины; Археогр. комис.; Ин-т истории Украины. — К.: Наук. думка, 1992. — 511 с.
8. Крохмальний, Р. Поетика трансферності у візіях Миколи Костомарова / Р. Крохмальний // Вісн. Львів. ун-ту. Серія філол. — 2007. — Вип. 41. — С. 44—52.
9. Пінчук, Ю. Микола Костомаров // Вибрані студії з костомаровознавства / Ю. Пінчук. — К.: Ін-т укр. археографії та джерелознавства ім. М. С. Грушевського НАН України, 2012. — 608 с.
10. Словник символів культури України / за заг. ред. В. П. Коцура, О. І. Потапенка, М. К. Дмитренка. — К.: Міленіум, 2002. — 260 с.
11. Яус, Г. Р. Досвід естетичного сприйняття і літературна герменевтика / Г. Р. Яус; пер. з нім. Р. Свято і П. Таращук. — К.: Вид-во Соломії Павличко «Основи», 2011 — 624 с.

Вольга Кавальчук (Брэст)

РЭАЛІЗАЦЫЯ КУЛЬТУРНА-МЕНТАЛЬНАЙ АПАЗІЦЫІ «СВОЙ — ЧУЖЫ» Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА «ТРЭЦЯЯ РАКЕТА»

Бінарная апазіцыя «свой — чужы» характарызуецца ўніверсальнымі якасцямі, аднак яе асобныя рэалізацыі ў розных культурных, гістарычных і мастацкіх «абставінах», несумненна, маюць адрозненні. Актуальным уяўляецца даследаванне адметнасцей і тоесных праяў рэалізацыі названай апазіцыі на прыкладзе мастацкіх твораў вядомых аўтараў, у прыватнасці, В. Быкава.

Аповесць «Трэцяя ракета», характарызуючыся ваеннай тэматыкай, з першых радзелаў дае магчымасць зразумець: «свае» — гэта чырвонаармейцы, героі твора, а «чужыя» — гэта ворагі, фашысты: *«Мы — саракапятчыкі. Яшчэ нас называюць ПТА (процітанкавая абарона), яшчэ "пушкары" або з абразаю "Бывай, радзіма". ... Вайна шмат у чым змянілася за тры гады, змяніліся зброя і тактыка, пацяжэлі нямецкія танкі, з'явіліся "тыгры", "пантэры", "фердынанды", а саракапятка ў нас усё такая ж, што і ў сорак першым, з якой тады стралялі па танкетках і лёгкіх каробачках-танках»* [1, с. 107–108]. Зразумела, што займеннік «мы» вызначае своеасаблівую супольнасць, якая ўтварылася толькі па прымеце далучанасці да тых, хто змагаецца на адным баку ў групе салдат. Падчас ваенных дзеянняў адыходзяць на другі план фактары нацыянальнай ці родавай еднасці, якія таксама могуць быць вызначальнымі крытэрыямі для вылучэння «сваіх» і «чужых». Якут, беларус, рускі — кожны з іх цяпер «свой», таму што змагаецца на адным баку, але, што цікава, этнонім «немец» становіцца сінонімам абразлівага і ненавіснага вызначэння «фашыст» і адначасова рэалізацыяй паняцця «чужы». Камандзір артылерыйскага разліку, Жаўтых, разважаючы пра тое, што бывае добрая і дрэнная зямля, якая нараджае добрых і дрэнных людзей, гаворыць наступнае: *«Нямеччына — паганая зямля. На ёй, пэўна, адны мухаморы ды порхаўкі розныя растуць. І фашысты яшчэ»* [1, с. 126].

Прага помсты адольвае і героя-апавядальніка — Лазняка. Памяць не дае яму спакою пасля таго, як, змагаючыся з ворагам у складзе партызанскага атрада, ён стаў сведкам жудаснага выпадку: фашысты змусілі жыхароў вёскі выйсці з хат і пачалі класці людзей у каляіны гразкай дарогі, па якой пасля рушыла калона машын. Вёска была вынішчана і спалена. Прасякнуты нянавісцю да «чужых», салдат ад адчаю пачынае злавацца на «сваіх»: «З таго дня пачаліся мае пакуты. Я думаў, што здурнею ад болю і бездапаможнасці, бяссільнае ярасці, што туманіла маю свядомасць. Зубамі я шматаў ноччу ватоўку ў лагерным шпіталі, удзень сварыўся з доктарам Фрумкіным, які хацеў мне адрэзаць нагу. Я тады стаў лаяцца, нізавошта крыўдзіў сястру і таварышаў» [1, с. 135–136]. З часам Лазняк трохі супакоіўся, але займеў намер вярнуцца на фронт і адпомсціць чужынцам, што зняважылі ўсё людскае.

Аднак адзін з герояў быкаўскай аповесці, Лук'янаў, які пабываў у палоне, не спалучае паняццяў «немец» і «фашыст». У размове з галоўным героем ён выказывае свае меркаванні пра ворагаў: *«За трыццаць год жыцця я не зразумеў таго, што за адзін год палону. Я ўсё думаў: усё ж яны, немцы, не якія азіяты, яны далі чалавецтву Баха, Гётэ, Шылера, Энгельса. Аказалася, увесь іхні сэнс — Гітлер. Вось што можа зрабіць адзін чалавек з нацыяй, якая даверыцца яму. Хаця не ўсе аднолькавыя. Некаторыя думаюць па-свойму. Напэўна, кожны чалавек — ад прыроды чалавек. Жыццё робіць з яго генія або злыдня. Немцы прадалі Гітлеру свае душы, і ён зрабіў іх злыднямі. Гэта страшна — прадаць аднаму ўсе душы. Апрача ўсяго іншага, гэты адзін — стане вампірам. Ён захоча акіяна крыві. Быў у нас Курт, ён шмат што разумеў правільна. Мы часам гутарылі. Я палонны, а ён салдат з аховы. Але ён трус. Ён болей за ўсё баяўся фронту. Ён ненавідзеў Гітлера, але пакорна служыў яму. Пасля ён*

павесіўся ў лагеры» [1, с. 150]. Такім чынам, пачынае ўзбагачацца дагэтуль адназначна адмоўная афарбоўка паняцця «чужы». З'яўляюцца згадкі пра выдатных людзей, якіх нарадзіла нямецкая зямля, пра тое, што не ўсе немцы думаюць аднолькава і жадаюць смерці іншым народам. Аднак аўтар дае зразумець, што недастаткова проста «быць супраць» і падпарадкоўвацца сістэме знішчэння чалавека, неабходна штосьці большае. Прыстасаванству наканавана несці разбурэнне не толькі ішым, але і самому чалавеку. Чужынец, які пакорліва выконвае ролю ката, хоць і не згодны з гэтай роляй, ніколе не стане «сваім».

У сваю чаргу, паняцце «свой» таксама пачынае канатацыйна ўзбагачацца, калі ў адказ Лук'янаву разважае Лазняк: *«Чаго ўжо чакаць ад немцаў, ... калі вось і нашы... Колькі набралося і ўласаўцаў, і паліцаяў...»* [1, с. 151]. Такія людзі, хоць і былі раней «сваімі», жылі і гаспадарылі побач, зрабіліся «чужымі», не перамогшы ў сабе карысталюбца і баязліўца і, па словах Лук'янава, паддаўшыся трусасці і разліку.

Прыкладам пераўтварэння са «свайго» ў «чужога» можа быць Лёшка Задарожны, які, разумеючы ўсю складанасць становішча адрэзанага ад іншых чырвонаармейцаў разліку, вырашае ўратавацца хітрасцю. Пасля смерці Жаўтыха камандзірам разліку становіцца Папоў. Ён адмаўляецца пакідаць пазіцыі і кідаць гармату без загаду, і Лёшка намаўляе яго адправіць каго-небудзь за дазволам прарывацца «да сваіх». Паняцце «свае» набывае ў гэтым кантэксце амаль сакральны сэнс. Яно становіцца сінонімам паратунку, свабоды, вызвалення з пасткі, у якой аказаліся артылерысты.

Толькі пасля чарговага бою, калі адсутнасць Лёшкі цягнецца нязносна доўга, Папоў пачынае адчуваць няладнае. Ён шкадуе, што адпусціў ахвотніка, бо той не прыйдзе назад. Лазняк усведамляе слушнасць меркавання камандзіра, але не можа адразу пагадзіцца з тым, што «свой» так лёгка мог стаць «чужым»: *«Агідная самота ўпаўзае ў маё нутро. Упэўненасць, з якою кажа гэтыя словы Папоў, дзейнічае, як гіпноз. І мне таксама робіцца ясна і зразумела, што назад Задарожны не прыйдзе — не затым ён пайшоў. Тут нейкая была яго хітрасць, якой ён дамогся, і мы засталіся ў дурнях. І ўсё ж не хочацца верыць у тое, я адганяю благія прадчуванні: усё ж ён свой чалавек, не вораг, як гэта ён можа кінуць нас тут?»* [1, с. 186]. Пасля таго, як да байцоў замест Лёшкі прыбегла медсястра Люся, высветлілася, што былому «свайму» «начхаць на хлопцаў» [1, с. 209]. Дзяўчына не адразу прызналася, што такія словы пра байцоў сказаў Задарожны. Яна не хацела турбаваць чырвонаармейцаў прыкрай навіной. Але спасылацца на драпіну на руцэ і патрабаваць адпраўкі ў тыл, калі «свае» чакаюць дазволу адысці і паміраюць адзін за адным — гэта, па словах Люсі, нясцерпная подласць. Лазняк, які хацеў адпомсціць ворагу, уражаны тым, што такім «чужым» можа аказацца чалавек, што ваяваў побач, «свой»: *«Зусім новае, ніколі раней не знаёмае пачуццё гневу і расчараванасці ахоплівае мяне. За ўвесь доўгі час маёй пакутнай прагнасці помсты я не думаў аб тым, не прадбачыў нічога падобнага. Я вачмі, поўнымі павагі і захаплення, глядзеў на кожнага з франтавікоў. Але вось бываюць, відаць, і такія»* [1, с. 210]. Былы «свой» цяпер уяўляецца Лазняку «агіднай порхаўкай». Праз гэту характарыстыку аўтар

злучае вобраз Лёшкі з паняццем фашызму, які ва ўяўленнях Жаўтыха нараджаецца разам з порхаўкамі на Нямеччыне.

Напрыканцы твора, калі здрадніка бачыць галоўны герой, ён не можа і не хоча стрымлівацца: Лазняк зрываецца на Лёшку, называючы яго фашыстам. Дыялог паміж героямі выяўляе Задарожнага як сапраўднага ворага, што свядома пагубіў «сваіх». Прагнасць помсты, якую так доўга меў Лазняк, рэалізуецца ў забойстве цяпер ужо «чужынца» Лёшкі.

Па-іншаму вымалёўваецца вобраз нямецкага танкіста, які памірае побач з галоўным героем. Абпалены салдат у паўпрытомнасці дапаўзае да бруствера артылерыстаў і не разумее, дзе знаходзіцца і хто побач з ім. Ён павінен быць увасабленнем паняцця «чужы», але з ворага пераўтвараецца ў звычайнага чалавека, падобнага да кожнага з тых, што апынуліся на іншым баку ваенных дзеянняў. Лазняк намагаецца бачыць у ім толькі фашыста, але бачыць больш: *«Я хачу знайсці яшчэ нейкі повад для свае злосці, я хачу бачыць гэтага танкіста віноўнікам усёй сённяшняй нашай трагедыі, але ў паперах толькі лічбы, нумары, нямецкія словы ...»* [1, с. 212]. Бачыць галоўны герой і фотаздымкі, на якіх ёсць сябры хлопца, дзяўчына і ён сам з маці. Подпіс на апошнім здымку бянтэжыць чырвонаармейца, робячы «чужога» чалавека больш падобным на «сваіх»: *«Простая рэч, але я ніколі не думаў, што ў майго ворага раптам акажацца маці, звычайная спакутаваная, не дужа маладая жанчына, якая гэтак нечакана стане між намі. Я думаю, што, напэўна, яна любіць яго і, напэўна, як і ўсякая маці, вельмі баіцца, каб чаго не здарылася з ім. І, напэўна, яна песціла яго ў маленстве і радавалася яго першым крокам і першым словам... і дбала, каб ён добра вучыўся і не меў двоек і каб не прастудзіўся, не захварэў, не трапіў пад машыну... Гэтаксама, як і мая, як і Люсіна, як і Папова, Лук'янава і мільёны мацярэй на зямлі. І можа так стацца, што і ён добры сын і гэтак жа любіць яе і кахае тую дзяўчыну... і суседзі старыя добрае думкі аб гэтым юнаку. Я разумею і гатовы спачуваць усякаму мацярынскаму гору, але цяпер я мушу ненавідзець гэтага яе сына, як, бадай, ён можа ненавідзець мяне, бо мы апалілі яго, а ёе забіў нашага Жаўтыха і параніў Лук'янава»* [1, с. 214]. Галоўны герой усведамляе непазбежнасць падзелу на «сваіх» і «чужых» на вайне, але разам з тым і расплывістаць гэтага размежавання: *«Гінуць нашы, паміраюць немцы, гінуць маладыя і старыя, добрыя, злыя, паганыя — і хто вінаваты? Адзін Гітлер? Не, адчуваю я, не адзін Гітлер»* [1, с. 214]. Вуснамі Лазняка В. Быкаў агучвае агульначалавечы боль ад страшэннай з'явы вайны, якую спараджаюць самі людзі.

Разам з тым узнімаюцца і іншыя пытанні: пытанне пра чалавечую подласць, калі «свой» можа стаць «чужым», і пытанне пра чалавечую еднасць, калі «чужы» можа аказацца такім падобным да «сваіх». Разважаючы над гэтымі балючымі парадоксамі, што забілі ўсю радасць выратавання ў Лазняку, галоўны герой думае: *«Ці мог я за доўгія месяцы ў шпіталі прадбачыць, што мая адплата ворагу заслоніцца ад мяне новай вайсковай няўдачай і подласцю свайго ж чалавека? Як гэта ўсё складана і трудна. Я думаў: дабрацца б да немцаў! А ці толькі яны сталі віною нашай бяды! На колькі ж франтоў суджана змагацца мне — і з ворагамі ў акружэнні, са сволаччу побач, нарэшце, з самім*

сабой» [1, с. 227]. Сапраўды, кожны з герояў, што выяўлены ў аповесці, праходзіць выпрабаванне на тое, застацца яму чалавекам у неверагодна цяжкіх ваенных абставінах ці паддацца спакусе зрабіць эгаістычны, труслівы, карысны выбар. Некаторыя нават не разглядаюць магчымасць другога выбару, хтосьці сумняваецца і ўсё ж аддае перавагу сумленнай пазіцыі, а нехта пераўтвараецца ў здрадніка і зласліўца. Такім чынам, кожны можа стаць чужынцам нават для самога сябе.

Вядома, падчас вайны ў свядомасці чалавека надзвычайна востра ўзнікае апазіцыя «свой-чужы», што звязана з неабходнасцю выжывання і супрацьстаяння ворагу. Асаблівая значнасць такой культурна-ментальнай апазіцыі ўласціва народам, краіны якіх, як Беларусь, стагоддзямі рабіліся арэнай ваенных дзеянняў. Такое завастрэнне назіраецца і ў аповесці «Трэцяя ракета» В. Быкава, галоўныя героі якой не толькі змагаюцца з фашысцкай навалай, але і перэасэнсоўваюць уласныя вартасці, спасцігаючы складанасць і вызначальнасць выбару чалавека, усведамляючы крохкасць жыцця і непазбежнасць ахвяравання. Ахвярамі ў мастацкім свеце твора становяцца людзі, якія гінуць у барацьбе за «сваіх», і тыя, хто застаецца жыць з усведамленнем таго, што не кожны «свой» — сябра, і не кожны «чужы» — вораг. Такім чынам, ваенныя рэаліі, з аднаго боку, робяць больш адчувальнай апазіцыю «свой—чужы», а з другога боку — у мастацкім свеце аповесці «Трэцяя ракета» становяцца паказчыкам яе адноснасці і складанасці.

Літаратура

1. Быкаў, В. Збор твораў: у 4 т. / В. Быкаў. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. — Т. 1: Аповесці. — 432 с.

Ірына Забалотная (Мінск)

ЯНКА БРЫЛЬ І АЛЕСЬ АДАМОВІЧ У ВЫЯЎЛЕННІ КАНЦЭПТУ «ВАЙНА»: УНІВЕРСАЛЬНЫ І НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАНТЭКСТ

Канцэпт «вайна» вызначаецца намі як схопліванне і інтэрпрэтацыя сэнсаў вайны вучонымі і мастакамі. Гэтыя сэнсы грунтуюцца на асаблівасцях гістарычнага быцця народа і выяўляюцца ў знакавых сістэмах, адной з якіх выступае мастацтва.

У беларускай літаратуры Я. Брыль быў адным з першых пісьменнікаў, які яскрава паказаў лінію зместавага напаўнення канцэпту «вайна» — «вайна і грамадства» (шырокі сацыяльны зрэз нямецкага грамадства ў час вайны, уплыў на яго ідэалогіі нацызму; вернасць гуманістычным прынцыпам, адстойванне нацыянальнай пазіцыі і чалавечай годнасці насуперак культурнай размытасці і фашысцкай прапаганды). Так, сацыяльна-гістарычны аспект канцэпту «вайна» выявіўся ў рамане Я. Брыля «Птушкі і гнёзды» (1964). Аўтар малюе вобразы нацыстаў і ненацыстаў знутры, вачыма палоннага беларуса Алеся Руневіча. Знаходзячыся ў Германіі (у 1939–1942 гг.), юнак меў магчымасць непасрэдна назіраць паводзіны і характар немцаў з пазіцыі адукаванага чалавека,

выхаванага ў гуманістычным рэчышчы маральна-філасофскіх ідэй Л. Талстога і іншых майстроў сусветнай літаратуры.

А. Адамовіч называў раман Я. Брыля амаль што адзіным беларускім творам, дзе паказаны «звычайны фашызм» вельмі шырока і ў часавым развіцці [1, с. 50]. Галоўная ўвага ў творы надаецца паводзінам сярэднестатыстычных немцаў, якія прынялі тэорыю нацызму. «Ідэі нацысцкай звышчалавечнасці ўбіваліся ва ўсе мазгі да металічнай нудоты настойліва. І вынікі былі» [4, с. 77], — піша Я. Брыль. Яны выяўляліся ў шматлікіх падрабязнасцях побыту і ўзаемаадносін гаспадароў і ваеннапалонных. Шчыра паважаючы прадстаўнікоў іншых народаў, іх звычаі і культуру, Руневіч адстойвае асабістую і нацыянальную годнасць і ўпэўніваецца ў тым, што з фашызмам, які прапагандуе стандартызацыю думак і паводзін, агульнае зніжэнне культуры, забараняе мець асабістую пазіцыю, трэба змагацца. Старэйшы і больш дасведчаны яго сябар, паэт Крушына, крыху стрымлівае яго рашучасць. «Мы будзем ваяваць з фашызмам, а не з немцамі...» — вось стратэгія Крушыны, з якой у рэшце рэшт згаджаецца і Алесь Руневіч [4, с. 265]. Юнак упэўніваецца ў гэтым канчаткова, калі бачыць працэс расчалавечвання, пераўтварэнне звычайных людзей у пярэваратняў, тупых і здзічэлых. Змены пачынаюцца з таго моманту, калі становіцца вядома пра поспехі нашых саюзнікаў на фронце.

Я. Брыль паказвае, наколькі небяспечным з'яўляецца натоўп, маса людзей, у якой губляюцца ўсялякія межы дазволенага. Асоба растварaецца ў ім. Паслядоўнікі нацызму даюць волю жывёльным інстынктам або гарлапаняць фашысцкія маршы, што становіцца відавочным у апісанні народнага гуляння, у якім удзельнічае натоўп (салдаты, падлеткі, патрыёты, ваяўнічыя фрау). Пісьменнік здолеў выявіць сацыяльна-псіхалагічныя карані фашызму і яго згубны ўплыў на чалавека. Праз сродкі масавай інфармацыі, школьныя падручнікі, масавыя мітынгі, пропаведзі, п'яныя гулянкі фашысты вельмі тонка апрацоўвалі псіхіку людзей, каб затлуміць іх свядомасць, авалодаць воляй і пачуццямі. І тады звычайныя абывацелі пачыналі слепа верыць у абранасць сваёй нацыі.

Традыцыю сацыяльна-псіхалагічнага выкрывальніцтва фашызму працягвае А. Адамовіч. Яго раман «Карнікі» (1980) — гэта рэканструкцыя псіхалогіі здрадніка, плыні свядомасці былога звычайнага чалавека, які ў сітуацыі гвалту, ціску і прыніжэння становіцца катам, паслухмяным удзельнікам карных аперацый. Абапіраючыся на дакументальныя факты, пісьменнік псіхалагічна тонка абгрунтаваў паводзіны карнікаў і тых, хто стаў імі не па сваім жаданні. Перад чытачамі аўтар ставіць праблему антрападыцэі, г. зн. апраўдання чалавека ў сувязі з немагчымасцю вырашыць супярэчнасць паміж ідэяй Богам устаноўленай светабудовы і наяўнасцю зла шляхам пераносу адказнасці за дысгармонію ў свеце на чалавека. Аднак, у чалавека, як правіла, існуе выбар паміж дабром і злом, чаму ж ён робіць заганны выбар, што штурхае яго да ўдзелу ў масавым забойстве? Аўтар прыходзіць да высновы, што каталізатарам такога выбару можа выступаць мера маральнага падзення чалавека, які, аднойчы ступіўшы на слізкі шлях, спыніцца ўжо не можа. За мяжой, якая падзяляе ранейшае жыццё і здрадніцтва, ратунку ўжо няма, пачынаецца маральная і духоўная дэградацыя.

Прычым дынаміка гэтага працэсу паказана натуралістычна-праўдзіва і псіхалагічна-заканамерна: ад саступак уласнаму сумленню да канчатковай капітуляцыі. Так, Сураў заспакойваў сябе тым, што ніколі не будзе страляць у сваіх, яго паплечнік па палоне Белы (абодва — былыя камандзіры Чырвонай Арміі) марыў пра тое, як ён перастраляе немцаў і завядзе аддзяленне ў лес да партызан, Мураўёў верыў у тое, што можна застацца чалавекам нават у такіх неверагодных умовах. Але кожны з іх ужо стаў на шлях засвойвання фашысцкіх метадаў. Нацысцкая «педагогіка» Дырлевангера хутка рабіла сваю справу па прывядзенні здраднікаў да агульнага паказальніка. Задачай было пераўтварэнне чалавека ў біялагічную істоту, якая магла падпарадкавацца любому загаду, забіваць усіх, не зважаючы на тое, хто перад ім: старыя, жанчыны ці дзеці. А. Адамовіч паказаў розны псіхічны стан чалавека: страх або, наадварот, самазабыццё перад забойствам ці нават задавальненне пасля «стараннай працы» па знішчэнні людзей. Былыя карнікі настолькі страцілі чалавечае аблічча, дэградаваўшы як асобы, што і пасля вайны не адчувалі віны за свае ўчынкі. Практыка генацыду ў час Другой сусветнай вайны не стала ўрокам для наступных пакаленняў, бо з цягам часу з'явіліся новыя «гіпербарэі» (А. Адамовіч прыводзіць матэрыялы пра новыя войны ў другой палове XX ст.).

Акрамя памяці былых забойцаў, карнікаў, якія імкнуліся абяліць свае дзеянні, існуе яшчэ і калектыўная памяць. Гэта *народная памяць*, памяць тысячаў спаленых вёсак разам з іх жыхарамі. Такая памяць выступае элементам самаідэнтыфікацыі чалавека ў адносінах да народнай супольнасці, узнікае пры існаванні калектыву, а пасля смерці ўсіх яго членаў прападае. У сваёй кнізе-араторыі «Я з вогненнай вёскі…», напісанай у сааўтарстве з Я. Брылём і У. Калеснікам (1977), А. Адамовіч узнаўляе вобраз нязломнага ў сваёй стойкасці беларускага народа, які цудам ацалеў. Пісьменнік прытрымліваўся талстоўскіх традыцый праўдзівасці ў літаратуры. «Мастацтва (па Л. Талстому) — гэта заўсёды і абавязкова ўспамін. Чалавек плача ці смяецца — гэта яшчэ само жыццё. Успамінаючы, як мы плакалі ці смяяліся, ствараючы стан гора ці радасці, мы ўступаем ужо ў сферу мастацтва. Калі літаратура — гэта абавязкова «ўспамін» (аб станах, думках і пачуццях), то законы чалавечай памяці будуць якімсьці чынам уплываць і на эстэтычным узроўні» [1, с. 42], — так тлумачыў А. Адамовіч зварот да жанру мастацка-дакументальнай аповесці. У аснову названай мастацка-дакументальнай аповесці пастаўлена памяць-успамін сведак жахлівых ваенных падзей. Пісьменнік быў упэўнены, што яму і сааўтарам неабходна было паверыць у тое, што з розных падрабязнасцей чалавечых лёсаў можна скласці кнігу новага жанру, што яна будзе запатрабаванай. Яго спадзяванні спраўдзіліся: аповесць, якая змяшчала сведчанні выжыўшых людзей са спаленых беларускіх вёсак, дакументальныя і гістарычныя факты, статыстычныя лічбы, фотаздымкі, стала не толькі папулярнай ва ўсім свеце, але і адпавядала аўтарскаму тэзісу пра «новае мысленне» і «новую літаратуру».

У артыкуле «Вайна і літаратура: праблемы новага мыслення» А. Адамовіч адзначаў, што для таго, каб выратавацца і выжыць у час ядзернай зброі, патрэбна новая сістэма мыслення. Яна будзе скіравана на антымілітарысцкую рэчаіснасць, дзе галоўнае выхаванне — *анты*ваенна-патрыятычнае, а вышэй-

шая праява логікі — поўнае адмаўленне ад любых войнаў на зямлі. Літаратура ж у такой сітуацыі імкнецца да стану «звышлітаратуры», заснаванай на новай мастацкасці і маралі [2]. Аб'ектам гуманістычнага досведу з'яўляецца не столькі чалавек як індывід, колькі ўсё чалавецтва, у якім дзяржавы і палітычныя блокі становяцца яшчэ і партнёрамі па выжыванні і выратаванні жыцця. Яскравым прыкладам такой «звышлітаратуры» якраз і з'яўляецца кніга «Я з вогненнай вёскі…», скіраваная на важнейшую якасць новага палітычнага мыслення — на *выпрацоўку пачуцця сораму* за рэалізаваны на практыцы генацыд беларускага народа. Да таго ж, твор — «звышаповесць» па колькасці стваральнікаў, калі ўпершыню сапраўдным аўтарам стаў народ. Задача пісьменнікаў была не менш адказная — зафіксаваць, захаваць галасы памяці, арганізаваць дакументальны матэрыял, спалучыць яго з фотаздымкамі, аўтарскімі каментарыямі, гістарычнымі фактамі. Як твору «звышлітаратуры», кнізе ўласціва праўдзівасць дакумента. Яна выяўляецца ў захаванні аўтарамі нават маўленчых асаблівасцей, прынятых у тым ці іншым рэгіёне краіны.

Нельга без асаблівага хвалявання чытаць сведчанні выжыўшых бацькоў і маці, якія страцілі сваіх дзетак. «Гэтае дзіця маленькае бяжыць — зашто ж яго? Яно ж маленькае, яно ж дзіця, яно ж кацілася, як тое яблычка... А яны — б'юць. Іскры скачуць!.. Што гэта, што гэта за такое было ў іх — я не ведаю. Гэта звярэ былі, а не людзі. Гэта не людзі былі, гэта — звярэ былі» [3, с. 142], — расказвае Алена Булава. Успаміны, запісаныя аўтарамі з усімі асаблівасцямі мовы чалавека, нюансамі і пераходамі яго душэўнага стану так, што чытач здольны адчуць хваляванне апавядальніка або ўявіць сабе ўсе падзеі настолькі рэальна, што ствараецца своеасаблівы эфект прысутнасці: «Адзін накруціць і другі накруціць валасы — як дзёрнуць, як дзёрнуць!.. Вырвалі ўсе валасы з галавы. Тады палажылі, адзін стаў на галаву, другі на ногі і сталі сеч плёткамі. Секлі, секлі...» [3, с. 145]. «Я з вогненнай вёскі…» — гэта «звышкніга» па сіле свайго маральнага і псіхічнага ўздзеяння, па ўзрушэнні нацыянальнай і сусветнай свядомасці дзеля папярэджання падобных трагедый у будучым.

Такім чынам, Я. Брыль і А. Адамовіч у выяўленні канцэпту «вайна» вылучаюцца праўдзівасцю і глыбінёй у сацыяльна-псіхалагічным раскрыцці ідэалогіі фашызму і яе ўплыву на абывацельскую свядомасць. Універсальны кантэкст канцэпту «вайна» якраз і звязаны, з аднаго боку, з паказам уплыву нацысцкай ідэалогіі і яе вынікаў у нямецкім грамадстве (Я. Брыль), а з другога боку, спробы яе ўкаранення сярод ваеннапалонных (А. Адамовіч). Пісьменнікі выкрылі подлую сутнасць антыгуманнай тэорыі і практыкі фашызму. Імкнучыся данесці праўду да ўсяго свету, А. Адамовіч стварае не толькі мастацка-дакументальную аповесць, але і новую сістэму мыслення, якая адпавядае гуманістычнай універсаліі ўсталявання міру на зямлі, адмаўлення ад любых войнаў. Так, аповесць-араторыя А. Адамовіча «Я з вогненнай вёскі…», напісаная ў сааўтарстве з Я. Брылём і У. Калеснікам, якраз і рэалізуе на практыцы прынцыпы новага мыслення, якія можна назваць універсальнымі для культуры.

Нацыянальны кантэкст канцэпту «вайна» выяўляецца ў шчырасці перажыванняў Алеся Руневіча па перадухіленні ідэалогіі фашызму і не прыняцця яе прадстаўнікамі беларускай культуры (Я. Брыль), у стварэнні «звышаповесці»,

дзе галоўным героем з'яўляецца сам беларускі народ, які ў час вайны быў пад пагрозай знішчэння, у незвычайнай стойкасці і ахвярнасці беларусаў, якія выжылі і знайшлі духоўную сілу, каб распавесці ўсяму свету пра фашысцкія здзекі (А. Адамовіч).

Літаратура

1. Адамович, А. М. Война и деревня в современной литературе / А. М. Адамович // Додумывать до конца: Литература и тревоги века. — М.: Сов. писатель, 1988. — С. 17−196.
2. Адамович, А. М. Война и литература: проблемы нового мышления / А. М. Адамович // Додумывать до конца: Литература и тревоги века. — М.: Сов. писатель, 1988. — С. 273−305.
3. Адамовіч, А. Я з вогненнай вёскі... / А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік. — Мінск: Маст. літ., 1975. — 448 с.
4. Брыль, Я. Птушкі і гнёзды / Я. Брыль. — Мінск: Маст. літ., 2006. — 463 с.

Елена Гук (Гродно)

КОНЦЕПЦИЯ АВТОРА И ГЕРОЯ В РОМАНЕ ВЕСЛАВА МЫСЛИВСКОГО «ГОЛЫЙ САД»

Деревенская проблематика занимала важное место в развитии польской литературы. Она подарила миру таких известных писателей, как А. Мицкевич, Ю. И. Крашевский, Э. Ожешко, С. В. Реймонт, М. Домбровская, Ю. Кавалец, Э. Редлинский, В. Мысливский и многих других. Будучи максимально приближенной к жизни, крестьянская проблематика меняется и обогащается жизнью. В конце XX — начале XXI в. в произведения о крестьянстве решаются не только вопросы деревенского быта, но и проблемы общенационального и даже общечеловеческого значения. Писатели «деревенщики» используют достижения других наук (философии, социологии, психологии), новые художественные приемы и оригинальные повествовательные манеры. Не случайно деревенская проблематика вызывает неослабевающий интерес критиков и читателей.

Итак, польская деревенская проза, пройдя достаточно долгий период становления и формирования, заняла особое место в литературном процессе современности. Это время по праву можно считать расцветом «крестьянского течения» в польской литературе. Деревенская тематика, отображавшая не только реалии и специфику жизни в деревне, открывала новые возможности наблюдения за преобразованиями в политике, экономике, переменами социального характера и пришедшими с этими изменениями проблемами и моральными конфликтами, сказавшимися на мироощущении людей.

Еще полвека тому назад В. П. Ведина утверждала что, проза, тематически связанная с деревней, развивалась в двух направлениях, взаимно пересекающихся и дополняющих друг друга. Первое направление связано с более объемным проникновением в доступные непосредственному аналитическому взгляду черты жизни польского села. Второе направление указывало на развитие поэтически-мифологического течения, в котором крестьянский колорит выступал отправным пунктом для постановки проблем общенационального и общечеловеческого характера [1, с. 8].

Особое место в литературе крестьянского направления занимает творчество Веслава Мысливского, названного критиками «писателем села». Внешние факторы крестьянской жизни (работа на земле, контакт с природой, обычаи) выступают неотъемлемым фоном произведений писателя, однако в центре внимания автора находится психология, способ мышления представителей этой среды, их неповторимое мировоззрение.

Аспекты психологии и философии крестьянина В. Мысливский отображает в романе *«Голый сад»* (1967), ставшем зрелым и содержательно богатым его дебютом, удостоенным литературной премии имени Станислава Пентака. Ева Пиндур замечает, что данное произведение характеризует необычное и нетипичное соединение и взаимопроникновение трех «стихий»: творческого воображения, лиризма и неудержимой тяги к познанию. В. П. Ведина подчеркивает, что писатель объединил конкретно-историческую, лиро-романтическую и метафорическую струю, и каждый из этих факторов выступает в новом ракурсе, полемически остром проявлении.

Главный герой произведения — крестьянский Сын, который не имеет собственного имени. Он вышел из сельского окружения и стал учителем. Образ героя невозможно рассматривать отдельно от фигуры Отца, жизнь которого является исходным пунктом повествования, построенного в форме исповеди или «высказанного монолога». Главную роль в романе играет воображение, которому Мысливский придает особое значение. Оно было *«панацеей от всех недостатков. Сросшееся с бытом, оно не представляло отдельного мира, а было в него интегрировано. Дополняло его, расширяло, а иногда осчастливливало*» [5, с. 61]. Сын, выступающий в качестве повествователя, хаотично отображающего воспоминания детства, юности, зрелых лет, ощущает себя придуманным отцом, существующим в его воображении, рожденным его фантазией, снами, видениями. Он сам признается: «… *może nie byłem naprawdę, lecz zostałem tylko przez ojca zmyślony*» [6, с. 28]. Герой отображает самые яркие и значимые воспоминания, переживает, рефлексиирует, смотря на происходившее с перспективы прожитых лет (использование техники ретроспекции). Прошлое доминирует над настоящим, практически вытесняя его, поэтому время реального действия проследить практически не возможно.

Как подчеркивает В. А. Хорев, отношение сына к отцу раскрывается как отношение любви, уважения, доверия, как первая и важная ступень познания героем-повествователем гуманистических начал жизни, осознание им своей неразрывной общности с окружающим миром и другими людьми. Соотношение ***Сын — Отец*** призвано символизировать отношение ***Человек — Мир***, что позволяет прочитать произведение как морально-философскую притчу о зависимости человеческой судьбы от окружающего мира, о необходимости нравственной связи человека с миром [3, с. 7]. Однако данное взаимоотношение и манера его раскрытия имеют не простой и непредсказуемый характер. Происходит постоянное сложение «кусков мозаики», «додумывание».

С помощью связей Сына с Отцом решается проблема отцов и детей, которая нашла свое символическое отражение в названии романа. Сад и растущие в нем деревья тесно связаны с идеей семейного родства, когда сам сад — это

символ семьи, а каждое из деревьев — член этой семьи. У каждого дерева есть свои корни (предки), свои листья и ветви (родственные связи), свои плоды (будущее поколение). Правда, в произведении сад голый, и хотя автор подразумевает некую надежду на возрождение, обретение силы, разрастание семьи, но все же он обречен на исчезновение, так как больше не приносит плодов. Это своеобразный символ вымирания деревни. Неслучайно именно в этом осеннем саду, Сын ищет уже умершего отца. Так когда-то в детстве его самого искал Отец: «*... Nadzieja we mnie wstąpiła, że jeśli gdziekolwiek ojciec jest, to tylko tu, więc tylko tu mogę go odnaleźć, w tym bezkresnym sadzie jesiennym, nie zbudzonym jeszcze po nocy, w tej pustce pozatykanej pniami jak pamięcią…*» [6, с. 160].

Голый сад В. Мысливского является своеобразной антитезой библейскому «Райскому саду», где для первых людей все было открыто, где царил блаженный покой и безопасность, а незнание было условием райской жизни. Сад, выступающий в большинстве мировых культур Божьим благословением, способностью достижения человеком духовной гармонии, в названии романа показан в самый неблагоприятный период поздней осени, когда деревья стоят беззащитно голыми. Прилагательное *голый* указывает на эту незащищенность. Нагота может быть интерпретирована двояко, с одной стороны, она является символом моральной и душевной слабости (слабым в моральном плане можно назвать героя, считающего себя плодом воображения отца), с другой — символизирует правду и чистоту (правдивой и чистой была безграничная любовь отца к сыну).

Согласно библейской традиции, в центре Райского сада росло Дерево жизни, постоянно приносящее плоды, которые дарили вечную жизнь, а листья исцеляли народы. Самым большим и высоким деревом, росшим в саду романа, является дикая груша, в листве которой ребенком прятался герой-рассказчик. Дикая груша символизирует чистоту и святость, защищает пространство от всего злого. Древние славяне верили в добрую силу груши, а целители использовали в своих обрядах ее древесину, ветки, золу и плоды этого дерева. Сам герой сравнивает ее с костелом. Однако в конце романа груша, росшая в саду, показана замерзшей, никто так и не привил ее, а вместе с исчезновением этого плодового дерева, угасла и последняя надежда на продолжение рода героя.

Проблема отцов и детей, не перерастает традиционный, рядовой и односложный конфликт поколений, а приобретает новое звучание. В *«Голом саду»* любовь Сына к Отцу становится способом спасения души, осмысления своей жизни, присоединения человека к функционированию мира [2, с. 317]. «Бунт» героя носит скрытый характер, а попытки показать себя иным, которые должны были привести к открытому конфликту, терпят поражение. Подтверждением этому является момент, когда Сын говорит Отцу, что больше не верит в Бога, но, вместо злобы, непонимания со стороны человека, для которого эта вера является незыблемой, герой слышит лишь то, что это его дело верить или нет. «*Byłem pewny — i nawet pragnąłem — żeby ojciec wtedy przeklął moją zuchwałość, odżegnał się ode mnie, batem mnie wściekle zawinął, ale on nawet oczu nie podniósł znad konia… — Nie każe ci wierzyć. Twoja wola*» [6, с. 8].

Вопрос психологического раздвоения героя, принимает не только форму душевных терзаний героя, но ощутим и в физическом плане. В. Мысливский изображает двух людей, отличных друг от друга, но связанных воедино родством и чувством любви: Сын, постигший «книжную» мудрость, и молчаливый, не доверяющий словам Отец, являющийся носителем народной мудрости, в основе которой лежит многовековой опыт поколений и социальная память. «*Память укореняла человека, подтверждала его место на земле, наделяла смыслом даже самую безнадежную жизнь и субъективную действительность, личностное измерение*» — пишет автор в своем эссе «*Конец крестьянской культуры*».

Конфликт, возникающий из мотива перехода из одной социальной группы в другую, раскрывается в образе Сына, который учился в городе. Г. Береза приходит к выводу, что мотив социального аванса наполняется новыми значениями, перерастая в важный конфликт между книжными знаниями и знаниями, полученными из повседневной жизни. Мудрость поколений, хранящаяся в народном сознании, постепенно стирается, а опыт, который был фундаментом крестьянской культуры, уже не передается «*…в этом опыте хватало всего*, — пишет В. Мысливский, — *что могло бы встретить в этом мире, как отдельного индивида, так и человека как часть коллектива. С этого опыта вырастала целая философская система, проникающая в человеческое поведение*…» [5, с. 57].

Героя «*Голого сада*» невозможно в полной мере отнести ни к крестьянам, ни к интеллигенции деревенского происхождения, он находится между мирами, на своеобразном пограничье. Отец с детства ограждает его от тяжелого труда, готовя к другой более «высокой» в его понимании жизни. Детское увлечение размахиванием кнутом не одобрялось отцом, а наивная вера Сына в превосходство в этом деле, разбивалась о твердую, непреклонную отцовскую уверенность в том, что, несмотря на победу над пастухом овец, он не умеет этого делать: «— *Nie pasuje ci bat, synu. ... Jeszcze kto zobaczy i będzie się śmiał. ...Rzucałem mu wtedy bat pod nogi i uciekałem pod stodołę, gdzie tuliłem twarz do desek i wybuchałem szczerym dziecinnym płaczem*» [6, с. 156]. Попытка работы Сына в поле не воспринимается Отцом и вызывает его неожиданную и непредсказуемую реакцию: «*Mówiłem ci, synu, nie rusz ziemi*» [6, с. 135]. С целью приобщения героя к науке Отец лишает его самой главной ценности сельского мира — связи с землей, т. к. именно земля «творит судьбу крестьянина, — она его богатство и одновременно проклятье, она является и основой порядка человеческого мира и источником его привязанности» [2, с. 317]. Однако отношение к земле у Отца и Сына совершенно разное.

С раннего возраста идет подготовка героя к другой жизни, не такой, какую прожил неграмотный отец. Он показывает Сына помещице, которая дает ему книги; просит у нее самого лучшего коня, чтобы привезти Сына со станции. Однако Сын, даже отучившись, понимает, что не способен постигнуть всей книжной мудрости, а полученное образование приводит его к осознанию определенных обязательств пред Отцом. Герой возвращается в привычную для него обстановку, в родную деревню, но уже в совершенно другом статусе. Он

становится чужим и это своего рода проявление бессилия и понимания того, что одного образования не достаточно, чтобы стать другим человеком. И в то же время он остается Сыном, обязанным Отцу своей мудростью и должен вознаградить его за старания, стать предметом его гордости, не где-то далеко, а перед хорошо знакомыми людьми. Герой пишет письма неграмотным крестьянам, читает отцу книги и газеты, учит других. А когда делят землю он, несмотря на косые взгляды окружающих, выносит книги из помещичьего дома.

Проблема общественного старта крестьян рассматривается В. Мысливским иначе, чем у других авторов этого направления. Приобщение Сына к «высокой» культуре не стало поводом изменения его духовного облика и отказа от принадлежности к крестьянской общности. Но обогащенная книжками мудрость стала причиной его внутреннего надлома и одиночества: «*Nie mogłem się nigdy pozbyć uczucia, że ta mądrość jest przeciwko mnie, tak samo jak jest przeciwko człowiekowi nieurodzaj, zaraza, ogień, powódź. Dlatego nie stać mnie było na uwielbianie jej, na szacunek, na miłość, jakimi zwykły człowiek mądrość darzyć…*» [6, с. 74].

На примере героя-повествователя автор показывает проблему стремления человека к осознанию своей сущности. Сын анализирует свою судьбу, свое поведение в отношениях с Отцом, покорность его воле и приходит к выводу, что иначе, чем определил Отец, быть не могло. Это своеобразная предопределенность судьбы. Его подчинение воле отца показывает не слабость, а внутреннюю силу, направленную против самого себя и своих желаний в имя сохранения духовного мира другого человека, человека, который стал для него целым миром и для которого он — мир [2, с. 319].

Смерть Отца приводит к еще большему надлому и одиночеству героя, он не может смириться с утратой, она кажется ему невероятной: «*Z tą jego śmiercią długi czas nie mogłem się pogodzić, a i teraz zdarzy się jeszcze, że się zapomne. … myślałem o niej jak o śnie, z którego kiedyś nad ranem się zbudzę…*» [6, с. 56]. Память, об Отце, становиться настоящим испытанием, нестерпимой мукой. Именно память, по мнению самого В. Мысливского «*укореняет человека на земле, придает смысл даже самой безнадежной жизни и каждой субъективной действительности…*» [5, с. 61]. Но как признается сам герой: *«… prawdziwość rzeczom wyznacza dopiero nasza za nimi tęsknota, nasz żal, nasze w nich odnalezienie się, bo na co dzień jesteśmy w rzeczach jedynie zagubieni, błąkamy się wśród nich, nie odróżniając ich od siebie, siebie od nich. Może też poprzez pamięć chcemy rzeczom zapewnić teraźniejszość naszą…*» [6, с. 30].

Произведение, отражающее, в первую очередь, движение мысли и чувств, тем не менее, рельефно показывает жизнь деревни в предвоенные и послевоенные годы [1, с. 27]. Новые социально-исторические условия формируют нового героя, полноправного участника исторического процесса. Эта важная идея воплощена с помощью глубинного анализа психологии героя [3, с. 10], знания крестьянской жизни и понимания тех социально-исторических перемен, которые пережила не только Польша, но и все человечество в середине XX в.

Литература
1. Ведина, В. П. Веслав Мысливский и развитие польской деревенской прозы (60−80-е годы) / В. П. Ведина // Роман в литературах стран Центральной и Юго-Восточной Европы // АН УССР, Ин-т лит. им. Т. Г. Шевченко. — Киев: Науч. думка, 1990. — С. 6−51.
2. Жук, В. Рэляцыя бацька-сын як спосаб адлюстпавання сялянская мудрасці ў рамане Веслава Мысліўскага «Голы сад» / В. Жук // Мелодии, краски, запахи «малой родины» Адама Мицкевича. — Гродно: ГрГУ, 2008. — С. 315−321.
3. Хореев, В. А. Предисловие / В. А. Хореев // Польские повести. — М., 1978. — С. 5—16.
4. Bereza, H. Spełnienie / H. Bereza // Sposób myślenia o prozie polskiej. — Warszawa, 1989. — S. 382−395.
5. Myśliwski, W. Kres kultury chłopskiej / W. Myśliwski // Twórczość. — 2004. — nr. 4. — S. 53—61.
6. Myśliwski, W. Nagi sad W. Myśliwski. — Warszawa: Państwowy instytut wydawniczy, 1967. — 163 s.

Вольга Лынша (Мінск)

АПОВЕСЦЬ ВАСІЛЯ БЫКАВА «У ТУМАНЕ» І ЯЕ ЭКРАНІЗАЦЫЯ

Талент Васіля Быкава шматгранны і неўміручы. Ён праявіўся не толькі ў шэрагу напісаных пісьменнікам выдатных раманаў, аповесцей і апавяданняў, але і ў тым, што па многіх яго творах былі пастаўлены кінафільмы. Гэта «Трэцяя ракета» (1963), «Альпійская балада» (1966), «Дажыць да світання» (1975), «Воўчая зграя» (1976), «Абеліск» (1977), «Узыходжанне» (1977), «Знак бяды» (1985), «У тумане» (2012), кароткаметражны фільм «Пастка», тэлефільм «Доўгія вёрсты вайны» (1976, паводле аповесці «На ўсходзе сонца»). У 1981 г. быў зняты фільм «Фруза», а ў 1989 г. — «Круглянскі мост». У 2008 г. выйшаў фільм «Асуджаныя на вайну» паводле аповесці «Пайсці і не вярнуцца».

Асаблівая ўвага ў дадзенай публікацыі звернута на аповесць «У тумане». Па-першае, таму, што сама назва твора выклікае цікавасць і адначасова ўзнімае некалькі пытанняў: «Чаму пісьменнік выкарыстоўвае асацыяцыю з такой прыроднай з’явай, як туман?» і «Што там адбывалася, у тым тумане?» І, па-другое, у самім паняцці «туман» схаваны нейкі іншы, шматзначны, сімвалічны патаемны сэнс, які звязаны з нечым непрыемным, шэрым, змрочным, жудасным.

Аповесць пачынаецца з фразы, што нібыта выяўляе завязку далейшага дзеяння: «Слотным ветраным днём позняй восені на другім годзе вайны атрадны разведчык Бураў ехаў на станцыю Масцішча, каб застрэліць свайго знаёмага Сушчэню…» [2, с. 274]. Ужо з самага пачатку звяртаюць на сябе ўвагу словы «застрэліць свайго знаёмага». Канешне, у звычайным жыцці з гэтых словаў можна было зразумець, што Бураў павінен застрэліць Сушчэню па прычыне таго, што той вінаваты і зрабіў нешта вельмі дрэннае Бураву. Але перад намі іншая, горшая і з-за гэтага яшчэ страшнейшая сітуацыя: Сушчэня перад Буравым ні ў чым не вінаваты.

Сюжэт аповесці наступны: другі год вайны, падчас расследавання справы аб падрыве цягніка немцы арыштоўваюць шляхавога абходчыка Сушчэню і яго трох саудзельнікаў чыгуначнікаў, якія дапамагалі яму развінціць рэйкі. Хлоп-

цаў павесілі ў мястэчку, а Сушчэню выпусцілі. Зразумела, што пасля такой падзеі людзі падазраюць яго у супрацоўніцтве з немцамі. Тады камандзіры ў атрадзе параіліся і адправілі Бурава з партызанам Войцікам зрабіць тое, што лічылі справядлівым і неабходным.

Адсюль зноў паўстаюць пытанні: «Чаму адправілі менавіта Бурава?», «Хіба нельга было каго іншага, не знаёмага Сушчэню чалавека?»

Пісьменнік нездарма ўводзіць у твор сітуацыю знаёмства Бурава з Сушчэнем. Аўтар расказвае пра дзяцінства двух герояў, пра іх характары. Зазначае, што Сушчэня нават падабаўся Бураву *«… можа, сваёй паважнасцю, роўнасцю ў адносінах да іншых, сяброў і суседзяў. Хто б тады падумаў, што іхнія лёсы спаквaля так недарэчна скрыжуюцца?»* [2, с. 280]. Але іхнія лёсы скрыжаваліся ў самы жудасны час; у час, які аб'ядноўваў і адначасова раз'ядноўваў іхнія лёсы, — у час вайны. Вайна — гэта неўпарадкаваная махіна са сваімі толькі ёй адной вядомай законамі, сваімі правіламі, дзе кожны чалавек з'яўляецца толькі часткай гэтага хаатычнага і антыгуманнага механізму. У вайну чалавечыя або сяброўскія адносіны не маюць ніякай сілы, сілу мае толькі «закон вайны» і рашэнне вышэйшых органаў. Так і з Буравым. Ён не хацеў выконваць гэтую місію. «*Лепш, каб ужо хто іншы», — думаў Бураў», — але павінен быў, загад ёсць загад* [2, с. 278].

Па-іншаму думаў Сушчэня, ён шчыра не мог зразумець, чаму ўсё так несправядліва адбываецца. Але, нягледзячы на абставіны, у якіх ён апынуўся, Сушчэня не намагаўся апраўдвацца ці, больш таго, уцячы. Ён з пачуццём годнасці прыняў свой лёс і паводзіў сябе па-чалавечы і высакародна: «бо Сушчэня ў лесе нават не прыбавіў хады, нават часам прытрымліваў у руках якую галінку, каб дужа не сцёбнуць Бурава» [2, с. 292]. Ужо гэта дробязь сведчыць на карысць Сушчэні, раскрывае яго чалавечнасць, уважлівае стаўленне да іншага чалавека.

Такіх дэталей шмат. Гэта і клопат пра Бурава, калі яго паранілі: Сушчэня не пакінуў яго аднаго, а нёс на плячах, колькі змог. Гэта і клопат пра Войціка, хітрага, маральна гнілаватага чалавека, якога Сушчэня таксама не пакінуў, калі таго забілі. Менавіта ў гэтых сітуацыях раскрываецца галоўнае ў характары Сушчэні, матывацыя яго ўчынкаў і урэшце яго канчатковы выбар.

У апошнія хвіліны жыцця Бураў слухаў усё, што, седзячы ля яго ног, апавядаў Сушчэня. І верыў яму. *«І як было не паверыць? Зноў, як і некалі ў дзяцінстве, побач гучаў знаёмы голас ціхманага і прыстойнага ў паводзінах чалавека, яго земляка. Паступова яго загадкавая "здрада" стала зразумела Бураву, і ён дужа шкадаваў, што ледзьве не застрэліў яго. Была б вялікая памылка, якая, бадай, цалкам лягла б на сумленне Бурава…Але, мабыць, яна і дала б жыццё, раптам падумаў Бураў. А так вось здыхай тут праз сваё чуллівае сумленне ў свае дваццаць сем год … Праўда, затое, можа застануцца тыя сушчэнеўскія Анэля і малы, а можа, і ён — у іхняй удзячнай памяці. Калі-нікалі, можа, і памянуць добрым словам. Але гэта — калі ацалее Сушчэня. Без Бурава, аднак, наўрад ці ацалее…»* [2, с. 336–337].

Такім чынам, толькі адзін партызан Бураў, чалавек з высокім усведамленнем справядлівасці, здолеў разабрацца ў трагедыі Сушчэні. Але Бураў выпадкова загінуў, і больш спадзявацца няма на каго...

Сам Сушчэня не адразу зразумеў, чаму яго не павесілі. Гэта здавалася яму абсалютна нелагічным. *«Калі ў СД яго перасталі біць і доктар Грасмаер пасля двух зусім міласэрных допытаў сказаў, што ён прагоніць яго дамоў, калі ён такі незгаворлівы дурань, Сушчэня, канешне ж, зусім не паверыў яму. Дудкі, падумаў ён, каб яны выпусцілі, павесяць, як учора павесілі трох ягоных рабочых. Хіба што пасля. А ён сапраўды ўзяў і выпусціў»* [2, с. 325]. І выпусціў на яшчэ страшнейшую, горкую і крыўдную смерць — самагубства.

Што тычыцца самагубства Сушчэні, наконт гэтага ў літаратурнай крытыцы існуе вельмі шмат думак. Некаторыя крытыкі лічаць, што гэта праяўленне слабасці характару і што, наадварот, Сушчэня павінен быў жыць і даказаць людзям, што ён не здраднік. Іншыя — што гэта і ёсць тое адзінае і правільнае выйсце, таму што па-іншаму Сушчэня зрабіць не мог. Ён думаў найперш не пра сябе, а пра будучыню сваёй сям'і, пра незаплямленасць і спакойнае жыццё жонкі і сына. Дз. Бугаёў зазначае: «Такім чынам, Сушчэнеўскае самагубства — па сутнасці, і не самагубства, а забойства чалавека той сістэмай, якая ў абсалют увяла падазронасць» [1, с. 209]. Таксама крытык гаворыць: «У гэтай тыповай для Васіля Быкава па ўсіх параметрах аповесці вельмі востра гаворыцца пра неабходнасць даверу і дабрыні, без якіх, па сутнасці, немагчыма нармальнае грамадскае і ўласна чалавечае існаванне» [1, с. 206]. Але людзі не давяралі Сушчэню, што і з'явілася прычынай такога фіналу і выбару смерці Сушчэнем. Сушчэня вельмі добра разумеў, што людзі ўсё роўна будуць лічыць яго здраднікам, а апраўданне было не характэрным для яго.

Хочацца сказаць аб экранізацыі аповесці. У 2012 г. па аповесці Васіля Быкава рэжысёрам Сяргеем Лазніцам быў зняты фільм пад назвай «У тумане». Над яго вытворчасцю працавалі кінематаграфісты пяці краін — Германіі, Расіі, Беларусі, Латвіі, Нідэрландаў.

Карціна ўдзельнічала ў асноўнай конкурснай праграме 65-га Канскага кінафестывалю, дзе была ўганаравана спецыяльным прызам FIPRESCI. Каментуючы рашэнне членаў журы, кіназнаўца Андрэй Плахаў адзначыў, што карціна «У тумане» вытрымана ў жанры «экзістэнцыяльнай драмы на партызанскім матэрыяле» [4].

Заўважым, фільм рэжысёра С. Лазніцы, зняты паводле «партызанскага твора» Васіля Быкава «У тумане», быў адзначаны высокім журы на многіх кінафорумах. Праца С. Лазніцы атрымала Гран-пры Адэскага міжнароднага кінафестывалю. Таксама фільм атрымаў Гран-Пры Шостага кінафестывалю «Люстэрка» імя А. Таркоўскага. С. Лазніца з яго кінастужкай «У тумане» перамог на Ерэванскім міжнародным кінафестывалі «Залаты абрыкос». Вышэйшая прэмія Гран-пры «Золата Лістапада» была прысуджана карціне С. Лазніцы «У тумане» і ў Беларусі на мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад–2012».

Паводле слоў Сяргея Лазніцы, уражаны аповесцю Быкава, яе героямі, ён проста не мог не зняць гэты фільм. Магчымасці ўвасобіць на экране напісаны

ім сцэнарый рэжысёр чакаў доўгія дзесяць гадоў. «У тумане» — другі па ліку пасля стужкі «Шчасце маё» ігравы фільм Сяргея Лазніцы, які да гэтага быў вядомы як дакументаліст і таксама неаднаразова станавіўся са сваімі работамі прызёрам міжнародных кінафестываляў.

Арыгінальнасць рэжысёрскай трактоўкі аповесці Васіля Быкава заўважаецца на самым пачатку кінастужкі. Яна адрозніваецца ад пачатку аповесці, аднак не супярэчыць асноўнай мэце быкаўскага твора. Першыя кінакадры — як своеасаблівая экспазіцыя далейшага разгортвання дзеяння — дапамагае гледачам увайсці ў атмасферу партызанскага супраціву нямецкім парадкам, усталяваным у Беларусі ў гады Айчыннай вайны. Дзеянне пачынаецца з публічнай смяротнай кары трох партызанаў, якія здзейснілі на чыгуначнай калеі дыверсію супраць нацысцкіх акупантаў. Пры гэтым выяўляецца і асноўны, скразны рэжысёрскі прыём: сама смяротная кара дыверсантаў не паказваецца, як і не інсцэніруюцца і ўсе іншыя смерці ў фільме. Замест гэтага камера С. Лазніцы замірае на грудзе касцей каля мясной крамы. Жудасна, але псіхалагічна ўразліва. Узнікае дадатковая алюзія. Прыгадваецца выслоўе, дзе з прыкрасцю канстатуецца: чалавек на вайне з'яўляецца «гарматным мясам». І гэты прыём вельмі трапна характарызуе антыгуманную сутнасць вайны.

Нельга не адзначыць колеравую гаму фільма. Яна, у адпаведнасці з сутнасцю тумана, змрочная, шэрая. Гэты мастацкі прыём, успрыняты ад Васіля Быкава, працягвае сваё развіццё ў кінастужцы. Рэжысёр яшчэ раз звяртае ўвагу на нявызначанасць усіх складанасцей ваеннага часу. Акрамя таго, вытрыманы на працягу ўсяго фільма колеравы дыяпазон падтрымлівае напружанасць успрыняцця сюжэтнай падзейнасці.

Глыбока адчулі ідэю фільма і твора Васіля Быкава выканаўцы галоўных ролей. Уладзімір Свірскі — шляхавы абходчык Сушчэня, Уладзімір Абашын — партызан Свідраў (у аповесці — Бураў), Сяргей Колесаў — партызан Войцік, Улад Іваноў — Гросмеер, Юлія Перасільд — Анэля.

Пакутным і трагічным падаецца вобраз галоўнага героя Сушчэні. Вочы актора Уладзіміра Свірскага, выраз яго твару гавораць аб нешчаслівай долі гэтага чалавека. Рэжысёр С. Лазніца імкнуўся перадаць праз фільм не толькі галоўнае ў псіхалогіі дзейных асоб. Думаецца, заслуга С. Лазніцы як аўтара сцэнарыя і рэжысёра яшчэ і ў тым, што праўду народнага характара ён падаў у непарыўнай сувязі з характарыстыкай ментальнасці беларусаў, іх традыцыйнымі адметнасцямі ўкладу жыцця. Успомнім, да прыкладу, эпізод, калі Бураў прыйшоў у хату да Сушчэні, каб забраць яго. Тут адлюстраваны этыкет паводзін беларусаў у сям'і. Сушчэня любіць і шануе сына. У хаце бядота, але гаспадыня, жонка Сушчэні Анэля, запрашае госця Бурава да стала. Бураў адмаўляецца, выказваючы гэтым сваю сумленнасць: ён жа прыйшоў у хату не з добрымі намерамі! Тады настае ўсім зразумелае маўчанне, падчас якога толькі Сушчэня бярэцца за гарэлку. Ён моўчкі, амаль што запар выпівае тры чаркі гарэлкі, што гаворыць аб яго моцнай устрывожанасці і хваляванні. Традыцыйныя тры чаркі — так сціпла, як гэта бывае пры выправе чалавека ў апошнюю дарогу, на пахаванні чалавека…

Выдатны крытык і літаратуразнаўца В. Аскоцкі ў артыкуле «Логіка недаверу» адзначыў у свой час мастацкую значнасць, ідэйную вастрыню аповесці Васіля Быкава «У тумане». Даследчык пісаў: «Не проста сыры і густы асенні туман засцілае, паглынае іх [герояў аповесці] твары і фігуры. Ён — метафарычны знак, сімвалічны вобраз маральных дэфармацый, што раз'ядноўваюць людзей, адчужаюць іх узаемнымі непаразуменнем і недавер'ем, якія сталі першапрычынай трагедыі, пранікліва ўбачанай, чула разгаданай сярод многіх і розных драм вайны».

Узнаўленне задумы беларускага пісьменніка рэжысёрам С. Лазніцам на кінаэкране можна лічыць вельмі значнай культурнай з'явай.

Літаратура

1. Бугаёў, Д. Праўда і мужнасць таленту: выбранае / Д. Бугаёў. — Мінск.: Маст. літ., 1995.
2. Быкаў, В. Поўны збор твораў: у 14 т. / Васіль Быкаў. — Мінск: Саюз беларускіх пісьменнікаў; М.: Время, 2005. — Т. 2: Аповесці.
3. «Новый мир». —1988. — № 2.
4. У тумане, фільм [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://be.wikipedia.org/wiki/%D0%A3_%D1%82%D1%3%D0%BC%D0%B0%D0%BD%D0%B5,_%D1%84%D1%96%D0%BB%D1%8C%D0%BC#.D0.92.D0.BE.D0.B4.D0.B3.D1.83.D0.BA.D1.96;

Ірына Часнок (Мінск)

РАМАН М. ГАРЭЦКАГА «ВІЛЕНСКІЯ КАМУНАРЫ» Ў АСЭНСАВАННІ ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Раман М. Гарэцкага «Віленскія камунары» (1931–1932) мае цікавую гісторыю вывучэння. З часоў адкрыцця рамана (1960-я гг.; упершыню надрукаваны ў 1963 г.) погляды даследчыкаў на твор істотна змяніліся. Асабліва важнай з'яўляецца праблема апаведача (наратара) у тэксце і ў сувязі з гэтым разгляд ідэалагічнага пункту гледжання ў «Віленскіх камунарах». Прасочым, якія змены адбыліся ў інтэрпрэтацыі рамана, і зробім кароткі бібліяграфічны агляд прац, у якіх закранаецца пытанне «пасрэдніка» ў творы.

Вядома, раман «Віленскія камунары» М. Гарэцкага доўгі час разглядаўся крытыкамі і літаратуразнаўцамі (некаторымі і зараз працягвае разглядацца) як твор пра змаганне і веліч рэвалюцыянераў.

М. Лужанін разглядаў твор як сур'ёзнае адлюстраванне рэвалюцыйных падзей, хоць адзначаў, што «*мы, у першую чаргу літаратары, літаратуразнаўцы і мовазнаўцы, як след яшчэ не прачыталі Гарэцкага. А пара б. Пара перадаць яго творы чытачу са справядлівай ацэнкай іх, фактаў літаратуры, цвяроза суаднесеных да часу стварэння і часу прачытвання*» [14, с. 9–80].

У прадмове да выдання 1965 г. Ю. Пшыркоў трактаваў раман як твор, у якім услаўляецца рэвалюцыя [18].

Д. Бугаёў у манаграфіі «Максім Гарэцкі» (1968, 2003) называе «Віленскія камунары» найбольш значным творам М. Гарэцкага [5, с. 160] і таксама разглядае яго як сур'ёзны паказ рэвалюцыйнай барацьбы [5]. Даследчык у кнізе, якая пісалася ў часы рэабілітацыі М. Гарэцкага і далучэння яго творчасці

да здабыткаў беларускай савецкай літаратуры, лічыць бессэнсоўнымі пошукі выяўлення прыхаванай антысавецкай пазіцыі, рознаскіраваных поглядаў на аб'ект адлюстравання ў рамане. Д. Бугаёў піша: «*Шмат гаворыць пра адносіны да камуністаў ягоны* (М. Гарэцкага. — *І. Ч.*) *раман "Віленскія камунары"*» [4, с. 263] (маюцца на ўвазе станоўчыя адносіны. — *І. Ч.*).

А. Адамовіч у сваёй знакамітай, прысвечанай разгляду творчасці М. Гарэцкага кнізе «Браму скарбаў тваіх адчыняю…» напісаў: «*Мышкі робяць гісторыю, але трохі, як бачыце, анекдатычна»* [1, с. 152]. Ён жа трапна заўважыў, што *«праз стыль, праз горка-іранічную "пісарэвіцкую" інтанацыю «Віленскіх камунараў» бачыцца, прачытваецца і яшчэ нешта»* [1, с. 154]. Аднак, паводле А. Адамовіча, *«раман — толькі рэквіем тым рэальна жыўшым і так вось загінуўшым членам Рэўваенсавета…»* [1, с. 156].

У апошнія дзесяцігоддзі XX ст. пачалі з'яўляцца новыя інтэрпрэтацыі тэксту М. Гарэцкага.

Адным з першых розныя складнікі ў стылі рамана вылучыў М. Стральцоў у эсэ «Чалавек з Малой Багацькаўкі» (1975) [20]. М. Стральцоў адзначыў прыкметы авантурнай і сентыментальнай стылістыкі ў «Віленскіх камунарах» (а гэта, па сутнасці, азначае адрозныя ракурсы ў асвятленні падзей, адрозныя пункты гледжання апаведача на падзеі), але яшчэ не вёў гаворкі пра адрозныя ўнутрытэкставыя аповедныя інстанцыі.

Упершыню пра наяўнасць «*віртуознага пасрэдніка*» ў рамане (г. зн. пра большую, чым у традыцыйнай беларускай прозе прысутнасць аўтарскай свядомасці ў тэксце) напісала Л. Корань (Сінькова): *«Паміж аўтабіяграфіяй героя і хронікай гістарычных падзей у тэксце «Віленскіх камунараў» ёсць віртуозны пасрэднік, дзіўна-відушчы інтэлектуал Максім Гарэцкі. Гэта ён выбірае апавядальніцкі тон і той пункт гледжання, з якога афіцыйная савецкая ідэалогія можа мець толькі сваё натуральнае сціплае месца ў прыватным жыцці шэраговага Мышкі»* [12, с. 47]. У артыкуле «Смехавое як пазнака нацыянальнага ў творах Максіма Гарэцкага» Л. Сінькова адлюстравала іранічныя моманты ў «Віленскіх камунарах» [19].

У часопісе «Тэрмапілы» за 2001 г. сустракаем наступнае меркаванне У. Лебедзева: *«"Віленскія камунары" — гэта праўдзівы аповед і пра тых, хто спрабаваў навязаць ідэі, якія супярэчаць жыццю, і пра тых, хто нейкім чынам паверыў у гэтыя ідэі»* [13, с. 225].

І. Чыгрын заўважыў, што Максім Гарэцкі, *«не зважаючы ні на што, развенчваў слепату носьбітаў камуністычных задум у нашым краі»* [23, с. 141]. Даследчык не пабаяўся кінуць выклік традыцыйнаму разгляду рамана: *«Зрэшты і ў Ю. Пшыркова можна прачытаць, што «Віленскія камунары» — выдатны паэтычны дакумент пра рэвалюцыйную барацьбу пралетарыяту Беларусі і Літвы". Гэта была агульнапрызнаная, хадавая думка пра ідэйную накіраванасць "Віленскіх камунараў". Таму нам давядзецца спрачацца не з пазіцыяй асобнага даследчыка, а з поглядам беларускага літаратуразнаўства на гэты твор М. Гарэцкага ў цэлым»* [23, с. 129].

У манаграфіі Д. Бугаёва адзначана: «*У адным з нядаўніх выступленняў давялося пачуць, нібыта пісьменнік (і якраз у "Віленскіх камунарах") паказаў*

заганнасць камуністаў, надоўга апярэдзіўшы ў іх крытыцы самога А. Салжаніцына. Але гэта ўжо з галіны новых міфаў, у якіх М. Гарэцкі менш за ўсё мае патрэбу» [5, с. 216–217]. Як бачым, даследчык не змяніў свайго меркавання наконт інтэрпрэтацыі рамана.

А вось М. Мушынскі ў «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя», а таксама ў сваёй самай новай, выніковай працы пра М. Гарэцкага і яго творчасць перагледзеў свае погляды на твор і адзначыў, што *«адносіны пісьменніка да вопыту віленскіх камунараў, якія са зброяй у руках выступілі на абарону савецкай улады, у сапраўднасці не такія апалагетычныя, як вынікае з ранейшых даследчых прац»* [15, с. 413; 16, с. 415]*; «выбар галоўнага героя і формы аповеду — ад яго імя — прадыктаваны імкненнем аўтара замаскіраваць ад пільнага цэнзарскага вока свой уласны пункт гледжання, у тым ліку і ўласнае разуменне рэвалюцыі, схавацца за героя-апавядальніка»* [16, с. 423]. Разам з тым, раней даследчык пісаў: *«У рамане з выключнай, амаль дакументальнай дакладнасцю намаляваны працэс выспявання класавай, рэвалюцыйнай свядомасці працоўных мас, праўдзіва паказаны цяжкасці, з якімі сутыкаліся кіраўнікі Віленскага Савета рабочых дэпутатаў, па-мастацку перададзена напружанасць барацьбы за ўплыў камуністычнай партыі сярод працоўных горада і сялян навакольных вёсак»* [17, с. 156].

Праблема «другога» стаяла ў цэнтры ўвагі М. Тычыны ў артыкуле «Максім Гарэцкі і праблема “другога” ў яго творах» [21]. Нягледзячы на тое, што раман «Віленскія камунары» ў дадзенай працы асобна не разглядаўся, і назва яго не згадвалася, аўтар артыкула зрабіў важныя заўвагі пра наяўнасць «другога» ў тэкстах М. Гарэцкага і пра творчасць пісьменніка ўвогуле, якія можна суаднесці і са згаданым раманам: «*Паняцце “позірк збоку”, як і паняцце “свайго” і “чужога”, “другога”, станавілася прыкметай самой паэтыкі, уплывала на сюжэтабудову і выяўлялася ў мастацкай структуры тэксту»,* «*Сляды “іншага” ў мастацкім тэксце частыя ў творчасці Максіма Гарэцкага*» [21, с. 5]. І, што істотна, М. Тычына падкрэслівае: «*Варта асобна адзначыць у прозе беларускага пісьменніка* (М. Гарэцкага. — *І. Ч.*) *такую прыкметную, а ў многіх выпадках і вызначальную асаблівасць, як іранічнае стаўленне да аб’екта паказу. У Гарэцкага яно звычайна лірычнае, філасафічна-адцягненае, біблейска-ўзвышанае. Так празаік успрыняў гегелеўска-марксаўскае паняцце “іронія гісторыі”: першы раз яна паўстае як трагедыя, а потым — як камедыя. Ён перажыў і трагедыю пагібелі сваіх ідэалаў, і камедыю людскога здрадніцтва, падступства, вераломнасці, прыстасаванства*» [21, с. 9]. Мы прывялі такую доўгую цытату, бо, на нашу думку, гэтыя словы неабходна ўлічваць пры аналізе рамана «Віленскія камунары».

У больш раннім артыкуле М. Тычына звяртаўся менавіта да «Віленскіх камунараў» і адзначыў наяўнасць іроніі ў творы: «*Ну як было не іранізаваць таму Мацею Мышку над уласным лёсам, які ламаў і круціў яго, як хацеў*» [22, с. 22].

Праблему суадносінаў аўтара — апавядальніка — героя ў творах М. Гарэцкага закранула і Т. Дасаева ў кнізе «Максім Гарэцкі і Янка Брыль: тыпалогія малых жанраў» [11]. Аднак даследчыца засяроджвае ўвагу толькі на

выяўленні асобы аўтара (Т. Дасаева не адасабляе паняцці аўтара і пісьменніка) непасрэдна ў малых жанрах. Пра аповедныя інстанцыі ў «Віленскіх камунарах» яна не піша.

У прадмове да кнігі «Выбраныя творы. Максім Гарэцкі» Т. Голуб тлумачыць сваю інтэрпрэтацыю ідэалагічнага пункту гледжання ў творы праз сувязь з біяграфіяй М. Гарэцкага: *«Праца над раманам "Віленскія камунары" ішла найбольш інтэнсіўна і мэтанакіравана, бо яна яшчэ цепліла надзею пісьменніка на змену абставін і адначасова была пэўным кампрамісам з боку аўтара. Асвятляючы тэму рэвалюцыі, ствараючы вобразы камуністаў як мужных і адважных барацьбітоў, змагароў за светлую будучыню, М. Гарэцкі імкнуўся не толькі сцвердзіць сябе як пісьменнік, але і паказаць сваю прыхільнасць да рэвалюцыйных ідэй, чым спадзяваўся выклікаць давер да сябе ў адказных асоб, якія маглі б змяніць яго трагічны лёс»* [6, с. 12].

А, напрыклад, І. Чыгрын звязвае біяграфію пісьменніка з напісаннем рамана іншым чынам: *«Як не можа паказацца дзіўным, але працу прыспешыў арышт 1930 г. Захацелася пераправерыць свой погляд на характар рэвалюцыі ў Беларусі. Задача была ў нейкай меры публіцыстычнай. Аднак не без выкліку. Не без тайнай надзеі (да канца дзён не пакідала вера ў чалавечае ў чалавеку), што адкрытай праўдай паўплывае на суддзяў, якія адправілі яго ў адміністратыўную ссылку на пяць гадоў, а потым, калі тэрмін скончыўся, нанава арыштавалі і ўрэшце расстаралялі. Самога расстралялі, але не праўду, якую ён так умела агаліў у творы»* [23, с. 135].

Цікавую пазіцыю знаходзім у кнізе «Беларуская літаратура і свет: ад эпохі раматызму да нашых дзён» (Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына, 2006). З аднаго боку, пра раман М. Гарэцага напісана, што ён «*стаў спробай празаіка аддаць належнае подзвігу змагароў за свабоду, якія ахвяравалі сваім жыццём дзеля перамогі*» [2, с. 214]. З другога боку, адзначаецца, што ў «Віленскіх камунарах» ёсць шматгалоссе ідэйных спрэчак, а таксама *«толькі ў адным выпадку іронія героя саступае месца гераічнай пафаснасці»* [2, с. 215]. Такім чынам, аўтары кнігі займаюць своеасаблівае прамежкавае становішча паміж супрацьлеглымі пунктамі гледжання.

Пра наяўнасць у рамане розных (і менавіта дзвюх) свядомасцей падрабязна напісала В. Губская. Даследчыца вылучыла ў тэксце М. Гарэцкага свядомасць аўтара і свядомасць персанажа-апавядальніка — трыксцера Мацея Мышкі [7; 8; 10]. В. Губская прааналізавала раман, у асноўным паслядоўна прытрымліваючыся тэорыі М. Бахціна: адзначыла поліфанію [9; 10], акцэнтавала ўвагу на тым, што «*вобраз Мышкі — гэта і ёсць тая "істотная, нявыдуманая" маска»* [9].

А. Белая ў артыкуле «Мастацкія носьбіты ідэнтычнасці ў рамане М. Гарэцкага "Віленскія камунары"» сцвярджае, што раман *«у цэлым мае багаты метафарычны рад, разлічаны на дамысліванне, асацыятыўнае ўспрыманне»* [3, с. 59]. Даследчыца разглядае выбітае вока Міхася Мышкі і зламаную руку Мацея як сімволіка-метафарычныя дэталі, што азначаюць светапогляд і тактыку бальшавікоў. І гэта, па словах А. Белай, «*дазваляе глыбей спасцігнуць гуманістычную пазіцыю пісьменніка, якую ён мусіў прыхоўваць»* [3, с. 60].

Як бачым, пытанне з ідэалагічным пунктам гледжання ў рамане, з выяўленнем аўтарскай ацэнкі ў творы і на сённяшні дзень застаецца спрэчным і патрабуе далейшага вывучэння.

Літаратура

1. Адамовіч, А. Браму скарбаў сваіх адчыняю… / А. Адамовіч. — Мінск: Выд-ва БДУ, 1980. — 224 с.
2. Баршчэўскі, Л. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына. — Мінск: Радыёла-плюс, 2006. — 596 с.
3. Белая, А. Мастацкія носьбіты ідэнтычнасці ў рамане М. Гарэцкага «Віленскія камунары» / А. Белая // Міжнародныя Шамякінскія чытанні «Пісьменнік — Асоба — Час» / рэдкал.: А. У. Сузько (адказны рэдактар) [і інш.] — Мазыр: МДПУ, 2011. — С. 57–62.
4. Бугаёў, Дз. Аплочана жыццём / Дз. Бугаёў // Праўда і мужнасць таленту— Мінск: Маст. літ., 1995. — С. 241–276.
5. Бугаёў Дз. Максім Гарэцкі / Дз. Бугаёў. — 2-е выд., выпр., дап. — Мінск: Бел. навука, 2003. — 239 с.
6. Голуб, Т. Скарбы жыцця / Т. Голуб // Выбраныя творы. Максім Гарэцкі — Мінск: Кнігазбор, 2009. — С. 5–22.
7. Губская, В. М. Вобраз Мацея Мышкі ў рамане М. Гарэцкага «Віленскія камунары» (1931-1932): ад рэвалюцыянера да трыксцера / В. М. Губская // Беларускае літаратуразнаўства: навук.-метад. зб. / гал. рэд. Л. Д. Сінькова. — Вып. 9. — Мінск: БДУ, 2011. — С. 24–30.
8. Губская, В. М. Дзве свядомасці і адна рэвалюцыя: на матэрыяле рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары» (1931–1932) / В. М. Губская // Беларускае літаратуразнаўства: навукова-метадычны зборнік / гал. рэд. Л. Д. Сінькова. — Вып. 10. — Мінск: БДУ, 2012. — С. 27–33.
9. Губская, В. М. Поліфанічная прырода рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары» (1931−1932) / В. М. Губская // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова»: сб. науч. тр. — Витебск, 2011. — Т. 12. — С. 166–173.
10. Губская, В. М. Раман М. Гарэцкага «Віленскія камунары» ў кантэксце беларускай прозы 1920-1930-х гадоў: жанравае наватарства: аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10.01.01 / В. М. Губская; БДУ. — Мінск, 2012. — 24 с.
11. Дасаева, Т. М. Максім Гарэцкі і Янка Брыль: тыпалогія малых жанраў / Т. М. Дасаева. — Мінск: БДУ, 2004. — 115 с.
12. Корань (Сінькова), Л. Максім Гарэцкі / Л. Корань // Цукровы пеўнік: літ.-крытыч. арт. — Мінск: Маст. літ. — 1996. — С. 22–65.
13. Лебедзеў, У. Узіраюся ў вечнасць (шлях М. Гарэцкага да «Скарбаў жыцця») / У. Лебедзеў // Тэрмапілы. — №4–5. — Беласток. — 2001. — С. 224—232.
14. Лужанін, М. Лёс пісьменніка і твора / М. Лужанін // З ранку да вечара. — Мінск: Маст. літ., 1983. — С. 78–103.
15. Мушынскі, М. Максім Гарэцкі / М. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. // Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. Імя Я. Купалы. — 2-е выд. — Мінск: Беларуская навука, 2001. — Том 1: 1901—1920. — С. 381–426.
16. Мушынскі, М. Падзвіжнік з малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі; навук. рэд. А. М. Макарэвіч; Нац. Акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. Імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мінск: Беларус. навука, 2013. — 543 с.
17. Мушынскі, М. Талент шматграннасці самабытны / Максім Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы // Склад. А. С. Ліс, І. У. Саламевіч; Бібліягр. Паказ. і камент. І. У. Саламевіча. — Мінск: Маст. літ., 1984. — С. 150–159.
18. Пшыркоў, Ю. Максім Гарэцкі і яго раман «Віленскія камунары» / Ю. Пшыркоў // Гарэцкі Максім. Віленскія камунары: Раман-хроніка. — Мінск: Беларусь, 1965. — С. 5–14.
19. Сінькова, Л. Д. Смехавое як пазнака нацыянальнага ў творах Максіма Гарэцкага / Л. Д. Сінькова // Беларускае літаратуразнаўства: навук.-метад. зб. // гал. рэд. Л. Д. Сінькова. — Вып. 6. — Мінск: БДУ, 2008. — С. 47–51.

20. Стральцоў, М. Л. Чалавек з Малой Багацькаўкі // Ад маладзіка да поўні: апавяданні, аповесці, эсэ // М. Стральцоў; уклад. В. Стральцовай. — Мінск: Маст. літ., 2005. — С. 323–336.
21. Тычына, М. Максім Гарэцкі і праблема «другога» ў яго творах / М. Тычына // Роднае слова. — 2003. — № 2. — С. 5–9.
22. Тычына, М. На выспе Патмас: Творчасць Максіма Гарэцкага / М. Тычына // Роднае слова. — 1993. — № 2. — С. 15–22.
23. Чыгрын, І. П. Паміж былым і будучым: Проза М. Гарэцкага / І. П. Чыгрын. — 2-е выд., выпр. — Мінск: Бел. навука, 2003. — 166 с.

Мікалай Хмяльніцкі (Мінск)

РЭЦЭПЦЫЯ АСОБЫ І ТВОРЧАСЦІ С. ПЯСЕЦКАГА Ў БЕЛАРУСІ: ПРАЗ МЕЖЫ І ІДЭАЛАГІЧНЫЯ КАРДОНЫ

Вядома, што рэцэпцыя — адна з форм культурна-літаратурнага ўзаемадзеяння, якая выяўляе характэрныя асаблівасці функцыянавання пэўнай літаратуры, ўключанасці таго ці іншага аўтара, а таксама твора ў кантэкст сусветнай (у нашым выпадку — беларускай). У такім аспекце даследавання пэўную цікавасць уяўляе асоба і творчасць польскага пісьменніка беларускага паходжання Сяргея Пясецкага (1901–1964), сапраўднае знаёмства з якім у нас распачалося не так даўно і чакае, безумоўна, цікавых перспектыў, бо сучасная літаратуразнаўчая навука павінна даць адказы на некаторыя вузлавыя пытанні, звязаныя з жыццём і дзейнасцю С. Пясецкага, што дазволіць па-новаму паглядзець на вядомыя сацыякультурныя і літаратурныя працэсы 20–30-х гг. XX ст., на творчую дзейнасць многіх пісьменнікаў згаданага перыяду.

Творчасць Сяргея Пясецкага, нягледзячы на яго шырокую прызнанасць у Польшчы, і шырэй, у заходнееўрапейскай прасторы, на жаль, стала вядома ў нашай краіне зусім нядаўна. Яго называюць «беларускім Джэймсам Бондам», «карсарам памежжа», «няўлоўным кантрабандыстам» і г. д., што спрыяе стварэнню легенды вакол імя гэтага чалавека. Напрыклад, не так даўно ў яго гонар быў наладжаны так званы «Кантрабандысцкі канцэрт», а экскурсавод Павел Махінаў, натхнёны жыццём і творамі С. Пясецкага, наладзіў займальны экскурсійны маршрут «Мінск кантрабандысцкі», у якім прапанаваў рэканструкцыю інтэр'ера Мінска пач. 20-х гг. XX ст. па вядомых творах «мінскай трылогіі» С. Пясецкага. Таксама можна прыгадаць, што быў створаны дакументальны фільм «Каханак Вялікай Мядзведзіцы», які здымаўся ў Ракаве і прысвечаны беларуска-польскаму пісьменніку (прэм'ера адбылася на канале АНТ). Па другі ж бок мяжы, у Беластоцкім драматычным тэатры, здзейснена пастаноўка «Запіскі афіцэра Чырвонай Арміі».

Як бачым, пазнавальны рух у дачыненні да асобы і творчасці С. Пясецкага ў апошняе дзесяцігоддзе значна актывізаваўся. Слушна на гэты конт у адным са сваіх інтэрв'ю ў 2010 г. адзначыла пісьменніца і журналіст Л. Рублеўская: «Сяргей Пясецкі, толькі пачынаем адкрываць яго, што для нас чарговы "срамешча", мы заўсёды вельмі шчодра дзелімся сваімі талентамі».

Прычына такога становішча можа быць патлумачана некалькімі прычынамі. Як вядома, на працягу многіх дзесяцігоддзяў існавала фільтрацыя ў аз-

наямленні з многімі творамі польскіх аўтараў, а адсюль вынікаў чыннік выпадковасці імёнаў, палітычнай кан'юнктуры ў выбары твораў і г. д. У выніку — сфальсіфікаваны вобраз рэцэпцыі, звужаная інфарматыўнасць, іншая іерархія вартасцей, на якую абапіраецца кантэкст той ці іншай нацыянальнай літаратуры і агульны кантэкст сусветнай літаратуры, які магчымы на дадзены момант. Усё гэта прама ці апасродкавана ўплывала і на рэцэпцыю і прысутнасць у беларускай культурнай прасторы творчасці С. Пясецкага. Вялікая колькасць літаратурных узнагарод, якімі быў уганараваны пісьменнік, не стала падставай для таго, каб артыкулы пра яго з'явіліся раней і ў найсучаснейшых літаратуразнаўчых энцыклапедычных даведніках, якія ўбачылі свет у Беларусі, Расіі ці на Украіне. Няма яго імя і ў апошнім 18-томным выданні Беларускай энцыклапедыі, хоць том на адпаведную літару выдаваўся ў 2001 г.

Айчыннае, ды і ўсходнеславянскае літаратуразнаўства, якое знаходзілася доўгі час пад прымусам заідэалагізаванасці, яшчэ не паспела шматаспектна асвоіць новы для яго мастацкі матэрыял. Зрэшты, толькі апошнім часам для нас адкрываюцца замежныя (і польскія ў тым ліку) пісьменнікі, якія па месцы нараджэння і па тэматыцы творчасці моцна звязаныя з нашай краінай. Маем на ўвазе, у прыватнасці, і С. Пясецкага, які побач з Чэславам Мілашам, быў прадстаўлены да Нобеля, а таксама Т. Канвіцкага, А. Юрэвіча і многіх іншых пісьменнікаў, якія ў дзіцячыя гады і юнацтве былі моцна звязаны з вёскамі, мястэчкамі і гарадамі сучаснай Беларусі. Пры ўсёй дынамічнасці мастацкай свядомасці мастацкае ўяўленне гэтых пісьменнікаў, як магнітнае поле вышэйшай напружанасці, утрымлівала на працягу многіх гадоў іх памяць на прыгажосці і рэаліях «краю дзіцячых гадоў». Многім з іх лёсам было наканавана ўпрыгожыць польскі літаратурны Парнас, але на роднай зямлі яны не маглі быць прызнанымі ў выніку іх уключанасці ў палітычныя рэаліі складанага XX ст., у прыватнасці і праз дачыненні да дзейнасці Арміі Краёвай. Творцы далі падставы лічыць іх «гераічнымі песімістамі», а вернасць стала адной з рысаў іх чалавечай ментальнасці, гуманістычны ж пачатак — найважнейшай асновай разумення сістэмы грамадскіх каштоўнасцей.

Такім чынам, пытанне рэцэпцыі творчасці С. Пясецкага ў Беларусі пакуль што не атрымала належнай увагі, але пэўная даследчая і эмпірычная база для высноў і магчымых перспектыў комплекснага даследавання ўжо назапашана [1–4; 6; 7]. Своеасаблівай зонай павышанай увагі даследчыкаў была і застаецца творчасць пісьменнікаў, народжаных сумесным існаваннем двух народаў (беларусы і палякі, украінцы і палякі), складанасць, супярэчлівасць унутранай біяграфіі прадстаўнікоў гэтай кагорты, іх важнасць у збліжэнні польскай і іншых культур. Творы С. Пясецкага стала прысутнічаюць у практыцы выкладання польскай літаратуры, згадваюцца ў кантэксце 1920–1930-х гг. пры вывучэнні славянскіх літаратур ва ўстановах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, прынамсі ў БДУ, пішуцца курсавыя работы і рыхтуюцца рэфераты, а ў 2001 г. была абаронена кандыдацкая дысертацыя на тэму «Творчасць Сяргея Пясецкага: праблема жанрава-стылёвай адметнасці» [6] выпускніком спецыяльнасці «Славянская філалогія» філалагічнага факультэта БДУ П. В. Рагойшам.

Што датычыцца непасрэдна перакладаў твораў С. Пясецкага на беларускую мову, то сітуацыя тут выглядае наступным чынам: у Беларусі намаганнямі аматараў польскай літаратуры і пры падтрымцы адпаведных зацікаўленых грамадскіх арганізацый выдадзена некалькі твораў польскага пісьменніка (напрыклад, «Каханак Вялікай Мядзведзіцы» [5] і «Пяты этап» (гэты твор таксама друкаваўся ў «Полымі» за 2010 г.)). Варта прыгадаць і праект электроннага рэсурсу «Будзьма беларусамі» — «Какаін, мяжа і Ракаў» (са здымкамі і ілюстрацыямі). Часопіс «Прайдзісвет» надрукаваў урывак «Боствам ночы роўныя» ў перакладзе Насты Гвоздзевай, інтэрнэт-прастора прапаноўвае таксама «Аўтадэнунцыяцыю» ў перакладзе Таццяны Крэмень. Ул. Арлоў згадвае імя С. Пясецкага ў кнізе «Імёны свабоды», выдадзенай у 2007 г.

Такім чынам, вызначаючы галоўныя характарыстычныя параметры творчасці Сяргея Пясецкага найперш трэба звярнуць увагу на ўмовы фарміравання таленту творцы. Разгляд творчай спадчыны С. Пясецкага праз прызму полікультурнасці не толькі ўпісвае творцу ў гісторыка-культурны кантэкст краіны яго нараджэння і сталення, але дазваляе аб'ектыўна акрэсліць важкасць яго ўкладу ў сусветную культуру. Як слушна адзначае П. В. Рагойша, «запозненае асэнсаванне месца і ролі С. Пясецкага ў гісторыі літаратуры звязана ў першую чаргу з тым, што цікавасць да яго як у Польшчы, так і ва ўсёй Заходняй Еўропе доўгі час была абумоўленая толькі знешняй арыгінальнасцю і сюжэтнай займальнасцю твораў, незвычайным лёсам, своеасаблівасцю пісьменніцкага стылю, успрыманнем ягонай творчасці ледзь не выключна ў рэчышчы "масавай літаратуры". З другога боку, замоўчванне пісьменніка ў Польскай Народнай Рэспубліцы было прадвызначана пэўнымі ідэалагічнымі прычынамі (яго пасляваенная эміграцыя на Захад, рэзкае непрыманне ім сацыялістычнага ладу і г. д.). Спецыяльнае вывучэнне творчасці С. Пясецкага як ў літаратуразнаўчым, так і грамадска-палітычным, сацыякультурным планах неабходна для стварэння навуковай карціны еўрапейскага літаратурнага працэсу першай паловы XX ст., а таксама цэласнага асэнсавання духоўнай культуры Польшчы і Беларусі» [6, с. 3].

Жыццё і творчасць Сяргея Пясецкага сталі аб'ектам літаратуразнаўчых даследаванняў таксама адносна не так даўно: у 90-я гг. мінулага стагоддзя, калі з'явіліся дзве манаграфіі — Кшыштафа Паляхонскага [9] і Рышарда Дэмеля [10]. Польскія аўтары прыгадваюць у сваіх кнігах біяграфічныя моманты, тагачасны сацыякультурны кантэкст, вылучаюць асноўныя матывы і стылёвыя адметнасці твораў С. Пясецкага, але зусім мала ўвагі звяртаюць на літаратурнае ўвасабленне сувязей лёсу і некаторых твораў Пясецкага з рэаліямі гісторыі і культуры беларусаў, а таксама польска-беларускіх культурных сувязей. Не вядуць размову вышэйзгаданыя даследчыкі і пра ўсходнеславянскія карані генезесу творчасці С. Пясецкага (адзначым, што дадзены аспект праблемы цудоўна распрацаваны ў публікацыях П. Рагойшы). Больш таго, у вышэй згаданых крытычных публікацыях амаль зусім не згадваюцца гісторыка-тыпалагічныя паралелі з творчасцю іншых польскіх пісьменнікаў, якія распрацоўвалі падобную тэматыку ў літаратуры міжваеннай Польшчы (напрыклад М. Ваньковіч).

Цалкам слушнымі ў дадзеным кантэксце падаюцца разважанні Н. Бахановіч: «Заканамерным бачыцца, што ў прадмове да кнігі «Каханак Вялікай Мядзведзіцы» (1937) С. Пясецкага (1901–1964), які таксама апісваў жыццё на мяжы — рэальнай, беларуска-польскай граніцы, з яго жудасцямі і авантурамі, М. Ваньковіч цытуе істотныя для яго самога радкі з ліста аўтара: “Пішу, бо пісаць павінен. Гэта ёсць мая арганічная патрэба, неадольнае і непераможнае жаданне. …Як прыкра раскладваць працу на месяцы, гады, калі хочацца яе зрабіць адразу… каб мець супакой…” У такой сувязі адзнаку невыпадковасці мае знаёмства і сяброўства пісьменнікаў як прадстаўнікоў тэрытарыяльнага і духоўнага памежжа. Мэтай выяўлення беларускага субстрату ў іх творчасці выступае адданне даніны мінуламу — людзям і мясцінам, што паўплывалі на асобаснае і творчае станаўленне. У гэтых творах аб дзяцінстве, юнацтве ажыццяўляюцца спробы праз гістарычныя пераломы паказаць найперш складаны працэс асэнсавання свету і сябе ў ім» [2, с. 218–219].

Такім чынам, можна канстатаваць, што прысутнасць асобы і творчасці С. Пясецкага заняла ў культурнай прасторы Беларусі адпаведнае месца, а іх вывучэнне ў хуткай перспектыве дасць плённыя вынікі і вывядзе імя нашага слыннага земляка-пісьменніка з-за нацыянальных і ідэалагічных межаў на арбіту ўзаемаўзбагачальнага беларуска-польскага культурнага дыялогу.

Літаратура

1. Арэшка, В. Сяргей Пясецкі / В. Арэшка // Спадчына. — 1999. — №1. — С. 136–140.
2. Бахановіч, Н. Беларуская тэма ў польскай літаратуры / Н. Бахановіч // Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць / А. В. Вальчук [і інш]; навук. рэд. М. У. Мікуліч/ Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. Імя Я. Коласа і Я. Купалы. — Мінск: Бел. навука, 2012. — С. 205–228.
3. Бразгуноў, А. Мінск у «зладзейскай» трылогіі Сяргея Пясэцкага // Знакамітыя мінчане XIX–XX ст. Мінск і Міншчына ў літаратурных творах на рубяжы XIX–XX стст.: матэрыялы Беларуска-польскай навук. канф., Мінск, 27 крас. 2010 г. — Мінск: Выдавец В. Хурсік, 2011. — С. 132–139.
4. Великий, А. Мифы и правда в романе С. Песецкого «Записки офицера Красной Армии» (с сентября 1939г.) / А. Великий // Знакамітыя мінчане XIX–XXст. Мінск і Міншчына ў літаратурных творах на рубяжы XIX–XX стст. Матэрыялы Беларуска-польскай навуковай канферэнцыі. Мінск, 27 красавіка 2010 г. — Мінск: Выдавец В. Хурсік, 2011. —С. 139–146.
5. Венідзіктаў, С. Сяргей Пясецкі (Жыццё ў творчасці). Камунікат / С. Венідзіктаў // Беларуская Інтэрнэт-бібліятэка. [Электронный ресурс] — Рэжым доступу: http://kamunikat.fontel.net/www/knizki/brama/kraj_1-2_2002/20.htm. — Дата доступу: 06.02.2013.
6. Пясецкі, С. Пяты этап: раман (Пераклад і прадмова Я. Янушкевіча) / С. Пясецкі — Мінск, Варшава: Pod wiatr, 2011. — 294 с.; Пясецкі, С. Пяты этап: раман / С. Пясецкі; пер. і прадм. Я. Янушкевіча. — 2 выд., выпр. — Мінск: Галіяфы, 2011. — 294 с.
7. Рагойша, П. В. Творчасць Сяргея Пясецкага: праблема жанрава-стылёвай адметнасці : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.03 / П. В. Рагойша; Беларус. дзярж. ун-т. — Мінск, БДУ, 2001. — 20 с.
8. Янушкевіч, Я. Вяртанне Вялікай Мядзведзіцы / Я. Янушкевіч // Голас Радзімы. — 1995. — 20 ліпеня. — С. 1.
9. Demel, R. Sergiusz Piasecki: Życie i twórczość / R. Demel — Warszawa: LTW, 2001. — 176 s.

10. Polechoński, K. Żywot człowieka uzbrojonego: Biografia, twórczość i legenda literacka Sergiusza Piaseckiego / K. Polechoński – Warszawa, Wrocław: PWN, 200. — 236 s.

Ніна Рашэтнікава (Мінск)

ЧАЛАВЕК У ЭСТЭТЫЧНАЙ СІСТЭМЕ КАРЭЛА КЛАСТЭРМАНА

Творчасць выдатнага чэшскага пісьменніка Карэла Кластэрмана (1848–1923) уваходзіць у залаты фонд чэшскай літаратуры. К. Кластэрман — паэт Шумавы, цудоўнага кутка на паўднёвым захадзе Чэхіі.

Пісьменнік нарадзіўся і правёў маленства ў нямецка-чэшскім асяроддзі і свае першыя крокі ў літаратуры распачаў з публіцыстыкі, аднак шырокую вядомасць набыў як аўтар раманаў і мемуараў, а малыя формы (апавяданні, лірычныя замалёўкі, нарысы) далі яму неабходны вопыт і майстэрства. У якіх бы жанрах прозы не працаваў К. Кластэрман, уражвае яго складаная і шматмерная эстэтычная сістэма. Звярнуўшыся да апавядання «Нешта», мы маем на мэце паказаць глыбіню і значнасць творчага почырку пісьменніка.

Для гэтага, як і для іншых твораў К. Кластэрмана, характэрны шматслойны зачын, без асэнсавання якога немагчыма ўвайсці «ў пісьменніцкі свет твора». Ва ўступе да падзей аповед мяжуецца з пейзажнай замалёўкай і гістарычным нарысам. А інакш як «дарагі чытач» зразумее тое месца, дзе адбываюцца падзеі ў творы. Гэтая мясцовасць пазбаўлена экзотыкі, але надзвычай арганічная для людзей, якія не столькі жывуць на гэтай зямлі, колькі змагаюцца з абставінамі побыту.

Такім чынам, аповед К. Кластэрмана ў шэрагу твораў малой формы дае магчымасць чытачу ўбачыць падзеі і канфлікты, на першы погляд, нязначныя, аднак менавіта яны дазваляюць надзвычай поўна асэнсаваць жыццё герояў такога дарагога для аўтара кутка Чэхіі. Адсюль і своеасаблівасць стылю мастака слова, які можа здзіўляць, але не прызнаць вялікі «талент» К. Кластэрмана немагчыма. Яго пісьмо настолькі індывідуальнае і непаўторнае, што адразу пазнаецца чытачом.

Вось партрэт галоўнага героя апавядання «Нешта» Аўгусціна, дзе адлюстроўваецца і характар, і нацыянальная адметнасць «тыповага шумаўскага немца». Усё гэта адчуваецца ў кожным радку, у кожнай рысе, апісанай аўтарам надзвычай уважліва і цярпліва. Галоўны герой апавядання «Нешта» меў *«без малога сорак гадоў, што цяжка вызначыць, калі ў чалавека грузная постаць. Хадзіў ён на кароткіх нагах, але пры гэтым меў велізарныя ступні; вялікая крупная галава сядзела на кароткай шыі з моцным недаразвітымі шчытападобнымі залізамі, што не мелі вельмі хваравітай формы і называліся валяк, лоб у яго быў нізкі, твар моцна пачырванелы, упрыгожаны вялікімі рыжаватымі вусамі з бакенбардамі, малую бараду, заўсёды дрэнна паголеную і пабітую на плямы бліскучым цвёрдым шчаціннем, шырокія вусны, цяпер гэтыя вусны расцягнутыя ў грымасе, малы нос, падобны на барвовую бульбападобную бародаўку з дзвюма, звернутымі да нябёсаў, дзіркамі, з якіх выраставалі цэлыя кусты кучаравых валасоў, але ён атрымаў, як узнагароду, бровы, якімі яго*

ўпрыгожвала прырода, яны былі падобныя на пару цыліндрычных, зачыраванелых выпукласцяў, скура на іх увесь час трэскалася, нібы раздражнёная вострымі кісцямі рыжавата-русай шавялюры, што падала на лоб, высоўваючы з-пад страціўшага форму незвычайна бруднага капелюша, які ён ніколі не здымаў, ані на вуліцы, ані дома, ані ўначы, калі спаў у сваім ложку» [1, с. 116]. Ёсць у гэтай партрэтнай характарыстыцы, якая перапоўнена, на першы погляд, нязначнымі дэталямі, нешта хвалюючае і трывожнае. Аўтар свядома пазбягае гераізацыі, ацэньвае жыццё Аўгусціна ў гэты мясцовасці настолькі складанае, што надзвычай моцны духам чалавек здольны вытрымаць гэткія выпрабаванні лёсам. Не менш характэрным з'яўляецца ў творы і апісанне сям'і Аўгусціна, яго дзяцей: *«Шчаслівы быў Аўгусцін, калі з гонарам глядзеў на сваіх нашчадкаў. Старэйшая з іх трынаццацігадовая дачка, якая звалася гучным і паэтычным імем Адэла, пасля яе дзесяцігадовы Філіп, хлопец здаровы, што дуб, падобны на бацьку і такі ж брудны, што нават у нядзелю, пасля — Божа мой! — СЭПЛ, сямігадовы бедны хлопец, карлік, які не валодаў нагамі, што было выклікана запаленнем суставаў, якое знікла на першым годзе жыцця дзіцяці без усялякай лекарскай дапамогі, толькі бясконцым прыкладваннем гарачых бліноў з вотрубоў і лістоў хрэну, акрамя адвару дзевясілу, што з пакланення ў пакаленне у сям'і Аўгусціна пілі, і што па словах гэтага славутага мужчыны, і ў гэтым выпадку выключна сябе праявіла, і без іх Сэпл не вытрымаў бы.*

Дзіця назаўсёды засталося б скалечаным, але ёсць у гэтым воля Бога, у няшчасці праявіўся надзвычайны талент дзіцяці, якое само па сабе без усялякай дапамогі, навучылася лічыць, паказваючы пальцам на мух, што поўзалі на чорнай брусчатай столі, бясконца паўтарала: «Адзін, два, тры, восем, дваццаць шэсць, сто, тысяча!» — «Хто б сказаў, што гэта дзіця само па сабе навучыцца лічыць! — дзівіўся бацька, — я ніколі да смерці не здолеў бы зрабіць такое. Цяпер зразумела, што стварыў нас Бог.

Чацвёртае і апошняе дзіця, на гэты раз дзяўчынка, нарадзілася ў дзень, калі нябожчыца, яе маці, на сёмым яе месяцы цяжарнасці, вырашыла, што патрэбна нараджаць, пра што і сказала Аўгусціну, але ў гэтым выпадку ёй не пашчасціла, яна памерла падчас родаў, але знайшлася суседка, якая дзіця выратавала і два гады ў сябе трымала, за што нічога не атрымала, акрамя паліва з яго запасаў: паленні, палкі, галлё і ігліцу і звыш таго малако ад адной казы, за тое, што другую і тры каровы акуратна тры разы на дзень даіла і ўсё гэтыя ўменні перадала Адэлі, ды так гэтую здольную дзяўчынку навучыла розным гаспадарчым справам, што тая, калі толькі мела адзінаццаць гадоў, магла запаліць у печы, зварыць бульбу, капусту, кашу, спячы бліны, памыць посуд, бо ўсё, пакуль дачка не ўмела, вымушаны быў рабіць Аўгусцін» [1, с. 118–119].

Апісанне побыту герояў, іх партрэтныя характарыстыкі даюць магчымасць аўтару глыбока паказаць быццё асобы як працэс, псіхалогію чалавека, які выпрабоўваецца самотнасцю, псіхалагічным пераадоленнем гэтага стану.

Аўгусцін не губляе надзею істотна змяніць сваё жыццё і гэтая такая натуральная для чалавека мара выклікае ў яго знаёмых зайздрасць. Герою

апавядання «Нешта» зайздросціць так шмат народу, што гэта выклікала б недавер чытача, каб не аўтарская даверлівая інтанацыя, дзе гумар і іронія нібыта дапаўняюць адно аднаго. Узаемаадносіны Францала, Марыяны і Аўгусціна маглі б, на першы погляд, выклікаць чытача ўсмешку, падзеі ў творы малююць трагічную развязку і зноў толькі на першы погляд, жыццё аказваецца нашмат больш складаным.

У чым жа сутнасць каштоўнаснай арыентацыі героя, што аўтар не дае магчымасці «дарагому чытачу» зразумець пазіцыю галоўнага героя?

У тэксце знаходзім наступнае: *«Улічваючы ўсе яго ўяўленні пра знешнасць, мы не будзем здзіўляцца, што яна вельмі спадабалася добраму Аўгусціну, яго ідэал жаночай прыгажосці быў звязаны з думкаю пра тое, як яе скарыстаць»* [1, с. 121]. Такім чынам аўтар паступова раскрывае, як каштоўнасныя арыентацыі адлюстроўваюцца на свеце эмоцый героя, як выпрабаванне каханнем высвятляе, наколькі чалавечным з'яўляецца чалавек.

Сусветная літаратура мае не шмат сюжэтаў на тэму кахання, і заўсёды людзі кахаюць, ненавідзяць, спаборнічаюць з роднымі, сябрамі, ворагамі.

Ці кахае Аўгусцін Марыяну? Пэўна, так, бо яе словы балюча паранілі, выбілі з каляіны, нават прымусілі пакінуць родныя месцы, з якім так шмат звязана.

На што спадзяваўся Аўгусцін? Адказ мы знаходзім у словах Марыяны: *«Не, не, — перапыніла яго Марыяна, — нават не думай, што я пайду ў такую разваленую хату! Яшчэ, хвала Богу, людзі мяне паважаюць, як бы яны маглі навяшчаць мяне далей, калі б даведаліся, што я атрымала… І потым, няхай хто-небудзь паглядзіць на гэта!»* [1, с. 127].

Як бачым, спадзяванні на сямейнае шчасце Аўгусціна не спраўдзіліся, а з гэтымі надзеямі герой звязваў надзею на дабрабыт. *«Няхай праваліцца гэтая катарга! Я цалкам зламаны! Ц мужчынская гэта работа жаць! Серп падыходзіць толькі жанчыне. Гэта ж жыццё! Ах, каб была тут Марыяна!... Але ж, хай будзе праклятая гэтая баба!»* [1, с. 131].

Каханне не мае канца. Гэта тыя карані, што забяспечваюць спрадвечнасць жыцця, веліч чалавека. Глыбокі боль і пакута вымусілі Аўгусціна рабіць тое, што не ў прыродзе чалавека. Герой Кластэрмана знішчае сваю гаспадарку, у якую ўклаў столькі сіл, надзей і спадзяванняў.

Уражваюць апошнія радкі твора: *«Развітаўшыся з Вінцуком, Аўгусцін сказаў: «Я пераканаўся, што ў страхавых канторах сядзяць злодзеі! Але няма нікога горшага за жанчыну. Ва ўсіх маіх няшчасцях вінавата жанчына. толькі яна магла прымусіць столькі ёй набыць сасісак і каўбас. Ніколі ні на адну больш нават не пагляджу!»* [1, с. 135].

Ствараючы канцэпцыю жыцця і чалавека, Карэл Кластэрман імкнецца паказаць, наколькі складаны і поўны пакут шлях яго герояў, раскрывае ідылічныя карціны шчасця і дабрабыту.

Літаратура

1. Ад падання да рамана. Выбраныя творы чэшскай прозы XIX — першай паловы XX стагоддзя / склад, перакл. з чэшскай мовы, аўт. камент. Н. Б. Рашэтнікава. — Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010.

Марына Шода (Мінск)

ЯНУШ КОРЧАК «КАРОЛЬ МАЦЮСЬ ПЕРШЫ»: ПРАБЛЕМЫ ПЕРАСТВАРЭННЯ І АДАПТАЦЫІ

На працягу апошняга стагоддзя здараліся перыяды, калі імя і творчасць Я. Корчака аддаваліся забыццю, але 2012 г. быў аб'яўлены ў Польшчы годам Януша Корчака, што абвастрыла цікавасць да яго твораў. Так, напрыклад, у 2010 г. адначасова былі перавыдадзеныя два класічныя рускія пераклады аповесці-казкі «Кароль Мацюсь Першы», а ў 2012 г. адрэдагаваны і перавыдадзены беларускі пераклад абедзвюх частак казкі. Абапіраючыся на гэтыя тэксты, мы паспрабуем паразважаць пра сітуацыю перакладной множнасці, аспекты паўнавартаснасці і эквівалентнасці перакладу, а таксама пра магчымыя стратэгіі перакладу дзіцячай літаратуры.

На працягу існавання мастацкага перакладу як віду перакладчыцкай дзейнасці падыходы да яго неаднаразова мяняліся, але ўсе яны канцэнтраваліся вакол адзінай галоўнай праблемы — магчымасці адпаведнай перадачы формы і зместу арыгінала.

Тэарэтыкі перакладу лічаць паўнавартасным перакладам той, дзе мастацкая рэчаіснасць тэкста-першакрыніцы адлюстроўваецца ў адзінстве формы і зместу. Адпаведна праца перакладчыка сумяшчае ў сабе дзве функцыі — інтэрпрэтатара і творцы. Перакладчык сутыкаецца, з аднаго боку, з другаснай прыродай перакладу, накіраванай на разуменне і аднаўленне зыходнага тэксту, з другога боку — з неабходнасцю стварыць новы тэкст, які б меў здольнасць да эстэтычнага ўздзеяння.

Калі перакладчык працуе над мастацкім тэкстам, ён павінен улічваць, што працуе не з асобнымі лексічнымі адзінкамі, а з іх зместавымі аналагамі, кожная моўная адзінка мае пэўную інфармацыйную нагрузку ва ўмовах пэўнага культурнага (сацыяльнага і г.д.) кантэксту твору.

Паводле трапнага азначэння тэарэтыка і практыка перакладу Т. А. Казаковай, «мастацкі пераклад уяўляе сабой разнавіднасць моўнай гульні, у ходзе якой на матэрыяле іншай мовы і заведама іншай інфармацыйнай базы (рознасць культурных традыцый і ўстановак, агульных і прыватных карцінаў свету) будуюцца аналагічныя, але не тоесныя мастацкія сусветы, якія маюць блізкія да зыходнага інфармацыйныя палі» [1, с. 19]. То бок не ў апошнюю чаргу паўнавартаснасць перакладу залежыць ад культурнай кампетэнцыі аўтара, і кожны пераклад, нягледзячы на адно з самых устойлівых меркаванняў, што перакладчык павінен схавацца ў цені аўтара, быць ананімам, — суб'ектыўны, адлюстроўвае асобу перакладчыка. З гэтага і паўстае магчымасць множнасці перакладаў аднаго і таго ж тэксту. Асабліва калі ўлічваць, што любы мастацкі тэкст мае «інтэрпрэтацыйны дыяпазон», а перакладчык — інтэрпрэтатар-стваральнік.

Што датычыцца перакладу дзіцячай літаратуры, то, паводле нашых назіранняў, часта перакладчыкі дазваляюць сабе большую вольнасць у абыходжанні з тэкстам. Як з яго фармальным, так і змястоўным бокам. Гэта тлумачыцца тым, што творы дзіцячай літаратуры часцей за ўсё — выдумка,

якая адлюстроўвае няісную рэчаіснасць, адпаведна дазваляе большую ступень фантазіі і творчай вольнасці. Але перадусім перакладчык мусіць памятаць пра функцыі дзіцячай літаратуры, якія, дарэчы, часткова супадаюць з функцыямі перакладных твораў у вызначэнні М. Л. Лазінскага: «Функцыя перакладных твораў дваякая: 1) эстэтычная, як твораў мастацкіх, 2) пазнавальная — як помнікаў, якія знаёмяць нас з іншай краінай, з іншай эпохай, з іншай культурай, з новым для нас ладам думак і пачуццяў» [6, с. 93]. У выпадку з дзіцячай літаратурай да пазнавальнай і эстэтычнай функцый псіхолагі дадаюць забаўляльную, ці геданістычную (дзеці павінны атрымліваць асалоду ад чытання), і кампенсаторную. Гаворачы пра апошнюю, варта згадаць пра псіхалагічныя асаблівасці ўспрымання дзецьмі літаратурных твораў — дзеці вельмі часта індэнтыфікуюць сябе з героямі і чытанне ўпадабанай кнігі для іх ёсць свайго роду эскапізмам — уцёкамі ад рэальнага свету. Адпаведна перакладчык дзіцячай літаратуры павінен стварыць ці перастварыць персанаж, не згубіўшы ягонай першапачатковай харызмы і прыцягальнасці. То бок ён павінен зрабіць тэкст і героя прывабнымі для чытачоў, раскрыць харaство, закладзенае ў даны вобраз аўтарам.

Аповесць-казку Януша Корчака «Кароль Мацюсь Першы» тройчы перакладалі на рускую мову і адзін раз на беларускую, але два розныя перакладчыкі. У 1925 г., праз два гады пасля арыгінальнага твору, у Ленінградзе з’явіўся пераклад Ю. Н. Райтлер, які называўся «Приключения короля Матюша». У 1958 г., на просьбу варшаўскага выдавецтва «Палонія», свой пераклад «Король Матиуш Первый» зрабіла Муза Паўлава. Кніга карысталася вялікім поспехам і яшчэ не адзін раз перадрукоўвалася ў Варшаве, але ў Расіі гэты пераклад надрукавалі толькі ў 1992 г. А ў 1972 г. (да стагоддзя Корчака) быў зроблены пераклад Н. Я. Падольскай. Які пасля неаднаразова перадрукоўваўся, у тым ліку з ілюстрацыямі, зробленымі для польскага выдання, што стварыла пэўнае непаразуменне: маленькія чытачы, зрабіўшыся дарослымі, вярталіся да любімай кніжкі дзяцінства і пад знаёмай вокладкай знаходзілі іншы твор. Беларускі пераклад, дакладней першая яго частка, якая называлася «Кароль Мацюсь Першы», быў зроблены Ядзвігай Бяганскай таксама да гадавіны Я. Корчака. Другая частка «Кароль Мацюсь на бязлюдным востраве» выйшла ў перакладзе У. Васілевіча ў 1982 г.

Перадусім варта з’вярнуць увагу на лінгвістычныя аспекты перакладаў. Стыль корчакаўскіх твораў вылучаецца лаканічнасцю, дакладнасцю і выразнасцю пабудовы сказа, пра што гавораць і польскія даследчыкі. Корчак не імкнуўся да ўпрыгожвання, не злоўжываў эпітэтамі і метафарамі. Словы аўтара не нясуць у сабе эмацыйнай нагрузкі — яны ствараюць сітуацыю, а не эмоцыю. Такую інтанацыю перадаюць пераклады Я. Бяганскай і М. Паўлавай. Напрыклад, возьмем эпізод на самым пачатку казкі, калі памірае кароль і доктар кажа міністрам, што не ведае, што рабіць, а таму трэба паклікаць іншых дактароў:

Пераклад Я. Бяганскай: «*Міністры згадзіліся з ім і заклікалі ўсіх вядомых дактароў, каб параіцца з імі, як ратаваць караля. Яны паслалі ў горад усе каралеўскія аўтамабілі, а самі папрасілі каралеўскага кухара падаць вячэру. Яны не чакалі, што нарада так зацягнецца, і былі галодныя, бо не абедалі*

дома. Кухар расставіў сярэбраныя талеркі, наліў у бутэлькі лепшага віна: ён хацеў застацца пры двары і пасля смерці караля» [3, с. 10–11].

Пераклад М. Паўлавай: «*Министры послушали совета и пригласили знаменитых докторов, чтобы посоветоваться, как спасти короля. Они послали в город все королевские автомобили, а сами тем временем велели королевскому повару подавать ужин, так как были очень голодны: они не знали, что совещание будет продолжаться так долго и не пообедали дома. Повар поставил серебряные тарелки, налил в бутылки лучшего вина, так как хотел остаться при дворе и после смерти старого короля*» [4, с. 12].

У перакладзе Н. Падольскай спакойны аповед Старога доктара — чалавека, які прызвычаіўся, што яго і так ўсе слухаюць — ператвараецца ў звышэмацыйны, на мяжы крыку: *«Как утопающий за соломинку, ухватились министры за этот совет. Любой ценой, но короля надо спасти! Тотчас из королевского гаража в разные концы города помчались автомобили за медицинскими светилами. А проголодавшиеся министры тем временем велели королевскому повару подать им ужин. Они ведь не знали заранее, сколько пробудут во дворце, и потому не пообедали дома. Дворцовые лакеи расставили на столе серебряные блюда с изысканными кушаньями, бутылки с самыми лучшими винами. Повар из кожи вон лез, стараясь угодить министрам: он боялся, как бы после смерти короля его не прогнали из дворца*» [5, с. 7].

Калі браць пад увагу вонкавыя складнікі перакладу, то тут мае месца эмацыйнае перабольшанне. Перакладчыцу ў пэўнай ступені можа апраўдаць тое, што яна перакладала дзіцячую літаратуру і намагалася падвысіць эмацыйнасць твора. Да таго ж, такая стратэгія цалкам укладаецца ў межы тэндэнцыі, адзначанай тэарэтыкамі перакладу, якія пішуць, што ў апошні час заўважаецца тэндэнцыя да ўзмацнення экспрэсіўнага пачатку ў перакладзе. Я. Корчак піша для дзяцей 7–12 год. Калі ўлічваць псіхалогію ўспрымання тэксту дзецьмі, то для такога ўзросту не характэрная цяга да моўных вывертаў і шматслоўных апісанняў. Іх прыцягвае дыялагічнасць, а не апавядальнасць.

У перакладзе Н. Падольскай з'яўляецца нечаканая ў 1970-я гг. паліткарэктнасць. Яна, магчыма, вынікала з геапалітычнай сітуацыі ў краіне і тлумачылася сяброўствам з афрыканскімі краінамі, дзе Савецкі Саюз намагаўся пабудаваць сацыялізм. Перакладчыца добра памятала пра яшчэ адну функцыю дзіцячай літаратуры — выхаваўчую. І рабіла ўсё, каб у свядомасці савецкага школьніка не складаўся вобраз «чарнамазага дзікуна». Так, напрыклад, у фінале часткі, дзе вяскоўцы развітваюцца з негрыцянскай дзяўчынкай Клю-Клю, якая правяла ў іх вёсцы лета разам з каралём Мацюсём, ёсць такія фразы:

— Разумная, вясёлая і харошая дзяўчынка, шкада толькі, што гэткая чорная.

— Аднак, калі прывыкнеш да яе, зусім не брыдкая, — дадавалі яны [1, с. 198].

Гэтая і некаторыя іншыя «непаліткарэктныя» фразы наўпрост выкрэсленыя з перакладу Н. Падольскай. А ў асобных момантах гэтая паліткарэктнасць проста пераўзыходзіць межы дазволенага ў перакладзе. Напрыклад, калі ў сталіцу Мацюсёвага каралеўства прыязджаюць чорныя каралі, яны паводзяць

сябе, як дзікуны, у перакладах М. Паўлавай і Я. Бяганскай, як і ў арыгінале, ідзе доўгае пералічэнне дзіўных, смешных, дурнаватых учынкаў негрыцянскіх каралёў. У Н. Падольскай раптам з'яўляюцца сыны гэтых каралёў і, калі каралі «степенно прохаживаются по городу», то ўсе непатрэбствы робяць іх дзеці: «*Первыми прибыли негритянские короли. И к ужасу и негодованию придворных, они, точно сговорившись, привезли с собой сыновей — черных как сажа, шустрых, озорных мальчишек. Короли расхаживают степенно по городу, озираются с любопытством по сторонам, дружелюбно беседуют друг с другом. А с маленькими бесенятами никакого сладу нет, прямо караул кричи!*» [5, с. 155]

Гэты момант адзін з самых спрэчных у перакладзе, бо ён цалкам не адпавядае арыгінальнаму сюжэту і супярэчыць педагагічным тэорыям самога Я. Корчака, які стала падкрэсліваў, што дзіця — такі ж чалавек, як і дарослы, толькі маленькі і мае роўныя з дарослым правы.

Неабходна асобна адзначыць эпізод, калі Мацюсь усведамляе ўвесь цяжар каралеўскай улады. У арыгінале ён звяртаецца за падтрымкай да Бога. Ва ўсіх трох аналізаваных перакладах гэтая малітва адсутнічае. Так, у перакладзе Я. Бяганскай чытаем: «"*З кім параіцца ў гэтую цяжкую хвіліну? — Мацюсь адчуваў, якая вялікая адказнасць зараз ляжыць на ім. — Што рабіць?" Кароль Мацюсь заплакаў і нарэшце заснуў, прытуліўшыся да бярозавага пня*» [2, с. 30].

Магчыма, эпізод не прайшоў цэнзуры яшчэ на этапе арыгіналу, але Польшча і за савецкімі часамі была рэлігійнай краінай, таму польская цэнзура спакойна ставілася да рэлігійнага зместу. У прыватнай размове супрацоўнікі інстытуту Я. Корчака паведамілі, што ніколі не бачылі цэнзурыраванага польскага тэксту «Караля Мацюся». Мяркуючы па ўсім, тут зноў спрацаваў прынцып выхаваўчай функцыі кнігі, памятаючы пра які, менавіта савецкая цэнзура прыбрала непажаданую для адпаведнага выхавання дзяцей інфармацыю. Так выглядаў эпізод ва ўсіх трох перакладах, нават у тым, што друкаваўся ў Польшчы, і толькі пільнасць рэдактара беларускага перавыдання 2012 г. выратавала гэты вельмі важны для стварэння адпаведнага настрою кавалак тэксту: «*З кім параіцца ў гэтую цяжкую хвіліну? — Мацюсь адчуваў, якая вялікая адказнасць ляжыць цяпер на ім. — Што рабіць?*

Раптам Мацюсь узгадаў, што любую важную справу трэба пачынаць з малітвы. Так некалі вучыла яго добрая мама. Кароль Мацюсь рашучым крокам паглыбіўся ў сад, далей, дзе яго ніхто не мог убачыць, і скіраваў гарачую малітву да Бога.

— Я маленькі хлопчык, — маліўся Мацюсь, — без тваёй, Божа, дапамогі я не дам рады. Гэта па Тваёй волі я атрымаў каралеўскую карону, дык дапамажы мне, бо я ў вялікім смутку.

Доўга прасіў Мацюсь Бога пра дапамогу і гарачыя слёзы цяклі па яго твары. Але перад Богам нават каралю не сорамна плакаць.

Кароль Мацюсь то маліўся, то плакаў. Але ўрэшце заснуў, прытуліўшыся да бярозавага пня» [3, с. 34–35].

Варта агаварыць яшчэ праблему перакладу назвы. Тым больш, што антрапонім часта з'яўляецца эмблемай мастацкага твору — выкарыстоўваецца

аўтарам у якасці загалоўка. Сёння значная ўвага надаецца праблеме перакладу ўласных імёнаў, але толькі ў тым выпадку, калі гэтыя імёны — вымоўныя, гэта значыць, нясуць семантычную нагрузку. Звычайным уласным імёнам, як правіла, перакладчык увагі не надае, бо спрацоўвае прынцып — «імёны не перакладаюцца». Перакладчык заўсёды павінен устанаўліваць сіметрыю сваёй моўнай сістэмы з сістэмай мовы перакладу. І часам здараюцца выпадкі, калі ў перакладзе арыгінальнае імя замяняецца на адпаведнае для іншага культурнага арэалу. «Пераклад павінен імкнуцца не да “правільнасці”, а да функцыянальнага падабенства» [1, с. 402]. З такой сітуацыяй мы сутыкаемся і ў казцы Я. Корчака, якая называецца «Król Maciuś Pierwszy». У абодвух прааналізаваных рускіх перакладах імя галоўнага героя гучыць як «Матиуш». Тут, на нашую думку, скарыстаўшыся транслітэрацыяй, перакладчыцы паспрабавалі знайсці сваю стратэгію перакладу імя. У выніку захоўваецца культурная дыстанцыя, паўстае трохі штучнае імя, якое ўдала ўпісваецца паміж словамі «кароль» і «першы», але назва губляе адпаведны сэнс: Маціўшам мог звацца чалавек любога ўзросту, а Мацюсём — толькі маленькі хлопчык. Таму адбываецца несупадзенне ключавых кодаў, бо для Я. Корчака вельмі важна падкрэсліць — кароль-хлопчык, кароль-дзіця, кароль, які яшчэ толькі вучыцца не толькі кіраваць каралеўствам, а нават чытаць і пісаць. У выпадку з беларускім перакладам сітуацыя вырашаецца проста — магчымасць існавання імя Мацюсь у беларускай мове (як Андрусь, Пятрусь і г.д.) дазваляе пакінуць назву нязменнай. А адпаведным для рускіх перакладаў, на нашу думку, было б імя Матюша (скарочанае ад рускага імя Матвей, як Андрюша, Петруша), то бок простае перавядзенне з адной моўнай сістэмы ў іншую без дадатковых семантычных нагрувашчанняў.

Варта падкрэсліць, што ў дадзеным выпадку мы сутыкнуліся з сітуацыяй, калі перакладчык свядома адаптуе пераклад, спрабуе ўпісаць працу ў кантэкст свайго культурнага арэала і сваёй эпохі. Але ў такім выпадку з часам пераклад непазбежна губляе актуальнасць і неабходным робіцца вяртанне да арыгіналу і яго перастварэнне ці абавязковая рэдактура існуючага перакладу і вяртанне выразаных цэнзурай момантаў.

Літаратура

1. Казакова, Т. А. Художественный перевод: теория и практика / Т. А. Казакова. — СПб., 2006. — 544 с.
2. Корчак, Я. Кароль Мацюсь першы; Кароль Мацюсь на бязлюдным востраве / Януш Корчак; пер. з польск. Я. Бяганскай, У. Васілевіча. — Мінск: Юнацтва, 1998. — 460 с.
3. Корчак, Я. Кароль Мацюсь Першы / Я. Корчак; пер. з польскай Я. Бяганскай. — М., 2012. — 330 с.
4. Корчак, Я. Король Матиуш Первый; Король Матиуш на необитаемом острове / Я. Корчак; пер. с польск. М. Павловой. — М.: Авлад, 1993. — 462 с.
5. Корчак, Я. Король Матиуш Первый; Король Матиуш на необитаемом острове / Я. Корчак; сокр. пер. с польск. Н. Подольской. — М.: Дет. лит, 1972. — 416 с.
6. Лозинский М. Л. Искусство поэтического перевода / М. Л. Лозинский // Перевод — искусство взаимного сближения народов. — М. 1987. — С. 91–106.

Вольга Гуцько (Мінск)

МАСТАЦКІ ВОБРАЗ ЗДРАДНІЦТВА Ў ТВОРАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Здрадніцтва — падзея ў жыцці кожнага чалавека, як з боку таго, хто здраджвае, так і з боку чалавека, якому здраджваюць. Мы імкнемся разгледзець праблему здрадніцтва з боку чалавека, які губляецца, бо чалавек, які застаецца верным сваім ідэалам і адстойвае іх, няўхільна выклікае павагу і каленапакланенне сучаснікаў і нашчадкаў.

Мастацкі вобраз здрадніцтва аднастайна негатыўна ўспрымаецца беларускімі пісьменнікамі. Ён заўсёды ганебны, і людзі, якія паддаюцца спакусе, могуць выклікаць спачуванне, але яны застаюцца за межамі маральных і чалавечых законаў, носьбітамі якіх з'яўляюцца галоўныя персанажі твора. Адзін з самых вядомых беларускіх аўтараў, які разгледзеў феномен здрадніцтва ў беларускай культуры і мастацкай літаратуры — Васіль Быкаў. Усе яго творы пранізаны пытаннямі выбару паміж жыццём і прэнгам. Пасля згасання ваенных падзей, у мірныя часы пытанне здрадніцтва было выкрэслена як актуальнае на памежжы жыцця і небыцця. Здрадніцтва перайшло ў сферу маральнага выбару, стала атаясамляцца з духоўнымі ідэаламі чалавека ці іх звяржэннем. Чалавек вырашаў самастойна свой лёс, адбываўся штодзённы выбар у бок яго індывідуальных якасцей. Але пытанне маральнага выбару засталося. Сам Караткевіч піша ў нататках 1976 г., што «цікава, мабыць, было б напісаць кнігу аб анатоміі здрады» [5, с. 285]. Таму для нас стала цікава звярнуцца да сцэнічнага ўвасаблення мастацкага вобраза здрадніцтва ў творах Уладзіміра Караткевіча.

Грунтоўнае даследаванне накірункаў творчасці Ўладзіміра Караткевіча праведзена А. У. Русецкім [5]. Прадстаўляе навуковую каштоўнасць зборнік матэрыялаў міжнароднай канферэнцыі «Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце», якая адбылася ў Оршы ў 1995 г. (Мінск, 2000). Асаблівую цікавасць выклікалі змешчаныя ў зборніку артыкулы В. Локун [4], А. Лявонавай [3] і А. Сцяпанавай [6], прысвечаныя даследаванню тэкста рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». А. Сцяпанава сцвярджае, што ў творы «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» прысутнічаюць рысы еўрапейскага постмадэрнізму — прынцып калажа і інтэрпрэтацыі імён [6, с. 62].

Літаратурная спадчына беларускага класіка прываблівае рэжысёраў-пастаноўшчыкаў і застаецца запатрабаванай на сцэнічнай пляцоўцы. У сцвярджэнне выказанай думкі можна згадаць шэраг пастановак: спектакль Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек «Ладдзя роспачы» (пастаноўка А. Ляляўскага, 2013), спектакль Беларускага дзяржаўнага моладзевага тэатра «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (пастаноўка В. Катавіцкага, 1999), спектакль Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Каласы пад сярпом тваім» (пастаноўка В. Анісенкі, 2008) і інш.

Выбар малой паэмы «Гулянка ў дэкарацыях» Ул. Караткевіча для сцэнічнага ўвасаблення быў невыпадковым. Усеагульная абыякавасць і ганарлівасць, якія пануюць на пляцоўцы, дзе здымаецца гістарычны фільм, засталіся актуальнымі для нашага часу рацыяналізму і дакладнага разліку. Зварот да гістарыч-

ных паралеляў у паэме падштурхнуў да думкі, што неабходна параўнаць тэксты рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» і малой паэмы «Гулянка ў дэкарацыях». Асноўнай мэтай была інтэрпрэтацыя лірычнага твору. Падчас разгляду тэксту рамана стала відавочна, што вобразы паэмы ўдакладняюцца апісаннем, прыведзеным у тэксце рамана. Такім чынам, параўнанне лірычнага твора і празаічнага рамана дапамагло найбольш дакладна і змястоўна інтэрпрэтаваць падзеі паэмы для іх увасаблення ў форме інсцэніроўкі.

Вобразы пакутніка Хрыста і яго спадарожнікаў — апосталаў, прыведзеныя ў абодвух творах, гістарычная абумоўленасць сюжэта выклікаюць на паверхню свядомасці тонкасплеценыя культурныя коды, ужо складаныя для сучаснага ўспрымання і разумення. Таму была патрэбна дапамога ў раскрыцці ці прыадкрыцці сучаснікам актуальнасці падзей, якія ўзнаўляюцца ў разглядаемых творах Уладзіміра Караткевіча.

Ідэя паэмы «Гулянка ў дэкарацыях» выкрывае здрадніцтва набліжаных да Хрыста людзей. Адбываецца паўтор разглядаемага феномена ў шэрагу твораў, дзе У. Караткевіч быў аўтарам ці сцэнарыстам. Па-першае, у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» апосталы за грошы, дадзеныя езуітам Басяцкім, зыходзяць з Гародні, ахопленай пажарамі і братазабойствам. Па-другое, здымкі фільма «Хрытос прызямліўся ў Гародні, або Жыціе і ўзнясенне Юрася Братчыка» прайшлі безвынікова, фільм быў пакладзены на паліцу. Тым самым падкрэслівалася здрада ідэалам. Па-трэцяе, малая паэма «Гулянка ў дэкарацыях» прысвечана толькі ганебным учынкам апосталаў.

Жанр рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» можна вызначыць як інтэрпрэтацыю гістарычнай хронікі. У рамане пераасэнсоўваецца евангельскі сюжэт з пункту гледжання каштоўнасцей беларускай культуры і жыцця горада XVI ст. У рамане прысутнічае памфлетная плынь, якая выкрывае хрысціянскіх служкаў у эпоху сцвярджэння гуманістычных ідэалаў у Еўропе, у час узмацнення руху за станаўленне нацыянальнай самасвядомасці. Іронія над евангельскай гісторыяй перарастае ў гімн гуманістычнаму ідэалу, які суправаджаецца здрадніцтвам дзесяці апосталаў і падтрымкаю ідэй Хрыста рамеснікамі, беднымі сялянамі, апосталамі Іудай і Фамой, «ганебнымі», па евангельскаму тэксту, але вернымі цярністаму руху Хрыста.

Тэкст малой паэмы «Гулянка ў дэкарацыях» звязвае падзеі твора «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» са стаўленнем да жыцця нашых сучаснікаў. Магчыма, аўтар пры напісанні твора меў на ўвазе час, калі адбываліся здымкі кінастужкі «Хрыстос прызямліўся ў Гародні, або Жыціе і ўзнясенне Юрася Братчыка». Уладзімір Караткевіч схіляецца да думкі ў малой паэме, што ніколі не спыніцца заганнае кола здрадніцтва, якое існавала яшчэ ў часы жыцця Хрыста, бо і сучасныя людзі ўзнаўляюць здрадніцтва і паўтараюць адвечныя памылкі.

Калі разглядаць тэкст малой паэмы «Гулянка ў дэкарацыях», то жанр яе набліжаецца да іранічнага памфлета, дзе сустракаюцца кпіны з ганарлівасці здымачнай групы («*Мог бы спрачацца з Сам-со-манам!*» [1, с. 106], «*Слава касцюмёрам, // Грымёрам, акторам, // А найбольшая таму, хто даў у крэдыт!*» [1, с. 107]). Тэкст і вобразы рамана даюць ключ да інтэрпрэтацыі тэкста малой

паэмы «Гулянка ў дэкарацыях». З дапамогай структурнага аналіза тэкста можна інтэрпрэтыраваць вобразы разглядаемага лірычнага твора.

Першыя радкі паэмы «Гулянка ў дэкарацыях» адсылаюць свядомасць чытачоў да вобразу мора: «*Гародня над морам*» [1, с. 106]. Разнастайныя асацыяцыі выклікаюць уражанне, што вялікі натоўп людзей пачынае здымкі фільма. Ідзе рваны палілог, сарказм і сатыра пануюць у тэксце.

Вобраз мора ў рамане дадае яркасці і дакладнасці фразе паэмы. «*У моры агню валіла да Замкавай гары гурма. Шчацінілася нажамі, косамі, пожагамі, старымі фузіямі, друкамі. Скакала над галовамі мора агню.*

— Хрыстос прыйшоў у Гародню!

— Багатыя Хрыста забіваюць!» [2, с. 144].

Наступная сцэна паэмы — гулянка — працягвае суправаджаць здымкі фільма. Тэкст аб'ядноўвае сучасны свет з падзеямі гістарычнага рамана. Словы сучасных людзей мяжуюць з іранічным зваротам да гістарычных персанажаў: «*Віно галоўнае, // Шашлыкі, // Сіні дым… // П'ем сваё, кроўнае, // На працы гарым. // Бач, апостал Павал цягне віно…*» [1, с. 106]. Празаічны тэкст рамана падрабязна тлумачыць абставіны, у якіх адбываецца гулянка апосталаў: «*Запалалі свечкі. Асвяціўся вялікі, на ўсю падлогу, кілім і на сярэдзіне яго — смажаны баран… Усе з рогатам сядалі за сталы, на хвіліну здзіўляліся, што Пан Бог адзін… Хутка віно палілося ракой, — усе гаварылі кожны сваё, не слухаючы іншых, цалаваліся, рагаталі*» [2, с. 221–222].

Сцэна кахання ў паэме пачынаецца як песня блазноце, богу Дыёнісу: «*Слаўся ў вышніх, лаза! // Слаўся, лаза. // Слаўся тая, што дорыць кахання сілу, // Слаўся тая, што гора паможа заліць…*» [1, с. 107]. У рамане каханне становіцца рухавіком памкненняў героя да свабоды, шчасця на зямлі. «*Закінуўшы твар, яна глядзела яму ў вочы, як на святую статую, што раптам ажыла*» [2, с. 209]. Але ў тэксце паэмы каханне, ды і сам вобраз Юрася Братчыка, «якога царква назвала "лжэХрыстом"» [2, с. 5], не з'яўляюцца асноўнай лініяй падзей у паэме. Больш увагі надаецца спадарожнікам Хрыста — апосталам. І менавіта з апосталамі звязаны асноўныя падзеі малой паэмы «Гулянка ў дэкарацыях».

Здрадніцтва Хрысту як увасабленню ідэала чалавечай годнасці, перш за ўсё адлюстроўваецца ў выбары апосталамі ўтрыманскага жыцця — добрай ежы, блазноты, уцех, адмовы ад цяжкіх абавязкаў. Прывядзем урывак з рамана, які дакладна выказвае меркаванне Фамы ў размове з Хрыстом пра апосталаў: «*Імя толькі ганьбяць. Пальцам аб палец на ўмацаваннях не стукнулі. Зброяю валодаць не вучацца. Адно п'юць, да за бабамі… ды кепікі з тых, хто працуе, строяць. Збіць іх на горкі яблык да сказаць, каб вымяталіся з города, калі хочуць*» [2, с. 478].

І таму лагічным завяршэннем такіх дзействаў будзе падман і здрадніцтва. У тэксце паэмы Уладзімір Караткевіч дадае вобраз гулянкі язычніцкім карагодам і пакланенням Д'яблу. У абодвух тэкстах рамана і паэмы прысутнічае, як доказ здрадніцтва, тупат падкоў, пеўня крык і цішыня.

Тупат падкоў звязаны з ахвярапрынашэннем, якое праводзілі язычнікі ў рамане падчас Чорнай імшы: «*Гэта было падобна на прыглушаныя, слізготныя*

крокі дзесяткаў маленькіх ног, сярод якіх часам выдзяляліся цяжкія, нібы ішла вялікая жывёла» [2, с. 317–318]. У тэксце паэмы больш дакладна гучыць пошчак капытоў: «*Проста ў д'ябла капыта // Рэквізітарам п'яным рупна падбітае…*» [1, с. 108].

Наступны вобраз, які сустракаецца ў тэксце рамана і паўтараецца ў паэме, — гэта «пеўня крык». Ён адразу адсылае нас да евангельскага тэксту аб трохразовай адмове Пятра ад Хрыста, сцвярджаючы яго здрадніцтва. Уладзімір Караткевіч наўмысна падкрэслівае крык пеўня як цытаванне евангельскага тэксту.

І трэці вобраз — вобраз цішыні — расшыфроўваецца дакладна ў тэксце рамана і некалькі разоў паўтараецца ў малой паэме, як спустошанне і марнасць ўсіх намаганняў, якія адбываліся на працягу падзей рамана і малой паэмы: «*Толькі Якуб Алфееў, як заўсёды недарэчы, пачаў спрабаваць голас.*

— Гора табе, Серазін… Го-ра… Гора табе, Віфсаіда.

І так яны зніклі за ўзгоркам. Некаторы час яшчэ даносіўся мядзведжы, яловы голас. Пасля засталіся толькі цішыня і зарыва» [2, с. 497].

У паэме мы зноў сустракаемся з акцэнтам на цішыні: *«Пеўня крык. // Цішыня. // Разлілося святло. // Цішыня*» [1, с. 109].

Сцэнарна-рэжысёрскі ход у інсцэніроўцы малой паэмы «Гулянка ў дэкарацыях», быў вызначаны як напісанне Іудай рукапісу Евангелля, таму што ён быў адзіны пісьменны чалавек сярод апосталаў. На працягу дзейства на сцэнічнай пляцоўцы яму перашкаджаюць пісаць, адбываюцца гулянка, здымкі кінастужкі, але ён на кароткі час удакладняе нататкі ў рукапісу, дадае тэкст, выкрэслівае непатрэбнае.

У кульмінацыйнай частцы паэмы адбываецца бой верных Хрысту апосталаў, Фамы і Іуды, і самога Хрыста з езуітамі («Ноч белых крыжоў»). Бой ідзе на заднім прамежку сцэны. На авансцэне працягваецца гулянка апосталаў. Да іх у гэты час прыходзіць езуіт-Д'ябал. Ён кідае срэбныя манеты кожнаму з апосталаў для таго, каб яны адмовіліся ад Хрыста. Апосталы прымаюць манеты, падбіраюць ежу, бутэлькі і знікаюць. Апостал Мацей вяртаецца, але толькі за рукапісам Іуды, бо, па пісанню, у Мацея павінна быць Евангелле. Вяртаецца і яшчэ адзін апостал — Ян, які таксама хоча мець рукапіс: «*Ян сказаў Мацею:*

— Евангелля палову мне давай.

— Н-нашто?

— Ты сабе нейкага Луку знойдзеш, — аблічча было юродскае. — Я — Марку нейкага. Пойдзем — будзе чатыры Евангеллі. Падправім. Што мне вашы мужыцкія заняткі? Я — прарок. Ісціны хачу, благадаці, славы божай.

Мацей падзяліў рукапіс Іуды напалам і змахлярыў, падкінуў сабе яшчэ аркушаў дваццаць, раздзёр ніткі. Усе рушылі дарогаю прэч ад зарыва. Ішлі моўчкі» [2, с. 497].

У заключнай сцэне аслаблыя ад бою апосталы, Фама і Іуда, прыходзяць у прытомнасць. Іуда хоча знайсці рукапіс. Апосталы адзінокія і спустошаныя. Іуда дастае новую чыстую паперу. Фама пачынае надыктоўваць, а Іуда пісаць: «*Будучы на схіле дзён, вырашылі мы, адзін пісьменны, а другі памятлівы,*

распавясці вам, людзі, аб Юрасі Братчыку, якога царква назвала "лжэХрыстом". І не быў ён бог, а быў чалавек. Але для нас, чалавекаў, нават для тых, што ведалі яго, быў ён — бог. І замыслілі мы пакінуць праўду. Можа, яна дойдзе, калі пачнуць канізаваць не ў святыя, а ў Людзі. То й хай будзе праўда. Аман!» [1, с. 5–7]

Апосталы пачынаюць пісаць Евангелле наноў — гэта фінал пастаноўкі.

Аўтар выказвае падзяку студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якія садзейнічалі ўвасабленню і сталі выканаўцамі інсцэніроўкі «Гулянка ў дэкарацыях» (па матывах твораў Уладзіміра Караткевіча) — Марыне Бельскай, Вікторыі Грышкавец, Лэйлі Мурсалавай, Дар'і Навуменка, Уладзіміру Фалітарыку, Глебу Кармазіну, Раману Казакевічу, Галіне Крупенчык, Таццяне Саўчанка, Таццяне Казак, Раману Несцяровічу, Аляксею Антонаву, Таццяне Лабатрасавай, Ксеніі Паслушнай, Аліне Саленік і іншым студэнтам чацвёртага курса 414а групы спецыяльнасці «Рэжысура свят».

Літаратура

1. Гулянка ў дэкарацыях (Малая паэма) // У. Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду: Кніга паэзіі / У. Караткевіч; прадм. Р. Барадуліна. — Мінск: Маст. літ., 1997. — С. 106−109.
2. Караткевіч, У. Хрыстос прызямліўся ў Гародні: Евангелле ад Іуды: раман / У. Караткевіч. — Мінск: Маст. літ., 2007. — 589 с.
3. Леонова, Е. Образ Марии Магдалины в романе В. Короткевича «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» и мировой литературный опыт «С тобой, как с деревом побег, срослась» / Е. Леонова // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: матэрыялы міжнар. навук. канф., Орша 24−25.11.1995 г. — Мінск, 2000. — С. 168−183.
4. Локун, В. У пошуку маральнага ідэалу. Проза Уладзіміра Караткевіча / В. Локун // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: матэрыялы міжнар. навук. канф., Орша 24−25.11.1995 г. — Мінск, 2000. — С. 133−152.
5. Русецкі, А.У. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літ. творчасці / А.У. Русецкі. — Мінск: Маст. літ., 1991. — 287 с.
6. Сцяпанава, А. Рысы еўрапейскага постмадэрнізму ў творах Уладзіміра Караткевіча (на матэрыяле рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні») / А. Сцяпанава // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: матэрыялы міжнар. навук. канф., Орша 24−25.11.1995г. — Мінск, 2000. — С. 58−62.

Таццяна Супранкова (Мінск)

ФАЎСЦІЯНА Ў ТВОРЧАСЦІ УЛ. КАРАТКЕВІЧА

Беларуская літаратура, пачынаючы са старажытных часоў, заўсёды была ўключана ў сусветны літаратурны працэс. У выніку ўзаемакантакту культур запазычваліся і пераасэнсоўваліся вобразы і сюжэты, якія атрымалі ўжо сваё развіццё ў іншых нацыянальных літаратурах. Пачынаючы з эпохі рамантызму, якая ў беларускай літаратуры ярка прадстаўлена творамі Адама Міцкевіча, Яна Баршчэўскага, Яна Чачота і іншых пісьменнікаў, цікавасць да таямнічых, часам містычных і трансцэндэнтных матываў, выдатна прадстаўленых у неўміручым «Фаўсце» Ё. В. Гётэ, распрацоўваецца пісьменнікамі ў рэчышчы асабістага бачання. Безумоўна, твор вялікага нямецкага асветніка быў пераасэнсаваны беларусамі праз прызму нямецкага рамантызму. На кожным новым этапе

далейшага развіцця нацыянальнай культуры цікавасць да гэта твора не толькі не згасала, але прымушала перачытваць, перакладаць, перастварaць топас фаўсціяны. На мяжы XIX−XX стст. гэта яскрава праявілася ў творчасці класікаў-адраджэнцаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Францішка Аляхновіча, Ядвігіна Ш. і інш. Пасля дзвюх сусветных войнаў беларускія пісьменнікі зноў праяўляюць цікавасць да сусветнай фаўсціяны, узбагачанай інтэрпрэтацыямі Ф. Ніцшэ, О. Шпэнглера, Т. Мана і інш.

Сярод пісьменнікаў, якія самі падкрэслівалі арганічны ўплыў на іх творчасць Ё. В. Гётэ, варта адзначыць Уладзіміра Караткевіча: ён выступіў адным з першых крытыкаў беларускага перакладу «Фаўста» Васіля Сёмухі ў сваім эсэ «І наш “Фаўст”», апублікаваным упершыню ў пятым нумары часопіса «Маладосць» за 1978 г. (праз два гады пасля выхаду ў свет пераклада). Як вызначае мэту свайго даследавання сам пісьменнік: *«…гэтае эсэ не разважанне пра тое, чаго вартая гэтая рэч, а проста некалькі думак аб перакладзе “Фаўста”, аб нашым беларускім “Фаўсце”*» [1]. Цудоўны знаўца нацыянальнай і сусветнай літаратуры, Ул. Караткевіч заўважае, наколькі важным для беларускага чытача было атрымаць пераклад знакамітага шэдэўра на ўласнай мове. Беларусы былі знаёмыя ўжо з рускімі перакладамі М. Халадкоўскага і Б. Пастэрнака, якія выдаваліся і ў нашых друкарнях, але наколькі важнай падзеяй быў выхад перастворанага па-беларуску твора, сведчаць наступныя разважанні пісьменніка: «*Шмат год я ведаў аб тым, што чалавек, пра якога я сёння гавару, перакладае адну з найвялікшых паэм зямлі на беларускую мову. Я ведаў Васіля Сёмуху даўно, ён быў рэдактарам аднаго з маіх твораў і сумленна імкнуўся зрабіць яго лепшым. … Пераклад “Фаўста” рэч, бадай, немагчыма-складаная. Ісці па сцежках Гётэ — як на злом галавы. Дыхаць жыватворным, але высокім паветрам яго горных вяршынь можа не ўсякі.*

І яшчэ адна падстава для трывогі. Я рызыкну сказаць, што пераклад такой рэчы — адзнака сталасці літаратуры, адзнака таго, што плынь яе нястрымная. Не можа паўнакроўна жыць літаратура без Шэкспіра, Дантэ, Гётэ, якія гучаць на яе мове. Першы ў нас ёсць. Другога пакуль што няма. Трэці — толькі што з’явіўся.

І вось пераклад прачытаны да апошняй старонкі. З грудзей вырываецца ўздых палёгкі... Вытрымалі... І ўсе мары юнацтва калі-небудзь узяцца за яго самому адпадаюць. Цяжкая праца выканана дасканала, і пасля яе ўсе твае спробы будуць проста непатрэбнымі...» [1]. Але не выканаўшы пераклад, пісьменнік змог дасягнуць іншага — стварыць свайго, беларускага Фаўста, адметнага і самабытнага.

Класік беларускай літаратуры Уладзімір Караткевіч на працягу плённай шматгадовай творчай дзейнасці працаваў у розных жанрах літаратуры. Ён — цудоўны раманіст, пранікнёны лірык, драматург-наватар, і да таго ж не толькі пісаў уласныя творы, але і ацэньваў дзейнасць іншых майстроў слова. Як літаратурны крытык ён выступаў з артыкуламі пра Францыска Скарыну, Янку Купалу, Якуба Коласа, Дж. Г. Байрана, Ё. В. Гётэ і інш. Ён вельмі добра адчувае ўключанасць айчыннай літаратуры ў сусветны літаратурны працэс, імкнецца падыхаць «жыватворным», «высокім» паветрам гётэўскіх вяршынь,

захапіцца гучаннем верша сусветнага класіка і зрабіць яго «нашым». Ул. Караткевіч заўсёды ў крытычных працах звяртаў увагу на добры і якасны пераклад тэкста з мовы арыгінала, а таксама выкарыстоўваў пералажэнні, прысвячэнні, пераапрацоўкі асобных топасаў, ідэй, матываў ва ўласнай творчасці.

Лірыка — гэта сапраўдная стыхія паэта, дзе яго голас загучаў з поспехам першага зборніка «Матчына душа», які пабачыў свет у 1958 г. Сама назва з'яўляецца знакавай. Матчына душа — гэта вобраз маці, каханай, роднай зямлі, Бацькаўшчыны. Таму тут сустракаецца шмат вершаў, прысвечаных жанчынам. Генеральна іх можна аб'яднаць у адзін агульны вобраз — жаночай душы, якая аддана любіць, усё прабачае, ніколі не здрадзіць, ахвяруе сабой, заўсёды дапаможа, нават у самых няпростых сітуацыях. Гэты вобраз — варыяцыя архетыпу маці альбо жанчыны, ён тыпалагічна блізкі да Вечна-Жаночага (Ewig Weibiche) у Ё. В. Гётэ, які ў фінале «Фаўста» таксама абагульняецца з вобразамі канкрэтных жанчын (перадусім Грэтхен, Маці Божай, Марыі Егіпецкай і інш.). Жаночая душа альбо Вечна-Жаночае — па-над часам і па-за часам, таму ў Караткевіча ў ім спалучаюцца і старадаўняя Беларусь са сваімі легендарнымі героямі, і Беларусь паўстанцаў XIX ст., і Беларусь партызанская, сыны і дочкі якой баранілі родны край ад ворагаў, і Беларусь сённяшняя, сучасная паэту, з набалелымі пытаннямі і нялёгкім пошукам адказаў. Галоўная састаўляючая гэтага вобразу — мудрасць, «кветка матчынай душы», «кветка радзімы».

Наступным крокам стаў выхад у свет у 1960 г. зборніка «Вячэрнія ветразі». Тэмы славутага мінулага, эпізоды ваенных будняў, хараства роднай зямлі тут працягнуты. Але з'яўляецца і новая тэматыка, якая навеяна надыходам касмічнай эры. Таму вобраз вячэрніх ветразяў становіцца таксама сімвалічным: цяпер адкрываюць сусветы новыя караблі. Хоць змянілася форма, але дух пошукаў і прыгод, жаданне паслужыць чалавецтву нязменнае. Паказальным тут выступае «Балада аб арганаўтах». Адразу ж гэта назва адсылае нас да міфа аб арганаўтах, але ў адрозненні ад грэчаскіх паляўнічых за залатым руном на чале з Ясонам, героі Караткевіча скараюць космас, і часам такое вандраванне заканчваецца трагедыяй. Так, у касмічнай экспедыцыі гіне капітан карабля, пасылаючы Зямлі і сваёй каханай развітальныя словы: *«Усе жанчыны на свеце — ты, // ўсе мужчыны на свеце — я»* [2]. Вобразы каханай жанчыны, адзінай Яе, Маці-зямлі (як радзімы) і таксама планеты Зямлі тоесныя, гэта далейшае развіццё канцэпцыі Вечна-Жаночага. Акрамя гэтага, як і Ё. В. Гётэ ў «Фаўсце», У. Караткевіч падымае пытанне небяспекі навуковых і тэхнічных адкрыццяў, якія не заўсёды могуць паслужыць на карысць людзям. Яркім прыкладам гэтаму з'яўляецца верш «Прарок Геронім Босх», дзе мастак Паўночнага Адраджэння параўноўваецца з біблейскімі прарокамі, якія бачылі жахлівыя карціны сучаснага ім заняпаўшага грамадства і казалі яму пра будучыню, заклікаючы да навяртання. Паэт кажа пра трагічнае дваццатае стагоддзе, убачанае ім на карцінах вялікага Босха, танкі, гранаты, атамныя грыбы, «якіх тады не было». Але ў завяршэнні У. Караткевіч верыць у чалавека, як і Ё. В. Гётэ ў свайго Фаўста: *«Зведаўшы чалавека, // Зведаўшы мора і сушу, // Не мог ты ведаць, што ў свеце // Стальныя вырастуць душы, // Што на хлуслівых*

і хцівых // Узнімецца іх рука // І вытрасе іх са скуры, // Як бульбу гнілую з мяшка» [2]. Стальныя душы — таксама інтэрпрэтацыя адроджанай фаўстаўскай душы ў фінале драматычнай паэмы Гётэ, толькі ў Караткевіча гэтыя звышлюдзі здольныя змагацца са злом тут на зямлі, якая і з'яўляецца раем.

Наступны зборнік вершаў «Мая Іліяда» выходзіць у 1969 г., уверцюраю да яго служыць «Беларуская песня», дзе аўтар расказвае пра сваю зямлю. Нягледзячы на адсыл да гамераўскай тэматыкі, які дае нам назва зборніка, антычных матываў тут няшмат, затое пераважаюць біблейскія. Зразумела, што Іліёнам для паэта з'яўляецца Бацькаўшчына, таму ён і распачынае Песню аб Беларусі «Беларускаю песняю». У вершы гучыць прысяга вернасці роднай зямлі, якая містычна працягнецца і пасля смерці. Паэт гатовы нават мёртвым узгадваць яе прыгажосць, пяшчоту і цеплыню, ніколі не пакінуць. Зноў жа паўстае вобраз полацкай Сафіі, скарбонкі мудрасці, сімвала мудрасці старадаўняй зямлі беларускай.

Фінальны зборнік «Быў. Ёсць. Буду» падводзіць вынік творчаму шляху паэта. Таму верш з аднаіменнай назвай, якім аўтар распачынае яго, адсылае нас да топаса помніка, калі ацэньваецца ўласны ўнёсак у скарбонку сусветнай культуры, пакінутая нашчадкам спадчына пісьменніка. Паэт «быў, ёсць і будзе»: *«За ўсіх, хто крывёю піша // Ў нязгодзе // З рабства подлай дарогай, // Хто за Край Свой Родны, за ўсе Народы // Паўстане нават на Бога»* [3]. Лірычны герой Караткевіча за свабоду, як і Фаўст, згодны паўстаць нават на Бога. Такі герой заслугоўвае таго, каб «узнесціся ў неба».

Фаўсціянскія матывы распрацоўваюцца Уладзімірам Караткевічам у шматлікіх творах празаічнага жанру, гэта і асобныя алюзіі, і цэлыя фабульныя пералажэнні. Так, асабліва відавочна запазычанні назіраюцца ў «Кніганошах», «Чортавым скарбе», «Мужыку і дзіве аднавокім», «Ночы», «Пане тванным, шляхціцы багняным», у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».

Самым яскравым пераасэнсаваннем сусветнай, у тым ліку і гётэўскай фаўсціяны, на наш погляд, з'яўляецца «Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны» (1961) і аповесць «Ладдзя Роспачы» (1968). Галоўны герой легенды праходзіць шлях ад чорта да Чалавека, ад Мефістофеля да Фаўста: Рагач — ён жа Андрэй Рогач, ён жа магнат Андронік Рагінскі, ён жа кароль Андронік І. У Гервасія Вылівахі таксама ёсць нешта і ад Фаўста, і ад Мефістофеля. У артыкуле «І наш Фаўст» Ул. Караткевіч акцэнтуе асаблівую ўвагу менавіта на Мефістофелі і адзначае, што Васілю Сёмуху добра ўдалося схапіць гэты вобраз: *«Мефістофель увогуле ўдаўся перакладчыку. Як і ў Гётэ, ніяк не можаш пазбыцца думкі, што аўтар ім трохі любуецца. Так, нарабіў пад канец шмат дрэннага (трэба ж яму апраўдаць сваю рэпутацыю), так, з'едлівасць. Але, нягледзячы на ўсё наноснае, ён багаборац, а значыцца ў сім-тым блізкі да ўвасобленага чалавека. Нахабны, дзёрзкі, вясёлы, злосны... і на дзіва сімпатычны. Сапраўдны іронік, хітруга, сафіст, цынік — і істота, якая чыніць дабро. Уладар дзіўнай, але цалкам натуральнай дыялектыкі: жыць — каб адмаўляць. Частка цемры, якая спарадзіла святло»* [1].

Заўважым, што асноўнаму, чаму насуперак жаданням Сатаны і пекла вучыцца Рагач, тоесна мефістофелеўскаму злу, з якога ўтвараецца дабро.

У легендзе менавіта ён спараджае святло, з чорта ператвараецца ў Чалавека, імкнецца зрабіць свет лепшым. Таму аўтар Легенды так яскрава іграе на кантрасце пачатка, прадстаўленага пеклам і змрочнымі замалёўкамі на зямлі, дзе таксама пануе пякельны агонь войнаў, і канца, калі апісвае той зямны рай, які здольны стварыць той, хто любіць сваю Бацькаўшчыну.

Разважаючы над удачамі беларускага перакладу, Караткевіч адзначае, што вобраз Мефістофеля сапраўды самы каларытны, наймацнейшы: «*Бо ён — гэта скепсіс, гэта адмаўленне старога, пробны камень чалавечай думкі і стымулятар чалавечага поступу, а значыць, неабходная частка нас саміх»* [1]. Калі звярнуцца да кульмінацыйнага моманту «Ладдзі Роспачы», то менавіта дзякуючы гэтаму прынцыпу Гервасій Выліваха і становіцца пераможцам Смерці: *«Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як не робіць ніхто, — і тады пераможаш. Нават калі ты слабы, як камар пасярод варожага мора. Таму што толькі дурні разважаюць заўсёды па правілах здаровага сэнсу. Таму што чалавек толькі тады чалавек, калі ён дзёрзка рве панылае наканаванне і плюе на "спрадвечны" закон»* [4].

Важнае месца ў легендзе адведзена тэме двайніцтва (якая навеяная рамантызмам), матыў гэты закранае не толькі галоўнага героя, але і жанчыну, якую ён кахае (Дубраўка, яна ж і каралева Агата — «длань святла і молат цемры, двайнікі ў чалавечых увасабленнях сваіх»). Калі Гервасій сустракае каханую Бярозку ў Ладдзі Роспачы, яе вобраз да болю таксама знаёмы яму.

Прамыя алюзіі на «Фаўста» Ё. В. Гётэ прысутнічаюць пры апісанні кабінета Сатаны ў легендзе. У пякельных універсітэцкіх аўдыторыях таксама вывучаюць гэты твор, дзе «ў скажоным выглядзе падаецца станоўчы вобраз Мефістофеля». Канцэпцыя «смерці і ўваскрашэння», цэнтральная ў Ё. В. Гётэ, распрацоўваецца і У. Караткевічам: Рогач пераўвасабляецца ў чалавека, Гервасій пападае ў царства смерці і зноў вяртаецца на зямлю (рай) разам з каханай.

Заслугоўвае ўвагі і гульня з лічбавай сімволікай. Галоўнаму герою «Ладдзі Роспачы» Гервасію трыццаць тры гады. Паводле біблейскіх інтэрпрэтацый, гэта ўзрост духоўнай спеласці чалавека, узрост дасягнення важных жыццёвых рэзультатаў. Таму Гётэ праводзіць свайго Фаўста праз амалажэнне, каб ён з шасцідзясяцігадовага ператварыўся ў трыццацігадовага, каб змог шмат чаго здзейсніць і спасцігнуць. У канцы выпрабавання Выліваха атрымлівае яшчэ сорак гадоў жыцця (таксама сакральная лічба), як і Фаўст. Яшчэ адным паказальным момантам з'яўляецца тое, што У. Караткевіч, як і Ё. В. Гётэ, часам дзеяння выбірае шаснаццатае стагоддзе, эпоху Адраджэння, калі свет стаяў на парозе Новага часу.

Як і многія літаратары дваццатага стагоддзя, Уладзімір Караткевіч таксама спрычыніўся сваёй творчасцю да тэматыкі фаўсціяны, стварыўшы свае самабытныя і непаўторныя інтэрпрэтацыі.

Літаратура

1. Караткевіч, У. І наш Фаўст [Электронны рэсурс] / У. Караткевіч — Рэжым доступу: http://uladzimir-karatkevich.com/arh/arh.html. — Дата доступу: 23.10.2013.

2. Караткевіч, У. Вячэрнія ветразі [Электронны рэсурс] / У. Караткевіч — Рэжым доступу: http://uladzimir-karatkevich.com/arh/arh.html. — Дата доступу: 23.10.2013.
3. Караткевіч, У. Быў. Ёсць. Буду [Электронны рэсурс] / У. Караткевіч — Рэжым доступу: http://uladzimir-karatkevich.com/arh/arh.html. — Дата доступу: 23.10.2013.
4. Караткевіч, У. Ладдзя Роспачы [Электронны рэсурс] / У. Караткевіч — Рэжым доступу: http://uladzimir-karatkevich.com/arh/arh.html. — Дата доступу: 23.10.2013.

Юлия Сединина-Барковская (Минск)

АНТИЧНЫЕ МИФОЛОГИЧЕСКИЕ РЕМИНИСЦЕНЦИИ И ЭКОЛОГИЧЕСКАЯ ПРОБЛЕМАТИКА СОВРЕМЕННОЙ ФАНТАСТИЧЕСКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ (НА МАТЕРИАЛЕ ПРОИЗВЕДЕНИЙ Т. ПРАТЧЕТТА, А. САПКОВСКОГО И О. ГРОМЫКО)

Проблема восстановления и сохранения экологического равновесия является одной из наиболее актуальных проблем современности. Формирование «общества потребления» привело к неотвратимо надвигающейся катастрофе, и то, что еще недавно гордо именовалось научно-техническим прогрессом, обнаружило свой разрушительный характер. Пытаясь найти способы гармонизации человеческой деятельности и вечных законов природы, ряд писателей обращается к мифологии, поскольку именно здесь накапливались опыт и знания многих поколений. «Мифы были чем-то вроде энциклопедии жизни: в них можно было найти ответы на все главные вопросы бытия» [1, с. 19]. Следует помнить, что человек-носитель мифологического сознания прекрасно ориентировался в окружающем мире и ощущал себя одним из его неотъемлемых компонентов. По мнению современного астрофизика К. Сагана, человек был «отдельной мелодической линией в космической симфонии жизни» [1, с. 250].

Слияние человека с окружающим миром, ощущение себя частью природы порождало анимистические представления, т. е. веру в то, что растения и животные имеют такую же, как у человека, душу. Наглядным примером анимизма в древнегреческой мифологии являются такие существа, как дриады. Напомним, что дриадами называются нимфы — покровительницы деревьев (от древнегреческого *δρῦς* — «дуб»). В древнегреческой мифологии необходимо разграничивать дриад и гамадриад (древнегреч. *ἅμα* — «вместе»), гораздо более тесно соединенных с деревьями и умирающих вместе с ними. Очевидно, в данном случае душа дерева как бы локализована в нем и должна разделить его судьбу, тогда как дриады воплощают в себе более позднее представление о том, что «*дерево является не телом, а только пристанищем духа дерева, который по желанию может его покидать или возвращаться*» [12, с. 128].

Однако уже в Древнем Риме мы можем заметить смешение указанных мифологических фигур, к примеру, в изложенном Овидием мифе о царе Фессалии Эрисихтоне, срубившем священный дуб и этим убившем живущую в нем дриаду:

И только разить топором он наискось начал,
Дуб содрогнулся, и стон испустило богинино древо.

В то же мгновенье бледнеть и листва, и желуди дуба
Стали; бледностью вдруг его длинные ветви покрылись.
А лишь поранили ствол нечестивые руки, как тотчас
Из рассеченной коры заструилася кровь…

(«Метаморфозы», VIII, 757–762. Перевод С. Шервинского.)

Без сомнения, образ прекрасных дев — духов деревьев — показался в достаточной мере привлекательным для создателей вымышленных миров литературы фэнтези. Впервые дриады как одна из древних дочеловеческих рас появляются в романе популярного английского писателя Т. Пратчетта «Цвет волшебства» (1983), первом произведении знаменитого цикла о Плоском Мире. Впрочем, поскольку цикл задумывался автором как пародия на фэнтези-литературу и одним из основных авторских приемов является подчеркнутая эклектичность повествования, то Т. Пратчетт умышленно не создает законченного описания расы: дриады как абсолютно неожиданно возникают в повествовании, так же неожиданно из него и исчезают: «*Но откуда здесь взялись дриады? Насколько помнил Ринсвинд, древесный народец вымер много столетий назад. Был вытеснен в процессе эволюции людьми, подобно большинству остальных Сумеречных Народностей… Дриады…, как считалось, вымерли много лет назад, вместе с феями*» [10, с. 155]. Причисление дриад к Старшим Народам и, соответственно, помещение их в фэнтезийное миропостроение мы также встречаем в саге о Цири и Геральте знаменитого польского фантаста, одного из классиков жанра фэнтези Анджея Сапковского (начиная со второго романа — «Меч предназначения» (1992)). Однако его дриады связаны с античными источниками достаточно опосредованно и представляют собой удивительную поэтико-символическую интерпретацию древних мифов. Пожалуй, наиболее наглядную связь с греческим мифом демонстрирует наша соотечественница О. Громыко в т. н. «белорском цикле» романов. Наиболее подробно дриады как одна из Разумных Рас описаны в романе цикла «Верные враги» (2009). Разработка указанной фантастической расы О. Громыко осуществляется гораздо более детально.

Рассмотрим сперва модели взаимоотношений дриад с их вместилищами — деревьями, созданные различными авторами. В древнегреческой мифологии можно выделить несколько видов дриад в зависимости от деревьев, с которыми они связаны. В романе «Верные враги» О. Громыко предоставляет нам следующую информацию: «*Дриады, вопреки распространенному мнению, жили далеко не во всяких деревьях, предпочитая довольно редкую породу — снежный ясень…*» [3, с. 176]. Таким образом, мы можем заключить, что в разработке указанных персонажей автор использует миф о ясеневых дриадах — Мелиях (древнегреч. *μελία* — «ясень»), рожденных из крови оскопленного Урана (Гесиод «Теогония», 183–187). Также, поскольку в фэнтези дриады представляются одной из древних рас, нам кажется необходимым упомянуть об антропогоническом значении ясеня. Согласно мифу о пяти веках человечества, наиболее полно изложенному у Гесиода, третье поколение людей — медное — произошло от ясеневых деревьев. Вероятно, т. к. ясень использовался для изготовления копий, то и стал родоначальником самого воинственного поколе-

ния. Возможно также, что именно на этом основании богиня возмездия Немесида изображалась с ясеневой ветвью в руке [6, с. 117–118]. Примечательно также, что стрелы дриад в романе А. Сапковского, мстящих людям за попытки захвата священного леса Брокилон, также имеют ясеневое древко [11, с. 520].

У Т. Пратчетта деревом дриад, в соответствии с этимологией их названия, является дуб. У А. Сапковского, согласно традиции древнегреческой мифологии, священный лес составляют различные виды деревьев, однако именно дуб соответствует Верховной Дриаде, Повелительнице Брокилона: «*Деревом Эитнэ был, конечно же, дуб. Точнее — три сросшихся комлями дуба, все еще зеленых, безо всяких признаков увядания, хотя Геральт определил их возраст лет в триста, не меньше*» [11, с. 553]. Следует отметить, что дуб также находит свое отражение в антропогонических воззрениях греков (Гомер «Одиссея», XIX, 163), в соответствии с народным поверием, что дуб был первым растением на земле [6, с. 109]. В то же время в произведениях О. Громыко образ дуба также постоянно присутствует в описаниях дриад и территории их обитания — Ясневого Града. Так, «*сами деревья напоминали дубы, такие же кряжистые и высокие*» [3, с. 176]. Упоминается дуб и в описании звука шагов дриады в повести «Капкан для некроманта» цикла «Белорские хроники»: «*По ступенькам крыльца будто дубовой веткой прошуршали, и к нам присоединилась Ларрина*» [4, с. 95].

Также по-разному авторами описывается способность дриад жить в деревьях. У О. Громыко фигурирует традиционная для древнегреческой мифологии модель соединения: «*С деревьями они связаны вовсе не неразрывно, хотя в Ясневом Граде сливаются с ними каждую ночь (или день, в зависимости от настроения). Но в случае необходимости спокойно покидают лес на месяцы, а то и на годы…*» [3, с. 177]. У Т. Пратчетта модель «многоквартирного» дерева дриад напоминает гибрид небоскреба с муравейником, а вполне естественный внешний вид дерева получает квазинаучное объяснение при помощи понятия «мирового древа»: «*То, что ты принижаешь названием «дерево», на самом деле четырехмерный аналог всей многомерной вселенной, которая… Нет, вижу, ты этого не знаешь*» [10, с. 155]. В то же время А. Сапковский представляет вниманию читателя значительно более реалистическую и интересную, на наш взгляд, модель экологически совершенного симбиоза: « — *Геральт! −шепнула Цири. — Эти домики живут. У них есть листочки! / — Они из живого дерева, — кивнул ведьмак. — Именно так живут дриады, так строят свои дома. Ни одна дриада никогда не причинит боли дереву топором или пилой. Они любят деревья. Но умеют делать так, что ветки растут, образуя домики*» [11, с. 544].

Как мы указывали выше, уже в античности вопрос о связи жизненной силы дриады и ее дерева решался неоднозначно. К примеру, глава александрийской поэтической школы Каллимах в гимне «К острову Делос» оставляет вопрос открытым:

Мелия, нимфа тех мест, плясунья, думать забыла
О хороводах, и бледность покрыла робкой ланиты,
Ибо страшилась она за дуб соприродный, увидев,

Как сотряслась Геликонова грива. О Музы, откройте,
Правда ль, что с деревом вместе на свет рождаются нимфы?
Нимфы ликуют, когда от дождей кудрявится древо;
Нимфы тоскуют, когда опадают листья у древа…
(80–85. Перевод С. Аверинцева.)

Вопрос о связи жизнеспособности дриады с целостностью дерева О. Громыко кардинально решает в пользу дриад. Эмоциональная окраска, указанная эллинистическим поэтом, здесь, впрочем, также присутствует.: «*Если же подкараулить момент, когда дриада внутри, и начать кромсать ясень топором… то оттуда вовсе не потечет кровь, а вылезет разгневанная тетка и запросто даст вам в глаз*» [3, с. 178]. В свою очередь, двойственная природа дриад, несомненно, дает автору простор для словесной игры (например, *«войдешь в заповедный лес только через наши бревна*» [3, с. 178]. Однако гибель избранных дриадами деревьев напрямую зависит от смерти самих дриад и позволяет судить о приключившейся беде даже на расстоянии: «*…через три дня ее дерево рухнуло, и дриады объявили официальный недельный траур…*» [3, с. 115]. В данном случае нами скорее усматривается аналогия с другой разновидностью нимф — ореадами, горными нимфами, с рождением каждой из которых на вершинах гор вырастают высокие деревья, считающиеся священными и засыхающими на корню в тот миг, когда души горных нимф расстаются с жизнью (Гомеровский гимн IV, с. 257–272).

Т. Пратчетт придерживается версии о взаимозависимости состояния здоровья дриады и дерева. Впрочем, степень причиненного вреда, вероятно, способна градуироваться: «*…девушка опустилась напротив и принялась молча разглядывать волшебника, время от времени потирая глубокую царапину на предплечье. / Ах да, дриада настолько связана со своим деревом, что страдает от ран вместе с ним, припомнил Ринсвинд*» [10, с. 155].

В свою очередь в романах А. Сапковского угроза распространяется не на единичные деревья и их дриад. Одержимые жаждой наживы люди стремятся уничтожить священный лес Брокилон и его защитниц-дриад, презрительно именуемых «*духобабами*»: «*Не задирай носа, лесное чудище, бестия из пущи, реликт прошлого, а послушай, чего желаем мы… А мы желаем кедра, дуба и гокори, желаем красного дерева, тиса на луки и мачтовых сосен… Желаем рубить и пилить, и рыть землю, не опасаясь свиста стрел. … Мы не желаем терпеть в своих пределах какой-то Брокилон — лес, в который не можем войти. Такой лес раздражает нас, злит и сгоняет сон с вежд, потому что мы — люди, мы распоряжаемся этим миром. Мы можем, ежели захотим, допустить в наш мир нескольких эльфов, дриад или русалок. Если они не будут слишком нахальны. Подчинись нашей воле, Ведьма Брокилона. Или сгинь*» [11, с. 556]. Автор использует мифологию дриад как символ потребительского отношения к природе, ведущего к катастрофе. О недопустимости подобного подхода предупреждают и античные писатели. В «Аргонавтике» Аполлония Родосского мы находим рассказ о нечестивце, проклятом гамадриадой и вместе с потомками осужденным на растущую бедность:

…он, неразумьем объятый,

Дуб тот срубил, уступая мятежному юности пылу.
И потому-то его в грядущем долей убогой
Вместе с детьми покарала она.

(II, с. 480–483. Перевод Г. Церетели.)

В то же время воинственные дриады, отстаивающие существование родного леса с луками в руках, без сомнения, вызывают ассоциацию с Артемидой, особенно ее почитание на полуострове Пелопоннес, где преобладают связи богини с культами деревьев. К примеру, здесь ее называли Лигодесма, поскольку ее образ был связан с ивой, а также Кариатида и Кедреатида — по названиям деревьев каштан и кедр. В то же время Артемида являлась предводительницей нимф и первоначально, вероятно — главной нимфой. [5, с. 123; 8, с. 22–23]. Безжалостность дриад Сапковского также соотносится с древнейшими представлениями об Артемиде как страшном божестве, несущем своими стрелами смерть людям, которые мы находим у Гомера.

В славянских литературах давно сформирована прекрасная традиция фантастической литературы. Особо следует подчеркнуть, что в последнее время все чаще принято говорить о феномене именно славянской фантастической литературы, сообщившей традиционным фантастическим жанрам более глубокую и актуальную проблематику. При помощи одних и тех же мифологических образов авторы рассматривают различные аспекты одной из наиболее актуальных проблем современности. А. Сапковский наглядно демонстрирует, какими разрушительными способны стать природные силы при исключительно потребительском обращении с ними. В свою очередь у О. Громыко дриады служат своеобразным воплощением экологического равновесия, соразмерности природы и разумных существ.

Литература

1. Альбедиль, М. Ф. В магическом круге мифов / М. Ф. Альбедиль. — СПб., 2002.
2. Аполлоний Родосский. Аргонавтика // Александрийская поэзия / сост. М. Грабарь-Пассек. — М., 1972.
3. Громыко, О. Верные враги / О. Громыко. — М., 2009.
4. Громыко, О. Капкан для некроманта / О. Громыко Белорские хроники / О. Громыко. — М., 2008.
5. Зайцев, А. И. Греческая религия и мифология / А. И. Зайцев. — М., СПб., 2005.
6. Кагаров, Е. Г. Культ фетишей, растений и животных в Древней Греции / Е. Г. Кагаров. — М., 2012.
7. Каллимах. Гимны / Каллимах // Александрийская поэзия / сост. М. Грабарь-Пассек. — М., 1972.
8. Нильссон, М. Греческая народная религия / М. Нильссон. — СПб., 1998.
9. Овидий. Метаморфозы / Овидий // Собрание сочинений: в 2 т. — СПб., 1994. — Т. 2.
10. Пратчетт, Т. Цвет волшебства / Т. Пратчетт. — М., 2006.
11. Сапковский, А. Меч Предназначения / А. Сапковский // Последнее желание. Меч Предназначения / А. Сапковский — М., 2005.
12. Фрэзер, Дж. Дж. Золотая ветвь / Дж. Дж. Фрэзер. — М., 1998.

Анна Покало (Брест)

МОДЕЛЬ ГЕРОЯ В МОНОДРАМАХ Н. КОЛЯДЫ («РОДИМОЕ ПЯТНО», «АМЕРИКАНКА») И Д. БАЛЫКО («PINE BAR»)

В современном культурном пространстве соотношение между такими фундаментальными понятиями, как множественность и единственность определяет вектор развития историко-культурного процесса в целом. Для литературы как органичной его части актуальной остается проблема реконструкции классических жанровых модификаций и формирование новых жанровых моделей и их вариаций. Соотношение между логическим и иррациональным в условиях трансформации социума, множественность «вкраплений» другого (языка, культуры, субкультуры) в национальные культуры дает предпосылки для возникновения нового типа вторичной реальности. Закономерным завершением становится в таком случае смена культурных парадигм, а в литературе — течений, направлений, стилей. Этимология термина господствующего течения «постмодернизм» подразумевает экзистенциальный тупик. Русская литература со свойственной ей чуткостью фиксирует это состояние незавершенного гештальта в целом у всего общества, актуализируя те жанровые модели, которые уже имели место при деформации общественного сознания и, как следствие, поиске стабильности не только в духовно-нравственной, но психолого-физиологической, экономической, политической и других сферах.

Современное литературоведение Беларуси, обращаясь к наследию белорусской и русской литератур, заново осмысливает проблемы развития литературного процесса и помогает понять закономерности возникновения новых жанровых форм, их эволюцию в литературе XX в. Особую позицию в системе жанров занимает монодрама. Сложность и многогранность монодраматической жанровой модели заставляет обратиться к истокам возникновения и формирования данного жанра в русской литературе начала XX в. Монодрама на микроуровне рефлексирует реализацию соотношения множественности и единичности. О недостаточной изученности данного феномена свидетельствуют малочисленные исследования, посвященные данной проблеме. В большинстве научных публикаций интерпретация термина монодрама происходит в контексте изучения драматургического опыта XX−XXI вв. и творчества отдельных персоналий в истории литературы, не считая декларации монодрамы и ее практической реализации на сцене Н. Евреиновым и А. Кугелем.

Для выявления жанровых дефиниций монодрамы первостепенной становится проблема героя. С одной стороны, потому что, по определению Н. Евреинова, драматурга, режиссера и теоретика театра начала XX в., монодрама — это «такой род драматического представления, которое, стремясь наиболее полно сообщить зрителю душевное состояние действующего, являет на сцене окружающий его мир таким, каким он воспринимается действующим в любой момент его сценического бытия» [3, с. 8]. Фактически, «единый действующий», «субъект действия» выступает детерминантом для жанровой модели. Универсум «одиночества», «единичности» воспринимается при этом не только сценически через актера, но и имплицитным читателем. Структура монодрамы

направлена на зрительную «инсталляцию» имажинативной сферы главного героя, его «внутренней точки зрения или жизненной правды» [7, с. 226]. Из всего вышесказанного вытекает и особенности взаимодействия между зрителем и главным героем, субъектом действия, потому что в соответствии с теорией Н. Н. Евреинова, срабатывает принцип «сценического тождества монодрамы с представлением действующего» [3, с. 8], т. е. видение всего происходящего одним персонажем, обуславливает «переживание, заражающий характер которого, вызывая, — по словам Н. Евреинова, — во мне сопереживание, обращает в момент сценического акта чуждую мне драму в «мою драму».

С другой стороны, проблема героя в современной монодраме тесно связана с проблемой героя в драматургии «новой волны». Вопросы нравственности тесно переплетаются с психологическими трудностями современного человека. Не случайно современную русскую и белорусскую драму исследователи именуют антропоцентричной, т. к. в ней преобладает личностное над социальным и создается портрет «негероического героя», тем не менее, способного нести положительную программу. Таким героям свойственно «заигрываться» с жизнью, терять ощущения реальности, причем трудно разобраться, где реальность, а где вымысел. Их объединяет постоянное пребывание в состоянии дискомфорта и поиск путей гармонизации своей жизни. Принцип «единого действующего» в решении экзистенциального конфликта становится отправной точкой для пересечения эстетических и этических начал.

Монодрамы Н. Коляды и Д. Балыко не только реализуют основные направления современной антропоцентричной драмы, но и представляют новый тип социально-экзистенциального и социально-онтологического героя. В монодраматических произведениях данные модели героев представлены наиболее выразительно. Кроме того, специфика героев в монодрамах Н. Коляды («Американка», «Родимое пятно») и Д. Балыко («Ангелика решает продаваться», «Pine Bar») заключается в том, что «единое действующее лицо» — женского пола. В абсурдном мире, лишенном гармонии, женское сознание оказывается наиболее уязвимым. Женщина не ищет смысл жизни как таковой, а пытается выжить, поборов собственные страхи, одиночество и ненужность. Поэтика жанровой модели монодрамы способствует демонстрации поиска самоопределения героя в условиях экзистенциального одиночества повседневности. Закономерно, что в условном мире монопьес появляются вымышленные самими героинями персонажи, к которым они и обращают свои монологи. Пустота, возникающая во внутреннем мире субъектов действия, заставляет их играть. Игра становится смыслом существования, заменяя собой все остальное. Она не действие, а лишь его имитация. В отличие от героев других жанровых моделей современной драматургии, склонных компенсировать внутреннюю пустоту, «возникающую на месте духовной вертикали в картине мира современного человека», инфантильностью, ленью и бездействием («Русский сон» О. Михайловой, «Русскими буквами» К. Драгунской)» [2, с. 41], игра становится активным способом рефлексии, попыткой увидеть выход из сложившейся кризисной ситуации, хотя бы придти к внутренней гармонии. Это в полной мере согласуется с тем, что природа

героя монодрамы восходит к «Парадоксу об актере» Дидро. Герой монодрамы, даже если она и представляет собой монопьесу для чтения, всегда актер. «Истинный талант актера заключается в серьезном изучении внешних симптомов чужой души, в умении обмануть нас искусственным воспроизведением этих симптомов. Чувствуют ли актеры в эту минуту что-нибудь или ничего не чувствуют — до этого нам нет никакого дела, тем более, что это скрыто от наших глаз», потому что, «если бы было дано знать вещи такими, каковыми они есть, у нас не было бы нужды в искусстве» [6].

Всех героинь объединяет деформация социальной перцепции. Их нельзя назвать асоциальными, тем не менее, они при свойственной им типичности, оказываются неадаптированными к окружающему миру, продолжая традицию неудачников, «блаженных», «идиотов» и «недотеп» в русской литературе. Их экзистенция обусловливает не столько социальную маргинальность, сколько психологическую обособленность, состояние пограничности между реальным и виртуальным (созданным в их сознании) миром. Драматурги интерпретируют маргинальность как состояние «выброшенности» из общего хода жизни, который для большинства считается нормальным и естественным. В пьесах Н. Коляды героя классифицируют как «маленького человека-маргинала» (Н. Журавлев, Н. Лейдерман). О своих персонажах драматург замечает: «Я обожаю своих героев, жалею и люблю их. Люди, о которых я пишу в пьесах, это люди провинции: мучающиеся, живущие на краю пропасти, страдающие, счастливые и несчастные, убогие и прекрасные. Я их очень хорошо знаю, этих людей. Они всегда хотят взлететь над болотом, но Бог не дал им крыльев, и они это понимают» [5]. Повторим, что в монопьесах автора в связи с их насыщенной психологичностью эти качества героев проявляются более рельефно. Автор обнажает их боль и в то же время лечит ее.

Несмотря на то что, поведение персонажа в большинстве случаев обусловлено обстоятельствами, тем не менее, его поступки и высказывания не диктуются складывающейся в процессе действия монодрамы ситуацией. Этим жанровая модель монодрамы существенно отличается от драматургических произведений других жанров. Сущность героя монодрамы проявляется в его высказываниях и отношении к окружающей действительности и раскрывается в художественном пространстве монодрамы. Развертывание образа героя в то же время из-за специфики сюжета обладает рядом особенностей. Героини Н. Коляды и Д. Балыко не попадают в ситуации, которые требуют от них поступка. Само речевое высказывание, которое в данном драматургическом дискурсе представляет собой диалогизированную прозу, схожую с «потоком сознания», есть поступок, заменяющий отношение между героями. Автор, идентифицируясь с персонажем, выражает свою точку зрения опосредованно. В пьесах Д. Балыко и Н. Коляды повествователь (рассказчик) и герой — одно лицо. Как следствие, совпадают «точки зрения»: пространственно-временная, эмоционально-оценочная (по классификации Б. Кормана). Автор не меняет носителя «точки зрения»: мир представляется не таким, какой он есть на самом деле, а каким видит его герой, сквозь призму его жизненных позиций и ценностных ориентаций.

В пьесах Н. Коляды и Д. Балыко прочие персонажи отсутствуют, т. е. характер героя нельзя определить из суммы его взаимоотношений и взаимодействий с другими персонажами и окружающим миром. Спецификой любого драматического произведения является то, что действие происходит непосредственно в момент его восприятия зрителем/читателем, потому для более глубокого анализа модели героя можно рассматривать субъект действия драмы с позиции межличностной коммуникации. В ситуации диадического общения каждый участник коммуникативного акта реализует себя как минимум в 4 ипостасях (Т. Ньюком, Ч. Кули). Следовательно, для формирования образа у реципиента имеется как минимум 4 позиции: 1) каков герой на самом деле; 2) каким он видит сам себя; 3) каким его видит собеседник; 4) каким ему представляется его образ в сознании его собеседника. В монодраме в связи с исключительной позицией единого действующего две позиции отсутствуют («каким его видит собеседник», «каков герой на самом деле»). С другой стороны, акцент на воссоздании образа, как проекции собственного восприятия героя, позволяет монодраме представлять «я»-концепцию субъектов действия в деталях, тем самым усиливая психологичность пьес такого вида. «Я»-концепция субъектов действия монодрам Коляды и Д. Балыко схожи и включают в себя ряд компонентов «я». Обратимся к их характеристике.

«Настоящее я» — то, какими герои кажутся себе в действительности в данный момент. У обоих авторов субъекты действия одинокие и неприкаянные женщины, типичные для нашего общества. Как каждый человек, они стремятся к счастью и пониманию. Сами себе они кажутся более значимыми, чем есть на самом деле: более исключительными, одаренными и соответственно непризнанными: «Вы подумали, что я продавщица? Именно они в таком виде продают на улице зимой яблоки и беляши. Нет, что вы! Я художник, я пианистка, вот и мой инструмент, вы это уже поняли, да? (Н. Коляда «Родимое пятно») [4]. «Динамическое я» — то, каким «я» ставит себе целью стать. Все героини мечтают стать хорошими, изменить свою жизнь. Чаще всего они мечтают хорошо сыграть свою роль, даже если их сцена — сама жизнь. Здесь в полной мере срабатывает инстинкт театральности, о котором писал Н. Евреинов: «я покажу, что я умею! Я хорошая артистка! Я долго училась, чтобы стать актрисой, это была моя мечта, и я ею стала, но я не виновата, что меня так долго затирали, не давали больших ролей, до пенсии ели в этом театре, постойте, я сейчас, я развлеку вас, я успокою вас, я угожу вам» [4]. «Фантастическое я» — каким «я» хотел бы быть, если бы все было возможно. В связи с тем, что социальные позиции персонажей обусловлены и статичны, в то время как в когнитивно-эмотивной сфере за героинями наблюдаются признаки прогрессирующего умственного расстройства, то «фантастическое я» приобретает различные формы и меняется через короткие промежутки времени. Мечтают героини о двух вещах об изменении своего предначертания в целом и о возвращении молодости. Причина всех неурядиц героини монодрамы «Родимое пятно» — отметка на лице, а старость — причина бессилия, одиночества и несвободы. В пьесе «Pine Bar» Д. Балыко героиня тоже мечтает о легкости и свободе: «А теперь, позвольте, я улечу… Я буду бабочкой… Одиноким ночным

мотыльком. Не бойтесь. Это совсем не страшно. Я никогда не боялась смерти… Мотылек должен сгореть…» [1]. «Будущее или возможное я» — то, каким, по мнению «я», оно может стать. Будущее субъектов действия туманно, потому что в мире, где реальность граничит с ирреальностью, воображаемый мир может оказаться более притягательным, а сам трагизм ситуации удовлетворит потребность в исполнении главной роли, о которой грезит каждый актер.

Таким образом, в монодрамах Н. Коляды и Д. Балыко представлена модель героя, сочетающего в себе традиционные и новаторские черты. В них сохраняется принцип «единого действующего» Н. Евреинова, имеющего свои специфические характеристики. Кроме того, в герое монодрамы черты персонажей современной драмы проявляются более ярко, т. к. она в силу своих структурных особенностей обладает способностью детально раскрывать внутренний мир человека. Своеобразием пьес, выбранных в качестве материала для анализа модели героя, становится то, что субъектом действия выступают герои женского пола, что также объединяет русского и белорусского авторов.

Литература

1. Балыко, Д. Pine Bar / Д. Балыко / Диана Балыко [Электронный ресурс]. — 2012−2013. — Режим доступа: http://www.dia-blo.net/user/theatre.php?i_selected_sub_menu=0&item_id_to_view=6&cur_page=2&per_page=5. — Дата доступа: 23.08.2013.
2. Гончарова-Грабовская, С. Я. Поэтика современной русской драмы (конец XX — начало XXI века) / С.Я. Гончарова-Грабовская. — Минск: БГУ, 2003. — 70 с.
3. Евреинов, Н. Введение в монодраму / Н. Евреинов. — СПб.: Издание Н.И. Бутковской, 1909. — 35 с.
4. Коляда, Н. Родимое пятно / Н. Коляда // Николай Коляда [Электронный ресурс]. — 2009—2013. — Режим доступа: http://kolyada.ur.ru/rodimoe/ — Дата доступа: 23.08.2013.
5. Коляда, Н. «Пишу, как умею, и что хочу» / Н. Коляда // Экран и сцена. — 1998. — № 48. — С. 16.
6. Кугель, А. Р. Профили театра / А. Р. Кугель // Театральная библиотека [Электронный ресурс]. — 2009−2013. — Режим доступа: http://www.teatr-lib.ru/Library/Kugel/Profili/. — Дата доступа: 23.08.2013.
7. Лавлинский, С. П. «Введение в монодраму» Н. Евреинова в контексте новейшей русской драматургии / С. П. Лавлинский // Школа теоретической поэтики: сб. науч. тр.: к 70-летию Н. Д. Тамарченко — М.: Intrada, 2010. — 224−233 с.

СЕКЦЫЯ 8
Традыцыі і наватарства ў сучасным літаратурным працэсе

Ева Лявонава (Мінск)

МАСТАЦКІЯ ПОШУКІ В. НЯКРАСАВА І В. БЫКАВА Ў СВЯТЛЕ ТВОРЧАСЦІ Э. М. РЭМАРКА

Васіля Быкава і Віктара Някрасава — з іх трагічным досведам асабістага ўдзелу ў Вялікай Айчыннай вайне — поруч паставіла само жыццё. Ды і акрамя франтавога вопыту ў іх жыццёвых перыпетыях нямала судакранан-няў, як нямала сугучнага ў іх эстэтычных пошуках, у іх вобразна-выяўленчых сістэмах, нарэшце — у драматызме лёсаў іх твораў на шляхах да чытача: абодвух пісьменнікаў цкавалі, абодвух абвінавачвалі ў «вузкасці» погляду «з акопа», у «дэгераізацыі»; тое, маўляў, «не точка, а “кочка зрения”», бо «далей за свой бруствер аўтар нічога не бачыць» [гл.: 4, с. 3–4].

Нядзіўна, што імёны В. Быкава і В. Някрасава нярэдка згадваюць у звязку адно з адным і даследчыкі, і мастакі слова. Напрыклад, самым непасрэдным чынам творчасць Васіля Быкава і Віктара Някрасава суадносіць Вячаслаў Кандрацьеў, сцвярджаючы, што някрасаўская кніга «У акопах Сталінграда» сталася «пэўным эталонам сумленнасці і шчырасці» і што з яе выйшла ўся сапраўдная ваенная проза, «такая, як творы В. Быкава, Р. Бакланава, К. Вераб’ёва і іншых…» [4, .с. 5].

Сам В. Быкаў надзвычай высока цаніў някрасаўскую аповесць «У акопах Сталінграда», нездарма яму ў свой час, напачатку творчага шляху, падавалася, што пасля гэтага ды некаторых іншых твораў пісьменнікаў-франтавікоў «тэма вайны вычарпана» [2, с. 211].

Пасля апублікавання ў «Новом мире» быкаўскай аповесці «Мёртвым не баліць», за якую аўтара, як вядома, бамбавалі ўсе афіцыйныя інстанцыі і якую яны абвясцілі яго «безумоўнай няўдачай» [2, с. 248], В. Някрасаў быў сярод тых, хто моцна падтрымаў В. Быкава. «Я адчуў сябе яшчэ болей упэўнена, — пісаў беларускі празаік, — калі аднойчы пад восень атрымаў тэлеграму зь Ялты ад славутага аўтара «Акопаў Сталінграду» і таксама ўжо бітага крытыкай… Віктара Някрасава», які жадаў «новых кніг праўды пра нашу вялікую вайну» [2, с. 257].

У сваю чаргу В. Быкаў «быў адзіным, хто не пабаяўся на поўны голас назваць з трыбуны забароненае імя Віктара Някрасава» на ўсесаюзнай канферэнцыі пісьменнікаў і крытыкаў, што праходзіла ў Мінску і была прысвечана 30-годдзю Перамогі; на той момант кнігі В. Някрасава зніклі з паліц і каталогаў усіх бібліятэк краіны. Можна ўявіць, чаго каштаваў пісьменніку гэты яго ўчынак, які яму самому бачыўся «грамадзянскім, літаратурным ды і проста чалавечым абавязкам» [5, с. 422]. Абвостранае «пачуццё гэтага трайнога абавязку» змушала В. Быкава і пазней неаднойчы заступацца за В. Някрасава, адлучанага ад літаратуры, аб’яўленага «здраднікам» і выгнанага з радзімы. Незадоўга да

смерці В. Някрасава В. Быкаў сустракаўся з ім, ужо вельмі хворым, у Парыжы. У хуткім часе В. Някрасаў пакінуў гэты свет; менавіта В. Быкаў падрыхтаваў на яго смерць некралог для «Литературной газеты», друкаваць які, аднак, забараніла гэтаму выданню партыйнае кіраўніцтва краіны.

«Для мяне як чытача проза Віктара Някрасава — перадусім сумленны, незамутнены чалавечы погляд на вайну, на праклятую і вялікую нашу вайну з нямецкім фашызмам, — прызнаваўся В. Быкаў. — Не ведаю, якім чынам здолеў ён у абстаноўцы, што так мала стасавалася з чалавечнасцю, выхаваць у сабе і захаваць на дзесяцігоддзі гэты погляд і гэтую чалавечнасць. Як ён яго рэалізоўваў і адстойваў у літаратуры, мы ведаем, мы гэтаму былі сведкамі і бачылі, што далося яму гэта цаной неверагоднай упартасці і супрацьстаяння гэткаму ж неверагоднаму па сіле ціску асяроддзя — побытавага, літаратурнага, партыйнага, дзяржаўнага» [3, с. 95]. Для В. Быкава, паводле яго слоў, было надзвычай важна, што В. Някрасаў паказаў свету «высокую сутнасць індывідуальнасці на вайне, значэнне асобы… Хаця б наяўнасць індывідуальнасці ў асяродку, найменей для яе дарэчным, асяродку, якім з'яўляюцца вайна і армія з іх абсалютам падпарадкавання аднаго ўсім, жорсткім нівеліраваннем усялякай адметнасці» [3, с. 96].

Адной з агульных вызначальных традыцый у творчасці абодвух пісьменнікаў сталіся раманы Э. М. Рэмарка аб Першай сусветнай вайне і яе маральна-псіхалагічных наступствах для былых франтавікоў — «На Заходнім фронце без перамен», «Вяртанне» і «Тры таварышы». Першы з трох раманаў карыстаўся асаблівай папулярнасцю ў пісьменнікаў-франтавікоў, дакладней — у тых з іх, якія імкнуліся быць максімальна праўдзівымі ў сваіх расповядах пра вайну і чалавека на ёй. Віктар Астаф'еў менавіта ў сувязі з творамі знакамітага нямецкага пісьменніка неяк зазначыў: «Самыя вялікія антываенныя кнігі напісаны тымі, хто спазнаў вайну ў акопах, груба, па-салдацку кажучы, зведаў яе на ўласнай шкуры» [7].

Паказальныя ўспаміны, пад якімі, без сумневу, маглі б падпісацца і Віктар Някрасаў з Васілём Быкавым, пакінуў Вячаслаў Кандрацьеў: «…Спыняюся на рамане "На Заходнім фронце без перамен", выцягваю яго, пачынаю чытаць і ўжо не адрываюся, пакуль не загортваю апошнюю старонку, узрушаны, нават агаломшаны той пранізлівай праўдай адлюстравання вайны, якую я неўсвядомлена ўвесь час параўноўваў з перажытым мною ўсяго некалькі дзён таму… Вядома, я разумеў, што мэты вайны, у жарале якой адзін за адным бясслаўна гінулі героі Рэмарка, і нашай Вялікай Айчыннай былі розныя». Але больш уразіла В. Кандрацьева падабенства войнаў: «Той жа неўладкаваны франтавы побыт, тыя ж адчуванні і душэўныя станы ў час артабстрэлаў, у наступах, атаках, амаль тыя ж акопныя размовы ў хвіліны перадышкі пра ежу, пра курыва, пра жыццё… Мусіць, пярэдні край — кавалак зямлі, дзе праціўнікі знаходзяцца адзін насупраць аднаго ў непасрэднай блізкасці, — ёсць тым асаблівым мікрасветам, дзе ўзнікаюць і свой страшны побыт, і свае ўзаемаадносіны, і свая мова, і свой лад мыслення і пачуццяў… Вось якія думкі апаноўвалі мяне ўлетку сорак другога… І вось з тых, цяпер ужо далёкіх, дзён раман "На

Заходнім фронце без перамен” з’яўляецца для мяне прыкладам таго, як з такой высокай праўдай паказваць і нашу вайну» [7].

Неаднойчы ў звязку з савецкай літаратурай аб Вялікай Айчыннай вайне разважаў пра Э. М. Рэмарка ды іншых пісьменнікаў «страчанага пакалення» і А. Адамовіч, не менш ясна за В. Кандрацьева ўсведамляючы пры гэтым і адрозненні паміж Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай, і эстэтычныя адметнасці літаратурных твораў пра тую і іншую, і асаблівасці ў пачуваннях удзельнікаў Другой сусветнай з розных бакоў, для аднаго з якіх гэтая вайна была справядлівай, а для іншага — захопніцкай. Але і падабенства ў адлюстраванні пісьменнікамі падзей Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай А. Адамовіч бачыў таксама — у агульных вытоках, агульных мастацкіх традыцыях, з творчасцю Льва Талстога і іншых пісьменнікаў свету ўключна, у агульнай антыміліта-рысцкай скіраванасці твораў і дэрамантызацыі ў іх вайны, у агульнай «бязліташнай праўдзе» [1, с. 25]. У адрозненне ад афіцыёзнай літаратуры, і В. Быкаў, і В. Някрасаў, і іншыя мастакі слова, іх аднадумцы, — як і колішнія іх папярэднікі, ад А. Барбюса, Л. Ф. Селіна да Э. Хемінгуэя, Р. Олдынгтана, А. Цвэйга, Л. Франка і, вядома ж, Э. М. Рэмарка, — гранічна персаналізавалі вайну, а разам з ёю персаналізавалі і ўсе яе жахі, чалавечую боль, смерць, пакуты і перажыванні. І ў В. Някрасава, і ў В. Быкава людзі — пры ўсім сваім «акопным» прадстаўніцтве — не зліваюцца ў «жалезным патоку», кожны прэтэндуе на асобаснасць, на свой голас, свой унёсак у агульную справу. Паводле А. Адамовіча, невыпадкова менавіта ў 1950–1960 гг. пачаліся дыскусіі пра «акопную праўду» і праўду «вялікую», маштабную, а на пісьменнікаў пачалі навешваць ярлык «рэмаркізму», якога не пазбеглі і В. Быкаў з В. Някрасавым.

Між тым значэнне традыцыі Э. М. Рэмарка для В. Быкава і В. Някрасава насамрэч было істотным. В. Быкаў у «Доўгай дарозе дадому» ўспамінае, што Рэмарк быў ці не першым з тых «славутых заходніх аўтараў, да таго ў нас невядомых», якіх пачалі выдаваць з часоў хрушчоўскай адлігі. Рэмарк «адразу знайшоў немалую папулярнасьць сярод чытацкай моладзі. (Парыж, жанчыны, кальвадос. Але і “На Заходнім фронце без пераменаў”.) Калі французскіх жанчын і свабоднае каханьне ўлады неяк трывалі, дык “Заходняга фронту без пераменаў” стрываць не маглі» [2, с. 277]. Заўважым, што гэты раман і раней быў вядомы беларускаму чытачу, і не толькі ў рускамоўным перастварэнні; дастаткова аператыўна, у 1931 г., ён выйшаў па-беларуску ў перакладзе Хведара Шынклера, зробленым, аднак, з рускай, а не з мовы арыгіналу. Раман меў адпаведныя купюры і суправаджаўся прадмовай сумна вядомага Карла Радэка. Іншая справа, што вельмі хутка твор з яго дэрамантызацыяй вайны быў не толькі забаронены ў Германіі, але на доўгі час выключаны з чытацкай сферы і ў Савецкім Саюзе; у 1960-х гг. творы Рэмарка, праўда, пачалі выдаваць, але таго ж «Заходняга фронту» «трываць не маглі» з-за жорсткай праўды аб вайне. «Трываць не маглі» рэмаркаўскага «акопнага гледзішча», якое — кіруючыся не так Рэмаркам, як рэаліямі франтавога вопыту — падзялялі і Р. Бакланаў, і В. Някрасаў, і В. Быкаў.

У «Доўгай дарозе дадому» пісьменнік распавёў, як «апэратыўна было пушчана ў абарот» вышэйпамянёнае «зьняважлівае ў нас азначэньне р э м а р -

к і з м (разрадка аўтара. — *Е. Л.*), які, бы бірку быку на рогі, вешалі на таго ці іншага аўтара. Першым такой “пашанай” быў ганараваны Булат Акуджава зь яго невялічкай, але ёмістай аповесьцю “Будзь здароў, шкаляр”… То была добрая аповесьць» [2, с. 277]. І сам В. Быкаў, як вышэй было сказана, не пазбег абвінавачванняў у «рэмаркізме».

Філасофска-эстэтычную прысутнасць традыцыі Э. М. Рэмарка ў творах беларускага пісьменніка заўважылі ці не з першых жа яго крокаў у літаратуры. В. Тарас успамінае пра ўражанне Н. Кісліка ад дасланага ў «ЛіМ» (у 1956 або 1957 г.) апавядання незнаёмага яму Васіля Быкава пра апошнія хвіліны жыцця маладога параненага байца, які «рыхтуецца падарваць сябе і немцаў…апошняй гранатай». Адзначыўшы дакладнасць рэалій, адсутнасць фальшу, таннай патэтыкі і «рамантызацыі пекла вайны», Н. Кіслік заўважыў: «Па сіле апавяданьне не саступае Рэмарку, менавіта па сіле — манера, інтанацыя, стылістыка свае…» [5, с. 59–60]. Перадаючы гэтыя словы В. Быкаву, В. Тарас і сам як наклаў рэзалюцыю: «Так што быць табе новым Рэмаркам» [5, с. 63], што, па зразумелых прычынах, аўтара апавядання яўна не ўзрадавала. «Быкава шанавалі ўпоравень з Рэмаркам, — піша М. Слуцкіс, — а па-мойму яго, Васілёва, праўда пра вайну і чалавека ў шынялі куды болей праўдзівая, без лішняй стылізацыі і манернасці...» [5, с. 367].

Трыяда *Рэмарк — Някрасаў — Быкаў* паўстае з успамінаў В. Аскоцкага — у сувязі з быкаўскай аповесцю «Трэцяя ракета», дакладней — сцэнай, калі абгарэлы немец прыпаўзае да акопа Лазняка. Гэтая сцэна «выпрабаваньня героя блізкасьцю ворага» выклікала ў крытыка асацыяцыі не толькі з Э. М. Рэмаркам, але і з апавяданнем В. Някрасава «Другая ноч» [гл.: 5, с. 406]. Раман «На Заходнім фронце без перамен» быў любімым творам В. Някрасава; ён яго, па ўласным прызнанні, «чытаў і абагаўляў» [6, с. 251]. Пра самога аўтара аповесці «У акопах Сталінграда» часам так і гаварылі — як пра «савецкага Рэмарка і Хемінгуэя ў адной асобе» [7].

Перазовы паміж Э. М. Рэмаркам і В. Някрасавым даюць аб сабе знаць у прынцыпах увасаблення не толькі ўласна ваеннай тэмы, але і тэмы «вяртання» — у раманах «Вяртанне» і «Тры таварышы» першага і ў аповесці «У адным горадзе» другога. У абодвух вяртанне франтавіка дамоў суправаджаецца расчараваннем, крахам ілюзій і надзей на пасляваеннае мірнае жыццеўладкаванне, сутыкненнямі ветэранаў з бюракратычнай машынай, непаразуменнямі з тылавікамі, адчуваннем «страчанасці». «У той час лічылася, што ў нас не існуе праблемы “страчанага пакалення”, але яна была і аказалася не менш шматцяжкай, чым праблема ў герояў Э. М. Рэмарка ў яго рамане “Вяртанне”, а ў чымсьці, мажліва, яшчэ больш супярэчлівай і балючай, — пісаў В. Кандрацьеў менавіта ў сувязі з аповесцю Віктара Някрасава “У адным горадзе”. — Успомнім хаця б, што нас, франтавікоў, якія адчулі сябе на вайне грамадзянамі, Сталін назваў “вінцікамі”» [4, с. 5]. Якраз аповесць «У адным горадзе» аказалася найбольш безабароннай перад абвінавачваннямі ў рэмаркізме, хаця дасталося і першай — «У акопах Сталінграда» — да яе нечаканага ўганаравання Сталінскай прэміяй. У творах усіх трох аўтараў нямала агульнага — і ў сюжэтнай атрыбутыцы, і ў непрыаздобленым,

непрыхарошаным бачанні вайны. Нездарма менавіта ў сувязі з прозай пра Вялікую Айчынную вайну А. Адамовіч прыгадваў «Чорны абеліск» Э. М. Рэмарка, дзе ёсць разважанні аб тым, як па-рознаму «памятае франтавік вайну — адразу пасля яе сканчэння і праз шмат гадоў. Спачатку ён адварочваецца ад усяго, што нагадвае аб перажытым, бачаным; потым — ён гатовы ўсё бачыць ужо не ў крывавых, а ў "ружовых" фарбах» [1, с. 458]. З В. Някрасавым і В. Быкавым, як і з іх папярэднікам Э. М. Рэмаркам, такога «ператварэння» не адбылося, яны выразна ўсведамлялі, што гавораць ад імя забітых, перад памяццю якіх яны адчувалі велізарную адказнасць.

Яднаюць пісьменнікаў і стылёвыя якасці, якія абумовілі мастацкую манеру Э. М. Рэмарка і якія ў дачыненні да В. Быкава А. Адамовіч вызначыў як «стылёвы сплаў жорсткага рэалізму з лірычнай апавядальнай стыхіяй» [1, с. 471], выкарыстаўшы, такім чынам, нават паняцце, амаль ідэнтычнае ўведзенаму ў абыходак нямецкімі літаратуразнаўцамі паняццю Hartstil. Падобныя празаікі і вонкавай адсутнасцю гераічнага ў іх персанажах, і логікай разгортвання сюжэту, і такімі мастацкімі складнікамі, як лакалізаваны хранатоп, лапідарнасць, стрыманая трагедыйнасць, гранічная дакладнасць ва ўвасабленні «псіхалогіі салдата ў баі» (В. Быкаў). У творах усіх трох пісьменнікаў шмат ахвяр, болю і крыві. Нярэдка сустракаюцца натуралісцкія малюнкі, якія часам мяжуюць з сюррэалізмам; дастаткова ўзгадаць прыліплы да губы мёртвага байца акурак, што ўсё яшчэ дыміцца, з рамана «У акопах Сталінграда» (чытач міжволі прыгадае рэмаркаўскіх матылькоў, што адпачываюць на зубах чэрапа, і да таго падобныя дэталі).

Вядома, спадчына Віктара Някрасава і Васіля Быкава мае нашмат больш перазоваў з творамі Эрыха Марыі Рэмарка, але і адзначаныя сведчаць пра арганічную роднаснасць грамадзянскіх і эстэтычных прынцыпаў гэтых мастакоў слова.

Літаратура

1. Адамовіч, А. Здалёк і зблізку. (Беларуская проза на літаратурнай планеце) / А. Адамовіч. — Мінск, 1976.
2. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому / В. Быкаў. — Мінск, 2002.
3. Быкаў, В. На крыжах: Выступленні, артыкулы, інтэрв'ю / В. Быкаў. — Мінск, 1992.
4. Кондратьев, В. Два лика войны: Предисловие / В. Кондратьев // В. Некрасов. В окопах Сталинграда. — Г. Бёлль. Где ты был, Адам? — М., 1991.
5. Наш Быкаў: Кніга ўспамінаў. — Мінск, 2004.
6. Некрасов, В. Через сорок лет…: Нечто вместо послесловия / В. Некрасов // В. Некрасов. В окопах Сталинграда. — Г. Бёлль. Где ты был, Адам? — М., 1991.
7. Эрих Мария Ремарк [Электронный ресурс]. — Режим доступа: kaor.ru|zarubezhnie-pisateli|erich-mariya-remark.html. — Дата доступа: 22.05.2012.

Марыя Воінава-Страха (Мінск)

ДЫЯЛАГІЧНАЯ СУВЯЗЬ ЖАНРАВЫХ ТРАДЫЦЫЙ І НАВАТАРСТВА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ НАВЕЛЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРЧАСЦІ У. СЦЯПАНА)

Пытанне дыялагічнай сувязі сучаснасці з літаратурнай класікай, традыцый і наватарства вызначаецца актуальнасцю і востраналемічнасцю ў айчынным літаратуразнаўстве. Як слушна заўважае В. Жураўлёў, «у залежнасці ад таго, як гэта пытанне будзе вырашацца на каардынатах тэорыі і літаратурнай практыкі, у многім будзе выяўляць сваю ключавую эстэтычную сутнасць пісьменніцкая думка і складвацца агульны малюнак літаратурнага працэсу. Хацелася б, вядома, каб у гэтай дыялагічнай бінарнай сістэме «традыцыі — наватарства» паболей наглядалася ўзаемападтрымкі, узаемапаразумення, узаемапавагі, узаемазалежных сувязей і меней адгукалася рэзкае і непрымірымае разыходжанне творчых поглядаў, канцэпцый, метадалагічных падыходаў» [1, с. 17].

Адзначана літаратуразнаўцам напрамую характарызуе працэс функцыянавання жанру навелы ў сучасным прыгожым пісьменстве, адной з асноўных асаблівасцей якога з'яўляецца яскравая тэндэнцыя да міжжанаравага ўзаемадзеяння, шырокай мадыфікацыі на розных ўзроўнях тэкставай тканкі. І тым не менш, эксперыментуючы са зместам і формай, айчынныя пісьменнікі на свядомым ці падсвядомым узроўні прытрымліваюцца ўсталяваных жанравых канонаў. І гэта цалкам натуральны працэс, бо «мастак можа праяўляць вялікую вынаходлівасць у галіне тропаў і фігур, але заставацца верным некаторым пэўным, але вельмі жорсткім правілам на ўзроўні жанру, які выступае як прадстаўнік творчай памяці» [2, с. 17].

Малая проза У. Сцяпана ўвасабляе яскравы прыклад цеснай дыялагічнай сувязі традыцыйных, класічных прыкмет жанру навелы і ўласна аўтарскіх, наватарскіх рашэнняў у працэсе стварэння тэксту.

Адзінства і непарыўнасць успрымання, падпарадкаванасць цвёрдаму кодэксу правіл, заснаванасць на супярэчнасці, несупадзенні, памылцы і кантрасту, імкненне накапліваць усю сваю вагу к канцу, падкрэсленае значэнне развязкі, у якой утрымліваецца нечаканы паварот, імкненне менавіта да максімальнай нечаканасці фіналу пры адначасовай канцэнтрацыі вакол сябе ўсяго папярэдняга — гэтая стройная традыцыйная навелістычная сістэма, праяўляючыся ў тканцы тэкстаў У. Сцяпана, усё ж не выключае магчымасць праяўлення непрадугледжаных і выпадковых кампанентаў і дапускае ўжыванне ўласна аўтарскіх мастацкіх прыёмаў і сродкаў пры дасягненні навелістычнага pointe.

Адзін з такіх прыёмаў рэалізаваны ў творах «Букет. Медаль. Шапка» і «Півонія». У дадзеных тэкстах кульмінацыйная дамінанта дасягаецца дзякуючы развіццю ўнутранай антытэтычнасці і поліфункцыянальнасці ключавой лексемы. Так, ва ўступным тэкставым сегменце твора «Півонія» аўтарам раскрываецца варыятыўнае выкарыстанне вобраза півоніі ў шматаспектным мастацкім свеце. Японскі паэт XVII ст. Мацуа Басё напісаў хайку, прысвечаны півоніі, у выніку чаго «півонія і пчала зрабіліся бессмяротным трохрадкоўем, якое

ўваходзіць ці не ва ўсе анталогіі японскай паэзіі» [3, с. 626]. Кітайскі мастак, каліограф і паэт Цы Бай-Шы «шмат разоў маляваў півоніі на бамбукавай і рысавай паперы. Мастак быў зусім нямоглы, кепска бачыў, але здолеў лічанымі ўзмахамі пэндзля перанесці на паперу харство кветкі» [3, с. 626]. Апяваў вобраз півоніі і беларускі мастак-самавука з Давыд-Гарадка Барыс Сыса, які «хайку Мацуа Басё пра півонію і пчалу не чытаў і не чуў, акварэльных кветак кітайца Цы Бай-Шы, магчыма, аніколі не бачыў» [3, с. 626], але «руплівасць, стараннасць і талент мастака з берагоў Гарыні дадалі прыгажосці на белым свеце...» [3, с. 627].

Вобраз півоніі наскрозь пранізвае тканку тэксту. Апавядальнік, знаходзячыся ў звычайным бары, ізноў узгадвае мастацкае выяўленне півоніі [3, с. 629–630]. Падобны паўтор-нагадванне служыць адначасова для ўзмацнення эфекту кантрасту: паэтычны вобраз півоніі, прадстаўлены ў пачатковым сегменце і ў асноўнай падзейнай лініі, рэзка супрацьпастаўляюцца з выявамі на гульнёвым аўтамаце: «У мяне на далоні тры манеты. Па сто песетаў кожная. Падыходжу да таго аўтамата, за якім вар’яцела немка… Шапчу. Як пароль: «Пі-во-ні-я», націскаю тры кнопкі і цягну на сябе рычаг… Усе дзевяць прамакутнікаў запаўняюцца кветкамі» [3, с. 631].

Аналагічная кантэкстуальная антытэчнасць ключавой лексемы прадстаўлена і ў навеле «Букет. Медаль. Шапка». Аднак калі ў папярэднім творы ўнутраная контрадыкторнасць відавочна суправаджаецца аўтарскай іроніяй, то ў прадстаўленым тэксце — навідавоку драматызм, не пазбаўлены пэўнай сентыментальнсці. Чытачу ў пачатку навелы складана зразумець агрэсіўныя паводзіны галоўнага героя, Эдзіка Мельніка, у дачыненні да Віцькі Курмаза па прычыне няўдалага жарту з «нейкай зношанай шапкай-вушанкай… Быцца у ёй сто даляраў ляжала» [4, с. 17]. Эфект навелістычнай нечаканасці, у адрозненні ад тэксту «Півонія», узмацняецца дзякуючы не акцэнтацыі на традыцыйным кантрасце духоўнага і матэрыяльнага, а яго своеасаблівым разбурэнні, цяжка спасцігальным, не пазбаўленым частковага вар’яцтва, але незвычайным, што і дазваляе дасягнуць раскрыцця навелістычнага pointe: верны сабака па мянушцы Букет і пасля сваёй смерці працягвае «суправаджаць» свайго гаспадара: «І ў гэтым годзе, як і ў мінулым, калі пачнуцца халады, надзене Эдзік сваю шапку і будзе няспешна ісці па пасёлку. І абавязкова хто-небудзь скажа-кіне ўслед: «Вунь Мельнік з Букетам…» [4, с. 21].

Згодна з канонам навелістычнага жанру У. Сцяпан імкнецца да лаканічнасці ў апісанні падзей, чаму садзейнічае плённае ўжыванне апасіяпезы. У некаторых творах аўтара апасіяпеза выступае цалкам скразным сродкам арганізацыі навелістычнага тэксту. Так, у навелах «Адна капейка», «Букет. Медаль. Шапка», «Драпіны», «Ключ» апасіяпеза ўтрымліваецца не толькі ў большай частцы тэкставых сегментаў, але і ў фінальных, пуэнтычных блоках. Пры гэтым апасіяпеза можа выкарыстоўвацца з рознай функцыянальнай нагрузкай, напрыклад, у якасці сродку: лаканічнай падачы інфармацыі: «Братавы... Ён іх у «Спорттаварах» купіў» [3, с. 49]; «Цяпер смешна... цяпер і школы нашай няма...» [3, с. 49]; адлюстравання часавага мастацкага перамяшчэння падзейнай

лініі: «А школа тут пры чым? Не ведаю, як я тады вытрымаў...» [3, с. 49]; псіхалагічнага ўзмацнення: «і ён азваўся, ажыў…» [4, с. 16] і г. д.

Адметнай рысай кампазіцыйнай арганізацыі ўласна навелістычнага аповеду ў некаторых тэкстах аўтара з'яўляецца прамое раскрыццё сутнасці падзеі без традыцыйнага суправаджэння ўводнай часткі. Напрыклад, у творы «Драпіны» цэнтральная падзейная лінія развіваецца згодна з законамі навелістычнага жанру. У дадзеным тэксце У. Сцяпана «супярэчлівы», антытэтычны характар з'яў дазваляе ўзмацніць элемент нечаканасці, незвычайнасці, неардынарнасці ў параўнанні з традыцыйным побатавым укладам. Напрыклад, стан прыроды, які стварае атмасферу прадчування свята, уступае ў выразныя контрадыкторныя адносіны з далейшым разгортваннем падзеі [3, с. 50]. На фоне прыроднай гармоніі і агульнага спакою выразна кантрасным з'яўляецца настрой цэнтральнага персанажа Алега Барадаўкі: «Ён нерваваўся і цёр шыю» [3, с. 50].

Далейшае развіццё сюжэтнай лініі вылучаецца дынамізмам і інтэнсіўнасцю. Аўтар выкарыстоўвае лаканічную, пазбаўленую другасных дэталей, але вельмі трапную характарыстыку персанажаў, якія ўведзены ў наратыўную прастору як неад'емны элемент стварэння адпаведнага каларыту агульнага фону дзеяння [3, с. 50−51].

Прыём прамога ўвядзення ў сутнасць падзеі яскрава ўжыты і ў творы «Адна капейка». Аўтар акцэнтуе ўвагу чытача на адной «неверагоднай» падзеі, указваючы пры гэтым на канкрэтны час яе здзяйснення — «пагодны чэрвеньскі дзень, пасля апоўдня» [4, с. 13]. Дынамізм развіцця дзеяння дасягаецца шляхам выкарыстання выказнікаў, выражаных дзеясловамі закончанага трывання: «вачам не паверыў», «калупнуў мыском кеда», «прыціснуў гумовай падошвай», «прысеў на кукішкі, азірнуўся» [4, с. 13] і г. д.

Тым не менш, нягледзячы на вернасць канону навелістычнага жанру, У. Сцяпан часам выходзіць па-за яго межы, выкарыстоўваючы нетрадыцыйныя з пункту гледжання структурнай арганізацыі формы. Напрыклад, уступны сегмент навелы «Наперадзе цемра» не ўтрымлівае звычайнай інфармацыі, характэрнай для тэкстаў гэтага жанру. Замест прасторава-часавай характарыстыкі, знаёмства з галоўнымі персанажамі ці аўтарскага ўводнага каментарыя ва ўступным сегменце даецца фармулёўка навелістычнай загадкі, выражанай складаназалежным пытальным сказам [3, с. 52].

Характэрны для У. Сцяпана і зварот да рэтраспекцыйнага паказу («Вогненнае воблака», «Donna Mia», «Драпіны», «Букет. Медаль. Шапка»), выкарыстання сродкаў псіхалагічнага пісьма («Ключ», «Паліто», «Партрэт»), што садзейнічае пашырэнню наратыўнай прасторы і выхаду за межы жанру навелы і, па сутнасці, адпавядае тэндэнцыі сучаснасці. Даследаванне развіцця жанру навелы сведчыць пра тое, што ў беларускай літаратуры XXI ст. асноўным, дамінантным відам навелістычных мадыфікацый з'яўляецца ўзаемадзеянне апавядання і навелы. У творах аўтараў, і навелістыка У. Сцяпана — яскравае таму пацвярджэнне, назіраецца тэндэнцыя да выхаду па-за межы традыцыйна сфарміраваных навелістычных рамак, адбываецца, па словах І. Шпакоўскага, «раманізацыя» жанру, што «звязана перш за ўсё з паглыбленым увасабленнем

эпічнага прынцыпу суаднесенасці гістарычных працэсаў і лёсу асобу, які фарміруецца ў гэтых працэсах» [5, с. 4].

Такім чынам, аналіз адметнасцей рэалізацыі жанру навелы ў творчасці У. Сцяпана дазваляе зрабіць вывад, што гэты жанр у беларускай літаратуры вызначаецца адметнасцю сюжэтна-кампазіцыйнай арганізацыі, што праяўляецца ў шматстайнасці спосабаў выражэння навелістычнага зачыну, развіцця дзеяння, кульмінацыі і развязкі, у выніку чаго ўтвараюцца розныя структурныя мадэлі. Так, у творчасці У. Сцяпана прыкметы класічнай навелы відавочна спалучаюцца з уласна аўтарскімі рашэннямі арганізацыі навелістычнай тэкставай тканкі: спалучэнне прасторава-часавай сфакусаванасці і інфармацыйна-паведамляльнай насычанасці, перарывістасць і неаднароднасць храналагічна-падзейнай лініі, дасягненне навелістычнай выразнасці шляхам выкарыстання адпаведных лексіка-граматычных сродкаў, ужыванне разнастайных сродкаў псіхалагічнага аналізу, арганічнае перапляценне мастацкіх дэталей з мэтай дасягнення эфекту цэласнасці і завершанасці, супадзенне канцоўкі твора з pointe, аднападзейнасць, адначасовае спалучэнне ўнутранай і знешняй наратыўнай плыняў.

Навела ў творчасці У. Сцяпана актыўна эвалюцыянуе ў кірунку змяшчэння сваёй дынамікі са знешняга ва ўнутраны падзейны план. Антытэтычнасць і парадаксальнасць, уласцівыя жанру, усё часцей набываюць выразнасць дзякуючы праяўленню духоўна-маральнай супярэчнасці героя, яго рознабаковай рэфлексійнай рэакцыі на акаляючы свет, што і знаходзіць адбітак на непрадказальнасці ўчынкаў персанажаў, неадназначнасці паводзінаў. Навелістычная «пуэнтычнасць» дасягаецца не толькі праз парадаксальнасць фізічнага дзеяння, а пачынаецца на ўнутраным узроўні, з'яўляючыся штуршком да развіцця знешняй антынамічнай дынамікі навелістычнай сюжэтнай тканкі.

Аналіз творчасці У. Сцяпана даказвае тое, што любая «структурная мадэль твора шукае свой індывідуальны варыянт» [6, с. 85], у выніку чаго нараджаецца індывідуальна аўтарская мадэль, якая (і гэта натуральна) выходзіць за межы існуючага сюжэтна-кампазіцыйнага шаблону, а часам нават сама становіцца ўзорам для іншых, у выніку чаго «мяняюцца суадносіны паміж жанрамі і характар узаемадзеяння паміж імі» [1, с. 341].

Абнаўленне і «асучасніванне» навелы пры захаванні асноўных, ключавых элементаў, таго, што вылучае дадзены жанр з ліку іншых, — вынік натуральнага заканамернага працэсу, бо менавіта літаратурны жанр, па словах М. Бахціна, «заўсёды і той і не той, заўсёды і стары і новы адначасова. Жанр — прадстаўнік творчай памяці ў працэсе літаратурнага развіцця. Іменна таму жанр і здольны забяспечыць адзінства і бесперапыннасць гэтага развіцця» [8, с. 141–142].

Літаратура

1. Жураўлёў, В. П. Лідар і яго суразмоўца як дыялог традыцый і наватарства / В. П. Жураўлёў і інш. // Беларуская літаратурная класіка і сучаснасць: праблемы характаралогіі / Нав. рэд. В. П. Жураўлёў. — Мінск: Бел. навука, 2013. — С. 8–71.

2. Большаков, В. П. Классицистическая теория жанров и ее преодоление / В. П. Большаков // Теория литературы: в 4 т. / редкол. Ю. Б. Борев [и др.] — М.: ИМЛИ РАН, 2003. — Т. 3: Роды и жанры. — С. 11–32.
3. Сцяпан, У. Півонія / У. Сцяпан // Сучасная беларуская проза: Традыцыі і наватарства. — Мн.: Сэр-Віт, 2003. — С. 626–632.
4. Сцяпан, У. А. Адна капейка: кніга прозы / Уладзімір Сцяпан. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2012. — 224 с.
5. Шпаковский, И. И. Сюжетно-композиционная структура современного рассказа: автореф. дисс. ... канд. филол. наук / И. И. Шпаковский; Белорус. гос. ун-т. — Мінск: 1996. — 20 с.
6. Жураўлёў, В. Структура твора. Рух сюжэтна-кампазіцыйных форм / В. Жураўлёў. — Мінск: Навука і тэхніка, 1978. — 312 с.
7. Хализев В. Теория литературы / В. Хализев. — М.: Наука, 1998. — 398 с.
8. Бахтин, М. Проблемы поэтики Достоевского / М. Бахтин. — М.: Наука и техника, 1963. — 320 с.

Евгения Логуновская (Минск)

ВАМПИРИЧЕСКАЯ ПАРАДИГМА В СОВРЕМЕННОЙ КУЛЬТУРЕ: ОБУСЛОВЛЕННОСТЬ ПОПУЛЯРНОСТИ ПРОИЗВЕДЕНИЙ ВАМПИРСКОЙ ТЕМАТИКИ СПЕЦИФИКОЙ ЧЕЛОВЕЧЕСКОЙ ПСИХИКИ

> ...Прочел я “Вампира — графа Дракула”. Читал две ночи и боялся отчаянно. Потом понял еще и глубину этого, независимо от литературности и т. д. Написал в “Руно” юбилейную статью о Толстом под влиянием этой повести. Это — вещь замечательная и неисчерпаемая, благодарю тебя за то, что ты заставил меня, наконец, прочесть ее.
>
> *А. А. Блок в письме другу Е. П. Иванову в 1908 г.*

Современная литература отличается идейно-тематическим разнообразием, пестротой техник письма, своеобразием героев. Принадлежащие к «инфернальной» сфере являются, пожалуй, одними из самых ярких и популярных. В последнее время на экранах, страницах книг и, более всего, в сети Интернет наблюдается всплеск инфернальной тематики. Видимо, современная культура специфична реанимацией различных культов, компонентов мифа и фольклора. Неомифологизм литературы XX века, нацеленный на постижение сложных нравственно-философских проблем, неизбежно коснулся вопроса нынешнего соотношения двух миров — реального и инфернального. Эта полоса стала частью сознания современного человека, компонентом культуры, предметом научного изучения.

По толковому словарю Д. Н. Ушакова, «инфернальный — (латин. infernalis) (книжн. устар.). Находящийся в аду, происходящий в аду, адский. Одержимый бурными страстями, демонический» [2, с. 564]. В фольклористике под инфернальными понимаются следующие образы: призраки, оборотни, адские псы, черти и др. Ярким проявлением инфернального является образ вампира. В. Л. Цымбурский в статье «Граф Дракула, философия истории и Зигмунд Фрейд» охарактеризовал вампиров как «образы, способные завоевы-

вать сознание миллионов, ориентировать их, навязывать им такое понимание действительности, которого до возникновения тех образов как будто и не могло быть» [5].

В современной культуре вампирическая парадигма переживает настоящий бум. Важна социально-психологическая составляющая популярности образа вампира. Образ вампира в сознание современного человека входит последовательно, процесс можно обозначить следующим образом: ребенок → подросток → молодежь → взрослый. Концепт «вампир» входит в сознание ребенка, когда тот сталкивается с фантастическими фильмами, часто не предназначенными для детей, но популярными среди них, детскими и подростковыми рассказами хоррор-жанра (например, серией детских ужастиков Р. Л. Стайна). По мере вхождения подростка, молодого человека, а затем взрослого в культурное поле, дискурс «вампир» укореняется в сознании.

Противопоставление **человек — вампир** в рамках вампирической парадигмы основано на оппозиции **Я — Другой**, возникшей в древнем мифе, продолженной в фольклоре и пришедшей в литературу. Однако современная культура характерна подталкиванием к принятию совершенно Иного и одновременно борьбой с Иными, Чужими. Вампир — это в первую очередь Чужой, он противопоставлен человеку. В то же время с развитием вампирической парадигмы образ вампира усложняется, и возникает градация образа вампира: хуже, чем человек (А. К. Толстой «Упырь», «Семья вурдалака», Б. Стокер «Вампир (Граф Дракула)»), → такой же, как человек (Э. Райс «Интервью с вампиром»), → лучше человека (С. Майер «Сумеречная сага»). Вампир может представать как монстром (Дракула, герои А.К. Толстого), так и жертвой, страдальцем (семья Калленов из «Сумеречной саги» С. Майер, герои «Вампирских хроник» Э. Райс). Таким образом, возникает необходимость внутренней составляющей популярности произведений, посвященных вампирской тематике.

Один из самых актуальных вопросов, связанных с вампирической парадигмой в культуре, — это вопрос: откуда в человеческом сознании возник такой интерес к образу вампира?

Объяснение можно найти в теории личности З. Фрейда, который считал, что психические образы телесных потребностей, выраженные в виде желаний, называются инстинктами. Есть две группы инстинктов — инстинкты жизни и инстинкты смерти. Инстинкты жизни З. Фрейд назвал Эросом и определил, что эта группа включает силы, которые служат для поддержания жизненно важных процессов и обеспечивают размножение вида. Наиболее существенной З. Фрейд считал сексуальную энергию — либидо. Либидо (от лат. libido — стремление) — «бессознательная психическая энергия индивида, коренящаяся в сексуальном инстинкте. Либидо рассматривается как доминирующий мотив человеческого поведения, проявляющийся в социально приемлемой форме благодаря сублимации, вытеснению и другим видам психологической защиты» [1, с. 161].

Вторая группа инстинктов — инстинкты смерти Танатос — лежат в основе всех проявлений жестокости, агрессии, самоубийств и убийств. Зигмунд

Фрейд посчитал их биологически обусловленными и такими же важными в регуляции человеческого поведения, как и инстинкты жизни, утверждая: «Целью жизни является смерть» [3, с. 38]. Таким образом, все живые организмы стремятся вернуться в неопределенное состояние, из которого они вышли.

Вампир олицетворяет два основных стремления бессознательного человека: Эрос и Танатос. Вампир, как известно из фольклора, — это нежить, он не жив и не мертв: с одной стороны, это человек после смерти, с другой стороны, живой, и эту иллюзию жизни он стремится поддерживать. Образ вампира-соблазнителя апеллирует к либидо, по З. Фрейду, главному стремлению нашего бессознательного. Соответственно увлечение вампирской тематикой — сублимация в чистом виде для авторов и читателей. З. Фрейд отмечал, что, «благодаря процессу “сублимирования”, при котором исключительно сильным возбуждением, исходящим из отдельных источников сексуальности, открывается выход и применение в других областях…» [3, с. 111]. Популярность вампиров отражает накапливаемые в психике человека отклонения, перверсии и элементы девиантного поведения.

З. Фрейд говорит о том, что любой инстинкт имеет четыре характеристики: источник, цель, объект и стимул [4, с. 117]. Инстинкт жизни вампира (смерти, по сути, он уже достиг) можно представить в виде комплекса компонентов:

Источник (состояние организма или потребность, вызывающая это состояние): жажда.

Цель (устранение или редукция возбуждения, вызванного потребности): утоление жажды, убийство человека.

Объект (любой человек, предмет в окружающей среде или что-то в собственном теле индивидуума, обеспечивающее удовлетворение (т. е. цель) инстинкта): человек-жертва.

Стимул (количество энергии, силы или давления, которое требуется для удовлетворения инстинкта): способности вампира (скорость, гипноз и т. д.).

В определенной мере помогает теория личности Карла Густава Юнга. К. Юнг исходит из того, что содержание бессознательного есть нечто большее, чем подавленные сексуальные и агрессивные побуждения. Интерес представляет его мысль, что поступки человека мотивированы интрапсихическими силами и образами, происхождение которых уходит вглубь истории эволюции. Это врожденное бессознательное содержит имеющий глубокие корни духовный материал. К. Юнг рассматривал либидо как «лишенные сексуальной основы иррациональные влечения человека, определяющие его поведение» [1, с. 161]. По сути, с такой точки зрения легко объясняется поведение вампира-персонажа, его либидо — жажда крови и порой это влечение достаточно иррационально для него самого.

Так же решает вопрос популярности «Вампира» Б. Стокера Вадим Цымбурский в статье «Граф Дракула, философия истории и Зигмунд Фрейд». Он пишет: «Итак, вот три аспекта, которые придется соотносить при оценке глубинных механизмов “дракулического” террора: приверженность к правде-

справедливости, трактуемой как испытание человека на готовность-неготовность оправдать собственную казнь; сексуальные, фаллические ассоциации, сопряженные с излюбленным орудием смерти; наконец, страсть принуждать свои жертвы к предварительному поглощению, всасыванию чужих жизней, так что в финальном акте на колу умирает вроде бы не один казненный, а все жизни, уже поглощенные им» [5].

Популярность вампирской тематики можно в какой-то мере объяснить, исходя из теории существования коллективного бессознательного, которое представляет собой хранилище латентных следов памяти человечества. В нем отражены мысли и чувства, общие для всех человеческих существ и являющиеся результатом нашего общего эмоционального прошлого. Как говорил сам К. Юнг, «в коллективном бессознательном содержится все духовное наследие человеческой эволюции, возродившееся в структуре мозга каждого индивидуума» [6]. Таким образом, вера в вампиров была настолько сильна, что перешла к современному человеку, поскольку структура его психики оставалась неизменной и коллективное бессознательное было ее ядром.

Таким образом, интерес к вампирической парадигме обусловлен спецификой человеческой психики. Вампир олицетворяет два основных стремления бессознательного человека — Эрос и Танатос. Образ вампира апеллирует к либидо, по З. Фрейду, главной движущей силе бессознательного. Соответственно увлечение вампирской тематикой — сублимация в чистом виде. В рамках же концепции К. Г. Юнга, который трактовал либидо как «лишенные сексуальной основы иррациональные влечения человека, определяющие его поведение» [1, с. 161], легко объясняется специфическое поведение вампира-персонажа: его либидо — жажда крови.

Литература

1. Краткий психологический словарь / Сост. Л. А. Карпенко; под общ. ред. А. В. Петровского, М. Г. Ярошевского, — М: Политиздат, 1985. — 431 с.
2. Толковый словарь русского языка: в 4 т. / Под ред. Д. Н. Ушакова. — М., 1935. — Т. 1— 764 с.
3. Фрейд, З. Очерки по психологии сексуальнорсти: пер. с нем. / З. Фрейд. — 2-е изд. — Минск: Попурри, 2010. — 480 с.
4. Хьелл, Л. Теории личности: основные положения, исследования и применение / Л. Хьелл, Д. Зиглер. — 3-е изд. — СПб.: Питер, 2006 — 607 с.
5. Цымбурский, В. Граф Дракула, философия истории и Зигмунд Фрейд / Цымбурский // Научная библиотека. [Электронный ресурс]. — Режим доступа: zar-literature.ucoz.ru. — Дата доступа: 24.02.2013.
6. Campbell, J. Hero with a thousand faces. / J. Campbell — N. Y.: Harcourt Brace Jovanovich, 2006. — 198 с.

Марина Бабенко (Київ)

ОБРАЗ ЛЮБОВІ В СУЧАСНІЙ УКРАЇНСЬКІЙ ФІЛОСОФСЬКІЙ ЛІРИЦІ: СПЕЦИФІКА МОДИФІКАЦІЙ

Одним із центральних об’єктів творчого осягнення в українській філософській ліриці є любов. Ця споконвічна рушійна сила завжди оспівувалася

митцями слова. Особлива ж її актуальність визначається духовними пошуками зламу століть, як слушно зауважує проф. Сергій Кримський, орієнтиром нового мистецтва стають вічні цінності: «Християнська трійця "Віра, Надія, Любов" була і лишається наскрізною для перебігу століть. Зрозуміло, що вона доповнюється досвідом теперішнього часу» [4, с. 28]. У ліриці думки любов сак ралізується, осмислюється як провідна категорія буття, як незмінна субстанція, яка є причиною всього живого. Лірика як царство емоцій найкраще передає сутність цього великого почуття, воно постає в поезіях священним, адже саме здатність любити, віддавати комусь тепло душі є ознакою духовності людини. У філософській ліриці образ любові наповнений особливим змістом, адже увага митців звернена передусім на онтологічну глибину цієї категорії. Ліричні медитації поетів філософського спрямування сповнені певного благоговіння перед її сакральною сутністю.

Образ любові, як і всі інші, не є сталим: він також має свої механізми зміни, він є рухливим. Власне, в цьому полягає специфіка його сучасних модифікацій. Кожен митець висловлює своє бачення у контексті даної епохи і власного світогляду. Особливість нового часу й нового розуміння вічних істин — це передусім свіжий погляд. Так, сьогодні актуальним є сприйняття любові як свободи. Саме такий образ споконвічної матері всього сущого зустрічається в сучасній філософській ліриці, характерною рисою якої є особлива метафоризація довкілля.

Молоді українські поети в своїй творчості приходять до глибинного усвідомлення любові як сенсу життя, як великої світової гармонії. Так, для ліричного героя Ю. Покальчука любов — це першопричина буття, справжнє світло душі. У вірші «Не наступайте на любов» він — тонкий психолог, який констатує невтішні реалії сучасного збайдужілого світу, де часто люди не помічають одне одного, не вміють любити. Саме тому вони боязко позирають на слово «любов», що написане невідомим автором на стінах Паризького метро. Ліричний герой спостерігає за тим, яку реакцію викликав у людей цей напис: дехто проходив мимо, захоплений лише собою, дехто, — обережно переступав. Однак, хтось зупинявся замислений, і тоді «душа його світилася» [7, с. 3]. Бажання передати силу цього почуття є лейтмотивом даного вірша, який увиразнюється ритмічними повторами: *«Не наступайте на любов не наступайте // якщо не можете переступайте // любов як навесні трава // вона жива завжди жива // не наступайте на любов не наступайте»* [7, с. 3]. Душа ліричного героя наповнюється світлом і красою завдяки усвідомленню високого сенсу, що вкладений у слово «любов»: *«Я закликаю усіх — пишіть слово // Любов // пишіть це слово // на стінах і бруківках на будинках і парках… // і у себе в душі незупинно зараз і завжди // пишіть слово Любов»* [7, с. 6].

Слід зазначити, що в сучасній філософській ліриці любов постає мірою усіх речей. Її образ тісно пов'язаний з біблійною мудрістю, з духовним оновленням, для молодих митців дорога любові — це шлях до Абсолюту, до морального самовдосконалення, шлях до Бога і, водночас, — до глибинних витоків свого «я». Саме до таких поетичних філософствувань вдається лірична

героїня М. Кіяновської. Її поезії наповнені внутрішнім світлом — це одвічний пошук справжніх цінностей через віру, через молитовно-медитативне занурення у сутність речей: *«Мій Господи, навчи мене піти! // Навчи мене навчитися відходу! // Навчи втрачати і не берегти, // Ковтати кригу, наче люту воду! // Навчи забути, як забув би Сам. // Навчи усе простити — аж до крові. // Навчи чинити віру голосам // Любові, Смерті — й істинно Любові»* [3, с. 57]. Для творчої манери авторки характерною є незрима присутність сущого, «тут-буття», в багатьох віршах любов осмислюється як щось природне і дане, те, що є вічним, що триває завжди, попри усвідомлення минущості людського життя. Це найглибше, найточніше вираження внутрішньої суті, любов постає суцільним образом-рефлексією, обрамленим в лаконічність фрази: *«Люблю тебе. Це віра. Це спосіб жити» [6, с. 70]; «Не любити — не бути, бо сказано — не убий»* [3, с. 52].

Любов у творчості молодих поетів часто зображується крізь призму морально-релігійних чеснот. Лірична героїня М. Савки замислюється над проблемою справжньої любові, що не вимагає віддачі, над здатністю любити ворогів: *«тебе // мені доводиться прощати // і просити прощення // у себе // за те що тебе прощаю // бо не можу інакше // ніж тебе возлюбити // вороже мій // та коли я помру // хто ж за тебе // молитися буде»* [8, с. 80]. Мотив глибокої християнської любові до ближнього є наскрізним в збірці «Квіти цмину», присвяченій рідним, близьким для авторки людям. Їй притаманне особливе розуміння філософії любові, що засвідчують такі слова у вступі до збірки: «Ці вірші — а писалися вони майже чотири роки — з'явилися із думок і спогадів про гарних і світлих людей… З роками все більше відчуваєш, що люди, яким не байдуже до тебе, — це і є твій найбільший скарб» [8, с. 3]. На думку авторки, пошук сенсу буття має лише одну відповідь, яка полягає у вмінні «любити і бути вдячним, радіти найпростішим речам» [8, с. 3]. З філософською сентенційністю звучить мотив простої і справжньої любові, яка дає сенс людському існуванню, адже «серце, в якому любов не живе, — неживе» [8, с. 111].

У подібному ракурсі зображується це вічне людське почуття в творчості Богдани Матіяш. Її стиль досить різко контрастує з тенденцією сучасного літературного нігілізму, з модою на брутальний епатаж. Позначена метафорою світла, яка є наскрізною в її творчості, її лірична проза випромінює душевну щирість. На актуальне питання доби «камо грядеши?» лірична героїня Б. Матіяш шукає відповідь у справжній любові, яка не знає ані пихи, ані злості, яка є досконалою за своєю найглибшою суттю: *«ті що люблять подивися які вони прості і красиві // делікатні як найперше ранкове світло // безтривожні як голуби…навчися в них дякувати за все що є і чого немає // навчися приходити довірливо й лагідно // і відходити просто // як світло увечері гасне як птах засинає // як вода що тече в землю вертається»* [6, с. 168]. Образ води, що тече і повертається в землю, увиразнює ідею вічного проминання, перетворення всього земного. Світ, у якому є любов, для ліричної героїні сповнений гармонії та краси, слід зазначити, що в її творчості загалом наскрізним є образ Бога-Творця. Відчуття гармонійного сприйняття довкілля вловлюється на рівні символів і художніх деталей, завдяки світлій, м'якій колористиці її творів

(«сонця і місяця добре світло»; «срібний осінній дощ»; «мовчатимемо просто будемо прості як опала хвоя // м'які як мох легкі як світло»; «блідо-рожевий теплий м'який дощ»; «серце як сніг безтривожне і чисте»; часте використання семантично «променистих» слів на позначення світу: теплий; лагідний; делікатний; усміхнений; тихий; прозорий; радісний). На думку ліричної героїні, любов — це мета, шлях до якої — через мудрість, смирення і просвітлення: «*вчитись любити це вчитись так багато приймати // радості й усміху дару й болю вчитись любити // це вчитись так багато на що заплющувати очі // так багато згодитись бути малим згодитись бігти // там де хотів би іти згодитись йти там де хотів би // спинитись мовчки стояти глибоко дихати»* [5, с. 55]. Її семантико-стилістичний ланцюжок ключових образів можна означити рядком з поезії «*нічого настільки доброго як би мені хотілося…»: «дерево — Бог — вічність — світло — любов»* [6, с. 182]. Для ліричної героїні ця стихія — повна віддача себе і відчуття найбільшої радості, коли можна *«все зовсім усе віддати» і не знати, яка любов насправді, не знати, «чи вона дрібна як пісок // чи як земля велика», однак бути впевненим, що це вірний шлях, адже «попереду тільки зірки і небо безмежне й просте // і найделікатніше світло»* [6, с. 169].

Сучасна філософська лірика реалізує себе передусім через потужне духовно-творче, аксіологічне начало. Образ любові як незмінної субстанції є домінуючим в такій поезії. Лірична героїня А. Багряної розмірковує над цією вічною силою, що творить життя: *«Все починається з любові: // Священна музика життя, // Із лона матері дитя // У чистій Всесвіту обнові. // Змиває час із рани кров // І відкрива першопричини, // І мати вчить малого сина, // Що світ спасе лише Любов»* [2, с. 38]. Оригінальні образи поєднуються з влучністю змісту (дитя як чиста «обнова Всесвіту» — мотив вічного оновлення світу через зміну природних циклів народження і смерті). Метафора *«змиває час із рани кров»* має символічний підтекст проминання усього, загоєння ран. Цікавим і семантично багатим є образ священної музики життя як сакральної, вічної, чистої сили. Філософія любові є лейтмотивом її творчості, її образ повсякчас освячується у проникливих поетичних рядках: *«Який цей біль солодкий і важкий! // Мов чакра часу, що тримає вічність, // І незліченну поцілунків кількість // Нанизує на себе вік крихкий. // Бузковий сенс бузкового початку, // Що одночасно є простим кінцем, // І все життя змикається кільцем, // В якому досить хаосу й порядку»* [2, с. 47]. Сила цього почуття для ліричної героїні настільки могутня, що існує поза межами буття, відкриває незвідані глибини підсвідомого, космос людської душі.

Глибоким розумінням найвищої сутності любові перейнятий вірш «Буттєве». Світла колористика твору, піднесена тональність поєднана з важливим усвідомленням одвічних істин життя, його сенсу, який розкривається лише в любові до найрідніших людей: *«Рахувати не втрати, не випиті грами вина, // а сльозини від споминів, сповнені світла обличчя // найдорожчих тобі, найрідніших тобі — це одна // і єдина на світі причина для того, щоб вічно // залишатися тим, ким ти є, ким створив тебе Бог, // й не ставати рабом — ні епох, ні брехливих історій. // Адже щастя — у тім, щоб останню хвилину на*

двох // розділити, як дім, // як хлібину, // як радість і горе» [1, с. 35]. Надзвичайно проста, практично позбавлена метафор мова даного вірша поєднується з глибиною основної думки, ідеї, з усвідомленням благородної сутності любові. Притаманні українській ліричній свідомості традиційні образи дому та хлібини підсилюють як національне, так і загальнолюдське визначення правди життя, його мети та сутності.

Любов у сучасній філософській лірици осмислюється крізь образ часу, адже вона — це не лише вічність, а і конкретна мить, спалах, момент відчуття гармонії, який подеколи є ледь вловимим. Саме тому, певно, ліричний герой Ю.Покальчука закликає любити прекрасну тимчасовість, в якій існуємо ми, бути вдячними за цей дар, *«любити одну хвилину // Цей час віднайдений у вічності ... Любити призахідне сонце // Пам'ятаючи що воно сяде за обрієм // І виблиск його крізь хмари // Це єдина і вічна мить»* [7, с. 43]. *Отже, усвідомлюючи минущість краси, треба «встигнути подякувати Всевишньому // За те що я живу і люблю»* [7, с. 43]. В його поезії часто звучить мотив самопожертви в ім'я любові, суголосний з творчістю Б. Матіяш. На його думку, егоїстично вимагати від коханої людини любові у відповідь, адже це лише ствердження свого «я». Він закликає цінувати великий дарунок, коли почуття є взаємними, вони порівнюються з рідкісним самоцвітом, «його недооціненість убиває сенс життя» [7, с. 274].

Любов у широкому значенні цього слова — найвища мета, вияв найблагородніших поривів людської душі. Саме в такому контексті постає її образ в сучасній філософській лірици. Специфіка модифікацій образу любові полягає у пошуках нових ракурсів зображення вічної теми.

Література

1. Багряна, А. Замовляння із любові / А. Багряна. — Луцьк: «Твердиня», 2011. — 78 с.
2. Багряна, А. Суцвіття слів / А. Багряна. — К.: Видавничий центр «Просвіта», «ЮАна», 2000. — 90 с.
3. Кіяновська, М. Міфотфорення / М. Кіяновська. — К.: «Смолоскип», 2000. — 104 с.
4. Кримський С. Заклики духовності XXI століття: [З циклу щоріч. пам'ят. лекцій ім. А. Оленської-Петришин] / С. Кримський — К.: Видавничий дім «Києво-Могилянська Академія», 2003. — 32 с.
5. Матіяш, Б. Твої улюблені пси та інші звірі. / Б. Матіяш — Meridian Czernowitz. — Кам'янець-Подільський, ПП Галагодза Р.С., 2012. — 60 с.
6. Метаморфози. 10 українських поетів останніх 10 років / Укл. С. Жадан, післям. В. Небо-рака. — Х.: Книжковий клуб «Клуб сімейного дозвілля», 2011. — 272 с.
7. Покальчук, Ю. Не наступайте на любов… / Ю. Покальчук. — Х.: Фоліо, 2008. — 282 с.
8. Савка, М. Квіти цмину / М. Савка. — Л.: Вид-во Старого Лева, 2006. — 128 с.

Лада Алейнік (Минск)

СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ЮНАЦТВА ЯК СРОДАК САЦЫЯЛІЗАЦЫІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ ВАЛЕРЫЯ ГАПЕЕВА)

Працэс сацыялізацыі асобы — засваення правілаў паводзінаў у грамадстве, псіхалагічных установак, сацыяльных норм, этычных і эстэтычных каш-

тоўнасцей, ведаў і навыкаў — адбываецца на працягу ўсяго жыцця. Нягледзячы на тое, што жыццё — гэта працэс пастаяннай адаптацыі, які бесперапынна патрабуе абнаўленняў і зменаў, сацыялізацыю агульнапрынята падзяляць на два этапы: першасную сацыялізацыю (перыяд ад нараджэння да станаўлення асобы) і другасную (перыяд свядомай персаналізацыі асобы, інтэграцыі ў пэўную сацыяльную групу). Пры гэтым, вызначальным у фармаванні асобы з'яўляецца менавіта першы этап — дзяцінства і падлеткавыя гады, калі закладваюцца асновы светапогляду, маральна-этычных і інтэлектуальных прыярытэтаў.

Першасная сацыялізацыя адбываецца пад уплывам шматлікіх сацыяльных інстытутаў — сям'і, школы, грамадства, равеснікаў, сродкаў масавай інфармацыі і, несумненна, літаратуры. Аднак, у адрозненне ад усіх іншых фактараў уздзеяння, якія ўплываюць на свядомасць асобы нязмушана, натуральна, літаратура патрабуе свядомай інтэлектуальнай дзейнасці індывідуума. Думаецца, найперш гэты факт зніжае актыўнасць і цікавасць падлеткаў да працэсу чытання, да літаратуры. Бо значна прасцей і лягчэй атрымліваць інфармацыю з вуснага камунікавання, з тэлевізійных праграм, якія не вымагаюць мысленчых высілкаў, разумовага напружання і канцэнтрацыі ўвагі.

А між тым, менавіта літаратура адыгрывае важнейшую ролю ў сацыялізацыі асобы, яе аксіялагічным станаўленні. Падлеткавы ўзрост, як вядома, вылучаецца асаблівай складанасцю. У гэты перыяд у юнай асобы ўзнікае адчуванне дарослasці, жаданне абмежаваць сферы свайго жыцця ад кантролю бацькоў і прымаць рашэнні самастойна. Мастацкая літаратура — сюжэты твораў, іх асобныя эпізоды і канфліктныя сітуацыі — здольны дапамагчы падлетку змадэляваць асабістыя паводзіны, вызначыць жыццёвую пазіцыю, прыняць рашэнне ў пэўнай сітуацыі.

Апошняе дзесяцігоддзе XX — пачатак XXI ст. вызначыліся ў беларускай літаратуры пэўнай актывізацыяй у галіне прозы для дзяцей і юнацтва. Увагу чытачоў прыцягнулі аповесці Яўгена Хвалея «Прынцэса тусоўкі» (1990), Андрэя Федарэнкі «Шчарбаты талер» (1999) і «Афганская шкатулка» (2002), Анатоля Казлова «Дзеці ночы» (2000), Людмілы Рублеўскай «Гульня ў Альбарутэнію» (2012) і «Авантуры Пранціша Вырвіча — шкаляра і шпега» (2013), Раісы Баравіковай «Казімір — сын Ягайлы + Насця з 8 «б» = [каханне]» (2008), Алеся Бадака «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» (2008), Алеся Наварыча «Пакланюся Перуну, памалюся Вялесу…» (2008), шматлікія іншыя.

Асаблівым плёнам у распрацоўцы праблем станаўлення асобы вызначылася творчасць празаіка Валерыя Гапеева. У полі зроку пісьменніка — актуальныя пытанні псіхалогіі падлеткаў, тыповыя канфліктныя сітуацыі, стыль паводзінаў і эмацыйных рэакцый, інтымнае жыццё школьнікаў.

У кнігу В. Гапеева «Урокі першага кахання» (2010) ўвайшлі тры аповесці — «Усё цудоўна, або Урок бяспечнага кахання», «Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці» і «Першы боль, або Доказ законаў прыгажосці». Кожны твор прысвечаны асобнаму канфлікту ў жыцці пэўнага падлетка, але героі ўсіх аповесцей з'яўляюцца аднакласнікамі, звязаныя міжасабовымі адносінамі і дзейнічаюць у адным сацыяльным асяродку. Аднак і пасля выхаду кнігі

пісьменнік прадоўжыў мастацкае даследаванне праблем фармавання юнай асобы. Працягам папярэдніх гісторый стала аповесць «Трафік для паэта» («Маладосць», 2011, № 10), у якой разглядаюцца новыя падзеі з жыцця школьнага калектыву і яго асобных прадстаўнікоў. Такім чынам, атрымалася ёмістая тэтралогія, кожная частка якой актуалізуе крызісныя сітуацыі, угрунтаваныя ў працэс сталення і станаўлення асобы, у працэс сацыялізацыі.

Творы В. Гапеева ахопліваюць шырокае кола праблем, уласцівых перыяду пераходнага ўзросту. Гэта ўнутрысямейныя канфлікты, узаемаадносіны вучняў і настаўнікаў, спосабы самасцвярджэння школьнікаў сярод аднагодкаў і інш. Адметна, што асобнай увагі пісьменніка заслугоўваюць праблемы інтымнага жыцця старшакласнікаў — першага кахання, першых эратычных адчуванняў і сексуальнага досведу — тыя праблемы, якія да нядаўняга часу былі табуяванымі ў літаратуры, разглядаліся ў сферы рамантычнага, а не псіха-аналітычнага.

Відавочна, што В. Гапееў падступаўся да мастацкага ўвасаблення гэтых праблем спакваля і асцярожна. У аповесці «Усё цудоўна, або Урок бяспечнага кахання» (першай з тэтралогіі) закранаюцца яшчэ толькі ўскосныя пытанні, датычныя інтымных адносінаў старшакласнікаў. Канфлікт твора бярэ пачатак ад школьнага мерапрыемства — «Дня прафілактыкі СНІДу», на якім урач-гінеколаг вядзе з дзесяцікласнікамі гаворку аб неабходнасці карыстання сродкамі кантрацэпцыі. Вонкавая рэакцыя падлеткаў, якія бянтэжацца, саромеюцца і адчуваюць няёмкасць, адпавядае іх узросту — яны смяюцца, ёрнічаюць, абменьваюцца між сабой двухсэнсоўнымі жартамі. Але насамрэч яны, несумненна, адчуваюць сябе прыніжанымі. І ў некаторых з іх, натуральна, абуджаецца дух супраціву, абуджаецца дзёрзкае жаданне ўзаемна збянтэжыць дарослых, даць ім адчуць тое самае, што адчуваюць школьнікі. «*Ларыса Уладзіміраўна! Вы так пераканаўча нам расказалі, што прэзерватыў з'яўляецца самым надзейным сродкам ад ВІЧ-інфекцыі… Дзякуй. І раней даводзілася аб гэтым чытаць і чуць, — пачаў Юрка, а ў зале імгненна насцярожыліся, бо ведалі ў школе Юрку добра — з-за яго прынцыповасці… Прэзерватыў — сродак прафілактычны, можна ў аптэцы купіць, можна ў шапіку якім, у гастраноме… Я вось не купляў, не карыстаўся, то Вы мне патлумачце: прэзерватыў — гэта таблетка такая? Перад ядой яе піць ці пасля? Заварваць кіпнем ці на гарэлцы настойваць? Можа, гэта гатовае націранне? Як гэты сродак прымяняць?*» [3, с. 6–7]. Відавочна, што навязлівыя і недастаткова карэктныя спробы школьных педагогаў пагаварыць з вучнямі на тэму полавага выхавання дасягаюць фактычна адваротнай мэты — старшакласнікі адпрэчваюць дарослых, цынічна высмейваюць, дэманстратыўна імкнуцца дыстанцыявацца ад падобных размоў.

Бацькі, якія непакояцца за сваіх дзяцей і ўсведамляюць небяспеку пераходнага ўзросту, гэтаксама пачынаюць выяўляць раптоўную цікавасць да іх інтымнага жыцця. Як вядома, далёка не ва ўсіх сем'ях існуюць давер і паразуменне паміж бацькамі і дзецьмі, далёка не ўсе дарослыя здольны быць стрыманымі і тактоўнымі. Іх рэакцыі часцяком наўпрост руйнуюць адносіны з дзецьмі. Напрыклад, маці знаходзіць у сумачцы дачкі «сродак кантрацэпцыі»,

які ў якасці жарта дзяўчыне падкінуў аднакласнік. «*— Ах ты дрэнь! — прасіпела маці такім голасам, што ў Тані ўсё абарвалася ўнутры. …*

— Я так і ведала, — выдыхнула маці, як вынесла прысуд і, імгненна размахнуўшыся, ударыла рукой з зацiснутым бліскучым белым пакецікам у твар Тані» [3, с. 12]. Альбо яшчэ адна бацькоўская рэакцыя, якая балюча раніць падлетка. Школьнік тлумачыць сябру: «*Нехта пабачыў, як мяне і Таню брат падвозіў сюды. І вось маці ўжо тэлефануе ў роспачы: ёй наказалі, што быццам мы запіхнулі беднае дзяўчо ў машыну, рот ёй закрыўшы, і павезлі гвалтаваць! Ведае мяне 16 гадоў — але гатова тут жа паверыць, што я здольны на любую дрэнь*» [3, с. 32].

Натуральна, агрэсіўны ўціск з боку бацькоў і педагогаў крыўдзіць і зневажае падлеткаў, правакуе іх на супрацьстаянне дарослым і ўрэшце прыводзіць да адкрытага высвятлення адносінаў: вучні шчыра выказваюць свае крыўды настаўнікам і бацькам, дарослыя вытлумачваюць дзецям матывы сваіх дзеянняў. Гісторыя мае аптымістычны фінал — абодва бакі дасягаюць паразумення.

Няма сумневу, што аповесць «Усё цудоўна, або Урок бяспечнага кахання», дзе адлюстравана дастаткова тыповая для старшакласнікаў канфліктная сітуацыя, апелюе да асабістых рэфлексій чытачоў, да іх маральнай свядомасці, дазваляе асэнсаваць падзеі і гіпатэтычна змадэляваць індывідуальны стыль паводзінаў у падобных умовах. Але вастрыня канфлікту ў творы часткова нівелюецца яго «калектыўным характарам» і, адпаведна, калектыўным вырашэннем.

Верагодна, гэта аповесць выконвае ролю своеасаблівых «уводзінаў» у тэтралогію — аўтар знаёміць з героямі, якія будуць дзейнічаць у наступных частках твора, з умовамі і агульным ладам іх жыцця, з іх бацькамі і настаўнікамі. І менавіта па гэтай прычыне В. Гапееў разглядае ў творы супярэчнасці агульнага характару. У наступных аповесцях увага аўтара канцэнтруецца пераважна на асабістых праблемах старшакласнікаў, на іх індывідуальным жыцці, але, безумоўна, ва ўзаемасувязях і шматлікіх стасунках з грамадствам. Бо менавіта паводзіны чалавека ў грамадстве, яго сацыяльныя сувязі асабліва выразна вызначаюць індывідуальнасць асобы. Паводле А. Эткінда, «індывідуальнасць не дадзена чалавеку ад прыроды, а фарміруецца ім самім у працэсе выканання шматлікіх сацыяльных роляў ўнутры розных чалавечых супольнасцей — бацькоўскай сям'і, кампаніі аднагодкаў, уласнай сям'і, вытворчага калектыву, тых сацыяльных груп (нацыі, партыі, грамадства, чалавецтва), каштоўнасці якіх індывід падзяляе і сцвярджае ва ўласнай актыўнасці» [4, с. 108].

Думаецца, В. Гапееў свядома адлюстроўвае ў кожным творы іншыя псіхатыпы падлеткаў. Нягледзячы на тое, што яго героі — аднагодкі і аднакласнікі, яны кардынальна адрозніваюцца і паводле псіхалагічных характарыстык, і паводле ўзроўню інтэлектуальнага развіцця, сацыяльнага жыцця, звычак, маральных каштоўнасцей. В. Гапееў, несумненна, дэманструе, што ўзроставыя праблемы не абмінаюць нікога, не залежна ні ад выхавання, ні ад агульнай развітасці, ні ад ступені самастойнасці.

Так, напрыклад, герой аповесці «Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці» — інтраверт, закамплексаваны падлетак, які амаль ні з кім не сяброуе, у класе трымаецца адасоблена, адпрэчвае нават увагу ўласнай маці, камфортна пачуваецца толькі «сам-насам з камп'ютэрам»: «*Тут, на гэтым форуме праграмістаў, Лёшка адно і адчуваў сябе вольна і спакойна. Яшчэ як толькі пачаў займацца праграміраваннем, адшукаў гэты рэсурс. Добрая ў іх тут кампанія. Адны хлопцы, ніякіх лішніх размоў*» [3, с. 68]. Але фактычна не маючы сяброўскіх стасункаў з аднагодкамі, падлетак, тым не менш, не пазбягае іх умяшальніцтва ў яго жыццё — ён робіцца ахвярай ненаўмыснага «віртуальнага падману», перажывае вострый крызіс, канчаткова страчвае давер да людзей.

Герой аповесці «Трафік для паэта» — рамантычны юнак, не пазбаўлены творчых амбіцый. У адрозненне ад галоўнага персанажа папярэдняга твора, у яго выдатныя адносіны з аднакласнікамі, з бацькамі. Аднак падлетак сутыкаецца з праблемай, якую яму ніхто не можа дапамагчы вырашыць: дзеля таго, каб выдаць кніжку вершаў, неабходна даволі вялікая сума грошай. Хлопец пачынае шукаць магчымасцяў заробку ў Інтэрнеце і змушаны, у рэшце рэшт, пераступіць праз пэўныя этычныя прынцыпы — ён пачынае здымаць на відэакамеру «падглядванні» за незнаёмымі людзьмі і размяшчаць гэтыя ролікі ў сеціве. Жыццё падлетка кардынальна змяняецца — яму даводзіцца вытрымліваць сапраўдную канспірацыю, каб не быць выкрытым ні бацькамі, ні сябрамі, ні самімі героямі відэаролікаў. Зароблены грошы не прыносяць яму маральнага задавальнення. Сумленне вярэдзіць: «*Мяжу пераступіў, закон, па той бок маралі апынуўся... Дык жа часова гэта… … Паўтара месяца, усяго паўтара месяца, ён упэўнены — і ў яго будзе патрэбная сума. І ўсё потым знікне, сатрэцца, забудзецца. … Нічога, мала пацярпець засталося. Яшчэ ролікаў дзесяць здыме і хопіць...*» [2, с. 64]. Але наступствы крамольнага бізнесу не прымусілі сябе доўга чакаць — старшакласнік робіцца аб'ектам шантажавання, і яго жыццё ператвараецца ў суцэльнае пекла.

Амаль што ідэальным выглядае жыццё гераіні аповесці «Першы боль, або Доказ законаў прыгажосці». Кацярына — самастойная і адказная дзяўчына, яна паспяхова вучыцца ў школе, карыстаецца аўтарытэтам сярод аднакласнікаў, у яе выключна даверлівыя адносіны з маці. Але дзяўчына дасягае таго перыяду, калі пачынае адчуваць сябе жанчынай. Яна закахалася ў аднакласніка, які адказвае ёй узаемнасцю. Аднак фізіялагічная акселерацыя, як падкрэслівае аўтар твора, не выключае інфантыльнасці, псіхалагічнай няспеласці. Вопыт фізічнай блізкасці вельмі па-рознаму ўспрымаецца дзяўчынай і юнаком. Для Кацярыны гэта пацвярджэнне сур'ёзнасці іх адносінаў. У яе каханага думкі іншага кшталту: «*А раптам Кацярына расхваліцца ўсім дзяўчатам, што ў яе быў секс з Юрыем? І якім яна намалюе яго? Нявопытным хлопчыкам? Ён прыйдзе ў клас — а з яго будуць адкрыта смяяцца. Ці ён можа прыйсці і ўбачыць за сваёй партай побач не Віктара, а яе. А што — яна ж нібыта мае на яго права… Пачне паказваць перад усімі, што яны каханкі… Калі яна прыйдзе заўтра і паслязаўтра да яго і пачне шантажыраваць? Возьме і*

зацяжарыць? І што тады рабіць? ... Не, калі ў яе ўзніклі якія ілюзіі, трэба іх развеяць. І заадно папярэдзіць, калі раптам у яе якія планы…» [3, с. 185].

Хлопец панічна баіцца адказнасці і па-хуткаму пачынае «выпраўляць памылку» — ён піша на мабільнік Кацярыне СМСку: «*Каця, мы дарослыя людзі, мы атрымалі цудоўны ўрок. Не будзем пра пачуцці… … Цвёрда дамовімся: што было, тое прайшло. І быццам не было. Упэўнены, ты хочаш таго ж. Ніякіх наступстваў. Калі што — не ўмешвай мяне*» [3, с. 187]. Натуральна, гэта лаканічнае паведамленне робіцца для дзяўчыны асабістай драмай, руйнуе яе рамантычныя ўяўленні аб каханні.

Такім чынам, сюжэты твораў В. Гапеева дэманструюць даволі распаўсюджаныя ў сучасным асяродку падлеткаў сітуацыі. Безумоўна, падобныя гісторыі нярэдка робяцца сюжэтамі мастацкіх фільмаў і публікацый у перыёдыцы, абмяркоўваюцца педагогамі і вучнямі на спецыяльных тэматычных занятках. Аднак літаратурныя гісторыі, іх ідэі і сэнсы, увасобленыя ў мастацкіх вобразах, здольны нашмат глыбей закрануць свядомасць чытача, чым дыдактычныя тэзы і выхаваўчыя гутаркі, літаратура ўплывае на асобу непараўнальна эфектыўней.

Выключнае значэнне мастацкай літаратуры ў працэсе выхавання і сацыялізацыі сцвярджае культурна-гістарычная канцэпцыя Л. С. Выготскага. Паводле гэтай канцэпцыі, літаратуру і яе змест правамерна разглядаць як носьбітаў ідэальнай формы псіхікі, якая засвойваецца і суб’ектывізуецца ў працэсе індывідуальнага развіцця — гэта значыць робіцца рэальнай формай псіхікі і свядомасці індывіда [1]. Інакш кажучы, працэс чытання мастацкай літаратуры — гэта дзейнасць, накіраваная на ператварэнне закадзіраванага аўтарам у тэксце сацыякультурнага вопыту ў асабісты вопыт чытача, што мае асабліва вялікае значэнне ў перыяд станаўлення асобы, на адным з галоўных этапаў яе сацыялізацыі.

Літаратура

1. Выготский, Л. С. Психология искусства / Л. С. Выготский. — Ростов на/Д.: Феникс, 1998. — 487 с.
2. Гапееў, В. Трафік для паэта / В. Гапееў // Маладосць. — 2011. — № 10. — С. 22 — 78.
3. Гапееў, В. Урокі першага кахання / В. Гапееў. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2010. — 192 с.
4. Эткинд, А. Индивидуализм, личность / А. Эткинд // 50/50: Опыт словаря нового мышления / Под общ. ред. М. Ферро и Ю. Афанасьева. — Москва: Прогресс, 1989. — 560 с.

Вячаслаў Караткевіч (Магілёў)

СПЕЦЫФІКА ВОБРАЗНАЙ СІСТЭМЫ ДРАМАТУРГІЧНЫХ ТВОРАЎ ПЯТРА ВАСЮЧЭНКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ЗБОРНІКА «МАЛЕНЬКІ ЗБРАЯНОСЕЦ»)

Сучасная беларуская літаратурная казка мае шэраг спецыфічных асаблівасцей. Яна бярэ свой пачатак з вуснай народнай творчасці і з мастацкіх традыцый папярэдніх перыядаў развіцця літаратуры, прычым не толькі беларускай. Сучасная казка ўтрымлівае ў сабе цікавы сінтэз тэм, ідэй, матываў, асэнсаванне якіх адбываецца праз вобразную сістэму тэкстаў.

У кантэксце гэтых высноў цікавым уяўляецца аналіз канкрэтных прыкладаў казачных драматургічных твораў з мэтай выяўлення іх сэнсавай глыбіні, дыдактычнага і развіваючага патэнцыялу з улікам таго факта, што гутарка ідзе пра творы, прызначаныя для ўспрымання дзецьмі.

У рэчышчы нашага даследавання паказальнымі з'яўляюцца п'есы-казкі Пятра Васючэнкі, змешчаныя ў зборніку «Маленькі збраяносец» (1999), які ўключае ў сябе 5 розных па форме твораў: дэтэктыў («Навагодні дэтэктыў»), казка з элементамі трылера («Страшнік Гам»), рыцарскія падарожжы («Маленькі збраяносец»), рэмэйк народнай казкі («Новы калабок»), прытча («Каляровая затока»).

Ва ўсіх названых творах, за выключэннем «Маленькага збраяносца», персанажамі з'яўляюцца жывёлы — воўк, ліса, заяц, карова, баран. Праз іх наладжваецца своеасаблівы дыялог дарослага і дзіцяці, якому прапануецца паглядзець на свет «збоку»: вачыма нявопытнага Шчупачка («Каляровая затока»), смелага і бескарыслівага Пеўня («Страшнік Гам»), хітрай Лісы Мэры («Навагодні дэтэктыў») і г. д. У гэтым відавочны фальклорны ўплыў. Як і народная казка, аўтарскі твор такім чынам дае магчымасць дзіцяці набыць сацыяльны вопыт, вучыць заўважаць розныя рысы характару, а таксама выяўляць станоўчыя і адмоўныя бакі розных жыццёвых пазіцый. Напрыклад, страх за ўласнае жыццё і нежаданне дапамагчы бліжняму прыводзяць да таго, што амаль усіх жывёл — персанажаў твора — з'ядае Страшнік Гам.

Пры гэтым назіраецца імкненне драматурга максімальна «асучасніць» казкі, каб надаць ім дадатковыя сэнсы. Паказальнай у гэтых адносінах з'яўляецца казка «Навагодні дэтэктыў», дзе расказваецца пра супрацьстаянне добрай фірмы «Навагоднія паслугі» і бандыцкай групоўкі «Лясны рэкет». Тут згадваюцца і «дарослыя» праблемы, якія, на наш погляд, будуць не зусім зразумелыя дзецям, гэта своеасаблівыя «намёкі» для прыцягнення ўвагі «недзяцей». Напрыклад, рэкламныя слоганы, касметыка «Лямонці», фільмы з удзелам Шварцэнэгера, урокі аэробікі Наталлі Наважылавай і г.д. абцяжарваюць сэнсавае напаўненне казкі і ператвараюць яе ў своеасаблівы мастацкі помнік свайму часу.

Асаблівае значэнне ў працэсе «асучаснівання» мастацкага твора займае асэнсаванне эстэтычных праблем, што прама выяўляецца, напрыклад, у спрэчцы Вядучага і Шэрага і адлюстроўвае эстэтычныя патрэбы сучасных дзяцей:

Вядучы. *Мы ім казку хацелі паказаць навагоднюю. Пра мядзведзя, зайца, лісу, ваўка, Дзеда Мароза і Снягурачку. Ды вось Дзед Мароз нечага падвёў.*

Шэры. *Ясна. Стаяць. Маўчаць. Ніякіх снягурачак. Ніякіх марозаў і казак. Гэта несучасна. Сучасныя дзеці не любяць казак. Яны любяць дэтэктывы, баявікі і ж-ж-жах!.. Ясна? …*

Вядучы. *Але, шаноўны Шэры…*

Шэры. *Ніякіх «але». Я сказаў: дэтэктыў. Са стрэламі, выбухамі і, можа быць… (Робіць рух, намякаючы на забойства)* [2, с. 60].

Праблемы неўладкаванасці пенсіянераў («Дзед Мароз. *Сорам, мая Мілая, — гэта калі пенсіянеры галадаюць*» [2, с. 66]), адначасовага недаверу да

нацыянальнай валюты і дэманізацыі іншаземнага («Бос. (да Дзеда Мароза. — *В. К.*) *Не прыкідвайся. Твой выкуп будзе каштаваць адзін мільён даляраў. Ясна?* Дзед Мароз. *Ды ты што, сынок? Наша фірма не за даляры працуе. ... Бяры хіба што «зайчыкамі»*. Шэры. *«Зайчыкі» нам не трэба*» [2, с. 69]) і іншыя выглядаюць штучна навязанымі дзіцячай свядомасці, бо не будуць засвоены, асабліва ў кантэксце святочнай казкі. Новая «калектыўная мараль», якая дыктуе змену парадыгмы этычных і эстэтычных каштоўнасцяў у дзіцячай літаратуры, імкненне ўсё «асучасніць» прыводзяць да размывання традыцыйнай сістэмы маральных каштоўнасцяў і абсурдызацыі рэчаіснасці: пісталет у руках Снягурачкі, жарты Дзеда Мароза пра алкаголь («Снягурачка. *Салодкім не злоўжывай. «Фантай» таксама. Запомніў?* Дзед Мароз. *Значыцца гэта… Салодкім не захапляйся… А гэтым… горкім?»* [2, с. 62]).

У меншай ступені працэс «асучаснівання» вобразаў адбываецца ў казцы «Каляровая затока». У цэнтры ўвагі праблема захавання чысціні навакольнага асяроддзя, якая раскрываецца праз адлюстраванне жыцця ў забруджанай затоцы. Вобразная сістэма гэтага твора грунтуецца на слабым (у адрозненні ад усіх іншых казак зборніка) супрацьпастаўленні персанажаў — Вадзянога Клапа і Хахулі. Гэта два лідэры, якія здольныя пераконваць і весці за сабой. Яны не маюць іншых спосабаў уздзеяння на тых, хто побач, акрамя красамоўства і дэманстрацыі ўласнага досведу. Пры гэтым Клоп выглядае занадта рацыянальным, хітрым, здольным на падман. Да яго далучаецца і старая Шчупачыха, якая праз словы Клапа ўбачыла пагрозу для свайго жыцця і жыцця Шчупачка, а таксама Чарвяк, які з'яўляецца прынадай і спрытна выконваю гэтую ролю з дапамогай Клапа.

У характэрнай для «светлых»* тэкстаў манеры падман пафасна выкрываецца, а Хахуля нечакана для Клапа і старой Шчупачыхі шчасліва пазбягае смерці, хоць і пападае спачатку да рыбакоў, а потым да вучонага-заолага. Клоп тут выглядае занадта падазроным, агрэсіўным і жорсткім. Ён гатовы ахвяраваць жыццём іншых (Хахулі, Шчупачка), крыўдзіць Слімака, расказвае Шчупачку страшныя казкі («Клоп. *...Клоп прывык* (піць забруджаную ваду. — *В. К.*)*, а людзі — не. Вось і пазнікалі памалу. А перад тым, як знікнуць, самі сябе ў «Чырвоную кнігу» запісалі.Чуеш? Разам з бабрамі, хахулямі, горнымі казламі і кондарамі апынуліся ў «Чырвонай кнізе». Ха-ха-ха! Ну што? Вясёлая казка?»* [2, с. 44]), каб захаваць брудную затоку і не даць іншым знайсці чыстую ваду. Пры гэтым ён здольны і на маральныя здзекі, расказваючы малому, што людзі могуць зрабіць з Хахулі чучала. Вадзяны Клоп бачыць ва ўсіх ворагаў, якія хочуць яго пакрыўдзіць і сумняваюцца ў праўдзівасці яго слоў.

Іншай выглядае Хахуля — рэдкі звярок, занесены ў «Чырвоную кнігу». Гэта асоба высакародная, яе дзеянні і ўчынкі дыктуюцца добрымі памкненнямі выратаваць жыхароў каляровай затокі і дапамагчы ім знайсці чыстую ваду. Пры

*Гл. псіхалагічную тыпалогію мастацкіх тэкстаў у адпаведнасці з эмацыйна-сэнсавай дамінантай, прапанаванай В. П. Бяляніным, дзе вылучаюцца «светлыя» тэксты з параняльнай акцэнтуацыяй, «цёмныя» — з эпілептоіднай, «вясёлыя» — з гіпаманіякальнай, «сумныя» — з дэпрэсіўнай, «прыгожыя» — з істэроіднай, «складаныя» — з шызоіднай [1, с. 54].

гэтым, аўтар не імкнецца ідэалізаваць Хахулю. Яе даверлівасць і наіўнасць ледзь не прыводзяць да смерці. У дадзеным выпадку своеасаблівая «часовая смерць» Хахулі мае характар ініцыяцыі: яна двойчы вучыцца, набывае сацыяльны вопыт, на вачах сталее. Па сутнасці трэцяя яе сустрэча з людзьмі, а да гэтага было разбурэнне нары і вылоўліванне на прынаду, калі Хахуля ўкусіла рыбака за палец, умацавала яе веру ў тым, што дабрыня ёсць на свеце. Тым не менш, яна здольная згуртаваць вакол сябе іншых. На яе бок пераходзяць баязлівец Слімак і маленькі ідэаліст Шчупачок. Сэнс жыцця Хахулі — дапамагчы іншым.

У гэтым жа заключаецца і сэнс жыцця Пеўня з казкі «Страшнік Гам». Пры гэтым назіраецца істотная розніца паміж Хахуляй і Пеўнем. Першая змагаецца з роўным сабе (супраціўленне з боку адмоўных вобразаў, як адзначалася вышэй, аслаблена), а Певень змагаецца са значна большым па памерах Страшнікам Гамам ва ўмовах рэальнай пагрозы жыццю (ужо былі з'едзены Сабака, Кот, Баран, Карова). Значэнне Пеўня не ў тым, каб пераканаць у фальшывасці ідэалаў іншых, а каб фізічна знішчыць зло. Звернем увагу, што мастацкі час у гэтай казцы нераўнамерны. У экспазіцыі ён працяглы, але бліжэй да кульмінацыі і развязкі паскараецца, што служыць для нагнятання абстаноўкі і стварэння злавеснай карцінкі, што характэрна для «цёмнага» тэксту. Усе вобразы маюць сэнсорныя маркеры (Карова мукае, яна вялікая, Баран бэкае, мае характэрную прычоску, якой надта ганарыцца, Певень сваімі спевамі будзіць сонейка, Страшнік Гам становіцца ўсё большым, калі з'ядае чарговую ахвяру і г. д.).

Заўважым, што ў казцы «Страшнік Гам» назіраецца барацьба паміж абсалютна палярнымі асобамі. Певень самы маленькі і не мае ніякіх выключных здольнасцяў, акрамя жадання спяваць і будзіць людзей, каб доўга не спалі:

Карова *(да Пеўня). Яйкі несці ўмееш?*

Певень. *Якія яйкі? Я ж Певень, а не кура. Я спяваць умею.* [2, с. 13].

Пры гэтым назіраецца пыхлівасць і ганарлівасць Пеўня, што ўяўляецца своеасаблівым псіхалагічным комплексам, імкненнем даказаць, што ён не з горшых, што ён можа абараніць сваю годнасць:

Певень. *Я з сонейкам сябрую. Раніцай яго буджу.*

Кот. *Само прачнецца.*

Певень. *А раптам не прачнецца?*

Сабака. *Хопіць нас палохаць. Мы — смелыя. А ты пайшоў прэч, дармаед. Гаў! Гаў!*

Певень. *Ну, што ж. Тут лес, дрэвы. Знайду сабе дупло і буду жыць у ім, як дзяцел. Бывайце, гаспадары. Глядзіце, не пашкадуйце* [2, с. 13].

Пеўню супрацьпастаўлены Страшнік Гам. Гэта міфічная істота — «пачвара цёмнага лесу». Ён паядае спачатку звяроў, якія яго баяцца, а потым і месяц ды зоркі. Гам адчувае сваю беспакаранасць, ён не ўспрымае Пеўня як роўнага сабе змагара і памыляецца. Разбуджанае спевам Сонца знішчае Страшніка і выратоўвае ўсіх. Пры гэтым назіраецца хуткая змена эмацыйнага стану Гама: ад насмешлівасці і бравады да прыніжэння.

Карова, Баран, Кот і Сабака выконваюць у казцы хутчэй дапаможную ролю. Яны служаць для дзяцей прыкладам правільных учынкаў паступаць: трэба дапамагаць адзін другому і не трэба баяцца.

Падобныя ж функцыі выконваюць Дзед, Баба, Свіння, Заяц, Вожык, Воўк, Ліса ў казцы «Новы калабок». Толькі тут яны ўзмацняюць цікавасць рэцыпіентаў да таямніцы: што знаходзіцца ўнутры Калабка. Вобраз жа апошняга становіцца абсурдным. Такі эфект дасягаецца праз неадпаведнасць чакаемага і атрымліваемага. Свой сакрэт, а гэта унутраная душэўнасць, Калабок адкрывае ў фінале твора:

Усе *(абступаюць Калабка). Ну, дык што ў цябе ўнутры?…*

Калабок. *Што ў мяне ўнутры? Душа ў мяне ўнутры, вось што! Яна ў мяне такая мяккая, трапяткая… Я вас усіх так люблю! Дык, можа, і вы палюбіце мяне… хаця б трошкі?»* [2, с. 129].

«Новы калабок» набліжаецца да «вясёлых» тэкстаў, дзе вядучым з’яўляецца маторны вобраз, які ўвесь час знаходзіцца ў стане ўзбуджэння, хутка перамяшчаецца, ніколі не губляе пачуццё аптымізму, любіць спяваць і імкнецца стаць у цэнтр увагі. Усе гэтыя характарыстыкі могуць быць аднесены да Калабка. Гэты вобраз становіцца сэнсаўтвараючым у казцы, семантычная нагрузка твора скіроўваецца ў бок усведамлення, што такое жывая істота, што ёсць сусветная любоў[*]. Такім чынам адбываецца напаўненне казкі філасофіяй і псіхалагічным аналізам (хай сабе і на прымітыўным узроўні!) матываў паводзін пэўных персанажаў.

Самая разгалінаваная вобразная сістэма прадстаўлена ў казцы «Маленькі збраяносец». Бок зла тут дваісты: Тарантул, які хоча захапіць Краіну Сланечнікаў і рыцар Дармедонт. Бок дабра таксама неаднародны: прынцэса Злата (Зоська), Андрусь. Звернем увагу, што ў казцы мы бачым працэсы пераўтварэнняў і развіцця асобы: бацька, старэйшы і малодшы браты Андруся, перавыхоўваюцца, як і Тарантул, які спачатку выглядае жорсткім і нават крыважэрным.

У характэрнай для «прыгожых» тэкстаў манеры пры характарыстыцы пэўных вобразаў шмат увагі надаецца знешнасці. Злата аказваецца не такой прыгажуняй, якой яе малявалі на партрэтах, Андрусь знешне непрыкметны, але яго эмоцыі выдае выгляд твару. Пры гэтым неаднаразова падкрэсліваецца першаснасць унутранай прыгажосці і псіхалагічнай матываванасці дзеянняў і ўчынкаў герояў. Таксама ў п’есе назіраецца хуткая змена эмацыйнага фону, які тлумачыцца не толькі знешнімі фактарамі, але і ўнутраным станам. Нярэдка героі дадумваюць, што могуць адчуваць іншыя (фрэйліна бачыць па твары Андруся яго закаханасць, Злата не бачыць шчырасці ў словах Дармедонта). Пры гэтым думкі саміх персанажаў дастаткова размыты, што тлумачыцца дваістасцю асобы (характэрная рыса «складаных» тэкстаў): за знешняй недаступнасцю прынцэсы Златы хаваецца звычайная дзяўчына Зоська, фрэйліна

[*]Тут адбываецца істотнае сэнсавае адхіленне ў параўнанні з народнай казкай «Калабок», дзе рэцыпіент знаёміцца з такой рысай характару, як хітрасць. У народнай казцы адсутнічаюць маральныя крытэрыі гэтай рысы характару, і тым не менш, у дзяцей, як правіла, не ствараецца ўражання ненатуральнасці фіналу казкі (паяданне Калабка).

Марселіна не можа знішчыць сваёй простай сутнасці сялянкі Марцэліны, Тарантул аказаўся добрым ткачом, а за знешняй адвагай Дармедонта хаваўся падманшчык і скнара.

Такім чынам, у зборніку П. Васючэнкі «Маленькі збраяносец» назіраецца істотная функцыянальная змена вобразнай сістэмы ў параўнанні з фальклорнымі казкамі. Калі ў народнай казцы жывёлы знаёмяць дзяцей з пэўнымі рысамі характару асобы, то ў прааналізаваных літаратурных казках падаюцца своеасаблівыя псіхалагічныя партрэты, за якімі стаяць сапраўдныя чалавечыя тыпы. Пісьменнік цікавіцца не столькі функцыянальнай прыналежнасцю, колькі ўнутраным «Я» таго або іншага вобраза, адчуваецца зацікаўленасць у адлюстраванні ўнутранага свету асобы, хай сабе і казачнай. Назіраюцца памкненні паказаць псіхалагічнае развіццё вобраза (Хахуля, Андрусь).

Разам з тым, прааналізаваныя сістэмы вобразаў уяўляюцца своеасаблівай матрыцай традыцыйнай іерархіі маральна-этычных каштоўнасцяў. Нягледзячы на памкненні выкарыстаць модныя стратэгіі «асучаснівання» твораў для дзяцей, драматург не пераходзіць межы дазволенага ў спецыфічнай дзіцячай літаратуры. Стварэнне новага казачнага свету праз выкарыстанне гатовых фальклорных вобразаў у незвычайных сітуацыях дае магчымасць прыцягнуць увагу рэцыпіента да надзённых і важных праблем, аблегчыць разуменне семантычнай напоўненасці мастацкага твора.

Мастацкі свет казак П. Васючэнкі ўяўляе сабой асобую мадэль асэнсавання рэчаіснасці, прадстаўленую з розных ідэйных і эстэтычных пазіцый. Выяўленне ж пэўных асаблівасцяў вобразнай сістэмы пры дапамозе псіхалагічных і псіхіятрычных падыходаў можа стаць падмуркам для выяўлення важных патэнцыялаў мастацкіх твораў у кантэксце ўспрымання п’есы рэцыпіентамі рознага ўзросту і выяўлення магчымага ўздзеяння твора на фарміраванне свядомасці, характару дзіцяці.

Літаратура

1. Белянин, В. П. Психологическое литературоведение. Текст как отражение внутренних миров автора и читателя: монография / В. П. Белянин. — М.: Генезис, 2006. — 320 с.
2. Васючэнка, П. В. Маленькі збраяносец: зб. п’ес для драм. і лялеч. калектываў / П. В. Васючэнка. — Мінск: БелІПК, 1999. — 132 с.

Соф’я Марозава (Мінск)

САКРАЛІЗАЦЫЯ ВЫЯВЫ ЯК АСАБЛІВАСЦЬ ЭКФРАСІСА Ў АПОВЕСЦІ ВІКТАРА КАРАМАЗАВА «БРАМА»

Зварот Віктара Карамазава да мастакоўскай тэматыкі ў апошнія два дзесяцігоддзі выявіў адметную грань таленту пісьменніка. За гэты час пабачылі свет 5 аповесцей, 4 эсэ, дзённік, раман, шэраг навел і папулярных артыкулаў. У гэтых творах назіраецца як эвалюцыя пісьменніка (ад аповесці-эсэ «Крыж на зямлі і поўня ў небе» да рамана «Мастак і парабкі»), так і пэўная цэльнасць, што забяспечваецца адзінствам стылю і наяўнасцю аўтарскай канцэпцыі мастака і мастацтва. Апошняя паслядоўна прасочваецца ва ўсіх творах азнача-

най тэматыкі і ўключае ў сябе шэраг складнікаў: асабісты мастацкі густ пісьменніка (у адпаведнасці з якім адбываецца падбор матэрыялу для твораў і яго ацэнка); асаблівасці трактоўкі спадчыны таго ці іншага мастака; сістэму каштоўнасцей (аўтарская і герояў); уяўленне пра ролю мастацтва ў грамадстве і ў лёсе творцы, якое вынікае з ідэйнага і вобразнага ўзроўняў твора. У дадзенай працы мы спынімся на такой асаблівасці карамазаўскай канцэпцыі мастака і мастацтва, як сакралізацыя выявы ў экфрасісе, і разгледзім яе на прыкладзе аповесці «Брама».

Экфрасіс — гэта слоўная рэпрэзентацыя твора выяўленчага мастацтва ў літаратуры, распаўсюджаны элемент паэтыкі літаратурных твораў на мастакоўскую тэму. Як мікратэкст і як асобны жанр экфрасіс узнік яшчэ ў Антычнасці [1, с. 259–260], першымі ж прыкладамі экфрасіса на ўсходнеславянскіх землях былі апісанні сакральных выяў, прадметаў, пабудоў Святой зямлі ў сярэднявечным жанры хаджэння. Менавіта з гэтай акалічнасцю даследчыкі звязваюць тэндэнцыю да сакралізацыі выявы ў экфрасісе, што назіраецца ў славянскіх літаратурах, прычым у дачыненні як да рэлігійных выяў, так і да свецкіх [6, с. 2–3; 2, с. 156].

У творах Віктара Карамазава ідэя сакральнасці мастацтва найбольш яскрава рэалізуецца ў аповесці «Брама», у вобразе іканастаса. Ён з’яўляецца структураўтваральным для аднайменнай главы, абумоўлівае яе мастацкія асаблівасці і хранатоп. Сакралізацыя выяў тут дасягаецца пры дапамозе іх суаднясення з іканапіснай традыцыяй. Вобраз іканастаса ўключаны ў сістэму хрысціянскіх алюзій, што пранізваюць усю аповесць «Брама» і ў значнай ступені абумоўлены асобай мастака Г. Вашчанкі, прататыпа галоўнага героя, і вобразнай сістэмай яго жывапісу.

Іканастасам уяўляецца апавядальніку сцяна ў майстэрні мастака Гаўрыла Вашчанкі, якая шчыльна, «рама да рамы», запоўнена карцінамі — і «ў кожнай выява, калі не чалавека, дык хвоі, дуба, крыжа, дарогі, печы, буслінага гнязда, і ўсюды, у кожнай раме, дух чысціні і святасці...» [4, с. 16]. Вобраз з’яўляецца зводным экфрасісам, у які аб’яднаны шэраг неатрыбутаваных (назвы карцін не згадваюцца) экфрасісаў. Пры дапамозе вобраза іканастаса аўтар аднаўляе архетыпы, значныя для духоўнай гісторыі мастака (дрэва, крыж, дарога, печ…); тут збіраюцца выявы найбольш блізкіх людзей — прадзед Пампей, бабуля Сынклета, маці, сястра. Неад’емным атрыбутам святасці выявы ў вобразнай сістэме Карамазава з’яўляецца залатая рама (метафізічныя якасці залатога колеру — адна з асноў іканапісу, асэнсаваная хрысціянскім філосафам П. Флярэнскім [10, с. 140−143]). Невыпадковасць, сімвалічная значнасць дэталі падкрэсліваецца яе паўторным выкарыстаннем у аповесці. Так, напрыклад, алюзія на «іканастас» уводзіцца ва ўяўны экфрасіс: у момант задумення мастака апаноўвае мроя — «шмат дубоў і хвояў, буслоў і ластавак, усялякіх кветак. Усё ў залатых рамах» [4, с. 94].

Варта адзначыць, што ў экфрасісе «іканастаса» гаворка ідзе часцей не пра саму выяву, а пра тое, *што* выяўлена. Аўтар асэнсоўвае напісаныя мастаком рэаліі як канстанты, філасофскія асновы жыцця, пэўныя архетыпы асобы, аднак не звяртае ўвагі на асаблівасці мастацкай тэхнікі, каларыстычныя і стылёвыя

характарыстыкі карцін. Гэтая неакцэнтаванасць «выкананасці» твора мастацтва прыводзіць да эфекту «нерукатворнасці» карціны, а таксама містычнай прысутнасці аб'екта, выяўленага на ёй.

У сувязі з «іканастасам» азначаны прыём дазваляе меркаваць, што мы маем справу не толькі з сакралізацыяй твора мастацтва, але і з сакралізацыяй самой рэчаіснасці, якая стаіць за ім, а менавіта — Палесся (сутнасная адпаведнасць выявы і выяўленага ўласціва і праваслаўнай іканаграфіі: паводле П. Фларэнскага, «іканастас ёсць самі святыя» [10, с. 45]). Сакральныя іканапісныя канатацыі экфрасіса ўплываюць і на вобраз героя-мастака — характарызуюць яго як носьбіта духоўнага бачання, прычым вытокам духоўнасці з'яўляецца для яго малая радзіма.

Трактоўка хрысціянскай сімволікі ў рэчышчы нацыянальных каштоўнасцей — адна з рыс беларускай літаратурнай класікі [5, с. 18], як і сакралізацыя радзімы, роднай зямлі [3; 11; 12]. У рэчышчы гэтай традыцыі, думаецца, ствараліся і такія экфрасісы, як, напрыклад, апісанні скульптур святых у паэме М. Танка «Люцыян Таполя» або канцэптуальны неміметычны экфрасіс скляпенняў у аповесці В. Ластоўскага «Лабірынты». Першыя ствараюць збіральны сакралізаваны вобраз беларускай вёскі, сведчаць пра духоўныя якасці сялян (паколькі скульптуры рабіліся паводле вясковых прататыпаў); другі раскрывае сакральную нацыянальную гісторыю беларусаў. Пры гэтым сакралізацыя выяў у экфрасісах М. Танка, як і В. Карамазава, адбываецца шляхам суаднясення іх з хрысціянскай духоўна-мастацкай традыцыяй (іканапісам і храмавай скульптурай адпаведна), вобразы ж В. Ластоўскага толькі знешне, структурна перайманюць рысы сакральных пячорных роспісаў, а па сутнасці ствараюць візію таемнай бажніцы старажытнай крывіцкай веры, заснаванай на ўласнай гісторыка-культуралагічнай тэорыі пісьменніка і ідэях масонства. І першыя, і другі, аднак, выкарыстоўваюць сакралізацыю выявы ў экфрасісе ў якасці выяўленчага сродка для сцвярджэння ісціннасці нацыянальных каштоўнасцей.

«Іканастас» В. Карамазава як зводны экфрасіс з'яўляецца адначасова і вобразам, і структурным прынцыпам, які арганізуе аднайменную главу, дазваляе аўтару свабодна пераходзіць ад аднаго апісання да другога. Вобраз іканастаса аб'ядноўвае ў сабе шэраг карцін Г. Вашчанкі, злучаючы іх як візуальнай цэльнасцю вобраза, так і адзінствам хранатопа. Паколькі экфрасіс як разнавіднасць тэксту супрацьпастаўляецца наратыву паводле дынамікі-статыкі, зменаў-пастаянства, часу-вечнасці [6, с. 29], то ўвасобленыя ў апісаных выявах ідэі і каштоўнасці вылучаюцца як канцэптуальныя, ісціннyя, непераходныя. Адметнае месца главы «Іканастас» у дачыненні да іншых частак аповесці падкрэсліваецца і тым, што дзеянне ў ёй адбываецца на адным з апошніх паверхаў будынка. У хранатопе твора гэта адпавядае міфалагічнай катэгорыі верха, неба, што актуалізуецца ў аповедзе некалькі разоў: герой «ляціць у неба» ў кабіне ліфта, голас гаспадара кватэры чуецца яму нібыта «аднекуль зверху». Трапляючы ў майстэрню, у «прастору мяккага святла і цёплых колераў» [4, с. 14], герой адчувае сябе ў іншасвеце, акружаны містычнай прысутнасцю адухоўленай палескай рэчаіснасці.

Экфрасіс «іканастаса» суправаджаецца ў аповесці яшчэ некалькімі канцэптуальна значнымі экфрастычнымі апісаннямі. Сярод іх — зводны экфрасіс, які можа быць умоўна названы «сімфонія крылаў» [4, с. 24–25]. В. Карамазаў стварае сюррэалістычную візію светабудовы, поўную адначасова зладжанасці і хаосу, прыземленасці і скіраванасці ў вышыню. Сінтэтычны вобраз пабудаваны з цытат твораў Вашчанкі, злучаных паводле асацыятыўнай логікі: «…ці не Гаспадар блаславіў у высокі космас самога мастака і ўсю яго сімфонію крылаў? Ды не адных птушыных. Туды, у неба, імкнуліся ляцець звычайныя палешукі, мужчыны і жанчыны, прыроблыя як быццам да зямлі, якую аралі і засявалі, а за імі — коні, дрэвы, крыжы, каменне, нават квадрат Малевіча адтуль вярнуўся на зямлю і, нібыта з люка карабля, выкідваў сейбіта і Еву, спакушальніцу з чырвоным яблычкам у руцэ, самога мастака з палітрай. Хто ім даў крылы? Стаялі тры кабеты, у кожнай у думках і ў сэрцы жыла надзея, кожная сваю надзею мкнула ў неба: адна — да Бога, другая — да каханка, трэцяя — да дзетак. Усе тры там бачылі ратунак, хоць і жылі на зямлі, дзе жыў і Гаспадар. Над вёскаю па небе на ружовых крылах ранняй вясны ляцела Лада…» [4, с. 25].

Гэтая вобразная плынь мае выразна візуальную прыроду, а таксама — унутраны дынамізм, што дасягаецца вялікай колькасцю дзеясловаў. Паэтыка плыні свядомасці ў экфрасісе выяўляе паступовую страту суб'ектнасці героя (госця ў майстэрні Вашчанкі), яго растварэнне ў візуальных уражаннях.

Завяршаецца візія светабудовы падрабязным неатрыбутаваным экфрасісам карціны Г. Вашчанкі «Тэатр абсурду», якая выкрывае заганную, мітуслівую цывілізацыю: «Туды, дзе неба, у тую чысціню, усе імкнуліся. Адны ляцелі на белых крылах, другія караскаліся па чорных лесвіцах, зрываліся з іх, бразгаліся вобзем, ачуньвалі, зноў паўзлі да лесвіцаў, па іх дзерліся на неба. Нехта з бяскрылых ляцеў на парасоне — і ён да сонца? З каменя будавалі гмахі ў неба вышай ды вышай, а пад гмахамі ляжалі руіны раней пабудаваных гмахаў, нават і вежа Вавілонская стаяла, дакладней — камель ад вежы, як помнік дурням. Вышыні шукалі і самыя ўбогія — гарбамі беспрасветных халуёў масцілі шлях да ката, хлуса ў белай сарочцы…» [4, с. 25].

Зводны экфрасіс карцін Вашчанкі і экфрасіс карціны «Тэатр абсурду» з'яўляюцца антыподамі да вобраза іканастасу: хаатычнасць першых супрацьпастаўляецца ўзвышанай зладжанасці другога. Але разам вобразы ўтвараюць дуальную мадэль светабудовы, пабудаваную на апазіцыі «верх-ніз», «сакральнае-прафаннае».

Фіналам главы «Іканастас» з'яўляецца відарыс з акна: убачаная з вышыні грамадская акцыя — «чырвоны вір з Крыжам Гасподнім» [4, с. 27–28]. Відарыс успрымаецца як яшчэ адна, фінальная, карціна, заключаная ў раму акна, што нагадвае пра адраджэнскую канцэпцыю карціны як «акна ў свет» [8, с. 265]. Рух натоўпу і яго ўзаемадзеянне з будкамі-машынамі перадаюцца праз дынаміку каляровых плям. Неўзабаве з іх вылучаецца «вялізная, у залацістай раме, карціна», а за ёй і «Крыж з распнутым Ісусам Хрыстом». Невыпадковым акцэнтам з'яўляецца і тое, што карціна з натоўпу належыць пэндзлю галоўнага героя — Вашчанкі.

Паказам карціны-іконы ў гушчы натоўпу пісьменнік дасягае публіцыстычнага завастрэння, падымае пытанні аб ролі інтэлігента ў пару сацыяльных катаклізмаў, сакральнай сутнасці мастацтва, яго ролі ў грамадстве. Паводле аповесці, мастак і мастацтва знаходзяцца па-за натоўпам, узвышаюцца над ім, аднак карціны як эманацыі мастакоўскай творчасці сыходзяць у свет і служаць грамадскім патрэбам.

Такім чынам, у экфрасісах аповесці-эсэ «Брама» выяўляецца ўласцівая для ўсходнеславянскага экфрасіса тэндэнцыя да сакралізацыі выявы. Яе квінтэсэнцыяй у аповесці з'яўляецца вобраз іканастаса, які падаецца ў хранатопе вышыні і дапаўняецца вобразамі-антыподамі, у выніку майстэрня мастака трактуецца як мадэль светабудовы. Сакралізацыя выявы ў экфрасісе з'яўляецца вынікам не дасканаласці карціны, а сакральнага статусу выяўленай на ёй рэальнасці, менавіта Палесся. Выток такога пераасэнсавання хрысціянскай вобразнасці палягае ў беларускай адраджэнскай традыцыі сакралізацыі радзімы.

Літаратура

1. Брагинская, Н. В. Экфрасис как тип текста (к проблеме структурной классификации) / Н. В. Брагинская // Славянское и балканское языкознание. Карпато-восточнославянские параллели. Структура балканского текста. — М., 1977. — С. 259−283.
2. Геллер, Л. М. На подступах к жанру экфрасиса: Русский фон для нерусских картин (и наоборот) / Л. М. Геллер // Wiener Slawistischer Almanach. 1997. — Sond. 44. — P. 154− 168.
3. Даніленка, С. Міф і Радзіма: Сакралізацыя дзяржавы-Радзімы ў літаратуры польска-беларускага рамантызму / С. Даніленка. — М.: Пабіліг, 1999. — 113 с.
4. Карамазаў, В. Брама: аповесць / В. Карамазаў. — Мінск: Кнігазбор, 2006. — 128 с.
5. Конан, У. Біблейскія і хрысціянскія матывы ў беларускай літаратурнай традыцыі / У. Конан // Наша вера. — № 4 (10). — 1999. — С. 14−22.
6. Криворучко, А. Ю. Функции экфрасиса в русской прозе 1920-х годов: дис. ... канд. филол. наук: 10.01.01 / А. Ю. Криворучко; Твер. гос. ун-т. — Тверь, 2009. — 192 с.
7. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. — Мінск: Міжнар. фонд «Беларускі кнігазбор», 1997. — 510 с.
8. Лосев, А. Ф. Эстетика Возрождения / А. Ф. Лосев. — М.: «Мысль», 1982. — 623 с.
9. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. — Мінск: Бел. навука, 2008. — Т. 7: Паэмы // [укладальнік У. І. Мархель], 2008. — 366 с.
10. Флоренский, П. Иконостас / П. Флоренский — М., 2005 — 203 с.
11. Шамякіна, Т. І. Сакралізацыя вобраза Радзімы ў нашаніўскай паэзіі Янкі Купалы // Т. І. Шамякіна // Вес. Гомел. дзярж. ун-та імя Ф. Скарыны. — 2009. — № 3, ч. 2. — С. 121−125.
12. Швед, І. А. «Яна нас корміць і поіць...»: сакралізацыя зямлі ў духоўнай культуры беларусаў / І. А. Швед // Роднае слова. — 2009. — № 7. — С. 107−109.

Ольга Погорєлова (Донецьк)

ОСОБЛИВОСТІ «ЧУЖОГО СЛОВА» В ПОЕЗІЇ О. ІРВАНЦЯ

Інтерпретація твору — це завжди тлумачення того, як цей твір тлумачить інші твори.

Х. Р. Яусс

Постмодерна літературна ситуація характеризується великою увагою до тексту та процесу, що передує його утворенню. Це стає можливим завдяки взаємодії різноманітних культурно-мистецьких феноменів і праці автора та читача, саме тому інтертекстуальне прочитання видається найдоцільнішим у сучасному літературознавстві

Х. Блум розглядає будь-яку поезію як авторський «акт прочитання» творів попередників, і таким чином інтертекстуальне прочитання стає компетенцією не сучасного читача, а читача-автора. Це явище називається «хибним прочитанням» (misreading) і полягає у виборі попередника, ревізії спільного поетичного бачення, висновком якого є постулювання власного поетичного «Я». У цьому процесі творчості попередник виступає у якості другого «я» поета, що вимагає ідентифікації. Творчість (за Х. Блумом) — це «одинока боротьба проти принципа-попередника, але боротьба, що ведеться в межах світу бачення попередника» [1, с. 27].

Говорити про функціонування інтертекстуальності у творах художньої літератури слід, насамперед відмежувавшись від широкого трактування цього явища Р. Бартом, від його концепції «інтертекстуальності без берегів», оскільки за такого підходу передбачається вільна гра текстів та ігнорується авторська інтенція, тобто інтертекст «не функціонує», а розчиняється в нескінченності текстового простору. Якщо ж розглядати це явище і з боку автора, і з боку читача, у його креативних та рецептивних компетенціях, то відкриваються ширші можливості для спостережень над міжтекстовими взаємодіями, які збагачують твір новими смислами і сприяють глибокому розкриттю творчого задуму [11, с. 11].

Саме завдяки виявленню міжтекстових зв’язків художній текст виявляється «конденсатором культурної пам’яті» (термін Ю. Лотмана), він здатний розкрити глибину для інтерпретації, подвоїти, примножити кількість прочитань. Більшість дослідників тепер приходить до думки, що лише включений в інтертекстуальний простір артефакт є високохудожнім, а багатство міжтекстових зв’язків є мірою змістовності твору. При цьому причетність до культурного простору через інтертекстуальність може бути не лише маніфестацією престижного знайомства автора із досяжним йому семіотичним спадком, а й певною авторською стратегією, спрямованою на досягнення задоволення від читання [11, с. 7].

М. Ґловінський подає свою інтерпретацію цього моменту: «Інтертекстуальні посилання — це завжди навмисне посилання, тобто запроваджене свідомо, адресоване до читача, який повинен відчути, що з тих чи інших

причин автор говорить у цьому фрагменті свого твору чужими словами. А відбувається так тому, що інтертекстуальні посилання є структурним елементом тексту, а ремінісценція лише справою його екзегези, яка свідчить про сферу літературної ерудиції письменника, його літературну культуру» [3, с. 294].

Як зауважують літературознавці В. Будний та М. Ільницький, усі різноманітні інтертекстуальні форми, що вживаються в контексті літературної традиції для збагачення семантики тексту, можна вважати похідними від цитати, яка є віддзеркаленням у мовленні «чужого слова» [2, с. 252]. Особливо цікавим видається мовлення О. Ірванця, у творчості якого здійснюється перегук ознак історичних періодів і мистецтва сьогодення. О. Ірванець — відомий український поет, прозаїк, драматург, сатирик, перекладач, член най яскравішого угруповання 1980-х рр. «Бу-Ба-Бу», яке Н. Білоцерківець охарактеризувала як перше українське постмодерністське угруповання ще в 1991 р.

Метою наукової розвідки є здійснити інтертекстуальне прочитання поезії О. Ірванця та розглянути специфіку цитацій у творі «Юркові, самому собі й Вікторові. Саме в такій послідовності».

Цитата — від латинського «викликаю, проголошую, називаю» — це більш-менш дослівно наведений у тексті уривок із претексту, яким може бути висловлювання іншого мовця або попереднє висловлювання автора цього ж тексту (автоцитата), що збагачує семантику і виконує інтерсекстуальну функцію. В. Будний та М. Ільницький виділяють цитати передтекстові (епіграф), внутрішньотекстові (цитування мовлення персонажів у авторській мові) і міжтекстові — чужі висловлення, які поділяються на явні та приховані цитати [2, с. 252].

Н. Фатєєва називає цитатою відтворення двох і більше компонентів тексту-донора із власною предикацією, і класифікує їх за ступенем атрибутивності до претексту на цитати з атрибуцією та без атрибуції [9, с. 122]. Х. Арендт зауважує, що сила цитати зосереджується «не в тому, щоб зберегти, але в тому, щоб очистити, забрати з контексту, зруйнувати. Набуваючи форми “фрагментів думки”, цитата має подвійну функцію — переривати виклад “трансцендентною силою” й одночасно концентрувати те, що викладається» [12, с. 57].

Цитата зупиняє лінійний розвиток тексту. М. Ямпольський, аналізуючи думку французького дослідника Л. Женні, зауважує, що властивість інтертекстуальності — це введення нового способу читання, який зруйнує лінійність тексту. Кожне інтертекстуальне відсилання — це місце альтернаттиви: або продовжувати читання, вбачаючи у ньому лише фрагмент, що є інтегральною частиною синтагматики тексту — або ж повернутися до тексту-джерела. Літературознавець наголошує, що така альтернатива не завжди реалізується. Вставні фрагменти, аномалії, що виникають у тексті, блокують його розвиток, змушують до інтертекстуального читання. На погляд дослідника, це пов’язано з тим, що будь-який «нормальний» наративний текст володіє певною внутрішньою логікою, яка мотивує присутність тих чи інших фрагментів у тексті. У випадку, коли фрагмент не може отримати достатнього мотивування, він і перетворюється в аномалію, яка для свого мотивування змушує читача

шукати іншої логіки, іншого пояснення, ніж те, що можна отримати із самого тексту, тому увага спрямовується в інтертекстуальний простір [12, с. 60]. Завдяки залученню читачем інших кодів, інших текстів цитата отримує своє мотивування і таким чином не лише уводить до тексту інші смисли, але і відновлює порушену лінійність, таким чином М. Ямпольський визначає цитату як фрагмент тексту, що порушує лінійний розвиток викладу й отримує мотивування поза цим текстом.

Варто зауважити, що іноді фрагменту тексту для інтеграції у контекст необхідно залучення двох, трьох, а іноді і більше текстів, тобто перетворення цитати у гіперцитату, яка впорядковує текст і одночасно створює, за висловом М. Ямпольського, «вавилон смислів», що є характерним для феномена інтертекстуальності. Підкреслимо, що іноді ці тексти суперечать один одному і не піддаються об'єднанню у звичайному сенсі.

Текст — це поле смислів, що виникає на перехресті культурної пам'яті автора і читача. При цьому тексту належить не лише те, що свідомо привніс у нього автор, але й те, що вносить у нього читач у своєму з ним діалозі. Цю тезу можна простежити на прикладі лірики О. Ірванця.

Так, поезія «Юркові, самому собі й Вікторові. Саме в такій послідовності», датована 1999 р., будується з інтертекстуальних елементів. Паратекстуальність назви спрямована до культурної пам'яті читача і приховує у собі склад угруповання «Бу-Ба-Бу» — Юрія Андруховича, власне Олександра Ірванця та Віктора Неборака, до яких і звертається автор. Така послідовність зумовлена датами народження поетів. Т.Гундорова у праці «Кітч і література» визначає базові положення групи, наголошуючи на її кітчевості: «Сцена як місце дії, діалогізм як форма драматичного дійства, театралізація як композиція, персонажність, маска і бахтіанство як ідеологія. Постійна метафора для «Бу-Ба-Бу» — маска… Творцем масок по праву став Неборак. Деконструкцією маски, розкладаючи її на кілька іпостасей і поєднуючи її в одну персонажність, займався Андрухович. Деструкцію маски, аж до абсурду, здійснював Ірванець» [4, с. 239].

Вислів *«веселий перевізник Харитон»* є травестійною алюзією до давньогрецької міфології, у якій Харон — мовчазний перевізник померлих душ через ріку Стікс, тож згадка про нього може вказувати як і на наближення смерті *(«сорокаріччя дихає в обличчя»)*, так і на забуття, що хвилює кожного поета.

Буквосполучення «*всі бу-ба-бу і шабадабада»* сприймаються як сакральні слова на зразок «сезам» чи «абракадабра», у той же час несуть у собі вагоме інтертекстуальне навантаження. Так, назва «Бу-Ба-Бу» стає загальним поняттям і може характеризувати як літературне угруповання, так і принципи, що знаменують творчі погляди його членів — бурлеск, балаган, буфонаду. Буквосполучення «шабадабада» має у собі декілька прихованих смислів: по-перше — автоінтертекст поезії «Короткий лист до Олесі» (з циклу «Листи з Олександрії»):

шабадабада шабадабада
мужчина і жінка

шабадабада шабадабада
двадцять років по тому
напевно і неодмінно
зустрінуться знову
і говоритимуть про
шабадабада шабадабада…[7, с. 689]

Ця поезія, у свою чергу, має інтертекстуальний зв'язок із відомим кінофільмом французького режисера Клода Лелюша «Чоловік і Жінка» 1966 р. («Un homme et une femme»), а також є алюзією-відповіддю на поезію І. Франка «Лист із Бразилії»: «*Сусіди любі! Пише вам Олеся…»* [10, с. 226]. Таким чином розгортається діалог між українською і французькою культурами, між двома поезіями та між минулим і сучасністю. Водночас, це буквосполучення є своєрідним евфемізмом, оскільки приховує слова, які автор замовчує *(«говоритимуть про шабадабада», «мудрішими аж на цілих шабадабада», «абсолютно не шабадабада»)*, перед нами виступає відкритий для читацького акту творення-дописування текст, що має безліч варіантів рецепції.

По-друге (повертаємося до поезії-присвяти), таку назву має альбом 1998 року (за рік до написання поезії) рок-гурту «Мертвий півень», авторами пісень якого виступають усі троє письменників, тож у цьому випадку «шабадабада» є алюзією сучасної музичної культури, і алюзією творчого проекту, що своє рідним чином знову поєднує Ю. Андруховича, О. Ірванця та В. Неборака.

У рядках *«це лиш антракт! Ще буде друга дія! // це ж наша «La Divina Commedia»,* згадуючи «Божественну комедію» Данте Аліг'єрі, автор порівнює життя з театральним дійством і водночас із головним творінням, підкреслює прагнення до пошуку істини в житті (чому присвячена поема Данте). Задля артистичності О. Ірванець вплітає у свій текст перший рядок із «Божественної комедії», не вдаючись до перекладу, і в цьому випадку цитата стає первинним засобом комунікації, елементом словника (за Н. А. Фатєєвою): *«Nel mezzo del cammin di nostra vita…» («На півшляху свого земного світу…»* [6, с. 23]). Думку продовжує інтертекст поезії В. Стуса «*Ярій, душе, ярій, а не ридай!»* [8, с. 332], однак заклик О. Ірванця пом'якшується внаслідок заміни протиставного сполучника «а» єднальним сполучником «та». Варто зазначити, що цитата В. Стуса перетворюється у гіперцитату, оскільки зазначений твір має присвяту — «Пам'яті А. Г» — тобто присвячений відомій художниці-дисидентці Аллі Горській, яка загинула в сорокарічному віці.

Період сорокаріччя власного життя автор окреслює парафразою *«середній вік. Часи середньовіччя»,* протиставляючи цьому *«золоті роки»* — тобто молодість, таким чином порівнює життєвий вік і культурно-історичні періоди розвитку мистецтва і людства в цілому. Завдяки введенню різних за культурним навантаженням і походженням цитат, поєднанню найбільш знакових мистецьких творів поезія О. Ірванця зацікавлює широке коло реципієнтів.

Отже, під час прочитання поезії варто розуміти, що авторська інтерпретація може бути зорієнтована на конкретного реципієнта чи на групу реципієнтів, які розпізнають міжтекстові зв'язки і зрозуміють авторські інтонації, модальні нюанси тексту. Інші читачі можуть просто не помітити цих інтер-

текстуальних відсилань, сприйнявши текст без закладеної в нього системи міжтекстових конотацій. Інтертекстуальність є мірою художньої ваги твору, адже в ній знаходить вираження механізм збереження та нагромадження культурної інформації, що через сполучення з інтертекстом допомагає запобігти вузькому прочитанню, зумовленому художніми особливостями конкретної епохи. Саме це і демонструє творчість О. Ірванця, що апелює до культурної пам'яті різних історичних періодів і сьогодення.

Література

1. Блум, Х. Страх влияния. Карта перечитывания: пер. с англ. / Х. Блум; пер., сост., примеч., послесл. С. А. Никитина. — Екатеринбург: Урал, 1998. — 352 с.
2. Будний, В. Порівняльне літературознавство [підручник] / В. Будний, М. Ільницький. — К.: Вид. дім «Києво-Могилянська академія», 2008. — С. 241−278.
3. Ґловінський, М. Інтертекстуальність / М. Ґловінський // Теорія літератури в Польщі. Антолгія текстів. Друга половина XX — початок XXI ст. / упоряд. Б. Бакули; за заг. ред. В. Моренця; пер. С. Яковенка. — К.: Вид. дім «Києво-Могилянська академія», 2008. — С. 284−309.
4. Гундорова, Т. Кітч і література / Т. Гундорова. — К.: Факт, 2008. — 284 с.
5. Dante Alighieri. La Divina Comedia. / Dante Alighieri. Режим доступу: http://www.ellibro total.com/ltotal/?t=1&d=1,3,1,1,1. Дата доступу: 05.09.2013.
6. Данте, Аліг'єрі. Божественна комедія. Поема / Данте; пер. з іт. Є. А. Дроб'язко. — Харків: Фоліо, 2008. — 608 с.
7. Ірванець, О. В. Сатирикон−XXI / О. В. Ірванець. — Харків: Фоліо, 2011. — 763 с.
8. Стус, В. Вибрані твори / Василь Стус; упор. Дмитро Стус — К.: Смолоскип, 2012. — 872 с.
9. Фатеева, Н. Интертекст в мире текстов: Контрапункт интертекстуальности / Н. Фатеева. — М.: КомКнига, 2007. — 280 с.
10. Франко, І. Твори: в 3 т. / І.Франко. — Т.1: Поезії. Поеми. — К.: Наук. думка, 1991. — С. 226.
11. Шаповал, М. О. Стратегії інтертекстуальності та гра свідомостей у сучасній українській драмі: автореф. дис. … д-ра філол. наук: 10.01.06 / М. О. Шаповал.— К, 2010. — 36 с.
12. Ямпольский, М. Пам'ять Тиресия / М. Ямпольский. — М.: РИК Культура, 1993. — 464 с.

Юлія Масарэнка (Мінск)

СУЧАСНЫ БЕЛАРУСКАМОЎНЫ ТЭКСТ ЯК АСНОВА ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА ТВОРА

Мастацкая літаратура на фоне сучасных глабальных змен у соцыуме, на першы погляд, нібыта імкліва і незваротна страчвае свае былыя пазіцыі. Сучасныя вучоныя ўпарта зазначаюць, што «літаратура павінна зноў вярнуць гэтую знікаючую ўвагу да свайго тэксту» [5, с. 79]. І мяркуем, якраз у гэтым, побач з Аўтарам і Рэдактарам-выдаўцом, галоўная роля належыць менавіта вучонаму — Даследчыку-літаратуразнаўцу.

Часам перад літаратуразнаўцамі ставяць наўпрост задачы прагнастычнага характару, што нярэдка здараецца і ў беларускім культурным асяродку. На гэты конт сучасная тэорыя літаратуры ў асобе вядомага расійскага прафесара В. І. Цюпы катэгарычна абвяшчае, што ў літаратурнай навуцы прагназаванне

таксама мае месца, але ў адрозненне ад прыродазнаўства, «**прагназаванне** (вылуч. — *Ю. М.*) у сферы літаратуры — гэта вытлумачэнне тэксту, заснаванае на яго аналізе (г.зн. на найніжэйшых, але неабходных стадыях даследавання) і таму прагназуючае адэкватнае ўспрыманне тэксту чытачом». «Працэс спасціжэння сэнсу» мастацкіх твораў, па фармулёўцы В. Я. Халізева, паўстае вызначэннем «дыяпазону карэктных і адэкватных прачытанняў» [10, с. 12]. Такім чынам, з гэтага вынікае, што беларускамоўны літаратурна-мастацкі твор, разлічаны на магчыма шырокае кола чытачоў, у сітуацыі наяўнага дзяржаўнага білінгвізму і ў выніку гістарычных прычын мае асаблівую патрэбу ў належнай тэкставай падачы, што суправаджаецца неабходнымі тлумачэннямі. Найперш сам аўтар (ці выдавец) змушаны не толькі выхоўваць у сабе пільнага рэдактара і цэнзара, але і быць у курсе сусветнага мастацка-культурнага руху.

Сучасныя літаратуразнаўцы спрабуюць акрэсліць і прааналізаваць змены ў тэарэтычнай навуцы, што адбыліся на мяжы стагоддзяў, у тым ліку ў метадалогіі і методыцы аналізу літаратурнага твора. Расійская даследчыца Г. Раманава заўважае, што «адна з найважнейшых змен (у апошняе дзесяцігоддзе XX ст.) — адмова ад падзелу катэгорый ідэйнага зместу і мастацкіх асаблівасцей. ... Не менш важная і другая змена ... — прызнанне дапушчальным прымяненне размаітых падыходаў да вывучэння літаратуры. ... Характэрны інтарэс да розных бакоў мастацкага твора, імкненне да аб'яднання пазітыўных ведаў, усіх падыходаў, максімальны ўлік усіх дадзеных пра пісьменніка і яго твор, усіх крыніц і г. д. (па прынцыпе дапаўняльнасці), паслабленне ідэалагічнага складніка» [8, с. 4]. Калі з гэтымі сцверджаннямі спакойна можна пагадзіцца, то наступнае: «Такія папулярныя ў свой час паняцці, як "асноўная праблема", "галоўная ідэя", "пафас", адыходзяць на другі план» [8, с. 4], — выклікае пэўныя пярэчанні, паколькі гэта не зусім так. Названыя паняцці не столькі адыходзяць на другі план, як актуалізуюцца і часам замяняюцца іншымі даволі адпаведнымі тэрмінамі, якія вызначаюць больш прыватны аспект разгляду на падставе іманентнага падыходу* да аналізу асобнага твора. Скажам, такімі, як **мастацкая канцэпцыя**, аўтарская **інтэнцыя,** асноўны **мэсідж** тэксту, **канцэптуальнае напаўненне** твора і да таго пад., што па-свойму назіраецца і ў беларускім тэарэтычным даследаванні літаратурна-мастацкіх твораў. І гэта, відавочна, звязана з тым, што «ў семіётыцы культуры пад істотную трансфармацыю падпала /само/ паняцце тэксту», а «як паказалі французскія семіёлагі, **тэкст** уяўляе з сябе шматгранны твор са складанай сацыяльна-камунікатыўнай функцыяй», у выніку чаго «тэкст робіцца значнейшым за свой змест і набывае рысы мадэлі культуры (прэцэдэнтныя тэксты). Пад **прэцэдэнтным тэкстам** разумеецца ўсякая буйная з'ява дадзенай

*Паводле «Навейшага філасофскага слоўніка» (Мінск, 2003): «тэкст — у агульным плане звязная і поўная паслядоўнасць знакаў. ... Існуюць як пашыраная па-філасофску нагружаная (раманамоўныя краіны, Германія), так і больш прыватная (англасаксонскі варыянт) трактоўкі тэксту. Умоўна іх можна абазначыць як іманентны (разглядае тэкст як аўтаномную рэальнасць, выяўляе яго ўнутраную структуру) і рэпрэзентатыўны (высвятляе адмысловасць тэксту як асаблівай формы прадстаўлення ведаў пра знешнюю ім рэчаіснасць) падыходы» [11, с. 1022].

нацыянальнай культуры, якая вядома абсалютнай большасці яе носьбітаў, і адсылкі да якой частотныя ў маўленні носьбітаў, лёгка дэшыфруюцца адрасатам маўлення. ... У сувязі з гэтым новым, пашыраным разуменнем тэксту, узнікла новая дысцыпліна — ***параграфеміка*** (або семіётыка тэксту). Задачы — вывучыць і апісаць не толькі вербальныя знакі тэксту, але і параграфемы, г.зн. невербальныя знакі; ахарактарызаваць іх ролю, месца і функцыі ў тэксце, а таксама спосабы прадстаўлення і афармлення тэксту» (Вылуч. — *Ю. М.*) [5, с. 70–71].

Шукаючы шляхі прыцягнення ўвагі да беларускамоўных мастацкіх твораў, трэба мець на ўвазе, што «па-першае, тэкст — гэта асноўная матэрыяльная дадзенасць літаратуры; ён мае пачатак і канец. Запатрабаванасць літаратурных твораў, іх папулярнасць, тэрмін жыцця ў гісторыі ў некаторай ступені залежаць ад «тэхнічных» параметраў тэкстаў: іх аб'ёму (ад афарызма і сучаснага слогана да рамана-эпапеі), графічных асаблівасцей, спосабу распаўсюджвання (выкананне вершаў пад гітару, размяшчэнне ў інтэрнэце, малатыражныя кніжныя /дададзім — часопісныя і інш. / выданні або шматмільённыя газетныя тыражы-наклады і г. д.). Па-другое, тэкст — маўленчы бок літаратурнага твора, інакш — **мастацкае маўленне, або дыскурс**, — тое, што належыць да катэгорыі формы» [8, с. 9]. Як адзначае Н. С. Валгіна, «**тэорыя тэксту** ахоплівае любыя знакавыя паслядоўнасці, аднак яе асноўным аб'ектам з'яўляецца **тэкст вербальны**, таму пры характарыстыцы і апісанні тэксту важны дадзеныя, назапашаныя лінгвістыкай. Адно тое, што тэорыя тэксту склалася як дысцыпліна прамежкавага тыпу, на базе шэрагу як фундаментальных, так і прыкладных навук, гаворыць пра мнагамернасць самога аб'екта (тэксту) і шматаспектнасць яго вывучэння. **Прадметам** названай навукі з'яўляюцца прыкметы і характарыстыкі (як структурныя, так і функцыянальныя) тэксту як камунікатыўнай адзінкі найвышэйшага ўзроўню, як цэльнага маўленчага твора. Камунікатыўнасць тэксту разумеецца як ступень яго звароту да чытача» [3, с. 3]. «Прагматычны аналіз палягае ў аснове тэорыі дыскурса. **Дыскурсам** (ад франц. discours — маўленне) у цяперашні час лічыцца звязны тэкст у сукупнасці з экстралінгвістычнымі чыннікамі — псіхалагічнымі, сацыякультурнымі ды інш. **Дыскурс** — гэта тэкст, узяты ў падзейным аспекце як сацыяльна скіраваная «дзея». Метафарычна дыскурс — гэта маўленне, паглыбленае ў жыццё. Таму тэрмін «дыскурс» уяўляецца некарэктным у прымяненні да старажытных тэкстаў, бо дыскурс як такі цалкам звернуты да прагматычнай сітуацыі. Тэндэнцыя да размежавання тэрмінаў «тэкст» і «дыскурс» абазначылася ў 70–80-я гг. мінулага стагоддзя. Пад дыскурсам пачалі разумець розныя формы актуалізацыі тэкстаў ў сувязі з экстралінгвістычнымі паказчыкамі» [3, с. 11]. У сувязі з гэтым асабліва важнай паўстае праблема **кананічнага** тэксту, пад якім варта разумець не проста аўтарскі тэкст, які бярэцца тэкстолагамі-вучонымі за аснову пры падрыхтоўцы так званага акадэмічнага выдання пэўнага твора, але перастворaны, згодна з сучаснымі навуковымі ведамі і асноўнымі нарматывамі правапісных форм, тэкст з усімі дадаткамі, заўвагамі і каментарамі, які найбольш поўна рэалізуе мастацкую канцэпцыю твора, эстэтычна выяўляе яго мастацкі свет, канкрэтна і ў патэнцыяле зафіксаваны ў «артыстычнай» своеад-

метнасці пэўнай, напоўніцу насычанай інфарматыўна, зместаформы, у выніку чаго можа служыць найбольш аўтарытэтным варыянтам-узорам дзеля далейшых перавыданняў рознага кшталту. Інакш кажучы, у ідэале такім і павінны ўрэшце з'яўляцца тэкст акадэмічнага выдання літаратурна-мастацкага твора, і не абавязкова ён павінен знаходзіцца менавіта ў зборы твораў пэўнага пісьменніка, але, са свайго боку, акадэмічны збор твораў проста-такі абавязаны мець кананічны характар тэкстаў, што накладае высокую адказнасць на тых, хто займаецца іх падрыхтоўкай.

Ствараецца ўражанне, магчымасці Інтэрнэту дазваляюць публікаваць і трымаць у адкрытым доступе не проста тэксты, так бы мовіць, тэхнічна недасканалыя, але і свядома асацыяльнага, выключна маргінальнага напрамку. У выніку часам адбываюцца істотныя канцэптуальныя скажэнні у сэнсазместавым напаўненні некаторых сучасных тэрмінаў.

Так, паняцце «**неонавая літаратура**» магло б ахапіць фактычна ўсю літаратуру на электронных носьбітах: і сецературу, і тэксты, што ўзнікаюць непасрэдна анлайн, і літаратуру ўвогуле на электронных носьбітах, і інш. Насамрэч жа маем што маем: у **адкрытым** доступе, рэпрэзентаваная непадцэнзурнай, бясплатнай і свабоднай, неонавая і «неановая» ў адным камплекце літаратура рускамоўнага варыянта аб'ядноўвае сецевых маргіналаў і развіваецца пад кіраўніцтвам адказных рэдактараў В. Юміна ды Упыра Ліхога на базе адпаведнага інтэрнэтаўскага партала ў кірунку дэкадансу, псіхадэліі, эротыкі (як выяўляецца, відавочнай і грубай парнухі) і інш. пад. «круцізны».

У асобных праявах падобныя тэксты нярэдка прэтэндуюць на званне не толькі мастацкіх, але і самых жывых, сучасных і праўдзівых. Г. Д. Ахметава [1] метафарычна, але і вельмі выразна акрэсліла паняцце «жывога тэксту»: «Мы разумеем пад спалучэннем «жывы тэкст» такі літаратурны твор, які з'яўляецца адкрытым, дынамічным, самаарганізаваным, які ўзаемадзейнічае з іншымі літаратурнымі тэкстамі. У якойсьці ступені пад «жывым тэкстам» можна ўявіць пэўную жывую істоту, што жыве ўласным самастойным жыццём і выходзіць з-пад апекі аўтара, які яе стварыў. «Жывы тэкст» — гэта твор таленавіты. Рытм таленавітага тэксту таямнічым чынам супадае з рытмам Аўтара і з рытмам Свету. Чалавек, Тэкст і Свет — гэта сістэмы, якія ўзаемадзейнічаюць, гэта сістэмы, асуджаныя жыць у зададзеным тэмпарытме. Рытм можна лічыць дыханнем Тэксту, калі меркаваць, што тэкст — істота жывая» [гл.: 1]. Думаецца, сапраўды мастацкі, жывы, таленавіты тэкст па сутнасці сваёй не можа быць асацыяльна скіраваным, гэткай самай благой версіяй «пощёчины общественному вкусу».

Амаль непераадольныя цяжкасці ў спасціжэнні мастацкай задумы твора нярэдка стварае некарэктнае выкарыстанне знакаў прыпынку альбо іх поўная адсутнасць. А таму ўсё ж не варта забывацца на іх ролю ў мастацкім тэксце [гл.: 2]. Так, у многіх вершах таленавітай і ўжо даволі вядомай, але далёка не заўсёды зразуметай паэткі, на сённяшні дзень аўтаркі дзвюх паэтычных кніг, Вікі Трэнас (Вікторыі Ляйкоўскай) адсутныя знакі прыпынку, думаецца, значна прасветлілі б сэнс і гэтым павысілі эстэтычную значнасць яе мастацкіх вершаваных спроб, як у двух даўнейшых яе творах «Ідыёма ідэала» [9, с. 117]

(дарэчы, трэба: *ідэал**у***) і «Вязні» [9, с. 118]. Тым не менш, агульнавядома, што менавіта паэтычныя творы ў форме верша, дзякуючы форме, але пры наяўнасці характэрных параграфем, даволі часта і не патрабуюць адпаведных знакаў прыпынку.

Аповесць-прысутнасць* Сяргея Манвада (Сяргея Мандрыка) «Міф пра смерць» з яго першай кніжкі «Тры аповесці» (Мінск, 2002) [7] — своеадметны сучасны варыянт гісторыі з дзіўна-трагічным канцом пра пяшчотныя зносіны двух маладых людзей (інтэлігентнага хлопца — філосафа па натуры і рамантычнай дзяўчыны-загадкі), распаведзенай у свой час Максімам Гарэцкім у творы малой эпікі «Красаваў язмін». Хоць непасрэдных алюзій у названым тэксце сучаснага аўтара і няма, а інтэртэкстуальныя перагукі — у наяўнасці, пералік якіх патрабуе дадатковага дэталёвага разгляду, сам твор выглядае па-мастацку даволі паўнавартасна (з уласнай мастацкай фактурай, героямі, канкрэтнай фабулай, мовай) і цікава. Другая ж аповесць — «Тэктанічны разлом» — паціху насцярожвае, скажам, груба абрысаванай сцэнай групавога сэксу з удзелам у ёй галоўнага героя, тым самым міжволі падводзячы да пэўнага расчаравання ў «добрапрыстойных» мастацкіх чаканнях. Трэцяя ж аповесць з ці не па-французску вабнай назвай «Пантамім» напрыканцы кнігі ўвогуле пакідае ўражанне падманутасці чытацкіх чаканняў праз непрыкрытую «медычную» натуралістычнасць апісання эратычных момантаў у быцці галоўнага героя, што значна знізілі эстэтычнасэнсавую значнасць твора, якая прадугледжвае вытрымліванне прынцыпу мастацкасці: «пісáць можна пра ўсё, важна — як». Такім чынам, навідавоку — таленавіты аўтар і недаведзеныя да эстэтычнай дасканаласці творы, што па-свойму прабачальна аўтару маладому і ёсць дакорам сучасным выдаўцам, якія невядома на які кантынгент разлічвалі пры выпуску кніжкі ў шырокі свет, скарыстаўшы прыватныя фінансы.

Напэўна, усё ж больш адказна падыходзяць да выдання твораў вяліка-вядомыя і дзяржаўныя выдавецтвы, што сур’ёзна хварэюць за сваё рэнамэ. Так, Сяргей Вераціла сваёй лірычнай прозай з першай кніжкі «Разбітае сэрца Вітаўта» (Мінск, 2013), выдадзенай «Мастацкай літаратурай» у серыі «Маладзік» [4], не толькі наступнічае традыцыям, закладзеным вядомымі айчыннымі пісьменнікамі, але, распавёўшы помны выпадак з дзяцінства свайго лірычнага героя («я-варыянт» галоўнага) і далейшую гісторыю дзіўнаватай, прыгожай і глыбока няшчаснай зямлячкі Веранікі, самім апавяданнем «Залаты пясок», ягоным мастацкім светам і філасофска-рытарычнымі пытаннямі, наяўнымі ў напраўду эстэтычным тэксце, і непасрэдна заключным абзацам «*Нам дазволена дакрануцца да прыгажосці. Але нам ніхто і не абяцаў, што гэта не будзе балюча*» [4, с. 55] як бы ілюструе і працягвае асноўную думку, выказаную ў нататках 1936 г.(«Сшытак № 1» з «Запісных кніжак») Альберам Камю: *«Чалавек уяўляе сябе адрэзаным ад свету, але варта аліве ўзняцца ў зіхоткасці залатога пылу, варта сляпучаму ранішняму сонцу асвятліць пясчаныя водмелі — і чалавек адчувае, як яго непахісная няўмольнасць змякчаецца. Так і*

*У аўтарскім жанравым вызначэнні.

са мной. Я ўсведамляю магчымасці, за якія нясу адказнасць. У жыцці кожная хвіліна тоіць у сабе цуд і вечнае юнацтва» [6, с. 198].

Тым самым творчасць маладога (паколькі кніга першая) пісьменніка досыць заканамерна ўпісваецца ў дыялог еўрапейскіх культур сусветнага літаратурнага працэсу ўжо адно праз гэты своеасаблівы інтэртэкстуальны факт, вынайдзены даследчыкам-інтэрпрэтатарам, можа быць, і даволі выпадкова, але не без падказак асноўных тэкстуальных стратэгій самога літаратурнага твора і яго мастацкай канцэпцыі, якія патрабуюць свайго асобнага даследніцкага раскрыцця.

Такім чынам, у якасці галоўнай высновы дадзенага даследавання рызыкнем выказаць думку аб неабходнай **кангеніяльнасці** літаратурна-мастацкага Твора, яго мастацкай канцэпцыі і кананічнага літтэксту.

Літаратура

1. Ахметова, Г. Д. Актуальные проблемы стилистики и анализа текста / Г. Д. Ахметова. — М.: Буки Веди, 2013. — 218 с.
2. Бурак, І. Л. Роля знакаў прыпынку ў мастацкім тэксце / І. Л. Бурак // Беларуская лінгвістыка. — Мінск: Бел. навука, 2013. — Вып. 70. — С. 101–105.
3. Валгина, Н. С. Теория текста: учеб. пособ. / Н. С. Валгина. — М.: Логос, 2003. — 173 с.
4. Вераціла, С. Разбітае сэрца Вітаўта / С. А. Вераціла. — Мінск: Маст. літ., 2013. — 174 с. — (Маладзік).
5. Кавинкина, И. Н. Основы семиотики: пособ. / И. Н. Кавинкина. — Гродно: ГрГУ им. Я. Купалы, 2011. — 108 с.
6. Камю, А. Творчество и свобода: сборник / А. Камю; пер. с франц.; сост. и предисл. К. Долгова, коммент. С. Зенкина. — М.: Радуга, 1990. — 608 с.
7. Манвад, С. Тры аповесці / С. Мандрык. — Мінск: Беллітфонд, 2002. — 104 с.
8. Романова, Г. И. Практика анализа литературного произведения (русская классика): учеб. пособ. / Г. И. Романова. — М.: Флинта–Наука, 2006. — 256 с.
9. Трэнас, В. Вершы / В. Трэнас // Літаратурны квартал / Уклад. Л. І. Рублеўская. — Мінск: ЛіМ, 2003. — С. 116–122.
10. Тюпа, В. И. Анализ художественного текста: учеб. пособ. / В. И. Тюпа. — 3-е изд., стер. — М.: Издат. центр «Академия», 2009. — 336 с.
11. Усманова, А. Р. Текст / А. Р. Усманова // Новейший философский словарь / Состав. и глав. ред. А. А. Грицанов. —3-е изд., испр. — Минск: Книжный Дом, 2003. — С. 1022–1023.

Кацярына Біруля (Мінск)

МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ ЖАНРУ ДЭТЭКТЫВА Ў ТВОРАХ ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ

Гісторыя дэтэктыва, як вядома, мае глыбокія карані. Венгерскі даследчык дэтэктыўнай літаратуры Цібор Кестхейі ў сваёй працы «Анатомія дэтэктыва» адзначаў, што дэтэктыўныя сюжэты і паасобныя элементы адпаведнага жанру сустракаюцца ўжо ў крыніцах старажытнасці. Гэтыя элементы выяўляюцца ў Бібліі (у гісторыі Каіна і Авеля маем злачынства, забойцу, ахвяру, прычыну злачынства, доказы, спробы схаваць злачынства) [4, с. 35]. Рускі літаратуразнавец Я. Меляцінскі вылучаў элементы жанру дэтэктыва ў казках «Тысячы і адной ночы», у сярэднявечных кітайскіх навелах. Імкнучыся прасачыць

традыцыі дэтэктыўнага жанру, многія даследчыкі называюць імёны Шэкспіра, Вальтэра, Бамаршэ, Годвіна, Дзікенса, Бальзака, Гофмана.

Дэтэктыў як літаратурны жанр узнік у сярэдзіне XIX ст. у перыяд бурнага тэхнічнага прагрэсу. Па словах Гекслі, гэта быў час «вялікага разумовага пераварота, які калі-небудзь бачыла чалавецтва, і здзейсніўся ён пры садзеянні навукі» [1, с. 15]. Дэтэктыўныя творы не проста ўвабралі ў сябе гэтыя дасягненні, а былі, можна сказаць, народжаны імі. Само раскрыццё складанага злачынства станавілася навукай, якая ўжо атрымала сваю назву — крыміналогія, а яе практычнае выкарыстанне — крыміналістыка.

Вядома дакладная дата нараджэння дэтэктыўнага жанру, які бярэ свой пачатак ад прыгодніцкага і авантурнага раманаў, — гэта 20 красавіка 1841 г., калі ўпершыню было надрукавана апавяданне амерыканца Эдгара По «Забойства на вуліцы Морг». З літаратуры пра таямніцы і злачынствы, якая існавала з даўніх часоў, Э. По вылучыў і зацвердзіў адну самастойную сюжэтную лінію, па наяўнасці ці адсутнасці якой у мастацкім творы і вызначаецца яго прыналежнасць да дэтэктыва: паказ працэсу раскрыцця злачынства.

Гістарычна склалася, што менавіта ў Англіі, ЗША і Францыі ў сярэдзіне XIX ст. амаль адначасова ўзнік гэты жанр. У кожнай краіне ён меў свае адметнасці і своеасаблівасці, але жанравыя прыкметы дэтэктыва і яго схема заставаліся нязменнымі. Дэтэктыўны жанр, як і любы іншы, у сваім станаўленні праходзіў пэўныя этапы эвалюцыйнага развіцця. Пры гэтым нельга не ўлічваць уплыву на яго сістэмы духоўных каштоўнасцей, нацыянальнай спецыфікі, ментальнасці, філасофіі, уласцівых грамадству кожнай асобнай краіны. У беларускай літаратуры таксама з'явілася зацікаўленасць да новага жанру, але значна пазней, чым у еўрапейскіх краінах. Паэтыка дэтэктыўнай літаратуры (займальны сюжэт, вострая інтрыга, прынцып загадкавасці, невядомасці і інш.) таксама паўплывала на стварэнне асобных твораў, напрыклад, «42 дакументы» (М. Зарэцкага), «Трэцяе пакаленне» (К. Чорнага), «Сэрца на далоні» (І. Шамякіна), «Падзенне Хвядоса Струка» (П. Кавалёва) і інш. [5, с. 88]. Можна прыгадаць і аповесць В. Ластоўскага «Лабірынты», якая вылучаецца сваёй таямнічасцю і загадкавасцю.

Нацыянальная дэтэктыўная проза на сучасным этапе (канец XX — пачатак XXI ст.) падзяляецца на дзве асноўныя плыні, якія маюць рознае паходжанне: гістарычную (В. Іпатава, М. Адамчык, М. Клімковіч, У. Сцяпан, Л. Рублеўская, З. Дудзюк, Е. Вежнавец, С. Балахонаў, Т. Сабоцкая) і міліцэйскую (М. Чаргінец, В. Праўдзін, С. Трахімёнак, У. Шыцік, Ф. Сіўко). Гістарычныя дэтэктывы вылучыліся з рамантычнага гістарычнага рамана, запачаткаванага У. Караткевічам, які заклікаў пісаць вострасюжэтныя дэтэктыўныя творы для падтрымання цікавасці да роднай літаратуры. На яго заклікі першымі адгукнуліся сябры Таварыства «Тутэйшыя» (канец 80-х — пачатак 90-х гг. XX ст.), праўда, толькі ў 2004 г. з'явілася выдавецкая серыя «Сучасны беларускі дэтэктыў» [3, с. 63].

Людміла Рублеўская працяглы час працуе на літаратурнай ніве. Пачынала яна сваю творчасць з паэзіі (зборнікі «Крокі па старых лесвіцах», «Адукацыя», «Замак месячнага сяйва»), выступала як публіцыст (кніга «Я — мінчанін») і

дзіцячая пісьменніца (кніга казак «Прыгоды мышкі Пік-пік»), а ў 2002 г. з'явілася кніга апавяданняў «Старасвецкія міфы горада Б». Паступова ў творчасці пісьменніцы адбыўся пераход да больш аб'ёмнай празаічнай формы — аповесці. Яе пяру належаць займальныя аповесці «Дзеці Гамункулуса», «Сэрца мармуровага анёла», «Пярсцёнак апошняга імператара», «Ночы на плябанскіх могілках». І, нарэшце, сёння Людміла Рублеўская праявіла сябе як раманіст. Яе раманы «Золата забытых магіл», «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію», «Сутарэнні Ромула», «Авантуры Пранцішка Вырвіча, шкаляра і шпега» зацікавілі чытача, а некаторыя з іх нават перакладзены на ўкраінскую і рускую мовы. Відавочна, што творчасць Л. Рублеўскай займае значнае месца ў бягучым літаратурным працэсе. Яе творы заслугоўваюць увагі і аналізу.

Л. Рублеўская добра знаёмая з працамі тэарэтыкаў дэтэктыўнай літаратуры і ў сваёй творчай практыцы імкнецца ўлічваць патрабаванні кампетэнтных літаратуразнаўцаў (Г. К. Чэстэртана, Р. О. Фрымена, С. С. Ван Дайна, Д. Сэйерс, Р. Нокса, Р. Уінкса, П. Буало і Т. Нарсежака, Х. Л. Борхеса і інш.).

Увагу аўтаркі нязменна прыцягвае ўсё роднае, беларускае: гісторыя, мастацтва, міфалогія. Яна прыхільна ставіцца да дэтэктыўнага жанру, у рамкі якога арганічна ўплятае заблытаныя і займальныя сюжэты. Таму невыпадкова, што менавіта гістарычны дэтэктыў захапіў увагу пісьменніцы. Л. Рублеўская абапіраецца на нацыянальную, у першую чаргу караткевічаўскую, традыцыю. Асабліва ярка вылучаюцца гістарычныя дэтэктывы Л. Рублеўскай — раман «Золата забытых магіл» і аповесць «Пярсцёнак апошняга імператара». Адметнасцю яе дэтэктыўных твораў з'яўляецца тое, што ў іх яна выкарыстала два планы — гістарычны і сучасны, іх узаемаабумоўленасць пераканаўча тлумачыцца словамі К. Ясперса: «Гісторыя прымушае таго, хто ўглядаецца ў яе, звярнуцца да самога сябе і свайго знаходжання ў сучасным» [6, с. 274]. Двухпланавую апавядальную плынь пісьменніца разгарнула такім чынам, што ў ёй добра адчуваюцца і абавязковае для дэтэктыва інтэлектуальнае напружанне, і займальнасць інтрыгі, падпарадкаванай разгадцы шэрагу таямніц [2, с. 210].

Гісторыя тоіць у сабе многа загадак, а гэта ў сваю чаргу з'яўляецца крыніцай для напісання твораў з дэтэктыўным сюжэтам. Разгадаць таямніцы мінулага — такую задачу ставяць перад сабой героі Л. Рублеўскай. Яе проза вызначаецца дынамічным развіццём сюжэта.

Асноўнае патрабаванне дэтэктыва — наяўнасць загадкі, якая павінна вырашацца ў творы. Людміла Рублеўская таямнічасць і загадкавасць гісторыі пераносіць у дзень сённяшні. У рамане «Золата забытых магіл» дзеянне адбываецца папераменна то ў сучасным, то ў мінулым. Таму невыпадкова, што пісьменніца дала жанравае вызначэнне свайму твору — паралельны раман. Пры дапамозе падобнага прыёму пабудавана і аповесць «Пярсцёнак апошняга імператара», дзе асноўнае дзеянне адбываецца ў сучасным свеце, а пэўныя гістарычныя экскурсы-ўстаўкі канкрэтызуюць яго. Героі твора знітаваны з гісторыяй краіны, роду, сям'і.

Дэтэктыўны твор, як правіла, мае ўскладненую фабулу з дваістым характарам: фабулу злачынства і фабулу расследавання. У рамане «Золата забытых магіл» злачынства было ўчынена ў XIX ст., калі забівалі Вінцэся Рашчынскага.

Яшчэ пры жыцці ён пабудаваў сабе шыкоўнае надмагілле, а неўзабаве яго знайшлі закатаванага і забітага ва ўласным доме. Чаму забілі Вінцэся Рашчынскага і што ён хацеў пакінуць сваім нашчадкам, — гэта спрабуюць высветліць героі ў сучасным часе.

Аповесць як мастацкі твор, вядома, значна меншая па аб'ёме і ахопу жыццёвага матэрыялу, чым раман. Тым не менш у аповесці «Пярсцёнак апошняга імператара» аўтарка разгортвае сюжэт такім чынам, што загадкавасць і таямнічасць пашыраюць мастацкую прастору твора, узмацняюцца ўсё больш і больш на працягу развіцця дзеяння і, нарэшце, вырашаюцца ў фінале твора. Устаўныя ж раздзелы, у якіх падаецца гісторыя пярсцёнка, уводзяцца спецыяльна, каб чытач разам з героямі мог рабіць пэўныя высновы. Аўтар «дазваляе» чытачу сачыць за шляхам пярсцёнка, праводзіць заблытанымі загадкавымі сцежкамі гісторыі.

Галоўнай дзеючай асобай дэтэктыўных твораў з'яўляецца сышчык, які павінен валодаць аналітычным розумам і лагічным мысленнем. Менавіта сышчык будуе схему расследавання. У Л. Рублеўскай у гэтай ролі выступаюць жанчыны. Пісьменніца абвяргае ўяўленне пра жанчыну як носьбітку пасіўнага пачатку. Жанчына, як правіла, валодае ў яе «моцным духам і магутным жыццёвым патэнцыялам» [3, с. 68]. У рамане «Золата забытых магіл» у якасці сышчыка-аматара выступае выкладчыца гісторыі сталічнай гімназіі Паліна Ведрыч, якая настолькі захапляецца расследаваннем, што нават у самых розных неспрыяльных абставінах застаецца гатовай давесці справу да канца. Магдаліну Дарбут з аповесці «Пярсцёнак апошняга імператара» спачатку расследаванне не зацікавіла, і ў ролі сышчыка тут выступае гісторык Кастусь Сташынскі. Але ў ходзе сюжэтных перыпетый прасочваецца пэўная эвалюцыя гераіні. Кастусь Сташынскі здолеў прывіць Магдаліне вялікі інтарэс да справы.

У гістарычных дэтэктыўных творах важным этапам расследавання з'яўляецца праца ў архівах, дзе героі знаходзяць патрэбныя матэрыялы. Аналіз у дэтэктывах звычайна адыгрывае амаль ключавую ролю. Збіраючы факты і гіпотэзы, неабходна скрупулёзна іх прааналізаваць. У гістарычным дэтэктыве дакументы, архіўныя матэрыялы, старажытныя рукапісы з'яўляюцца асноўнай крыніцай для аналізу. Менавіта на іх падставе і робяцца пэўныя вывады. Творы Л. Рублеўскай пабудаваны такім чынам, што, знаёмячыся з гістарычнай часткай аповеду, удумлівы чытач можа самастойна адказаць на тыя пытанні, якія хвалююць герояў-сучаснікаў. Ён становіцца нібы назіральнікам паэтапнага працэсу расследавання таямніцы. Так аўтарка свядома падае чытачу матэрыял для разважання.

Асноўны метад расследавання, якім карыстаецца сышчык Л. Рублеўскай Паліна («Золата забытых магіл»), можна назваць дэдуктыўна-індуктыўным. Такім метадам карыстаўся знакаміты Шэрлак Холмс Артура Конан Дойла. Героі рамана часта маюць фактычную выснову, інтуітыўную здагадку (з архіўных крыніц, гістарычных матэрыялаў), якую затым спрабуюць дэталёва растлумачыць, даказаць. Гэта дэдуктыўны шлях расследавання. Калі героі, наадварот, маюць шмат не звязаных паміж сабой гіпотэз (звычайна яны складаюцца з загадкавых падзей мінулага), то іх задача звесці іх да агульнага вываду,

заключэння, звязаць у адзінае цэлае (індуктыўны шлях). Спалучэнне абодвух метадаў дае свой плён, і ў канцы твора Паліна падсумоўвае ўсё, што ўдалося высветліць пра жыццё былога паўстанца Вінцэся Рашчынскага, якому ў вёсцы, дзякуючы яе намаганням, ставяць помнік.

Гісторыя ў творах Л. Рублеўскай выступае як самастойны герой. Аўтарка паспрабавала перадаць становішча Беларусі ў XIX ст. і невыпадкова выбірала менавіта гэты перыяд, складаны і цяжкі ў гісторыі нашай Бацькаўшчыны. Якраз у гэты час актуалізаваліся рамантычныя тэндэнцыі ў беларускай літаратуры [3, с. 154]. Таму аўтарка стварае вобраз героя-рамантыка, прычым ён максімальна абагульнены. Вінцэсю Рашчынскаму як рамантычнаму герою характэрны маральны максімалізм — адданасць веры бацькоў, імкненне да праўды, самаахвярнасць у імя вызвалення радзімы. Ён выступае ў вобразе пакутніка, які імкнецца знайсці для свайго народа дарогу да шчасця [3, с. 153]. Такім героем можна назваць і Паліну Ведрыч. А. Бязлепкіна слушна адзначае: «У беларускай літаратуры з пазалітаратурных прычын рамантызм ніколі не вычэрпваўся» [3, с. 154]. Колькі такіх невядомых герояў, як Вінцэсь Рашчынскі, мае наша краіна. У аповесці «Пярсцёнак апошняга імператара» героі марылі стварыць Каралеўства Беларусь, марылі пра незалежнасць сваёй краіны, дзе ў той час не існавала свабоды слова, а таталітарны рэжым усё больш згушчаў фарбы над заўтрашнім днём.

Важную ролю ў дэтэктыўных творах, як вядома, адыгрываюць вобразы-дэталі і вобразы-падзеі. Мастацкія дэталі ў дэтэктывах нясуць пэўную інфармацыю, асабліва пры апісанні побыту, дзеяння персанажа, яго партрэта. Л. Рублеўская надае ім выключную ролю. Пазасюжэтныя элементы твора (лірычныя адступленні, аўтарскія развагі, пейзажныя малюнкі, партрэтныя характарыстыкі герояў) арганічна ўплятаюцца ў яго тканіну. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на вобразы-рэчы, якія часта вызначаюцца незвычайнасцю і таямнічасцю (фігуркі жабак, каменныя ваўчыныя лапы, кніжачка з нябачнымі чарнілами і інш.).

Творы Л. Рублеўскай, як і належыць дэтэктыўнай літаратуры, адрозніваюцца займальнай інтрыгай. Тут прысутнічаюць усе яе віды: сацыяльна-палітычная (паўстанне 1863 г., паказ асноўных тагачасных класаў грамадства і інш.; барацьба за ўладу, за зямлю ў рамане «Золата забытых магіл»); псіхалагічная (даволі тонкая вымалёўка характараў: Паліна, яе антыпод Дзіна з «Золата забытых магіл», Кастусь, Марк з «Пярсцёнка апошняга імператара»); любоўная (ёсць любоўныя трохкутнікі, нават не адзін, а некалькі); прыгодніцкая (яна абавязковая ў творах Л. Рублеўскай і надае ім займальнасць). У прозе аўтаркі многа апісанняў, дэталёва падаецца асабістае жыццё герояў, што часта ставяць у віну аўтарам-дэтэктывістам, тлумачачы гэта як адхіленне ад расследавання.

Наватарства твораў Л. Рублеўскай у тым, што яна стварыла вобразы маладых беларусаў, якія шчыра паважаюць і любяць родную гісторыю, мову, культуру. У вобразах Паліны Ведрыч, Магдаліны Дарбут, Кастуся Сташынскага, выяўляецца ідэал Л. Рублеўскай. Ужо ў саміх назвах дэтэктыўных твораў «Золата забытых магіл» і «Пярсцёнак апошняга імператара» хаваецца таямніца. Семантыка слоў «забыты» і «апошні» ўтрымлівае тыя ключавыя моманты, якія адпавядаюць слову «знайсці». Знайсці пярсцёнак апошняга імператара і золата

забытых магіл — значыць аднавіць пра іх памяць у нашчадкаў, увекавечыць у гісторыі.

Літаратура

1. Адамов, А. Г. Мой любимый жанр — детектив / А. Г. Адамов. — М.: Советский писатель, 1980. — 312 с.
2. Бугаёў, Д. Беларускі дэтэктыў Людмілы Рублеўскай / Д. Бугаёў // Полымя. — 2006. — № 7. — С. 207–212.
3. Бязлепкіна, А. П. 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру / А. П. Бязлепкіна. — Мінск: Лімарыус, 2012. — 224 с.
4. Кестхейи, Т. Анатомия детектива. Следствие по делу о детективе / Т. Кестхейи. — Будапешт: Корвина, 1989. — 261 с.
5. Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці / В. П. Рагойша. — Мінск: Народная асвета, 2009. — 303 с.
6. Ясперс, К. Истоки истории и её цель. Смысл и назначение истории / К. Ясперс. — М.: Худ. лит., 1994. — 324 с.

Светлана Гончарова-Грабовская (Минск)

ИНТЕРПРЕТАЦИЯ «ЧУЖОГО СЮЖЕТА» В ПЬЕСАХ А. КУРЕЙЧИКА И Н. РУДКОВСКОГО

«Чужой сюжет» — «это сознательно введенная в контекст произведения некогда созданная народом или художником история героев и обстоятельств их жизни, в которой отразился соответствующий той эпохе уровень противоречий действительности» [2, с. 59]. Он обнаруживает себя в пьесе узнаваемыми деталями, персонажами, цитатами, которые легко расшифровываются читателем / зрителем, в сознании которого происходит интерактивная связь между «чужим сюжетом» и современной пьесой.

В современной русскоязычной драматургии Беларуси «чужой сюжет» используют А. Курейчик («Потерянный рай») и Н. Рудковский («Последняя любовь Нарцисса), наполняя его своим видением, пересматривают каноническую трактовку, подчиняя сюжет новой художественной интерпретации как на уровне содержания, так и жанровой формы. Это заимствование идет не в русле римейка, а в русле свободного обращения с чужим текстом (как это было свойственно Г. Горину).

Так, в пьесе *«Потерянный рай»* (2002) А. Курейчик прибегает к библейскому сюжету о Каине и Авеле, по-своему трактуя его этический смысл. Как известно, в мировой литературе его использовали Дж.-Г. Байрон («Каин») и Дж. Мильтон («Потерянный рай»). Следуя своим предшественникам, А. Курейчик дает новую, нестандартную его трактовку, что позволило связать описанное явление с неким универсальным бытийным законом, выявить в нем глубинный экзистенциальный смысл. И в то же время абстрагироваться, увидеть символы и знаки вечного, вневременного, духовного. Драматург актуализировал морально-философский смысл «чужого сюжета», заставил современников задуматься над проблемой выбора между Добром и Злом, приводя к мысли, что человек не должен утрачивать надежды на поиски Рая. Морально-

философскую проблему А. Курейчик вывел на универсальный уровень, последовательно разворачивая ситуацию выбора.

Сюжетная структура «Потерянного рая» представляет модель «микротекста в макротексте», где макротекст (текст пьесы) воспринимается читателем через призму микротекста (библейского сюжета), при этом макро- и микротекст зеркально отражаются друг в друге. Драматург использует разные варианты архаичного мифа, связанные с соперничеством двух братьев — доброго и злого, кроткого и жестокого.

Внутренняя конфликтность пьесы строится на противостоянии между Каином и Авелем, их отношении к Богу, к миру, к поиску Эдема. Автор наделяет их диаметрально противоположными характерами, воплощающими два полюса: добра — зла, материального — духовного. Они выражают бинарные архетипы человека: один бунтарь, жаждущий знаний, свободы, решивший быть независимым от Бога; другой — покорный, послушный, верующий в Господа, умирающий с его именем на устах.

В пьесе А. Курейчика Каин представлен благородным, мужественным, умным и вместе с тем физически слабым человеком — «худым» и «хилым». Автор идет по линии от противного: его Каин — носитель духовного начала, а не материального. Имя Каин свидетельствует о принадлежности к ремеслу (семантика корня qin — «ковать») [4, с. 197]. Существует и другое толкование (Каин от *канна* — «приобретать собственность»). Однако в пьесе, как и в Библии, он — земледелец. Но драматург, используя другие версии мифа, наделяет Каина талантом музыканта (хорошо играет на свирели), что было свойственно его потомкам. И в то же время он — кузнец. Об этом мы узнаем в сцене борьбы с Авелем.

Образ Каина, созданный драматургом, сложен и противоречив. Каин одобряет поиски Эдема, с пониманием относится к отцу и матери. Он — их любимец. Мать называет Каина «отрадой», но упрямство сына вызывает у нее тревогу, так как тот не может смириться с тем, что Бог лишил отца Рая, фактически лишил его смысла жизни. Каин любит Бога и в то же время является носителем богоборческой идеи.

Поводом для конфликта между братьями послужило жертвоприношение Богу. Драматург сохраняет эту коллизию, но не следует библейскому тексту [1, Бытие: глава 4 песни 1−8], таящему «загадку», связанную с мотивом преступления. В пьесе «Потерянный рай» Каин тоже приходит в негодование, когда Господь принимает не его жертву, а Авеля. В нем зреет бунт, но не против Авеля. Он вступает в диалог-спор с Богом. А. Курейчика интересует не столько мотив преступления, сколько ответ на вопрос, почему человек стремится найти Рай? Каин пытается понять, почему для отца поиски Рая стали целью жизни? Конфликтная ситуация разрешается трагически. В физической борьбе с Авелем, Каин первоначально проигрывает. А. Курейчик следует аггадической трактовке мифа: Авель «победил брата в борьбе, однако, растроганный просьбой брата о милостыне, отпустил его, а затем тот убил Авеля» [5, с. 269]. Убийство брата — шаг к утверждению свободы, независимости, попытка доказать Богу другую истину о человеке, доказать, что зло царит на

земле. Совершив убийство, Кайн не раскаивается, а считает себя богоравным, его терзают противоречия, заложенные в природе человека (его величие и беспомощность перед тайнами бытия), поэтому он зол на Бога, на брата и на себя, его гложет гордыня, стремление к внутренней свободе и независимости.

А. Курейчик отступает от библейской трактовки и финала. Отец прощает сына и отдает ему карту, на которой указано предположительное местонахождение Рая, надеясь на то, что сын осуществит его мечту. Бог отпускает Каина: «Ты теперь свободен. Ты, и потомки твои. Народы же Авеля, народы Божьи никогда не появятся на земле» [3, с. 160].

Драматург по-новому трактует и образ Авеля. Согласно Библии Авель — первый мученик, первый гонимый праведник, с него начинается ряд невинно убитых. Он несет в себе духовное начало, он стремится отдать все людям и Богу, не привязан к земле, пасет скот. Однако семантика его имени связана со словом «тщета», «суета». Как предполагают исследователи, возможно, «это указывает на краткость века Авеля, бесследно исчезнувшего с земли» [4, с. 197].

В пьесе «Потерянный рай» он воплощает материальное начало. Он физически сильный. Это подтверждает и сам Авель, говоря, что может «разорвать пасть льву», осознавая в себе дикую, необузданную силу. Авелю не нужен Рай. Он хочет жить там, где ему удобно. Грубый и сильный он в итоге выбирает путь смирения, отказывается от Рая небесного и собирается строить счастье на земле. Покорный и прагматичный, он не спорит с Богом, считая, что тайна жизни должна остаться тайной, ибо так устроен мир. Он не стремится к познанию, ему «плевать на смыслы…». Не духовная, а материальная пища является для него главенствующей. Он не понимает и не принимает бунт Каина, не понимает и мотива его поступка, объясняя все завистью.

Автор намеренно «смешал» различные версии библейских преданий и расставил свои акценты на характеристиках братьев: слабый физически Каин силен духом, а сильный физически Авель пассивен и покорен. Во всех библейских преданиях Каин — отрицательный герой, у А. Курейчика — положительный. Каин борется за добро, но совершает зло, стремясь доказать Богу, что на земле царит жестокость. Автор изображает его личностью, стремящейся к познанию, к свободе и независимости. Каин — продолжатель идеи Адама, а Авель становится лишним, его смерть закономерна.

По силе своего мятежного духа, гордости, стремления к свободе и познанию Каин А. Курейчика близок Каину Дж.-Г. Байрона. И в то же время они различны. Байроновский герой одинок, и его бунтарство не имеет перед собой ясных перспектив и целей. Это бунт ради бунта. Да и отношение к Богу у них разное. Каин А. Курейчика вступает с Богом в диалог, стремится быть независимым даже от него, протестует против покорности и рабства. Для Байроновского Каина Иегова символизирует мировое зло. Для него Рай — «лишь сон». Он враждебно настроен к родителям, обвиняет их в совершенном грехе (сорвали плод с Древа Жизни), жесток и силен. Он тоже бросает вызов Богу, Люцеферу, окружающему миру.

Каин — религиозный фанатик. И убивает он Авеля, неудовлетворенный политикой Рая, приведшей к изгнанию из него всех (то есть первых людей), и отчасти (как это написано в Книге Бытия) потому, что жертвоприношение Авеля было более угодно божеству. Каин А. Курейчика не теряет веры в Рай, любит родителей и, наоборот, старается им помочь. Он, подобно байроновскому Люцеферу, пытается доказать существование Зла наравне с Добром, равноправие зла как силы, действующей на земле. Кайн Байрона восстает против всеобщего повиновения, подчинения и рабства. В итоге он проклят Евой, его просят уйти из дому. Кайн в пьесе А. Курейчика прощен отцом, который надеется на то, что сын найдет Рай.

Другой у Байрона и Авель. В мистерии английского поэта Авель покорен и добр, он воплощает трусость, страх и лицемерие. У Курейчика — физическую силу, дерзость и смирение.

А. Курейчик показал бинарные модели этического выбора: одни, как «авели», равнодушные и прагматичные, покорно принимают действительность такой, какова она есть; другие — как «каины», не утрачивают надежды и ищут Рай. Такова авторская полемика с общепринятым толкованием библейского сюжета, попытка экстраполировать ее на современную ситуацию XXI в.

Пьеса Н. Рудковского *«Последняя любовь Нарцисса»* (2006) интерпретирует «чужой сюжет», используя античную версию о Нарциссе. В греческой мифологии прекрасный юноша Нарцисс — сын речного бога Кефисса — отверг любовь нимфы (Эхо), за что был наказан. Увидев в воде свое отражение, он влюбился в него. Терзаемый страстью, Нарцисс умер и был превращен в цветок, названный его именем. Рецепция этого мифа нашла свое отражение в пьесах Кальдерона, Руссо, опере Скарлатти, Глюка, в картинах Тинторетто, Караваджо, Пуссена. Оригинальная его трактовка дана и в пьесе Н. Рудковского «Последняя любовь Нарцисса». Здесь Нарцисс диктатор, отдающий коварные приказы, но умывающий руки от преступлений. Он презирает свободу, поэтому гордится своим превосходством и силой. В литературе известны подобные произведения («Дракон» Е. Шварца, «Диктатор» Ч. Чаплина и др.), в которых разоблачалась диктатура. Н. Рудковский следует этой традиции.

По своему жанровому вектору («современная трагедия в пяти актах») данная пьеса гораздо сложнее, чем кажется на первый взгляд. Драматург стремился сюжет подчинить жанру античной трагедии, выдержать ее канон, сохранить героев древнегреческого мифа о Нарциссе, но наделить протагониста другими качествами. Во многом это ему удается. Н. Рудковский апеллирует к «Золотому ослу» Апулея: метаморфоза превращения Луция (с помощью колдовства у него появились ослиные уши) созвучна авторскому замыслу.

Контаминируя греческий миф о Нарциссе с романом Апулея, автор достигает высокого уровня обобщения, рассуждая о войне и насилии. Для драматурга важно было сочетание древнегреческой трагедии с хором, катарсисом, шекспировской трагедии с трагикомическими персонажами — шутами и современной трактовки. Следует отметить, что Н. Рудковскому удалось сохранить принципы трагедии, частично их трансформировав и подчинив другой цели — острой критике, что потребовало средств комического. Античный

сюжет автор переосмысливает, сохраняет пять актов, как того требовала трагедия, хор и катарсис.

Тематическую основу трагедии, как правило, составляет **преступление**. В данной пьесе преступление тоже формирует исходную сюжетную ситуацию. Его совершает Нарцисс, отдавший приказ убить женщин. Драматург соблюдает правила трагедии: пять актов имеют партии хора. Хор в этой пьесе выступает носителем «доксы» (общего мнения). Эгоцентризм Нарцисса не позволяет ему критически посмотреть на себя, поэтому разоблачительную функцию выполняет хор.

В гротескной форме автор изображает отношение Нарцисса к государству, которым правит. Он — оборотень, полюбивший врага в своем обличье. Подобная метаморфоза окончательно развенчает страшный облик Нарцисса. В финале его съедает волк, наделенный функцией «deus ex machina», что характерно для античной трагедии.

В этой пьесе обнаруживает себя характерный для Н. Рудковского прием: сочетать драматические диалоги с монологами, осложняя художественную структуру вставными «повествовательными фрагментами» (рассказами), что придает драме эпический характер. Драматург сохраняет диалог, но он является внешне-композиционной формой, так как принципиально важным остается *монолог*. В данном случае они не выполняют роли речевых агонов, а по сути своей позиционируют героев. Так, в первой сцене, один из странствующих монахов рассказывает историю о жестоком убийстве молодых женщин, которые не захотели дать свое молоко воинам, ибо оно предназначалось детям.

Особую роль играют монологи Эхо. В ее уста автор вкладывает правду, которую она должна донести до людей. Ее образ тоже получает новую трактовку. Известно, что отвергнутая прекрасным Нарциссом, она превратилась в скалу, остался лишь ее голос. В пьесе Н. Рудковского Эхо лишается голоса, т. к. Нарцисс отрезает ей язык. Она приходит к выводу, что в государстве есть и «мертвые» духовно — это равнодушные, смирившиеся со всем люди.

Трагизм, как эстетическая категория, в данной пьесе приобретает свою специфику. Нарцисс не вступает в неразрешимое противоречие с исторической необходимостью, так как уверен в своей правоте. Происходит не трагедия личности, а трагическую опасность представляет сама личность. Конфликтная ситуация касается судьбы народа, а не протагониста. Подобная несовместимость «я» и «других» нивелируется. «Трагическое» приобретает комическую окраску. Нарцисс становится объектом осмеяния со стороны автора.

Древнегреческие трагедии, как правило, были политически злободневны, их реплики вплетались в повседневные дискуссии граждан полиса. Этому следует и Н. Рудковский. Он насыщает пьесу острыми репликами, прозрачными кальками современности, берет на себя миссию гневного обличителя. Как и Е. Шварц («Дракон»), он использует художественную условность, прибегая к «чужому сюжету», за образной оболочкой которого читатель / зритель видит иронический взгляд автора, понимая остроту его критики.

Оба драматурга (А. Курейчик и Н. Рудковский) подвергают «чужой сюжет» кардинальному пересмотру, достигая своей цели: они стремится актуали-

зировать их морально-философский смысл, чтобы заставить современников посмотреть на свою жизнь с позиции Добра и Зла.

Литература

1. Библия: книги Священного Писания Ветхого и Нового Завета. — Изд. Моск. Патриархии, 1956–1968.
2. Головчинер В. Е. Эпический театр Евгения Шварца / В. Е. Головчинер. — Томск: Изд-во Томск. ун-та, 1992.
3. Курейчик, А. Потерянный рай / А. Курейчик: сб. пьес Исповедь Пилата. — Минск: «Мэджик Бук», 2006.
4. Синило, Г. В. Древние литературы Ближнего Востока и мир Танаха (Ветхого Завета) / Г. В. Синило. — Минск, 1998.
5. Сініла, Г. В. Біблія як феномен культуры і літаратуры / Г. В. Сініла. — Мінск., 2003. — Ч. 1. Духоўны і мастацкі свет Торы: Кніга Быцця.

Людміла Карпава (Мінск)

КУЗЬМА ЧОРНЫ І ІВАН ПТАШНІКАЎ: КАНЦЭПЦЫЯ ЧАСУ

Наша айчыннае літаратуразнаўства неаднойчы падкрэслівала, што кардынальнымі праблемамі даследавання існасці XX ст. заўсёды заставаліся час і мараль, асоба і трагічныя «зломы гісторыі». Менавіта трагізмам і гераізмам вогненных дзён згадваецца Вялікая Айчынная вайна, якая сёння ўяўляецца ўжо далёкай гісторыяй. Аднак яна працягвае жыць у геннай памяці беларусаў, напамінаючы і напамінаючы, якіх неймаверных духоўных высілкаў каштавала рэалізацыя права на жыццё, каштавала самаахвярная мужнасць у імя Вялікай Перамогі.

Дзякуючы ўнікальнаму мастацкаму зроку не аднаго пакалення творцаў, набліжаюцца, аднаўляюцца і набываюць адзнакі канкрэтных рэалій тыя далёкія падзеі ваеннага ліхалецця.

Не малую лепту ў гэту пачэсную справу ўнёс класік беларускай літаратуры — Кузьма Чорны. Яго антымілітарысцкія творы, напісаныя ў вайну і пра вайну, месцяць у сябе і праўдзівы паказ народнага супраціву фашысцкай навале, і трагізм ваенных будняў, і філасофскае асэнсаванне жорсткага часу, і моцную повязь прыватнага лёсу дзейных асоб з глыбіннымі праблемамі нацыянальнага жыцця, і тонкае пранікненне ў духоўны свет чалавека на вайне.

Арыентацыя на лепшыя здабыткі рускай і сусветнай класікі, пераасэнсаванне іх дазволілі К. Чорнаму заставацца самабытным нацыянальным мастаком-наватарам і, у першую чаргу, у ваеннай раманістыцы — вышэйшым яго творчым дасягненні. Ды і нястомныя мастацкія пошукі празаіка, якія прывялі яго да стварэння ваенных раманаў, рабілі дабратворны ўплыў не толькі на яго літаратурных паплечнікаў, а і тых, хто ішоў на змену, бо былі плённыя.

Уплыў твораў і асобы Кузьмы Чорнага на айчынную прозу адчуваўся, зразумела, даўно. Але характэрна, што сіла гэтага ўплыву мацнела з гадамі, дазволіўшы нацыянальнаму эпічнаму слову пра вайну стаць пачутым не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Водгулле ж, якое знайшлі чорнаўскія

творы ў літаратурнай практыцы беларускіх празаікаў, цяжка пераацаніць. Яны атрымалі як бы сваё другое жыццё.

Іван Пташнікаў — творца, прадстаўнік так званай паглыблена псіхалагічнай плыні ў нацыянальнай прозе, заявіў пра сябе, калі, падводзячы вынікі дасягнутаму, краіна зноў ацэньвала пройдзены ёю шлях — пераадоленыя цяжкасці, перамогі. У мастацкай літаратуры гэта знаходзіла сваё выяўленне ў павышанай увазе да гісторыка-літаратурных тэм, у імкненні нанава асэнсаваць трагічны час усталявання савецкай улады, гадоў калектывізацыі і, зразумела, падзей Вялікай Айчыннай вайны, якая так дорага каштавала чалавецтву і ў выніку якой карэнным чынам змянілася жыццё многіх народаў.

Схільны да абагульненняў, чуйны да патрэб часу, І. Пташнікаў не мог застацца і не застаўся ў баку ад гэтага. Ён, як і І. Чыгрынаў, В. Адамчык, Б. Сачанка, М. Стральцоў, В. Казько, а таксама многія маладзейшыя, непасрэдна не ўдзельнічаў у Вялікай Айчыннай, але дзіцячыя ўспаміны, спусташэнні, што прынесла вайна, ляглі на сэрца, стаялі перад вачыма, нават з днямі набывалі моц. Абапіраючыся на мастакоўскія здабыткі сваіх папярэднікаў і старэйшых сучаснікаў, асэнсоўваючы гэтыя здабыткі згодна свайго сацыяльнага і культурнага досведу, ён стварыў выдатныя творы, прысвечаныя той вялікай вайне. Празаік павёў размову з чытачом ад імя свайго пакалення, а адсюль, як справядліва зазначыў І. Навуменка, «непаўторнае бачанне свету, радасці і горыч», якія выпалі на долю яго аднагодкаў [3, с. 52].

Асабістая памяць вайны, імкненне як мага глыбей пранікнуць у законы развіцця рэчаіснасці, па-філасофску асэнсаваць іх і знайсці адпаведна ўсяму гэтаму скандэнсаваныя формы вобразнасці ператварылі першапачатковую рэальнасць (рэальнасць асабіста ўбачаную, пражытую, што і сёння сніцца, прымушае мацней стукаць сэрца) у рэальнасць высока мастацкую.

Згушчанасць падзей, інтэнсіўнасць духоўнага жыцця дзейных асоб — уласцівыя адзнакі ваенных аповесцей І. Пташнікава, дзе абраная тэма звычайна рэалізуецца ў сітуацыях, пры якіх яго героі адарваны ад звыклага асяроддзя і знаходзяцца ў выключна трагічных абставінах. Не шмат у творах і батальных карцін, але ні першае, ні другое не перашкаджае пісьменніку ўбачыць і паказаць вайну, якую вядуць яго героі, як народную, убачыць і паказаць, што сапраўдны яе герой — пакутны народ, які не можа жыць побач з занявольнікамі. Трагізм ваеннага часу І. Пташнікаў звычайна раскрывае праз паказ жахлівага становішча, у якое трапляюць самыя безабаронныя — жанчыны, падлеткі, дзеці, якіх пісьменнік любіць пяшчотна, моцна.

Увага да нораву, характару герояў, узмоцненая ўвага да іх душэўных змаганняў уласцівы І. Пташнікаву. Асабліва характэрны яны для аповесці «Тартак», дзе драматызм абставін (спалены лёс жыхароў вёскі Дальва) выключна абвостраны, як абвостраны і пачуцці дзейных асоб, у якіх жыве здзіўляючыя сіла жыцця, сіла супраціўлення жахлівым абставінам (дарэчы, такое назіраецца і ў ваенных апавяданнях І. Мележа, М. Лупсякова). Трагедыю народа аўтар акрэсліў праз ідывідуальныя чалавечыя абліччы і «даў адчуць усю чалавечую ўнікальнасць кожнага персанажа, даў магчымасць зразумець, што з кожным з іх памірае і што ў выніку страчвае жыццё» [1, с. 505]. І падаецца ўсё

гэта без патэтыкі, нават свядома зніжана, з перанясеннем увагі на бытавыя дэталі. Узмацняецца ж карціна іншымі спосабамі. Адной з асаблівасцей творчай індывідуальнасці І. Пташнікава з'яўляецца ўменне знаходзіць незвычайнае ў звычайным, прыкметнае ў непрыкметным. Вось гэтым і кампенсуецца адсутнасць паэтыкі. Эвалюцыя мастацкага мыслення празаіка ішла як «пад знакам панавання лірычнай, эмацыянальнай «вясковай прозы», так і «пад уплывам беларускай вясковай традыцыі, якая знайшла сваё яркае ўвасабленне не толькі ў класічных творах беларускай літаратуры, але і ў сучаснікаў Пташнікава — І. Мележа, А. Чарнышэвіча, М. Лобана, П. Пестрака і іншых» [2, с. 29].

І. Пташнікаў адзін з першых у беларускай літаратуры асэнсаваў падзеі вайны апасродкавана. Так, вайна прысутнічае ў яго аповесці «Лонва», хоць дзея і адбываецца тут у пасляваенны час. І на ёй можа больш наглядна, чым на пазнейшых творах пісьменніка, стала відаць, куды далей ён пойдзе, распрацоўваючы ваенную тэму. Ды і наогул трэба сказаць, што стыль Івана Пташнікава фарміраваўся ў першую чаргу пад уздзеяннем уласнага жыццёвага вопыту і самога жыцця, якое пісьменнік (зразумела, у абсягах сваёй творчасці) ведае вельмі добра. У «Лонве» пануе атмасфера святла, ціхай радасці — і ў прыродзе, і ў людзях, якія, аднак, ніяк не могуць забыцца на перажытыя ў вайне жахі, не яе кроў, бязлітаснасць. Радасць і шчасце ў герояў Кузьмы Чорнага — у мінулых, у мірных днях. Сёння і заўтра — пакуль жахі і смерць. У І. Пташнікава, наадварот. І ў гэтым адлюстроўваўся не толькі аб'ектыўны ход падзей у жыцці, а і спецыфічны ракурс іх паказу празаікам, які ўмее «бачыць жыццё ў складаных, многалучных праявах, разумець маральныя патрабаванні да асноў жыцця» [3, с. 233]. Недарэмна (праўда, паволі, прыхавана) ідзе працэс гераізацыі дзейных асоб у І. Пташнікава, хоць часам складаецца ўражанне, што гэтым ён робіць уступку жыццю і нават не дужа ахвотна прымае гэта. Каб пераканацца ў справядлівасці такога вываду і ў тым, як багацеюць вопыт і фарбы празаіка, даволі параўнаць аповесць «Тартак» і «Найдорф».

Подзвіг, які робяць Жаваранка і Алёшка («Найдорф») — гэта не штосьці выпадковае, вымушанае, або сляпое. Не толькі канстатацыя — вось як бывае ў жыцці. Дзейныя асобы «Найдорфа» ішлі да гэтага даўно і свядома. Яны маглі абысці небяспеку, іх ніхто не абавязваў рабіць тое, што яны рабілі. Ім загадвала сэрца, бо нельга было прайсці міма таго, што яны бачылі, не выкарыстаць магчымасцей, якія прадстаўляліся ім. Інакш кажучы, гераічны пачатак жыў у іх натурах, быў выхаваны папярэднім жыццём. Яго падагравала тое, што Л. Талстой называў «схаванай цеплынёй патрыятызму». А адсюль і амаль будзённы характар подзвігу.

Разам з гэтым, а можа, і з прычыны гэтага ў І. Пташнікава расце непрымірымасць да чалавечых хібаў, заган. Пазнаючы вайну, ён пазнае і якім няшчасцем могуць абярнуцца слабасць і заганы чалавека для другіх людзей, пра што сведчыць яго раман «Мсціжы» і зноў-такі аповесць «Найдорф». Чалавек павінен увайсці ў будучыню чыстым, высакародным. Вось за што змагаецца І. Пташнікаў у сваіх ваенных творах. Пераадольваючы сваю неапраўданую насцярожанасць да вялікіх сацыяльных праблем, ён выходзіць на больш шырокія прасторы жыцця. Авалодваючы тэхнікай псіхалагічнага даследавання,

маючы мастацкую культуру і талент, мастак пачынае больш пільна ставіцца да сацыяльных праблем быцця, стараецца паказаць чалавека ў барацьбе, у складанасці яго сувязей з людзьмі, у перапляценнях яго асабістага лёсу з гісторыяй. Яго аповесць «Найдорф» — па-сутнасці твор пра тое, што дабро на Зямлі вынішчыць нельга, што цемра ніколі не здолее згасіць святло, бо ёсць такія людзі, як Жаваранка і Алёшка.

Прычым мастацкае вырашэнне ў І. Пташнікава ніколі не аднастайнае. Пластыка пісьма дасягаецца моцным шчапленнем мікраэлементаў самых разнастайных мастацка-выяўленчых сродкаў (партрэтных штрыхоў і рысачак, пільнасцю ўвагі да зрухаў у акаляючым прыродным асяроддзі, мікразмен у быційным стане асобы і г. д.). І чым мацней тое шчапленне, тым трывалейшая сувязь пісьменнік — тэкст — чытач. Мастацкая дэталь-падрабязнасць дапамагае скрупулёзнаму даследаванню экзістэнцыяльнага стану дзейнай асобы, яна вытлумачвае той стан і падрыхтоўвае да далейшых учынкаў-дзеянняў персанажа. Усё гэта ў сваю чаргу спрыяе высокай нацыянальнай насычанасці вобразаў, бо аўтар выключна «адчувае ў вобразах беларускі матэрыял» [4, с. 91].

У «Найдорфе» праявілася і яшчэ адна новая тэндэнцыя ў творчасці І. Пташнікава — выросла мера ўмоўнасці і вобразы ўсё часцей пачалі ўзнімацца да ўзроўню сімвала. Такім вобразам-сімвалам стала само селішча Найдорф, якое дало назву аповесці. У ім адзін толькі раз пабываў Алёшка. Але чытач даведаецца пра яго гісторыю. Найдорф нябачна прысутнічае пры падзеях амаль увесь час — як арыенцір, як сведка. Недзе за ім грукоча бой, у напрамку яго ляцяць самалёты, пад ім вісіць вузкі маладзік, Млечны Шлях канцом сваім таксама паказвае на Найдорф, ля Найдорфа гінуць Жаваранка і Алёшка. Цікава, што разам з Найдорфам пісьменнік гэтак жа часта звяртае сваю ўвагу і ўвагу сваіх персанажаў на Млечны Шлях.

Разам з тым тут хочацца зноў напомніць, што ваенныя творы К. Чорнага шмат падказалі сучасным пісьменнікам, якія пішуць пра значэнне для чалавека і грамадства духоўных і маральных каштоўнасцяў, пра неабходнасць чалавека пераканаўчых адказаў на адвечныя пытанні чалавечага быцця. Зразумела, не аднымі толькі мастакоўскімі здабыткамі К. Чорнага вызначаецца напрамак, у якім гістарычна развіваліся эстэтычныя ідэі І. Мележа, А. Адамовіча, В. Быкава, І. Чыгрынава, І. Пташнікава і інш. Аднак, калі б гэтых здабыткаў не было, то змест іх ідэй, сіла іх уздзеяння, магчыма, былі б іншымі.

Адны вучыліся і вучацца ў Кузьмы Чорнага, як служыць радзіме і часу, другія бяруць за эталон мастацкі ўзровень ягоных твораў, трэція працягваюць пошукі, што ён вёў, чацвёртыя наследуюць яго паэтыку… Такім чынам, чорнаўская традыцыя з удзячнасцю ўспрымаецца і засвойваецца літаратурнымі творцамі на ўсіх узроўнях арганізацыі мастацкіх тэкстаў.

Літаратура

1. Андраюк, С. А. Іван Пташнікаў // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Аддзяленне гуманітраных навук і мастацтваў, Ін. літаратуры імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. — Мінск: Бел. навука, 2002. — Т. 4., кн. 1. 1966–1985. — С. 490−521.

2. Марціновіч, А. З Мсціжаў бачны свет. Агляд творчасці І. Пташнікава / А. Марціновіч // Роднае слова. — 1992. — № 10. — С. 29–36.
3. Навуменка, І. Збор твораў: у 6 т. — 6 Т. Літаратурная крытыка / І. Навуменка. — Мінск: Маст. літ., 1984. — 535 с.
4. Шамякіна, Т. На лініі перасячэння / Т. Шамякіна. — Мінск: Маст. літ., 1981. — 143 с.

Ганна Мятліцкая (Мінск)

АРХЕТЫП СВЯТЛА Ў ЛІРЫЦЫ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

Сапраўдная паэзія нараджаецца з падсвядомасці, уяўляе сабой стыхію падсвядомага, той плён, што прыносіцца натхненнем. Гэта яскрава сведчыць і творчасць адной з самых яркіх, самых адметных беларускіх паэтэс Я. Янішчыц, якая вызначаецца дамінаваннем пачуццяў, эмоцый. «Увогуле гавораць: талент — рэдкасць, ды самая сапраўдная рэдкасць на свеце — дар імправізатара. Паэтаў з гэтым дарам можна пералічыць на пальцах. Сярод іх найперш Адам Міцкевіч і Янка Купала, сюды можна аднесці яшчэ дваіх — Рыгора Барадуліна і Яўгенію Янішчыц. Чаму? Бо мелі шчасце бачыць феерычнасць іх натхнення, проста фантаннае выпырскванне іх вясёлкава-гуллівага слова, настрою, імгненнай рэакцыі на з'явы знешняга свету» [3, с. 61], — слушна заўважыў А. А. Лойка. У вершах Яўгеніі Янішчыц адлюстравалася душа беларускай жанчыны, шчырай, сумленнай, з багатай, мілагучнай мовай, з жаночай мудрасцю.

Лірыка Я. Янішчыц нібыта наскрозь пранізана святлом і блізкая да фальклорных вытокаў. Фальклярызм, народная мелодыка, прыхаваныя ў вершах, з'яўляюцца яскравым сведчаннем знітаванасці яе творчага таленту з песеннай стыхіяй роднага Палесся. А народнае (фальклорнае) і звязана з архетыповым — адлюстроўвае яго, караніцца ў архетыпах нацыянальнага менталітэту.

У Я. Янішчыц, як, да прыкладу, і ў Я. Купалы, пейзаж, як правіла, мазаічны, складзены са штрыхоў. Усе вобразы святла ў паэтэсы станоўчыя, і адпаведна — гэта прыгожыя вобразы, адчуваецца, што аўтарка любіць гэтыя з'явы прыроды, падсвядома імкнецца, каб атрымаўся і станоўчы, і прыгожы вобраз адначасова. З гэтай мэтай паэтэса часта выкарыстоўвае памяншальныя суфіксы, накладанне назоўнікаў і іншыя сродкі мастацкай выразнасці. Прыродныя вобразы, дэталькі гарманічна ўплятаюцца ў лірычны малюнак верша, надаюць твору вобразнасць, метафарычнасць, дапамагаюць перадаць пэўны настрой.

Вобразы святла ў лірыцы Я. Янішчыц сустракаюцца вельмі часта. Гэта не толькі вобразы сонца, зорак, месяца, зор, але і кветак (рамонкі, лілеі і інш.), і птушак, і снегу, і многага іншага — усяго таго, што складае светлы бок жыцця. Пры гэтым няма амбівалентнасці вобраза снегу (хоць нам сустрэўся адмоўны вобраз завірухі), што адпавядала б славянскім міфалагічным уяўленням.

Яўгенія Янішчыц — тонкі лірык. Яе паэзія надзвычай метафарычная і вобразная. Для перадачы і добрага, і дрэннага ў жыцці, а таксама ў настроі

паэтэса часта карыстаецца мастацкім прыёмам кантрасту (можна нават удакладніць: вострага кантрасту), яна часта супрацьпастаўляе тое, што спрыяе чалавеку, і тое, што перашкаджае яму (напрыклад, у якасці адмоўнага кампанента падобных кантрастаў выступаюць такія вобразы, як золь, вецер, скруха). Жар і лёд супастаўляюцца ў вершы «Непастаяннае, як хваля». Так, жанчыне адначасна светла і горасна [4, с. 147], яна жыве «*між сонца і між грому*» [4, с. 255], яе голас «*пазначаны светлай журынкай рабін // І жарам шыпшыны акопнай*» [4, с. 65], яе праца «*пад хмараю. І промнем залатым» [4, с. 254],* узгадваюцца *«гора з сонцам напалам*» [4, с. 153].

«Святло — субстанцыя, экзістэнцыяльна ўласцівая зямному свету, якая пранізвае сабой усё існае на зямлі — ваду, паветра, агонь; неад'емны атрыбут свету (параўн. спалучэнні значэнняў ‘святло’ і ‘свет’ у слове *světъ у славянскіх мовах). Гэта тлумачыць выразы накшталт “белы свет”, “Божы свет” або “вольны свет”, якія абазначаюць свет, напоўнены святлом» [2, с. 565]. У многія вершы Я. Янішчыц уплецены вобразы святла, з якімі асацыятыўна суадносіцца ўсё станоўчае. Часам яны складаюць ідэйна-мастацкую аснову твораў. Так, лірычная гераіня верша «Стрыжы начныя» размаўляе з птушкамі і дажджом. Паэтэса прыехала ў вёску, а там дажджы... У творы перададзены яе настрой, жаданне, каб было сонечна: стрыжы і ластаўкі, «хоць на хвілінку сонца запыніце», дажджы, «*...бліскаўкі-маланкі, // Аціхніце ну хоць бы на світанку», «няўжо чаканы промень абміне?*» [4, с. 257].

Вобразамі святла напоўнены і верш «Азёрны час»:

Раскалышаш возера святло.
Будзе зорка да вясла прыбіта. ...
Поўна зор вандроўнае вядро [4, с. 150].

Родныя мясціны дораць успаміны пра светлае, мроі: «*...ў зялёным канверце вясны // Прысылалі мне сонца Прылукі*» [4, с. 152]. Святло ў прыродзе спрыяе нараджэнню святла ў чалавечай душы: «*Толькі далечы гэтай адкрытая насцеж, // Зноў святлее душа, як лістотай лясы*» [4, с. 222].

Святло — гэта аснова жыцця і яго пачатак: «*Нам, як пачатак буквара — // Святло, Любоў і Годнасць*» [4, с. 256], «*...дождж, і гром, і ясны промень — // Пачатак і працяг жыцця*» [4, с. 86]. Вобраз святла адухоўлены: святло (жытняе) шуміць («*Убачу маму на дарозе // У шуме жытняга святла*» [4, с. 68]), можа памерці («*Ля муроў стагоддзяў, ля падмуркаў, // Дзе яшчэ не вымерла святло*» [4, с. 95]).

У мастацкім свеце Я. Янішчыц нярэдка вобразам дрэў (і ўвогуле раслін) уласціва святло, вобразы святла становяцца асновай метафарычнай мовы паэтэсы: «*Светла сцежку асыпаў чаромхавы дым*» [4, с. 275]. Гэты радок адлюстроўвае спадзяванне паэтэсы, што нешта іншае, светлае пачнецца ў яе жыцці. Назіраецца персаніфікацыя вобраза каліны: «*Светла аклікну каліну-сяброўку — // Сумам маім на мяне паглядзіць*» [4, с. 257] (верш «Каліна зімы»). «Агнявая агромленая гронка» каліны — увасабленне лірычнай гераіні (верш «***Гэта, мілы мой, лёсу насмешка...»). Вобраз любові да святла знаходзім у вершы «Прыйсці да таварыша»: «*За ноч паднялася ў аціхлым двары // Любоў да святла — ці галінка бярозы?*» [4, с. 135]. Гэтыя два вобразы (абстрактны і

канкрэтны) спалучаны на падставе асацыятыўнага падабенства. Вобраз бярозы асацыятыўна суадносіцца з белым колерам і — адпаведна — са святлом:

Мой горкі прыпамін,
Жыцця скупая проза:
Яго туга — Палын!
Яго святло — Бяроза! [4, с. 197]
(верш «***Мой горкі прыпамін...»)

І ў фінале твора: «*Панікну Палыном // І выстаю — Бярозай*» [4, с. 197]. У вершы «Над перакатнай рэчкаю» таксама сустракаем падобны вобраз бяроз: «*Як глянь: бярозы свечкамі, // Нязманлівым святлом*» [4, с. 35].

Яўгенія Янішчыц вельмі назіральная. Шыпшына цвіце пунсовымі агеньчыкамі — гэта «*акопнае святло*» [4, с. 263]. Сяброў, блізкіх і дарагіх людзей паэтэса ўспрымае праз вобразы святла. Так, пра сябра паэтэса гаворыць: «*Ты жадаў усім святла*» [4, с. 109]. Святло чалавечай аўры — гэта значыць святло, уласцівае чалавеку, — можа быць празрыста звонкім: «*І ў звоне дзён разносяць крыгі // Твайго святла празрысты звон*» [4, с. 250]. Малады ўзрост — душэўнае святло, час кахання: «*Яшчэ святла даволі // І нельга не любіць*» [4, с. 221].

Каханне напаўняе душу святлом — матыў многіх твораў Я. Янішчыц. Так, верш «Святло» — твор на тэму кахання, прысвечаны адлюстраванню пачуццяў закаханых і іх адносін:

...Светла як ад ранішняга снегу,
Толькі ад вячэрняга — святлей [4, с. 215].

У вершы «***Слоў медзякі... Пачуццяў бранзалеткі...» паэтэса асацыятыўна суадносіць каханне са святлом, атаясамлівае паняцці «любоў» і «святло»: «*Іграй, святло! Струмень, любові ток!*» [4, с. 96].

Станоўчыя вобразы шчасця і мар, як і вобраз кахання, таксама асацыіруюцца са святлом. Лірычная гераіня кажа: «*Паўстану я ў святле нязменных мар*» [4, с. 62]. Шчасце палае: «*...Журавінавым болем прабілася шчасце, // І палае яно паміж позняй расы*» [4, с. 222].

Праз вобразы святла перадаюцца і адчуванні лірычнай гераіні пасля яе расстання з каханым: «*...нікога // Болей светла не любіць*» [4, с. 251]; святло згіне ад недаверу — гаворыцца ў вершы «***Нясуджаны, я так скажу аднойчы...»; «*Смяюцца вочы, поўныя святла. // А на губах — гарчавінка самоты*» [4, с. 246].

Вобраз мамы, Марыі Андрэеўны, для паэтэсы бясконца дарагі і светлы. Паэтэса піша пра вочы мамы: «*Слязой і сонцам ў адначассе вочы // Спакойна спрабавалі мне ўсміхацца*» [4, с. 171], пра ліст ад мамы: «*І чую я, як светла словы ткуцца, // І гэтак светла ліст яе чытаць*» [4, с. 163]. Маці светла моліцца зямлі (верш «Ты косіш сена, колеш дровы»), «*Жытнёвы твар прасвечаны усмешкай, // Агонь сунічна шчокі распаліў*» [4, с. 157], мама «*сустракае... прасветленасць дня // Усмешкай — адвыклася плакаць*» [4, с. 67].

«*Апазіцыя святло — цемра цесна звязана з уяўленнямі пра вочы, зрок і слепату*» [2, с. 565]. Святло вачэй згадваецца ў вершы «Ружы Купалы», у якім абыгрываецца адна з рыс характару класіка: паэт любіў кветкі, не дазваляў іх

рваць, асабліва любаваўся ружамі. Я. Янішчыц адзначае, што ў балесны лёс Я. Купалы ўпляліся шыпы і ружы.

«Нязгасная іскрынка ў вачах» і ў Тараса Шаўчэнкі (верш «Тарасаў шлях»). П. Машэраў быў санцалюбам (верш «Жураўліны рэквіем»). На дабрыню і святло ў душах удоў звяртаецца ўвага ў «Баладзе вернасці»: «*Адкуль у вас пагэтулькі святла?..*» [4, с. 112].

Сустракаюцца ў лірыцы Я. Янішчыц і вобразы светлага адыходу (верш «Удовін дождж»), светлай дарогі (верш «Рыгору Семашкевічу») — гэта пра праводзіны чалавека ў апошні шлях. Згадваецца народны звычай «светла ўспамінаць» нябожчыка (верш «Птах», з датай 27.VII.1984 г., — У. Караткевіч памёр 25.VII.1984 г.).

Акрамя таго, вобразы святла выкарыстоўваюцца для перадачы настрою, унутранага стану лірычнай гераіні, апісання паэтэсай самой сябе. У гераіні светла на душы [4, с. 262], яна «*святлом і цішаю сагрэта*» [4, с. 73], «*ветлым сонцам ці шчасцем сагрэта?*» [4, с. 42], на прыродзе адчувае сябе «*...шчаслівай // Святлом узгоркаў і раўнін*» [4, с. 41], праз гады па-ранейшаму ўспрымае сябе светлай дзяўчынкай (верш «***Не сябрукі мы і не аднагодкі...»).

Тонкае адчуванне святла паэтэсай, адчуванне сябе на святле, магчыма, гэта і адчуванне сваёй душэўнай аголенасці і адкрытасці. У вершы «***Напэўна, шчасце ў мяне не па ўзросту...» лірычная гераіня падрабязна перадае свой унутраны стан:

Прабіваецца праз першае лісце
Празрыстасць думак і гукаў празрыстасць...
Сонца высока.
Блізка да маю.
Сама сябе на святле адчуваю [4, с. 75].

Загадкавая метафара ў вершы «***Жыву сярод глухіх балот...»: лірычная гераіня жыве «*пад сонцам найвышэйшай пробы*» [4, с. 26]. Да таго ж у вершы «***А як хацелася цяпла…» яна гаворыць пра сябе: «*Мой боль — // На вышыні святла, // Таму і ноччу мне світае*» [4, с. 188].

Мастацкія спробы асэнсаваць сваё жыццё, выкарыстоўваючы пры гэтым вобразы святла, назіраем у многіх творах Я. Янішчыц, паэтэса імкнецца праз радкі твораў як бы наноў раскрыць сябе, свае перажыванні, перадаць свой унутраны стан, настрой:

Будзе светла мне і горка
За лагчынай, за гарой
Паміж ранішняю зоркай
І вячорнаю зарой [4, с. 101].

Або:

Што ж, і сама я ўразумела:
На вуснах з горыччу святла
Жыву няўтульна і няўмела
З нязменнай прагаю крыла [4, с. 207].

Яўгенія Янішчыц у вершах «***Вось так узгараецца слова...» і «***У заснежаны вечар зімовы...» спрабуе асэнсаваць свой лёс. У першым з іх паэтэса разважае, што яна будзе часова з праменьчыкам, іскрынкай, раллёй (іскрынка,

магчыма, асацыіруецца з імгненнем: хутка загараецца і хутка гасне), яна будзе ўзаемна з калінай, слязінай, святлом, будзе навечна з карэньчыкам, каменьчыкам, зямлёй. У другім вершы лірычная гераіня гаворыць пра сябе: «*Пракаціўся узорны мой шлях, // І лісточкам ззалелым трапеча // Цуда-зорка ў пустэльных палях*» [4, с. 268] і ніжэй дадае: «*Дагараю, але не згараю, // Бо нязменна гляджу на зару*!» [4, с. 269].

Паэтэса задумваецца над сваёй будучыняй, непакоіцца ад няпэўнасці: «*...На якім агні замешан // Мой наступны крэўны дзень?*» [4, с. 251]. Лірычная гераіня прызнаецца: «І душа мая часта, нібы матылёк, // На агонь вылятае, ды агню не баіцца» [4, с. 155], клопатна турбуецца: «О толькі б не паменела святла» [4, с. 142]. У вершы «***То цёмны бор, то рэдзенькі лясочак...» гаворыцца, што лірычная гераіня ўваскрэсне праз агонь.

Сама паэзія, на думку Я. Янішчыц, звязана са святлом. У вершы «Прыгаршчы святла» паэтэса разважае, што значыць сапраўдная паэзія, вечнасць паэзіі: «*Паэзія, — яна не знае тлену, // Калі ў душы хоць прыгаршчы святла*» [4, с. 75], адзначае, што на сэрцы агнём выпісваюцца радкі. Са святлом суадносіць яна і творчы дар. Сама творчасць успрымаецца паэтэсай як святло: «*Прымі святло, // Што льецца з-пад пяра // І вырастае ў сонца пад рукамі...*» [4, с. 151] (верш «Другу»); «*Сёння й ніколі так светла пяру*» [4, с. 244], — гэта значыць добра і лёгка пішацца; «*Знаю, будзе ткацца слова // З неспакою і святла*» [4, с. 91]. Творчасць як крылы, — лірычная гераіня Я. Янішчыц часта адчувае сябе птушкай або ў некаторых вершах знаходзім яе мастацкае пераўвасабленне ў птушку: «*І за спіной світаюць вольна // Два летуценныя крылы*» [4, с. 275].

У вершы «Зона святла» называюцца імёны творцаў (І. Мележ, А. Куляшоў), якія ўнутрана блізкія паэтэсе, выяўляецца яе сувязь з мастацкай традыцыяй:

Ды ў час, калі шукае слова — слова,
Знябыўшы тлусты тлум і мітусню,
Агеньчык цыгарэты Куляшова
І журавіны Мележа — прысню [4, с. 86].

У твор уключаны і роздум лірычнай гераіні над сваім жыццём, яго складанасцямі: «*Жыццё, // жыцця ты іншага не мысліш // На катарзе любові і святла!*» [4, с. 86]. У лірыцы перададзена разуменне паэтэсай свайго жыццёвага прызвання: «*Дзякуй лёсу, // маю не ў нагрузку — // Зорны крыж Мацея Бурачка...*» [4, с. 20], «*Служу зямлі, дзе промень не пагас*» [4, с. 266].

Такім чынам, намі разгледжана невялікая частачка лірыкі Я. Янішчыц, у якой выяўлены архетып святла. У адпаведнасці з міфалагічнымі ўяўленнямі, святло — тая субстанцыя, якая пранізвае ўсё на зямлі, прысутнічае не толькі ў прыродзе (святло як стан у навакольным свеце), але і ў чалавеку, яго душы, яго працы, яго творчасці, у яго жыцці ў цэлым. Як бачна, зусім невыпадкова даследчыкі адзначаюць, што паэзія Я. Янішчыц вельмі светлая, «...вясковыя вобразы загаварылі словамі самай чыстай, адухоўленай, светлай паэзіі ... усё створанае Я. Янішчыц здольна адарыць чалавека светлай духоўнай энергіяй» [1, с. 183]. З кожным асобным вобразам святла ў мастацкім свеце паэтэсы

звязаны пэўныя думкі, ідэі, асацыяцыі. Святло — адзін з яе любімых архетыповых вобразаў.

Літаратура

1. Калядка С. У. Непрыручаная птушка Палесся. Творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц / С. У. Калядка. — Мінск: Бел. навука, 2007. — 216 с.
2. Левкиевская Е. Е. Свет — тьма / Е. Е. Левкиевская // Славянские древности: этнолингв. словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. — М.: Междунар. отношения, 2009. — Т. 4: П (Переправа через воду) — С (Сито). — С. 565−567.
3. Лойка А. А. Займальная літаратура: эсэ / А. А. Лойка. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. — 176 с.
4. Янішчыц Я. Выбранае / Я. Янішчыц; уклад. А. Канапелькі і В. Коўтун. — Мінск: Маст. літ., 2000. — 351 с.

Вольга Козіч (Мінск)

ПСІХАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ БЫЦЦЯ ЧАЛАВЕКА (ПА СТАРОНКАХ ТВОРАЎ АНДРЭЯ ФЕДАРЭНКІ)

Напачатку мінулага стагоддзя М. Багдановіч у артыкуле «Забыты шлях» выказаў вельмі важную літаратуразнаўчую ісціну: «Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой асаблівы склад (стыль) творчасці, найбольш прыдатны для гэтай душы» [1, с. 288]. Нацыянальная проза была заўсёды моцная сваім бытапісальніцтвам. Яно праяўляецца ў абвостранай увазе да самых штодзённых і простых праяў жыцця, да падрабязнасцей, дробязей, прыватнасцей чалавечага існавання. Вялікая карціна свету, сутнасць быцця чалавека выяўляецца праз побытавае, выпадковае, тым самым дазваляючы нам убачыць непаўторны, заўсёды індывідуальны свет асобнага чалавечага жыцця.

Героі твораў А. Федарэнкі — звычайныя людзі, тыя, каго называюць «простымі», нічым, на першы погляд, не адметныя. І толькі талент пісьменніка адкрывае чытачу іх душы на тую псіхалагічную глыбіню, за якой чуецца жывая зацікаўленая размова пра беларуса-сучасніка.

Падзеі аповесці **«Ціша»** адбываюцца на гарадской ускраіне Чэшская Слабада, хаця месца прапіскі можа належыць любой геаграфічнай кропцы нашай Беларусі. Шасцігадовы Петрык Дворак жыве разам з маці (працуе ў прыгарадных цяпліцах), бабуляй Домнай (яна — ўдава франтавіка), непадалёк жывуць сямейныя Стах і Стэфан — дзядзькі Петрыка па бацьку. Марк — бацька хлопчыка, — як раней казалі, «сабакам сена косіць», нібыта зарабляе грошы ў далёкай Сібіры на будоўлю кааператыўнай кватэры ў «мікрараёне». Празаік ужо на першай старонцы твора дае знішчальную характарыстыку сынам бабулі Домны: *«Усе тры браты мелі розную знешнасць: Стэфан — светлы, Стах — руды, Марк — чарнявы; затое былі аднолькавыя характары: упартыя, упёртыя, ганарыстыя і надта ж нядружныя, да таго, што за вочы іх празвалі «браты Карамазавы», і гэтая дражнілка даўно гуляла па навакольлі як анекдот, як абазначэнне пустой крыўды: «Чаго надзьмуўся, як той Карамаз?», ці «Вам яшчэ не хапала сварыцца, як тым Карамазавым!»* [2, с. 50–51]. Менавіта тут, як мне падаецца, схаваны тлумачальны код філасофскага зместу аповесці. Зразумела, адразу напрошваюцца асацыяцыі з раманам Ф. М. Дастаеўскага «Браты

Карамазавы». Але гэта толькі алюзія, намёк, не больш. Малы Петрык, маладая будучыня Беларусі, фарміруецца ў гэтым, мякка кажучы, не вельмі сяброўскім асяроддзі. Апісальнасць — не лепшы пісьменніцкі сродак нават такога майстра сучаснай прозы, як А. Федарэнка. Прыходзіцца верыць, што Петрык *«у свае шэсць быў перакананы, што ён — самы шчаслівы чалавек на зямлі, людзі, якія яго акружаюць, самыя лепшыя, самыя добрыя, а выдумляюць яны нейкія праблемы проста так, ад няма чаго рабіць, каб яшчэ весялей жылося»* [2, с. 51].

Свет людзей і прыроды такі, якім існуе ва ўяўленні герояў А. Федарэнкі: драматычна-смяшлівы, цнатлівы і вясёлкава-смешны. Час у аповесці доўжыцца тры гады. Падрослы Петрык падсумоўвае, што ў жыцці «ўсё разам, гора і шчасце, сваркі і прымірэнні, слёзы і смех, і ўсё пераменлівае, перамешанае, непастаяннае, усё ў руху, круціцца, як у калейдаскопе; і як у калейдаскопе з розных асколачкаў шкла пры пэўным павароце і неабходным ракурсе ўзнікае малюнак… Якое ж яно, жыццё, аказваецца, аграмаднае!» [2, с. 90].

Аповесць «Ціша» ў кантэксце творчасці празаіка бачыцца як новая прыступка ў спасціжэнні псіхалагічных глыбінь жыцця чалавека. У XX ст. слоўнае мастацтва сутыкнулася з новымі перашкодамі. Папярэдні час быў пазначаны пэўнымі ідэалагічнымі канонамі, верай у лепшую будучыню новых пакаленняў. Бацькі здзяйснялі рэвалюцыі, змагаліся ў шматлікіх сусветных, грамадзянскіх, айчынных, лакальных войнах, каб выйграць і тым самым забяспечыць шчасную долю дзяцей. Спажывецкая ідэалогія нарадзіла не адзінкавага, выбітнага, а масавага чалавека, у нейкай меры «маленькага» і цікавага толькі самому сабе. Усе каштоўнасныя адрознасці вымяраюцца грашыма, іх колькасцю. У гэтым пракруставым ложы жывая душа пакутуе паміж «высокім» (прагай да духоўнасці, змястоўнасці ўнутранага жыцця, здольнасці да значных учынкаў) і «нізкім» (задавальненне фізіялагічных патрэб, забяспечанне матэрыяльнага дабрабыту і г. д.). Іншымі словамі: якія прыёмы псіхалагічнага раскрыцця характару могуць быць дапаможнымі майстру слова?

Беларускі чытач добра памятае хрэстаматыйнае апавяданне «Галя» глыбокага знаўцы чалавечай душы Янкі Брыля, у якім пісьменнік псіхалагічна тонка раскрывае перажыванні жанчыны, што ў маладосці разышлася са сваім каханнем. У аднайменным апавяданні А. Федарэнкі Галя — *«нудная, непрыгожая, падобная на худога вераб'я, за ўсю вучобу з ёю не гуляў ні адзін хлопец»* [3, с. 146]. Але не яна — галоўная гераіня. У эпіцэнтры твора знаходзяцца перыпетыі жыцця напачатку яе аднакурсніка, а затым мужа Ігара Снарскага. Драма Ігара ў тым, што ён не кахае жонку, не любіць працу, што яму толькі *«хочацца простага спакою, утульнасці, крэсла мяккага перад тэлевізарам, лямпы пад сінім абажурам, добрай, ласкавай жонкі…»* [3, с. 151]. Тэарэтычна ён згодны сілаю прымусіць сябе любіць, шкадаваць, памагаць Галі. На справе ж прыгадвае *«шурпатыя пацалункі, выцягнуты ўніз, непрыгожы жончын твар, на якім застыла нейкая вечная вінаватая пакора»* [3, с. 163]. На мяжы стагоддзяў чалавек страціў далучанасць да вялікіх жыццёвых спраў, стаў незапатрабаваным, незадзейнічаным дзяржаўнымі структурамі. Гэта значыць, набыў прастору свабоды асобы, але не зусім усведамляе, як яе выкарыстаць. Герой апавядання А. Федарэнкі псіхалагічна дакладна канстатуе: *«Поўная*

пустата ў думках і няведанне, што рабіць, для чаго жыць… Нашто? Перавесці тоны мяса, хлеба, цыстэрны піва, каб скончыць усё гадоў праз пяцьдзесят, неяк пад раніцу, у анкалагічным аддзяленні, у палаце на чатырох, дзе зачуханы дзяжурны, нядаўні студэнт, злы і нявыспаны пасля ўчарашняй п'янкі, пазяхаючы, адганяючы ад рота перагар, памацае пульс, ногі, зробіць каравым почыркам, дрыжачымі пальцамі запіс у кніжачку» [3, с. 156]. Выпрабаванне мірным, забяспечаным жыццём, атрымліваецца, таксама мае свае выдаткі, прыўносіць душэўны неспакой.

Майстра псіхалагічнай прозы А. Федарэнка нагадвае пра вечныя каштоўнасці, што падвышаюць духоўнасць незалежна ад часавых і прасторавых вымярэнняў. Можа, па гэтай прычыне не мае імя герой апавядання **«Аднакласнік»**. Аўтар твора прыадкрывае заслону псіхалогіі творчасці: *«Пісьменніку трэба дэталь, іскрынка: які-небудзь кляновы сухі ліст пры дарозе, зламаная травінка, трэшчына ў асфальце, выпадкова пачутая мелодыя ці нават проста чырканне запалкі аб карабок, — і гэтага дастаткова, каб сюжэт сам сабою «ўспыхнуў», прыдумаўся, і сюжэт гэты можа атрымацца больш рэальным за любую жыццёвую гісторыю, бо сфакусіруе многа падобных гісторый»* [3, с. 163]. Некалі малады, здаровы, самаўпэўнены і цынічны аднакласнік захацеў спазнаць фізічную блізкасць з дзяўчынай як плату за тое, што выканаў ёй курсавы праект. І вось цяпер ён — калека з высахлай ад хваробы нагой — слушна сцвярджае, што *«каханне жанчыны, калі ўдумацца, гэта такая страшная загадка, такая тайна; ёсць у тым, што жанчына ахвяруе сабою, аддае ўсю сябе чужому чалавеку штосьці такое містычнае, незразумелае і нежартоўнае, што нельга гуляцца з гэтым»* [3, с. 168].

Таямніцу быцця пісьменнік раскрывае праз жыццеапісанне народных характараў. Педантычны, абмежаваны, знешне непрывабны і вельмі сквапны вясковец Сыч з аднайменнага апавядання дваццаць гадоў помніць і любіць нябожчыцу-жонку, даглядае яе магілку і амаль кожны выхадны носіць туды кветкі. За гэта, піша А. Федарэнка, *«даруецца Сычу яго прагнасць, брахня ў вочы, незразумеласць, нелюдзімасць»* [3, с. 175]. Празаік не ідэалізуе героя, не робіць яго ні станоўчым, ні адмоўным. Нават асабліва не заглыбляецца ў стан перажыванняў героя. Сыч мае права на існаванне не толькі ў жыцці, але і на старонках мастацкага твора, пашыраючы тым самым дыяпазон чалавечых характараў у мастацтве слова.

Апавяданне **«Памарак»** у творчасці пісьменніка бачыцца як узор традыцыйнай смехавой культуры. Трапная назіральнасць, дасканалае валоданне словам, выдатнае сюжэтабудаванне — складнікі таго, што робіць тэкст мастацтвам слова. Адзінокая бабылка Антоля і Еўка, што выклікае цікавасць у мужчын нават у старасці. У творы як быццам нічога не адбываецца, адсутнічае падзейны рад. Але, разам з тым, унутраны змест набывае падключанасць да сілавога поля вялікіх чалавечых пачуццяў, перажыванняў, уражанняў. Да немаладой Еўкі сватаецца ўдавец Кузьма. Антоля ўспрыняла гэты факт як асабістую драму: *«Зусім раскісла Антоля. Запусціла сябе. Ні есці не можа, ні спаць, ні работу рабіць — адно ходзіць, туляецца па хаце, па двары і думае, думае. Абы-што ў галаву лезе. Уключыць кіно, каб думкі перабіць, — а ў кіно*

зноў дон Хуліо ўпрошвае Сільвію… Здаецца, каб пайшоў да каго ды выгаварыўся, выліў усё з душы, дык і палягчэла б. Але каму ты пра такое скажаш? Смяяцца будуць, разнясуць па вёсцы, Еўцы перакажуць… Як памарак хто пакінуў!» [3, с. 178]. Сама ж Еўка вырашае канфлікт вельмі неадназначна, паведаміўшы Антолі вынік: *«Я ж не паспела тады сказаць табе, што да яго (Кузьмы — В.К.) нейкая баба з Залозак, таксама ўдава, сваталася, у прымы хацела пераманіць… А каб я не перахапіла і ён пайшоў? Што б мы без яго рабілі?.. А гэты будзе нам мужчынаю, адзін на двох. Я ж і рабіла з такім, як той казаў, прыцэлам…»* [3, с. 182]. Дарэчы, уменне пасмяяцца, як правіла, з'яўляецца сведчаннем вышэйшага пілатажу пісьменніцкага майстэрства.

Сённяшняя паўсядзённасць нарадзіла «новых» людзей, характары якіх былі слаба абазнаны папярэдняй нацыянальнай літаратурай. Менавіта такі Берасевіч — галоўны герой апавядання **«Уночы».** Хто ён? Хворы ці ў прадчуванні псіхічных адхіленняў? Загнаны ў кут гарадской цывілізацыяй, агрэсіўна настроены на ўсіх і на ўсё: *«Ён пачынаў востра, без аніякай, здавалася б, прычыны баяцца і ненавідзець людзей. Не ўсё чалавецтва, а менавіта бліжняга свйго, які абганяў яго на аўтамабілі, ехаў побач у метро, выступаў па тэлевізары, ішоў па тратуары»* [3, с. 246], — паведамляе пра героя ў самым пачатку твора аўтар. Дзіўныя лекі адшукаў для сябе Берасевіч: сядаў у машыну, без усялякіх мабільнікаў, выбіраўся за горад і на максімальна дазволенай хуткасці ехаў да вёскі «пацерціся» сярод «простага народа», выпіць самагонкі, далучыцца да «прымітыўна-амёбнага», па яго словах, успрымання жыцця, заняцца за танную плату каханнем. Пасля праведзенай ночы, слушна піша А.Федарэнка, *«пачыналася раніца, не сціхаў салаўіны пошчак, ад зямлі ішлі цёплыя хвалі, пахла чаромхай, росным гравіем, і неба на ўсходзе з фіялетавага ператваралася ў радасна-ружовае»* [3, с. 258]. Думаецца, характар Берасевіча ўсё ж патрабуе большай псіхалагічнай расшыфроўкі. Зразумела, жанр апавядання мае свае абмежаванні. Характар Берасевіча толькі графічна акрэслены, яўна недастаткова, каб напоўніць малую апавядальную форму вялікім зместам.

Змены, якія адбываюцца ў грамадстве, не могуць застацца пабочнымі для літаратуры. Вобразнае асэнсаванне жыцця чалавека — мэта слоўнага мастацтва. Талент пісьменніка вырашае, ці стане гэта зацікаўленай, змястоўнай, глыбокай размовай пра быццё беларуса новага стагоддзя.

Літаратура

1. Багдановіч, М. Забыты шлях // Збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. — Мінск: Навука і тэхніка, 1993. — Т. 2. — С. 286−291.
2. Федарэнка, А. Ціша / А. Федарэнка // Маладосць. — 2013. — №7. — С. 50−90.
3. Федарэнка, А. М. Мяжа: раман-эсэ, апавяданні / А. М. Федарэнка. — Мінск: Літаратура і мастацтва, 2011. — 264 с.

Сяргей Трунін (Мінск)

ПОСТМАДЭРНІЗМ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: РАМАН А. БАХАРЭВІЧА «САРОКА НА ШЫБЕНІЦЫ»

Постмадэрнізм у беларускай літаратуры яшчэ, здаецца, не аформіўся ў самастойную мастацкую сістэму, але асобныя рысы ўжо прысутнічаюць у некаторых творах (напрыклад, раман А. Федарэнкі «Рэвізія» створаны на стыку рэалізму і постмадэрнізму).

А. Бахарэвіч — празаік маладога пакалення — сваім раманам «Сарока на шыбеніцы» дэманструе прыклад адносна самастойнай з'явы постмадэрнісцкага тэксту ў сучаснай беларускай прозе. Гэта, на наш погляд, абумоўлена літаратурнымі традыцыямі, якія відавочныя ў яго творчасці. З рускіх пісьменнікаў гэта, перш за ўсё, У. Набокаў, творчасць якога прадстаўляе сабой гэтак званы «перадпостмадэрнізм», таму што ён «прадбачыў» і выкарыстаў некаторыя стратэгіі, якія пазней сталі асноўнымі для постмадэрнізму, і, безумоўна, традыцыі заходнееўрапейскай літаратуры, у якой постмадэрнізм як мастацкая сістэма склаўся нават раней, чым у рускай. Таму заканамерна, што менавіта гэтаму празаіку ўдалася спроба стварэння беларускамоўнага постмадэрнісцкага тэксту.

Раман «Сарока на шыбеніцы» належыць да тыпу **наратыўнага постмадэрнізму** (згодна з класіфікацыяй І. С. Скарапанавай, прадстаўленай у артыкуле «Мадыфікацыі постмадэрнізму ў рускай літаратуры»). «Для наратыўнага постмадэрнізму характэрна ... захаванне кода наратара, які, аднак, можа быць разбураны, распаўсюджвацца толькі на мастацкую і не распаўсюджвацца на навуковую частку тэксту, падвяргацца другаснаму — парадыйна-іранічнаму кадзіраванню (тут і далей пераклад мой. — *С. Т.*)» [2, с. 10]. У рускай літаратуры да гэтага тыпу належыць шэраг тэкстаў, сярод якіх такія аўтары, як А. Бітаў, З. Зінік, А. Каралёў і іншыя. Як і ў рамане А. Бітава «Пушкінскі дом», Наратар А. Бахарэвіча рэпрэзентуе лінію галоўнай гераіні, якая часткова з'яўляецца сімулякрам і адсылае да іншых культурных кодаў. Вераніка — галоўная гераіня «Сарокі на шыбеніцы» — адсылае чытача да вобразу Веранікі з рамана П. Каэльё «Вераніка вырашае памерці». Па-першае, у абедзвюх гераінь аднолькавае імя, па-другое, абедзве маюць у грамадскім асяроддзі маргінальны статус, які яны актыўна адрэфлексоўваюць; па-трэцяе, раман А. Бахарэвіча пачынаецца з таго, што гераіня павінна загінуць; па-чацвертае, сама фраза «Вераніка вырашае памерці» некалькі разоў гучыць / цытуецца на працягу рамана.

Але адрозненне ад Каэльё заключаецца ў тым, што гераіня партугальскага пісьменніка рэалізуе ў рамане танатаідальны комплекс, а Вераніка А. Бахарэвіча — наадварот, спазнае асабістае лібіда, прычым адбываецца гэта на ўзроўні розных хранатопаў рамана. Яе пошукі шматпластавыя, бо з кожным разам яна ўсё больш адрэфлексоўвае тое, што з ёй адбываецца. Напрыканцы 8-й главы Наратар выказвае сваё негатыўнае стаўленне да Каэльё: ён бачыць у ім толькі чалавека, які зарабляе грошы. На падставе гэтага можна зрабіць выснову,

што раман Бахарэвіча — гэта антыпод рамана Каэльё. Бахарэвіч наўмысна і паслядоўна падвяргае дэканструкцыі каэльеўскі дыскурс у сваім тэксце.

Наратар не супадае з вобразам аўтара ў рамане: ён уключаны ў аповед і яго лінія раўназначная лініі галоўнай гераіні. Іншымі словамі, Наратар — такі ж персанаж рамана, як і Вераніка, іх лініі ідуць паралельна адна адной. У яго свой вобраз Веранікі, які, між іншым, адрозніваецца ад таго, што прадстаўлены ў рамане: «*...гульня абражала* ***маю*** *Вераніку — можа,* ***іхную*** *й не, але маю — дакладна* (вылуч. намі. — *С. Т.*)» [1, с. 237]. Ён нават вядзе з Веранікай своеасаблівы аднабаковы дыялог, які мае форму прамога звароту да гераіні: «*Ніколі не хавай мяне, прашу цябе. Калі нашай гісторыі не наканавана спаткаць прыдуманы мной канец, і мне давядзецца пайсьці першым, не давай ім закапаць мяне. ... І ня плач. Прыгадай даждлівы, паўночны партовы горад, цягнікі й маю няголенасьць. А потым кінь у агонь*» [1, с. 238–239]. Такім чынам, хранатоп Наратара лакалізаваны ў сваёй прасторы, якая перасякаецца з прасторай іншых хранатопаў, але не пранікае і не ўзаемадзейнічае з імі, бо мае герметычны характар.

Раман мазаічны, і гэтая мазаічнасць абумоўлена постмадэрнісцкай дэцэнтрацыяй: усе сюжэтныя лініі маюць аднолькавае значэнне адносна адна адной. У постмадэрнісцкім тэксце не можа быць падзелу на галоўную і другасную лініі — А. Бахарэвіч відавочна вытрымлівае гэты прынцып. Сюжэтная лінія, звязаная з Веранікай, развіваецца ў межах **пяці хранатопаў**:

1) дзяцінства і школьныя гады (эпізоды са школьнага жыцця і піянерскіх лагераў, Мінск);

2) навучанне ў ВНУ і студэнцкія гады, Мінск;

3) першая праца (Цэнтр дзіцячай творчасці, Мінск);

4) другая праца (раённая адміністрацыя, Мінск);

5) прастора анлайн-гульні (Інтэрнэт).

Тэкст А. Бахарэвіча арганізаваны па рызаматычным прынцыпе — сюжэт развіваецца нелінейна. Як і ў большасці постмадэрнісцкіх раманаў, усе хранатопы пераплятаюцца, акцэнт на якім-небудзь канкрэтным адсутнічае. Таму можна зрабіць выснову, што ўсе яны раўнапраўныя ў прасторы рамана. Акрамя таго, у якасці шостага хранатопу выступае хранатоп Наратара (сучаснасць, Гамбург). Гарады ў рамане не называюцца, але яны лёгка атрыбутуюцца з дробных дэталяў апісання і агульнага кантэксту.

Яшчэ адзін прыклад постмадэрнісцкай стратэгіі знаходзім у 7-й главе. Размова ідзе пра дэканструкцыю жыццёвых штампаў і клішэ: А. Бахарэвіч пералічвае спосабы, з дапамогай якіх можна «мець» чалавека (дарэчы, пракладна тое ж самае бачым у рамане У. Сарокіна «Норма», дзе гаворка ідзе пра «нормы» чалавечага жыцця ад нараджэння да смерці). Як і ў сарокінскім рамане, спіс-пералік Бахарэвіча адлюстроўвае амаль усе сферы жыцця звычайнага чалавека перабудовачнай і постперабудовачнай эпохі: «Паасобку, удвох, утрох, учацьвярох, ротай, батальёнам, палком, ветэранскай арганізацыяй, хакейнай камандай, сям’ёй, дзявятай бэ клясай, мастацкім гуртком, літаратурным аб’яднаньнем, рэдакцыяй газеты, палітычнай партыяй ... » [1, с. 218]. Трэба адзначыць, што ў дадзеным выпадку аўтарам скарыстана яшчэ адна

постмадэрнісцкая стратэгія — татальная іронія да ўсяго. Гэта бачна з таго, што ў спіс на роўных правах трапляюць як сур'ёзныя сферы жыцця, так і досыць камічныя. Усе яны аднолькава з'яўляюцца аб'ектам аўтарскай дэканструкцыі.

Існуюць розныя погляды на постмадэрнізм, якія больш ці менш карэлююць паміж сабой. Для таго, каб выявіць постмадэрнісцкія стратэгіі А. Бахарэвіча, у якасці асновы возьмем **класіфікацыю постмадэрнісцкіх прыкмет**, прапанаваную Іхабам Хасанам:

1. «Няпэўнасць, якая ўключае ў сябе ўсе віды няяснасцей, двухсэнсоўнасцей, разрываў аповеду, перастановак» [цыт. па: 3, с. 57]. У рамане «Сарока на шыбеніцы» гэты прынцып працуе на поўную моц, таму што чытачу сапраўды не заўсёды ясна, што з'яўляецца кропкай адліку для аўтара; хранатопы перамешаныя. Нават дачытаўшы твор да канца, чытач не ўпэўнены ў сваім успрыняцці; сам тэкст множыць безліч інтэрпрэтацый.

2. «Фрагментарнасць. Мастак-постмадэрніст займаецца дэканструкцыяй, аддае перавагу калажу, мантажу, выкарыстоўвае гатовы ці раз'яднаны літаратурны тэкст» [цыт. па: 3, с. 57]. Сапраўды, структура рамана поўнасцю адпавядае гэтаму прынцыпу. Фрагментарнасць дае магчымасць аўтару расказаць некалькі гісторый паралельна, не робячы акцэнта на нейкай канкрэтнай. Усе гісторыі адначасова і галоўныя, і другарадныя.

3. «Дэкананізацыя, якая адносіцца да ўсіх канонаў і ўсіх афіцыйных умоўнасцей» [3, с. 58]. Як і тыповы постмадэрнісцкі тэкст, раман А. Бахарэвіча напісаны па-над усімі канонамі. Аўтар стварае асабістую прастору, чужыя коды выступаюць хутчэй не як традыцыя, а як аб'ект літаратурнай рэцэпцыі. Відавочна, што А. Бахарэвіч не мае патрэбы ні ў якіх канонах, на першы план выходзіць самакаштоўнасць створанага тэксту. Часткова аб'ектам дэкананізацыі з'яўляецца П. Каэльё, з раманам якога беларускі пісьменнік уваходзіць у нябачны інтэртэкстуальны дыялог.

4. «Безасабовасць, павярхоўнасць. Постмадэрнізм адмаўляецца ад традыцыйнага "я", узмацняе сціранне асобы, падкрэслівае множнасць "я"» [3, с. 58]. Галоўная гераіня Вераніка знаходзіцца ў стане пошукаў свайго «я». Гэта праяўляецца як на ўзроўні сюжэта (яна трапляе ў камп'ютарную анлайн-гульню, дзе стварае свой сімулякр Уладу), так і на ўзроўні арганізацыі тэксту («я» Веранікі «рассыпана» па рамане, размножана вялікай колькасцю гісторый, якія расказвае пра яе Наратар).

5. «Неўяўляльнае. Мастацтва постмадэрнізму ірэалістычнае і антыіканаграфічнае» [3, с. 58]. Уявіць нейкую паслядоўнасць падзей ці цэласны вобраз гераіні чытач не мае магчымасці, таму што раман адмыслова фрагментарны, дэцэнтраваны.

6. Іронія. У адрозненне ад рэалістычнай ці мадэрнісцкай іроніі, якая скіравана на нейкі аб'ект, постмадэрнісцкая іронія мае татальны характар. Іншымі словамі, аб'ектам іроніі становяцца ўсе і ўсё. Аўтарская іронія ў рамане відавочная: яна перадаецца і Наратару, які іранічна ацэньвае сваё становішча, і Вераніцы, якая іранічна ўспрымае людзей вакол сябе і многае з таго, што з ёй адбываецца. Вельмі часта для галоўнай гераіні іронія служыць выйсцем з эмацыйнага тупіку.

7. Гібрыдызацыя (мутантнае змяненне жанраў). Акрэсліць жанр рамана даволі цяжка. Гэта і любоўны раман (хаця, хутчэй «антылюбоўны»), і філасофскі (Вераніка і Наратар спрабуюць спасцігнуць сэнс жыцця), і нават крыху фэнтэзійны (Вераніка трапляе ў анлайн-гульню, дзе звычайныя правілы жыцця папросту не працуюць, але яе сімулякр спрабуе па іх жыць у віртуальнай прасторы).

8. Карнавалізацыя. Безумоўна, элементы карнавалізацыі ў рамане прысутнічаюць у тыя моманты, калі Вераніка ператвараецца ва Уладу — свайго персанажа-сімулякра анлайн-гульні, своеасаблівага alter ego. Гэты персанаж, створаны Веранікай, жыве сваім жыццём і часткова ўвасабляе нерэалізаванае лібіда Веранікі.

9. Перформанс, удзел. Элементы перфарматыўнасці ў рамане таксама ёсць. Яны звязаны з трыма сюжэтнымі ўзроўнямі тэксту:

а) узровень Наратара;

б) узровень Веранікі;

в) узровень Улады.

У Наратара ёсць ілюзія таго, што ён апісвае жыццё Веранікі (насамрэч гэта не зусім тая ж самая Вераніка, а хутчэй нехта, вельмі падобны да яе), у той жа час у Веранікі ёсць ілюзія, што яна кіруе Уладай, але ж гэта таксама ілюзія, таму што на Уладу як персанажа ўздзейнічаюць іншыя героі анлайн-гульні. Яна аднолькава марыянетачная як у дачыненні да Веранікі, так і да іншых удзельнікаў гульні.

10. «Канструктывізм. Постмадэрнізм канструіруе рэальнасць» [3, с. 58]. А. Бахарэвіч у працэсе аповеду канструіруе рэальнасць, якая складаецца са шматлікіх фрагментаў. Прычым гэтых «рэальнасцей» як мінімум тры: рэальнасць Наратара, Веранікі і Улады. Усе яны мадэліруюцца аўтарам па аднолькавым прынцыпе калажнасці.

11. «Іманентнасць. Пры дапамозе новых тэхнічных сродкаў стала магчымым развіць чалавечыя пачуцці — ахапіць свет ад таямніц падсвядомасці да чорных дзірак у космасе і перавесці яго на мову знакаў, пераўтварыўшы прыроду ў культуру, у іманентную семіятычную сістэму» [3, с. 58]. Створаныя аўтарам у рамане некалькі светаў не маюць акрэсленых межаў і таму яны ўзаемапранікальныя. Як і ўсе постмадэрністы, А. Бахарэвіч у гэтым рамане адмаўляецца ад апазіцый «верх — ніз», «чорнае — белае» і г. д., што дазваляе яму перастварацъ рэальнасць такімі спосабамі, якія падаюцца яму найбольш адэкватнымі.

Асаблівага каментару патрабуюць некаторыя постмадэрнісцкія катэгорыі ў дачыненні да «Сарокі на шыбеніцы». Паняцце, якое прапанаваў Дэрыда, — *дэканструкцыя як дэцэнтрацыя* — рэалізавана ў рамане на практыцы. Дэканструкцыя ў першую чаргу праявілася ў рамане ў тым, што яна скіравана на дэцэнтрацыю тэксту, у выніку чаго ён страчвае сваю лінейнасць. Але класічнай рызомы не атрымліваецца, бо яна прадугледжвае ўсё ж такі нейкі нябачны стрыжань, якога ў рамане няма. Сюжэты і фрагменты знаходзяцца тут у раўнапраўных адносінах. Здаецца, метасюжэтам усіх прасторавых пластоў тэксту

з’яўляецца пошук сэнсу жыцця і ўсведамленне таго, што ва ўсіх гэты сэнс розны і вербалізаваць яго цяжка.

Усведамляючы немагчымасць дакладных дэфініцый і множнасць ісцін, Бахарэвіч рэалізуе ў рамане яшчэ адзін постмадэрнісцкі прынцып — *свет як тэкст*. З гэтага боку важны не канчатковы вынік (яго аўтар выдае з першых старонак), а сам працэс таго, як ён фарміраваўся і з якіх складнікаў утвараецца. Пісьменнік прапаноўвае чытачу самастойна рэканструяваць логіку развіцця сюжэта. Зразумела, што ў кожнага яна будзе сваёй, не падобнай да іншых.

Базавая для постмадэрнізму *катэгорыя гульні* таксама прысутнічае ў рамане. Праз гульню адкрываюцца якасці чалавека, і таму адзін з хранатопаў тэксту ўвасабляе прастору анлайн-гульні, у якую трапляе Вераніка і дзе яна стварае свой сімулякр Уладу. Але у прасторы рамана ў цэлым Улада — такі ж персанаж, як і Вераніка, мае з ёй роўныя правы. Дарэчы, сама Вераніка (і ў тэксце на гэта ёсць намёкі) можа з’яўляцца сімулякрам, створаным Наратарам, а Наратар, у сваю чаргу, сімулякрам аўтара, бо насамрэч з’яўляецца яго alter ego. Такім чынам, тыповая постмадэрнісцкая напластаванасць таксама характэрна для рамана.

У заключэнне мае сэнс адзначыць, што «Сарока на шыбеніцы» — адна з першых (ці не першая?) ластавак постмадэрнізму ў сучаснай беларускай літаратуры. У працэсе аналізу рамана стала відавочным, што беларуская літаратура цалкам падрыхтаваная да гэтай мастацкай сістэмы. Нягледзячы на вялікае спазненне гэтай з’явы ў беларускім літаратурным працэсе, яна мае ўсе шансы для хуткага і, што яшчэ важней, прадуктыўнага развіцця.

Літаратура

1. Бахарэвіч, А. Сарока на шыбеніцы / А. Бахарэвіч. — Менск: І. П. Логвінаў, 2009. — 354 с.
2. Скоропанова, И. С. Модификации постмодернизма в русской литературе / И. С. Скоропанова // Художественная литература: Проблемы исторического развития, функционирования и интерпретации текста: сб. науч. тр. / Под ред. В. И. Самусенко. — Минск: Ин-т совр. знаний, 2000. — Ч. 1. — С. 9–15.
3. Скоропанова, И. С. Русская постмодернистская литература: учеб. пособие / И. С. Скоропанова. — М.: Флинта; Наука, 1999. — 608 с.

Тетяна Урись (Київ)

ТЕНДЕНЦІЇ РОЗВИТКУ СУЧАСНОЇ УКРАЇНСЬКОЇ ЛІТЕРАТУРИ ПЕРІОДУ 90-Х РОКІВ XX — ПОЧАТКУ XXI СТОЛІТТЯ.

Кінець XX ст. — початок XXI ст. — це період українських літературних експериментів. Проблема співвідношення традицій і новацій в літературі не нова. У переломні періоди, коли відмирає якесь одне літературне явище і зароджується інше, відбувається одночасне існування старих, уже існуючих елементів, та становлення і розвиток нових. В означений період відбувається синхронний розвиток та взаємодія традиції, авангарду, модерну та постмодерну.

Мета статті — розкрити основні тенденції в розвитку сучасного українського літературного процесу, охарактеризувати традиції та новації українських письменників періоду 90-х років XX ст. — початку XXI ст.

Досліджуваний період є знаковим для України, оскільки саме в цей час наша держава отримала офіційну незалежність, що у свою чергу дало поштовх до розвитку багатьох суспільних процесів на її території. Що ж до літератури, то письменники відчули «смак» свободи творчості, відсутність жорсткої цензури та безліч можливостей: довільно обирати тематику творів та вільно наснажувати її власними, а не запропонованими «згори» ідеями, відповідно тексти звільнялися від політичної заангажованості, характерної для радянської літератури, і набували сучасного звучання. Микола Ткачук в одній зі своїх статей писав про докорінні зміни в характері розвитку літературного процесу, оскільки «проходило відкидання догматичних схем розвитку літератури в заідеологізованих рамках «соціалістичного реалізму» й інтенсивний пошук нових естетичних способів моделювання й відбиття дійсності» [8, с. 1]. Тож кінець ХХ ст. — початок ХХІ ст. — один із най цікавіших періодів у мистецтві та суспільному житті. Це був період, коли в літературі почали з'являтися нові теми, нові підходи до творчості, нові літературні угрупування («Бу-Ба-Бу», «ЛуГоСад», «Пропала грамота», «Нова деґенерація», «Червона Фіра» та ін.). Разом із цим письменники зіштовхнулися з деякими проблемами: економічний колапс у країні, спад книговидавництва, державні видавничі механізми вже не діяли, комерційних ще не було, тому поставала проблема з друком та популяризацією творів.

Період незалежності України призвів до тотальної переоцінки цінностей у суспільстві, і відкрив шлях до поширення нового напряму в літературі — постмодернізму, метою якого є вразити та здивувати читача, привернути його увагу. Задля такого епатажу письменники вдаються до еклектики, синкретизму, поєднування непоєднуваного тощо.

На початку 90-х рр. ХХ ст. ідеї постмодернізму спричинили початок літературної дискусії, в якій брали участь Т. Денисова, Г. Сиваченко, С. Андрусів, М. Павлишин, О. Ільницький, І. Фізер. У другій половині 90-х рр. до цієї дискусії долучилися й молоді українські критики: І. Бондар-Терещенко, Є. Баран, С. Квіт, Т. Кравченко, Р. Семків та ін. Кожен із науковців мав власне уявлення про постмодернізм, тому єдиної думки чи конкретного визначення цього явища в ході дискусії вироблено не було. Загалом у сучасній критиці постмодернізму протиставляють традиціоналізм (традицію), що має підґрунтям національну самобутність та ідентичність нації та її літератури.

Поруч із постмодерністами працює й генерація письменників, які зберігають і творчо осмислюють літературні традиції (Ігор Павлюк, Павло Вольвач, Марія Матіос та ін.). Для їх доробку характерний творчий пошук, що виявляє себе в розширенні жанрового і стильового спектрів літератури.

Дослідники намагаються класифікувати творчість авторів українського постмодерну. Р. Харчук визначила три принципи, на основі яких науковці створюють класифікації цього літературного явища: генераційний (Леся Демська, Володимир Єшкілєв, Ігор Бондар-Терещенко), географічний, або ж територіальний (Наталя Білоцерківець, Володимир Даниленко), принцип естетичної, стильової орієнтації (Тамара Гундорова, Володимир Єшкілєв, Роксана Харчук).

Класифікації Р. Харчук та Т. Гундорової, на нашу думку, найбільш точно характеризують літературний процес періоду постмодерну.

Роксана Харчук свого часу здійснила спробу класифікувати сучасних авторів, поділивши їх на «західників» і «ґрунтівців». До перших вона зараховувала письменників, зорієнтованих на західну культурну традицію (Ю. Андрухович, Ю. Іздрик, В. Єшкілєв), а до других — зорієнтованих на власну традицію (В. Медвідь, Є. Пашковський, О. Ульяненко) [9, с. 20].

Цінності — це поняття, яке вказує на культурне, суспільне або ж особистісне значення явищ і фактів дійсності. **Аксіологія** — філософська наука про природу цінностей, їх місце в реальності і про структуру ціннісного світу,

тобто про зв'язок різних цінностей між собою, з соціальними і культурними факторами і структурою особистості. У літературознавстві та мистецтвознавстві аксіологія — це вчення про художні цінності. На основі розуміння їх природи літературознавці розробляють теорію літературної критики, сприймання та інтерпретації творів літератури, їх функціонування серед різних читацьких кіл.

Критика називає М. Матіос найталановитішою і найпрацездатнішою українською письменницею, «гранд-дамою української літератури», творчість якої є найстрокатішою у жанровому відношенні: повість, бульварний роман, книга кулінарних рецептів, роман-памфлет, сага у новелах. Письменниця рішуче відстоює традиційні українські цінності. Науковці відзначають такі особливості її творчості, як звернення до фольклористики та історії українського народу, бачення повсякденного реального життя як театру абсурду, апокаліптичного карнавалу та інтертекстуальність.

Прозові тексти М. Матіос представляють, моделюють, віртуалізують історію, що відбувається з людиною, людьми і подані густими, нерідко запашними шматками соціумного життя [3, с. 66].

Твір письменниці «Життя коротке, щоб казати "ні"» просякнутий відвертістю, переживаннями зрілої жінки, яка прагне кохання. У повісті перед читачами постає жінка 45-ти років, вдова, яка має дорослих дітей та добру репутацію. Життя головної героїні з її покійним чоловіком Василем було досить розміреним, не було пристрасті, шаленого вихору почуттів, але був спокій, стабільність. Коли вона згадує його, то розуміє, що: «*більше плаче за своїм спокоєм з ним і за тією ясністю в усьому…*» [9, с. 21].

І тут раптом, розвіюючи сірість безвихідних буднів, з'являється він, чоловік, який змушує носити «валеріану замість обручки», «чоловік-невидимка, чоловік-невловимка». Чоловік, старший від сина всього на п'ять років, який у божевільній кориді *«виконував дві ролі одночасно: тореадора (з двома червоними полотнищами) і бика»* [9, с. 7]. «Прогнозований добробут» залишився позаду.

Героїня збирається на відпочинок до Варни, але один телефонний дзвінок, його голос у трубці Ї і квіткам можна влаштувати поминки. Він має над нею владу, маніпулює Ї жінка це розуміє, але суперечити не може. Усвідомлення того, що цей чоловік *«довший час був допінгом, однак тепер він дедалі частіше ставав депресивними пігулками у самотніх, одноманітних днях»*, затуманюється пристрастю, яка заплющує очі, змушує вибачати все і відчувати себе справжньою царицею на «бенкеті життя» [9, с. 11].

М. Матіос майстерно зображує напружений психологічний стан головної героїні. Потік спогадів, порівняння минулого життя з теперішнім вимальовують образ «розбитої життям», але достатньо сильної жінки. Героїня чекає коханого, їй страшно від тиші та самотності. Час іде, а його все немає, здається, що відлік годин, хвилин, секунд було втрачено. Очікування катує жінку, все, що вона хоче Ї віддати свою любов: *«Нікому в житті я не встигла віддати свою любов. Вона зібралася у мені, як магма, — і точить зсередини вогнем так, що й не здивуюся, якщо мене колись розіб'є інфаркт»* [9, с. 31]. Героїню гнітить те, що

на будь-який «порух магми» з глибин серця вона відповідала «ні». М. Матіос говорить, що у багатьох її героїнь свідомість репресована не стільки суспільними чинниками, скільки внутрішніми: *«Для жіночої свідомості більшого тоталітариста і репресанта, аніж сама жінка, годі знайти. Проблема лежить у площині стосунків «жінка — чоловік». І я це називаю синдромом Анни Кареніної. Коли поглинута пристрастями жінка не може змагатися уже ані із зовнішніми, ані з внутрішніми проблемами. І вибирає шлях найбільш жорстоких репресій стосовно себе самої чи того, хто є об'єктом її марень. В повісті «Життя коротке, щоб казати «ні»…», доведена внутрішніми протиріччями, умотивованими чи не зовсім умотивованими ревнощами, розбалансована муками сумління, поглинута незнаною досі пристрастю жінка зважується на злочин — убивство. Прийняття цього рішення уже жодним чином не залежить від зовнішніх чинників, які могли би відвернути драму...»* [8].

«Щоденник страченої» в сучасному літературному просторі характеризується як психологічна розвідка Марії Матіос. Як зазначає О. Максименко: *«Це імітація щоденника головної героїні, що використовується автором як увиразнення змісту, що представляє авторське «Я» з позиції емоційної співпричетності письменниці до головної героїні з метою формування уявлення про жіночу сутність й відтворення правдивої інформації щодо узагальненого образу жінки сучасного світу»* [7].

З Ларисою Ковальчук читач знайомиться в час, коли вона перебуває в межовій ситуації: фізично в стані «напівжигтя, напівумирання»; морально в стані емоційного напруження, пов'язаного з долею чоловіка, що багато років був об'єктом її палкої пристрасті, а потім двічі вистрелив у неї, за що його чекає покарання. В цій кризовій ситуації жінка знаходить сама себе в стані цілковитої порожнечі й повного збайдужіння: *«...мушу зізнаватися, що не шкодую ні за чим і ні за ким. Хіба що за одним лише чоловіком, який любив спати по діагоналі ліжка, закинувши одну руку за голову, а другою стискаючи мою праву грудь»* [11].

Основою проблематики твору є життєва ситуація Лариси, безмежне кохання та пристрасть до чоловіка, що стають руйнівними для неї та підштовхують до межі між життям, божевіллям та смертю. Становище, в якому опинилась головна героїня, наштовхує її на роздуми, порівняння, пошуки аналогій з історії, з сучасного життя щодо важливості ролі та значення жінки для чоловіка, для родини, для суспільства.

На одній із сторінок щоденника Лариса Ковальчук записала: *«Іноді мені здається, що я просвистую своє життя в чотири пальці»* [11]. Ще частіше жінка називає себе убивцею чи самовбивцею, катом. Не доклавши зусиль до самопізнання й самоствердження себе в бутті на своєму істинному місці, Лариса не реалізувала себе ні в ролі матері, ні в ролі дружини, ні в ролі берегині, ні в ролі коханки. Перед лицем смерті вона відчуває повний крах свого життя, повну його пустоту, як людина, що «розминулася» з собою і своїм життєвим призначенням, не здійснила того абсолютного вибору, що тільки й надає сенсу людському буттю [2].

Сімейна сага «Майже ніколи не навпаки» складається з трьох новел. М. Матіос змальовує життя трьох гуцульських родин — Чев'юків, Варварчуків та Кейванів, які протягом всього твору взаємодіють.

Улюбленим архітектонічним проектом письменниці є «багатоярусність», нанизування дистанційованих часом подій, а найапробованішим композиційним прийомом виступає ретроспективність, зміщена хронологія. Накладання буттєвих історій на казково-містичний світ снів, марень творить досить складне сюжетно-композиційне плетиво.

Твір вражає своєю фабульною та концептуально-стильовою багатошаровістю. По-перше, він являє собою поєднання різночасових епізодів, які сталися у буковинському селі Тисова Рівня за часів Австро-Угорської імперії, першої світової війни та першої третини XX ст. По-друге, авторський задум показати драматичну історію кількох гуцульських родин у межах означеного часу втілюється шляхом осмислення феномену людської долі як на подієвому, так і психологічному, філософському, метафізичному, екзистенційному рівнях. По-третє, письменниця вдається до різних наративних форм: спогаду-сповіді, розповіді-одкровення, внутрішнього мовлення тощо. У глибоко індивідуалізованих «партіях» персонажів, кожна з яких являє собою вивершену світоглядну систему, послідовно повторюється одна проблема — скласти для себе беззаперечне алібі, базоване на власному кодексі поведінки. Фрагментована манера викладу, членування роману на окремі завершені складові має світоглядний сенс, адже світ далеко не цілісний, він розколотий на безліч бачень, сприймань, розумінь [12].

Світ «Майже ніколи не навпаки» дихає складним і невичерпним життям, любов'ю й ненавистю. Письменниця, коли її запитали про що ця книга, відповіла: *«Мені близька теза Ірини Вільде, яка сказала: «Поки я не впораюся із цим маленьким світиком — людським серцем, не візьмусь, просто не зможу сягнути до ширших проблем людського життя». Ця книга — про те, на що здатне людське серце, яке вражене любов'ю, ненавистю, бажанням помсти, заздрістю, і на що воно спроможне у часи випробування радістю і печаллю. Коли мене питали, яка головна думка твору, відповідала і такими ж словами підписувала книжки: «Честь понад усе». Кожен персонаж доводить своє людське алібі морального плану. Воно може видатися для когось жорстокістю чи злом. Я намагаюся розвернути кожну людину так, як розвертають діамант перед прожектором, і з'ясувати, чому людина вчинила, можливо, жорстоко, але справедливо»* [6].

Напружена зміна подій гострофабульних новел (детективної «Чотири — як рідні — брати», еротичної «Будьте здорові, тату», соціально-психологічної «Гойданка життя») у зворотній часовій послідовності дає змогу письменниці розгорнути житейські історії вглиб, дозволяє заглянути у корінь, у найпосутнішу причину людських тріумфів та горя [12].

Отже, М. Матіос у зазначених творах торкається загальнолюдських цінностей, які є невід'ємною складовою духовного життя людини, зокрема жінки. Основними з них є: кохання, материнство, родина, щастя. Основною

проблемою героїв є те, що вони не можуть повноцінно реалізувати ці цінності, що призводить їх до маніакальної пристрасті.

Література

1. Блюмкин, В. Мир моральных ценностей / В. Блюмкин. — М.: Знание, 1981. — 64 с.
2. Вірич, О. Трагедія екзистенційного не вибору (на матеріалі «Щоденника страченої» М. Матіос [Електронний ресурс] / О. Вірич. — Режим доступу: http://www.westudents.com.ua/4240-tragedya-ekzistencynogo-ne-viboru-na-materal-schodennika-strachenoyi-m.matos.html
3. Голобородько, Я. Буковинська орнаментика Марії Матіос / Я. Голобородько // Вісн. національної академії наук України. — 2008. — № 3. — С. 66−73.
4. Кавалеров, А. Цінність у соціокультурній трансформації / А. Кавалеров. — Одеса: Астропринт, 2002. — 221 с.
5. Леонтьев, Д. Философский энциклопедический словарь / Д. Леонтьев. — М.: Просвещение, 1989. — 387 с.
6. Люблю негідників, яких вимальовую у своїх книжках [Електронний ресурс]. — Режим доступу: http://molbuk.ua/2007/09/20/ljublju-negdnikv-jakikh-vimalovuju-u.html
7. Максименко, О. Щоденник страченої Марії Матіос — щоденник-імітація [Електронний ресурс] // О. Максименко — Режим доступу: http://archive.nbuv.gov.ua/portal/Soc_Gum/Vlush/Filol/2013_4_2/20.pdf
8. Матіос, М. Внутрішній опір жінки в репресивних умовах існування / М. Матіос // Доповідь на щорічних «франківських читаннях» у Нагуєвичах. — Режим доступу: http://www.mariamatios.com.ua/ru/smi/vystupleniya/vnutr_shn_j_op_r/
9. Матіос, М. Життя коротке. Книга прози / М. Матіос. — Львів: Кальварія, 2001. — 236 с.
10. Матіос, М. Майже ніколи не навпаки [Електронний ресурс] / М. Матіос. — Режим доступу: http://www.e-reading.biz/bookreader.php/1001186/Matios_-_Mayzhe_nikoli_ne_navpaki.html
11. Матіос, М. Щоденник страченої [Електронний ресурс] / М. Матіос. — Режим доступу: http://www.e-reading.biz/bookreader.php/1001189/Matios_Mariya_-_Mariya_Matios.html
12. Насмінчук, І. Стильова специфіка прози Марії Матіос: до проблеми єдності формальних та змістових чинників [Електронний ресурс] / І. Насмінчук. — Режим доступу: http://archive.nbuv.gov.ua/portal/soc_gum/Npkpnu_fil/2009_18/2_05_Nasmin chukI.pdf
13. Харчук, Р. Сучасна українська проза: Постмодерний період: навч. посіб. / Р. Харчук. — 2-е вид., стереотип. — К.: ВЦ «Академія», 2011. — 248 с.

СЕКЦЫЯ 9
Мастацкі тэкст у лінгвістычным і метадалагічным дыскурсах

Галина Зыкова (Москва)[*]

МАШИНОПИСЬ И КОМПЬЮТЕРНЫЙ НАБОР КАК СПОСОБЫ АВТОРСКОЙ ФИКСАЦИИ ТЕКСТА: КАКИЕ ТЕКСТОЛОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ ОНИ МОГУТ ПОРОЖДАТЬ? (ИЗ ОПЫТА ПОСМЕРТНЫХ ИЗДАНИЙ СТИХОВ ВС. Н. НЕКРАСОВА)

В текстологии по умолчанию признавалось, что материальный носитель текста есть по отношению к самому тексту нечто вполне внешнее, незначимое (хотя, конечно, этот носитель может быть источником сведений, прежде всего основанием для датировок, чем и занимается палеография). Известно, что авангардисты попытались пересмотреть эту вроде бы неотменяемую истину, так, Крученых в манифесте «Фактура слова» (1923) среди факторов, формирующих именно текст, называет именно то, что всегда было принято относить к области «случайного», находящегося вне текста: «6) фактура начертания (почерк, шрифт, набор, рисунки и украшения, правописание, двойное, тройное написание и т. д.), 7) фактура раскраски: цвет буквы, живопись, полихромия, 8) фактура чтения: декламация, пение, хор, оркестр, публичные выступления…» [1].

Такие высказывания, кажется, оценивались преимущественно как выражение субъективного мнения художника о своем творчестве, не влекущее за собой прямых практических последствий для, например, позднейших издателей; так, «фактурой начертания» и «фактурой раскраски» в текстах молодого В. Маяковского составители позднейших критических изданий, как известно, пренебрегали — чтобы удешевить книгу? ради «удобопонятности», боясь обвинений в формализме?

Однако свойства материальных носителей могут оказаться такими, что ими не получается просто пренебречь, «отказавшись от лишнего». Публикатору, который имеет дело с машинописью и готовит на ее основе книгу, в некоторых случаях — не берусь судить, насколько частых — приходится производить что-то вроде перевода с одного языка на другой; по крайней мере, именно такой перевод (приблизительность, неполная точность которого ощущалась постоянно) проделывали публикаторы авторского свода Вс. Н. Некрасова, зафиксированного в беловой машинописи в начале 1980-х гг. [2]; схожий опыт у меня был недавно при сверке набора с оригиналами для издания, воспроизводящего самиздатские сборники и еще один машинописный авторский свод, начала семидесятых годов [3].

[*]Работа осуществлена в рамках проекта «Социокультурная история литературы: метод и инструментарий» лаборатории «Кросс-культурная история литературы» Центра фундаментальных исследований НИУ ВШЭ.

В случае с машинописью Вс. Н. Некрасова текстологические проблемы, которые все время возникают перед публикатором и которые вряд ли удается вполне разрешить, связаны с тем, что перед нами визуальная поэзия, т. е. такая, в которой потенциально значим любой отступ и интервал, расположение текста на странице. Книжный набор имеет дело со сравнительно ясными вещами: вот отступ на 1 пункт, на 2 пункта; вот интервал одинарный, полуторный и т. п.; интервал, конечно, технически можно сделать любым, но работая на компьютере (или верстая книжку каким-то более старым способом), мы заведомо сознательно делаем отступ или интервал таким, а не другим. Для рукописи — если для автора важен графический образ текста — естественно предположить, что автор изобразил именно то, что хотел. А вот работа с пишущей машинкой, как оказалось, привносит массу потенциально случайного: например, текст не выровнен по левому краю, мы знаем (в том числе по качественным прижизненным публикациям), что у автора отступ (иногда совсем небольшой) — это прием; между тем машинопись прозы, например, критических статей, где отступ приемом никак быть не может, показывает, что эта кривая линия левого края вполне может быть и технической неаккуратностью, случайностью; для автора значимы интервалы, он играет с ними постоянно, это заранее известно — но в конкретной, этой машинописи сплошь и рядом неясно, на самом ли деле этот интервал задуман как больший? и если больший, то насколько? Единственным идеальным решением здесь было бы факсимиле, т. е. отказ от интерпретации, от того, чтобы отделить случайное от намеренного, т. е. текстологическая капитуляция.

Когда автор фиксирует свой текст на компьютере, то с этим для текстолога будет связана опасность другого рода: с высокой степенью вероятности он столкнется с тем, что, пусть редакций (или вариантов) произведения осталось много, источников для обнаружения случайных авторских ошибок / описок нет: по техническим причинам, потому что, продолжая работу над текстом, автор не переписывает его заново (как это было до компьютеров), а копирует исходный файл, со всеми его ошибками, как это делаем и все мы. С таким отсутствием необходимых дополнительных источников — при изобилии редакций — мне пришлось столкнуться, когда я готовила книгу Вс. Н. Некрасова «Самара (слайд-программа) и другие стихи о городах» [4].

Литература

1. Крученых, А. Е. Фактура слова / А. Е. Крученых. — М.: МАФ, 1923.
2. Некрасов, Вс. Н. Стихи 1956–1983 / Вс. Н. Некрасов // Подготовка текста М. А. Сухотина, Г. В. Зыковой, Е. Н. Пенской. — Вологда: Библиотека московского концептуализма, 2012.
3. Некрасов Вс. Н. Авторский самиздат: 1961–1976 / Вс. Н. Некрасов. — М.: Совпадение, 2013.
4. Некрасов Вс. Н. Самара (слайд-программа) и другие стихи о городах / Вс. Н. Некрасов. — Самара: Цирк «Олимп», 2013.

Зінаіда Бадзевіч (Мінск)

ДЗЕЯСЛОЎ У МОВЕ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ ЦЁТКІ

Дзеяслоў як адна з найбольш ужывальных часцін мовы (пасля назоўніка) мае не толькі разгалінаваную сістэму форм у мове, але і надзвычай багаты сваім зместам. Ім перадаецца дзеянне не абстрактна, не адцягнена, а ў пэўным часе «і з паказаннем усіх адносін, якія выражаюцца выказнікам» [1, с. 411].

Адметнай рысай творчасці многіх пісьменнікаў, у тым ліку і Цёткі (Алаізы Пашкевіч), з'яўляецца выкарыстанне эмацыянальна-псіхалагічных, эстэтычных магчымасцей дзеяслова. Невыпадкова французскі паэт Шарль Бадлер, падкрэсліваючы эмацыянальна-эстэтычную вартасць дзеяслова, называў дзеяслоў «анёлам руху, без якога фраза мёртвая». Сугучную думку выказаў і рускі пісьменнік А. М. Талстой, які пісаў: «Знайсці правільны дзеяслоў для фразы — гэта значыць даць рух фразе» [2, с. 411].

Творчасць Цёткі, «жанчыны з бунтарскай душой», паэтэсы, рэвалюцыянеркі, асветніцы, настаўніцы, артысткі, фельчара, сястры міласэрнасці, рэдактара, публіцыста, — гэта адбітак рамантычнага бачання свету. Паэтэса радасна і непасрэдна захаплялася момантам руху і дзеяння як у жыцці, так і ў прыродзе. Чытаючы яе паэтычныя творы, адразу кідаецца ў вочы незвычайная дынаміка з'яў, пачуццяў, колераў, гукаў, якая дасягаецца незвычайнай «працаздольнасцю» дзеясловаў.

Вось як апісвае Цётка ясны летні дзень, поўны не толькі разнастайных гукаў і фарбаў, але найперш дзеянняў, рухаў: гаспадар *«**бяжыць** з касою на зялёну сенажаць», «Сонца зерне **налівае**, бусл **клякоча** на гумні» , «бабы **мыюць**, хусты **рубяць**», «чутна — ў лесе недзе **трубяць**, **сочаць** гнёзды пастухі», «**дрыжыць** колас, серп аж **пеніць**, **сыпле** іскры з-пад зубоў. Перавясла рукі **шчэміць**, сноп **ісці скакаць** гатоў», «Нат і копы **пайшлі** ў тан. Ім у тахту пожня **свішча**, **падцінае** барабан», « А каліны ды маліны **цягнуць** ручкі за хмялём», «Вецер у губы сабе **дзьме**», «Лес **махае** галавою, дуб, **нахмурыўшыся, спіць**», «Вольха **шэпча** з лешчыною», «Беразняк кусты **смяшыць**», палетак «**б'ецца** ў жывых фарбах»* [3, с. 28–30].

Тая ж дынаміка рухаў, інтэнсіўнасць дзеянняў характэрна і пры апісанні местачковага кірмашу: «***Бягуць** хлопцы і дзяўчаты, **гоняць** быдла, жарабяты», «поўны рынак людцаў крыку, а што смеху, а што рыку! **Гогуць** гускі, **пішчыць** свінне», «Янук **годзіць** новы боты, Юрка **свішча** для ахвоты*».

Агромністай энергіяй, напорам пачуццяў, дзеянняў і рухаў напоўнены вершаваныя радкі, калі паэтэса звяртаецца да «дзецюкоў» увесну. І зноў жа крыніцай экспрэсіі з'яўляецца дзеяслоў у імператыўнай форме:

Дзецюкі, гу-гу-гу!!!
Ўжо вясна на дварэ!
Ўжо трава на лугу,
Ужо кветкі ў траве!
Гэй хутчэй за саху,
*Ды **араць**, ды **араць**...*
Ды ўсім у спяху
***Засяваць, засяваць**...*

Ды глыбей, ўсё глыбей
Зерне ***сыпаць*** *ў зямлю…*
Ды хутчэй, усё хутчэй
Упраўляці *раллю* [2, с. 87].

Бясспрэчна, вясна без рухаў і дзеянняў не ўяўляецца. Абуджэнне прыроды — гэта ўжо рух, змена ў навакольным асяроддзі. Кожны вясновы дзень патрабуе актыўнага дзеяння, інтэнсіўнага руху, трэба ў час зааараць і засеяць, каб хапіла хлеба на год. Таму імператыўныя двухкратныя дзеяслоўныя формы *(ды) араць, (ды) араць, засяваць, засяваць*, аднакратныя *сыпаць, упраўляці* не толькі актуалізуюць сэнсавыя адценні слоў, але і ўзмацняюць агульны эмацыянальны напал верша «Скора прыйдзе вясна», адлюстроўваюць рэаліі сялянскага жыцця.

Абвостранай душэўнай рэакцыяй смутку, узмоцненай сілай Цётчынага перажывання і пяшчоты прасякнуты радкі верша «Восень»

Восень «*гусей гоніць з бацянамі ў далёкі край за моры*». І з гэтым ключом птушак «узнімаецца» цэлы ланцужок дзеясловаў загаднага ладу са значэннем папераджальнасці, перасцярогі *не кляніце, гаварыце, не забіла, не ўкусіла* ці ў форме інфінітыва *вярнуцца клекатаці, забаўляці,* што надае вершаванаму радку гутарковасць, прыналежнасць вуснай форме маўлення:

Птушкі мілы, ***не кляніце****,*
А малітвы ***гаварыце****,*
Каб вас хваля ***не забіла****,*
Каб акула ***не ўкусіла****,*
Каб ***вярнуцца клекатаці***
Пастушкоў ***забаўляці*** [2, с. 40].

Упэўнена і пераканаўча гучыць голас паэткі, «выкрасаючы» з кожнага дзеяслова глыбінны сэнс, у вершы «На магіле». Тут няма цішыні і спакою, статычнасці, як гэта звычайна бывае, а, наадварот, прысутнічае дынаміка рухаў, дзеянняў, бо асноўная тэма верша — гэта не смерць і не быццё, а жыццё і творчасць, і перадаецца ідэя паэтычнага крэда паэтэсы простымі дзеяслоўнымі формамі закончанага трывання будучага часу са значэннем сцвярджальнасці і пераканасці, што перадае аўтарскую сілу духу:

На магіле ***ўзыду*** *дубам.*
Пачну шаптаць *братнім губам*
Аб іх долі, аб свабодзе,
Стану *песняй у народзе!*
Пастух дудку з мяне ***скруціць****,*
Як ***зайграе****, кроў* ***замуціць***… [3, с. 38].

Далей зноў пайшла дынаміка развіцця дзеяння, працэсу. І ўсё гэта перадаецца цэлым радам экспрэсіўных дзеясловаў: «*Гострыя зубы , як бы з пілы,* ***колюць, рэжуць, цягнуць жылы, смаляць, паляць, пякуць, студзяць****, старых, малых са сна* ***будзяць****», «а дзе толькі дудка* ***свішча****, — людзі* ***бягуць****, як на йгрышча*».

Як бачым, абвостраным было ўспрыманне паэтэсай усіх праяў тагачаснага жыцця беларускага народа. Зрокам і слыхам, душою і сэрцам, розумам і пачуццямі ўспрымала яна крыўдную рэальнасць жыцця, усё пазна-

чала яркімі і моцнымі дзеясловамі, якія не маглі не крануць, не ўразіць, не абудзіць жыватворнай сілы народа, не запаліць у яго душы агонь надзеі ў лепшую будучыню.

У стылістычных адносінах дзеясловы, ужытыя ў мастацкіх творах Цёткі, з'яўляюцца разнатыпнымі. Найбольш мнагалікую групу складаюць стылістычна-нейтральныя словы: *бегчы, свістаць, заспяваць, слухаць, бачыць, шаптаць, пець, цвісці, сыпаць, зайграць* і інш. Радзей сустракаюцца гутарковыя (размоўныя) дзеясловы тыпу *свіснуць* у значэнні 'украсці' *«у артысты пэндзаль свісну»*, *распладзіцца* у значэнні 'павялічыцца' *«распладзілась стражнікаў», злізаць у* значэнні 'знішчыць' трэба *«злізаць усіх міністраў, бюракратаў, антыхрыстаў»* і інш.

Надзвычай высокай ступенню экспрэсіўнасці надзелены адвыклічнікавыя дзеясловы тыпу *бахаць, войкаць, грукаць, рыкаць, гопаць, пырснуць*.

Вобразнасць дзеяслова асабліва выяўляецца пры яго метафарычным ужыванні. Часцей за ўсё метафарызуюцца стылістычна-нейтральныя дзеясловы, якія набываюць новае кантэкстуальнае значэнне, і найперш значэнне адухаўлення прадметаў рэчаіснасці: *ісці «сноп ісці скакаць гатоў», пайсці «Нат і копы пайшлі ў так»', хадзіць «Будзе смык вастрэй хадзіць», цягнуць «А каліны да маліны цягнуць ручкі за хмялём», сыпаць, пеніць « Серп аж пеніць, сыпле іскры з-пад зубоў», махаць «Лес махае галавой», скакаць «скрыпка скача»* і інш.

Наглядна-пачуццёвае ўспрыманне выклікаюць такія метафарычныя дзеясловы, як *свістаць «пожня свішча», зяваць «кот на прыпечку зяўне», смяшыць «Беразняк кусты смяшыць», скрыпець «вяроўкі шыбенец скрыпяць», рыкаць «хваля стогнам рыкне», ікаць «бераг болем ікне»* і інш.

Семантычны аб'ём дзеясловаў у паэтычных тэкстах Цёткі надзвычай разнастайны. У залежнасці ад адносін працэсу (дзеяння) да суб'екта ці аб'екта можна вылучыць наступныя тэматычныя групы дзеясловаў:

— дзеясловы працяглага нераўтваральнага ўздзеяння: *пясціць, лашчыць, дарыць, смяшыць, свістаць, плакаць* і інш.;
— дзеясловы перамяшчэння; працэс накіраваны на аб'ект і прыводзіць да змены месцазнаходжання аб'ектаў ў прасторы: *штурхаць, ліць, браць, праляцець, узяць, несці* і інш.;
— дзеясловы пераўтваральнага ўздзеяння; аб'ект атрымлівае дадатковую прымету: *«чутна йграйце, гулка йграйце»* і інш.;
— дзеясловы працяглага, нязменнагастану; працэс непасрэдна не накіраваны на аб'ект і не прыводзіць да змен у суб'екце: *спаць, стаяць, ляжаць, сядзець, быць* і інш.;
— дзеясловы зменнага стану; працэс не звязаны з аб'ектам, але прыводзіць да змен у самім суб'екце: *сохнуць, вянуць, худзець, расцвітаць, чырванець* і інш.;
— дзеясловы руху, перамяшчэння ў прасторы: *бегчы, ісці, крочыць, ляцець* і інш.

Шчыруе паэтэса і ўжываннем дзеясловаў са значэннем імгненнасці, аднаразовасці дзеяння, якія ўключаюць у сваю структуру суфікс *-ну-: стукнуць, грукнуць, пырснуць, скінуць, жахнуць* і інш.

Асабліва сэнсавую і мастацкую выразнасць набываюць дзеясловы-імператывы, з дапамогай якіх перадаецца загад, просьба, пажаданне. Без гэтых граматычных формаў, безумоўна, аўтарцы не магчыма было б рэалізаваць сваю рэвалюцыйна-агітацыйную праграму: *«...Цара павесіць трэба!», «Біце ў звоны, біце ў звоны!», «Кіньма спаць», «Не чакайце, нам зямлю, паны, аддайце!», «Не чакайце, не прасеце, звонкіх песень у мяне», «Чуйце, людзі! Чуйце, чуйце, руку дайце!», «пара, людцы, парваць путы!»,* класавую еднасць, роднасць па працы: *«Дайце, жнейкі, серп займісты, дайце гострую касу, змяту з нівы хлеб зярністы», «Хлеб галодным гаспадарам: ешце, людцы, вы нядарам працавалі ўсё лета, закусіце хоць за гэта», «чутна йграць, гулка йграць»* і інш.

Як бачым, з дапамогай дзеясловаў Цётка перадае ўсе тонкія і складаныя рухі жывой і нежывой прыроды. У аўтарскім радку ён характарызуецца гранічнай выразнасцю, сэнсавай ёмістасцю, садзейнічае дынамічнаму развіццю дзеяння і яго вобразнай актуалізацыі.

Літаратура

1. Буслаев, Ф. И. Историческая грамматика русского языка / Ф. И. Буслаев. — М.:Учпедгиз, 1959. — 624 с.
2. Толстой, А. Н. Собрание сочинений: в 10 т. — М., 1961. — Т. 10. — С. 212.
3. Цётка. Творы / Цётка. — Мінск: Маст. літ., 1976.

Ганна Ніжнік, Святлана Якуба (Мінск)

НАЗОЎНІКАВЫЯ І ПРЫМЕТНІКАВЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ З НЕГАТЫЎНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКАЙ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ МОВАХ: АНІМАЛІСТЫЧНЫ КОД

Анімалістычны, ці заалагічны, код культуры, замацаваны ў фразеалагічнай карціне свету, пададзены багатым лінгвакультуралагічным матэрыялам, які складае значную частку нацыянальнай моўнай свядомасці таго ці іншага народа. Пад заалагічным кодам разумеюць «сукупнасць абумоўленых культурай стэрэатыпных уяўленняў пра ўласцівасці, характарыстыкі або асаблівасці паводзін жывёл, што выступаюць як крыніца асэнсавання чалавекам свету і нясуць у дадатак да сваіх прыродных уласцівасцей функцыянальна значныя для культуры сэнсы» [5, с. 296].

На думку А. Грыбасёвай, «незалежна ад таго, з'яўляецца чалавек прыхільнікам тэорыі Дарвіна і з сімпатыяй глядзіць на свайго кроўнага па паходжанні ці верыць апісанню з'яўлення чалавека на свет, змешчанаму ў Кнізе Быцця, у моўным абшары свету, усталяваным чалавецтвам, ён усё падвяргае ацэнцы» [10, 11]. Вельмі часта гэта ацэнка рэчаіснасці ажыццяўляецца шляхам пераносу якасцей і ўласцівасцей, узятых з жывёльнага свету, на свет людзей. Назвы прадстаўнікоў жывёльнага свету, якія належаць да нейтральнай лексікі, пры ўжыванні ў адносінах да чалавека метафарызуюцца і ў асноўным набываюць экспрэсіўную, негатыўную канатацыю (выключэнне складаюць такія жывёлы, як леў, арол і некаторыя іншыя). Найбольш трапныя выразы

затрымліваюцца ў свядомасці народа і пачынаюць пастаянна ўжывацца для характарыстыкі чалавека.

Фразеалагізмы беларускай і польскай моў, што адносяцца да заалагічнага кода, утварыліся ў выніку пераасэнсавання словазлучэнняў, у склад якіх уваходзяць назвы свойскіх і дзікіх жывёл, птушак, рыб, рэптылій і насякомых. Фразеалагічныя адзінкі з анімалістычным кампанентам валодаюць ярка выражанай нацыянальна-культурнай спецыфікай, якая прадвызначае асацыятыўныя сувязі фразем, і з'яўляюцца неад'емнай часткай фразеалагічных адзінак, што выкарыстоўваюцца пры негатыўнай характарыстыцы чалавека. Значную ролю ў стварэнні такіх характарыстык у беларускай і польскай мовах адыгрывае метафара свойскіх жывёл.

Так, для апісання негатыўных рыс характару асобы ў беларускай фразеалогіі выкарыстоўваюцца адзінкі з такімі кампанентамі, як 'асёл', 'баран', 'каза', 'конь', 'цяля', 'кот', 'сабака', 'свіння'. Найбольшую колькасць фразеалагізмаў, што характарызуюць чалавека з адмоўнага боку, складаюць выразы з кампанентам 'сабака'. Пацверджанне думкі, што сабака ў беларусаў з'яўляецца не толькі сімвалам вернасці, але і ўвасабленнем хітрасці, злосці, сквапнасці і іншых якасцей, трэба шукаць у старажытнасці. Першапачаткова ў свядомасці чалавека замацаваўся вобраз сабакі як жывёлы нячыстай, з чартоўскага акружэння. З развіццём цывілізацыі, калі сабака стаў сябрам чалавека, негатыўная канатацыя вобраза сцерлася, і ён пачаў успрымацца як станоўчы. Аднак старажытныя вераванні захаваліся ў памяці беларускага народа і знайшлі сваё адлюстраванне ў фразеалагічных адзінках. Фразеалагізмы з кампанентам 'сабака' характарызуюць някемлівага, вельмі хітрага і пранырлівага чалавека, а таксама таго, хто сам не карыстаецца чымсьці і іншым не дае гэтым пакарыстацца (*дурны, як сабака да году*, *з-пад сучкі яйцо ўкрадзе, сабака на сене*): *Вельмі ж ты ўжо справядлівы, Андруша. Усе вы Шэметы такія. — Не ўсе. Лукаш табе* ***з-пад сучкі яйцо ўкрадзе***. С. Александровіч [7, с. 564]; *Варта было яму толькі ўзяць у рукі гэтую загавораную шкатулку, як зараз жа, з гэтага моманту і наступіла расплата — немагчымасць сваім багаццем пакарыстацца…* ***Сабака на сене***… А. Федарэнка [7, с. 351].

Ужыванне вобразаў казы, асла ў такіх фразеалагічных адзінках, як *адстаўной казы барабаншчык*, *асёл маляваны* выдатна перадаюць народныя традыцыі. Напрыклад, у аснове фразеалагізма *адстаўной казы барабаншчык* ляжыць старажытны звычай. У кірмашовыя дні выводзілі напаказ «вучонага» мядзведзя, а такасама прыбранага «пад казу» хлопчыка-танцора. Іх суправаджаў барабаншчык, звычайна адстаўны салдат, які барабанным боем прыцягваў увагу гледачоў да асноўных «акцёраў» — мядзведзя і «казы». Роля барабаншчыка была самая сціплая і незайздросная. У беларускай мове выраз стаў ужывацца без уліку яго сапраўднага этымалагічнага вобраза (*адстаўной казы барабаншчык* замест *адстаўны казы барабаншчык*) [8, с. 35]. Да фразеалагізмаў, што характарызуюць чалавека з адмоўнага боку, адносіцца ўласнабеларускі *асёл маляваны*, паходжанне якога, паводле І. Я. Лепешава, звязана з існаваннем вандроўных цыркаў, калі адным з удзельнікаў спектакля

быў размаляваны асёл, які, нягледзячы на афарбоўку, не мяняў сваіх паводзін і заставаўся такім жа ўпартым [8, с. 40].

Вобраз распусніка, блудніка ствараецца пры дапамозе фразеалагічнай адзінкі *кот марцовы*. Слова *марцовы* (сакавіцкі) перайшло ў разрад архаізмаў, а лексема *марац* яшчэ захавалася ў некаторых прыказках, напрыклад, *марац адкусіць палец*. Як адзначае У. Коваль, згодна са славянскім павер'ем, «месяц *марац* — 'месяц катоў', таму што ў гэты час паўсюль у паселішчах чутна мяўканне кошак… а ўсе хлопчыкі, народжаныя ў сакавіку, будуць 'за бабамі бегаць'» [4, с. 89]. У беларускіх фраземах падаецца вобраз сляпога кацяняці для характарыстыкі чалавека, які 'не разбіраецца ў тым, што адбываецца ў наваколлі': *Потым ужо з вяршыні дасягнутага чалавек бачыць, як трэба ісці і якім* ***сляпым кацянём*** *ён тыцкаўся, шукаючы дарогу*. М. Лобан [6, с. 568].

Варта адзначыць, што ва ўнутранай форме некаторых беларускіх фразеалагічных адзінак вобраз жывёлы з'яўляецца дамінуючым. Напрыклад, семантыка фразеалагізма *асёл маляваны* амаль цалкам перадаецца кампанентам-заонімам, бо асёл сам па сабе для беларусаў з'яўляецца сімвалам дурасці, недалёкасці. Атрыбутыўны кампанент у гэтай фраземе выконвае не столькі сэнсаўтваральную, колькі экспрэсіўную функцыю. Разам з тым значэнне большасці фразеалагізмаў не вызначаецца адным толькі анімалістычным кампанентам. Напрыклад, у фраземе *кот марцовы* пры стварэнні вобраза раўназначна ўдзельнічаюць абодва кампаненты, і толькі разам яны складаюць значэнне «распуснік, блуднік».

Такія адмоўныя якасці чалавека, як недалёкасць, глупства, характарызуюцца і пры дапамозе фразеалагізмаў *статак бараноў* і *панургаў статак*. Як адзначае Л. М. Якшук, *панургаў статак* — паўкалька, якая ўзнікла на аснове сюжэта з рамана французскага пісьменніка XVI ст. Ф. Рабле «Гарганцюа і Пантагруэль» і мае значэнне 'натоўп, які бяздумна ідзе за кім-небудзь'. Французскі фразеалагізм *moutons de Panurge* (даслоўна: *бараны Панурга, панургавы бараны*) быў недакладна скалькаваны і набыў выгляд *панургаў статак* (магчыма, пад уплывам рускага выразу *стадо баранов*, які мае аналагічнае значэнне) [9, с. 76].

Што да кампанента 'свіння' ў беларускіх фразеалагізмах, то, на думку А. М. Багушэвіча і А. Л. Садоўскай, «асноўная ідэя, што рэпрэзентуецца праз вобраз свінні ў беларускай фразеалогіі — антыномія, неадпаведнасць пэўных жыццёвых з'яў, сітуацый, атрыбутаў, неадпаведнасць унутранай культуры і паводзін чалавека таму сацыяльнаму становішчу, якое ён займае» [1, с. 16]. Сапраўды, беларускі фразеалагізм з кампанентам 'свіння' *свінтус грандыёзус*, які мае кніжнае паходжанне, ужываецца для характарыстыкі ганебнага, няўдзячнага чалавека, нахабніка.

У беларускай фразеалогіі сустракаюцца адзінкавыя назоўнікавыя і прыметнікавыя фразеалагічныя адзінкі з кампанентамі 'кабыла' (*прышый кабыле хвост* — 'лішняя, непатрэбная асоба'), 'конь' (*конь божы* — 'неразумны чалавек'), 'карова' (*як з казы карова* — 'нікуды не варты, дрэнны'), 'цяля' (*ласкавае* (*ліслівае*) *цяля* — 'той, які ўмее дагадзіць і пакарыстацца абставінамі') і іншымі. Варта адзначыць, што вышэйзгаданыя кампаненты-заонімы як

асобныя назвы жывёл у свядомасці носьбітаў мовы зафіксаваліся са станоўчай канатацыяй, аднак пры дапамозе агульнай карціны, створанай фраземамі з гэтымі кампанентамі, чалавеку даецца негатыўная характарыстыка.

Частотнасць выкарыстання той або іншай назвы жывёлы ў польскай фразеалогіі неаднолькавая. Найбольш пашыраны ад'ектыўныя і субстантыўныя фразеалагізмы, у склад якіх уваходзяць назвы такіх свойскіх жывёл, як сабака, вол, баран, казёл, што тлумачыцца іх цесным кантактам з чалавекам. Паводзіны і звычкі гэтых жывёл склалі вобразную аснову пры фарміраванні шматлікіх фразеалагічных адзінак. Так, асёл, баран, казёл, вол асацыіруюцца з упартасцю, недалёкасцю (*uparty jak koziół* 'упарты як казёл', *barania głowa* 'някемлівы', *skończiny osiół* 'чысты дурань', *głupi jak cap* 'дурны як бык'): — *Trudno was przekonać... — Dlaczego trudno?.. Tylko* ***skończonego osła*** *nie można przekonać do słusznej sprawy.* J. Wawrzak [3, c. 397]; — ***Głupiś jak*** *ten* ***baran****! — cisnęła ramionami i porzła.* W. Reymont [2, c. 191]; — *Słuchaj, chłopie! Szkoda mi twojej głowy, ale rozumu nie szkoda, ile żeś jesteś* ***głupi jak cap****.* H. Sienkiewicz [2, c. 238]). У польскай моўнай карціне свету пры дапамозе фразеалагічнай адзінкі *wół roboczy* 'пра таго, хто многа працуе' ствараецца негатыўны вобраз чалавека, які цягне многа рознай даручанай іншымі работы. Г. Дамбровска сцвярджае, што фразеалагізмы з кампанентамі 'асёл', 'баран', 'казёл', 'вол' метафарычна абазначаюць недалёкага чалавека і найчасцей служаць для характарыстыкі мужчыны [11, с. 158].

У польскай фразеалогіі назіраецца вялікая група фразеалагічных адзінак з кампанентам 'сабака', што характарызуюць асобу як: а) злую (*zły jak pies* 'вельмі злы'), б) нікому не патрэбную (*jak pies w kręgielni* 'як бочка без абручоў'), в) няўпэўненую ў сабе (*siedzieć jak pies na płocie* 'адчуваць сябе няўпэўнена'), г) пазбаўленую волі (*ktoś jest uwiązany jak pies na łańcuchu* 'як сабака на ланцугу'), а таксама мужчын, ахвочых да жанчын (*ktoś jest pies na kobiety* 'бабнік').

К. Масёлэк-Класіньска, даследуючы асаблівасці фразелагізмаў з кампанентам 'сабака', адзначае, што польская мова замацавала толькі некаторыя аспекты рэчаіснасці: «Шмат фразеалагізмаў звязана з сабакамі, якія жывуць на вуліцы, і толькі адзін фразеалагізм узнік з назіранняў за жыццём сабакі, які жыве ў доме гаспадароў» [12, с. 75]. Так, пры дапамозе фразеалагічнай адзінкі *delikatne francuskie pieski* 'далікатны, як французскі шчанюк', палякі характарызуюць залішне далікатных людзей, пестуноў: — *Jakoś nie dało się słyszeć, żeby komuś żebra połamali. Od kiedy to takie* ***delikatne francuskie pieski*** *się zrobiliśmy.* S. Wiech [3, c. 176].

Пры дапамозе фразеалагізмаў з кампанентам 'цяля' палякі асуджаюць чалавека невыбітнага, мяккацелага, недалёкага, які баіцца сябе праявіць, пры гэтым акцэнтуецца ўвага на семантычных складніках маладосці і няўпэўненасці: *Cóż to za głupie cielę ta Aniusia, cóż to za głupie* ***cielę marynowane****.* S. Żeromski [2, с. 261]. Праз асацыяцыю з каровай, жывёлай, якая ў сельскай гаспадарцы многіх славянскіх народаў з'яўляецца найбольш шанаванай, успрымаецца як «карміцелька», апісваецца чалавек, з якога цягнуць грошы,

якога выкарыстоўваюць у асабістых мэтах: *dojna krowa* (‘пра крыніцу даходу, што выкарыстоўваюць працяглы час’).

У польскай мове адзначаем фразеалагізм *królik doświadczalny* (‘пра таго, на кім што-небудзь правяраюць, выпрабоўваюць’), заснаваны на назіранні за прафесійнай дзейнасцю чалавека. Пры дапамозе вышэйзгаданай фразеалагічнай адзінкі палякі асуджаюць бязвольную асобу, якая паддаецца на розныя эксперыменты.

Такім чынам, цесны кантакт са свойскімі жывёламі і ўяўленні пра іх замацаваліся ў моўнай карціне свету беларусаў і палякаў у выглядзе фразеалагізмаў, якія перадаюць адметнасці нацыянальнага характару. Ад’ектыўныя і субстантыўныя фраземы беларускай і польскай моў, звязаныя з адмоўнай характарыстыкай чалавека, утрымліваюць анімалістычныя кампаненты, якія маюць негатыўную канатацыю і адлюстроўваюць агульныя міфалагічныя ўяўленні славян пра свойскіх жывёл. Так, беларусы і палякі асуджаюць някемлівасць (*адстаўной казы барабаншчык*, *głupi jak cap*), упартасць (*асёл маляваны, uparty jak kozioł*) і іншыя якасці. Мужчын, ахвочых да жанчын, палякі характарызуюць пры дапамозе фразеалагізма з кампанентам ‘сабака’ (*ktoś jest pies na kobiety)*, а беларусы — з кампанентам ‘кот’ (*кот марцовы*).

У беларускай фразеалогіі адлюстраваліся такія негатыўныя рысы характару, як хітрасць і пранырлівасць (*з-пад сучкі яйцо ўкрадзе*), няздатнасць ні да чога (*як з казы карова*), уменне дагадзіць і скарыстаць сітуацыю (*ласкавае цяля*) і інш.

Асаблівасцю польскай фразеалогіі з’яўляецца адмоўнае стаўленне да асобы працавітай, але мяккацелай (*wół roboczy)*, да залішне далікатных (*delikatne francuskie pieski)*, няўпэўненых (*siedzieć jak pies na płocie*), бязвольных (*ktoś jest uwiązany jak pies na łańcuchu*) і злых (*zły jak pies*) людзей. Адмоўна ацэньваецца асоба, якую можна выкарыстаць у асабістых мэтах (*dojna krowa*).

Такім чынам, даследаванне назоўнікавых і прыметнікавых фразем з адмоўнай характарыстыкай чалавека праз метафару свойскіх жывёл анамалістычнага кода дазваляе прасачыць логіку і адметнасць мыслення носьбітаў мовы пры адборы пэўных кампанентаў з шэрагу іншых, адзначыць ментальныя асаблівасці прадстаўнікоў беларускага і польскага этнасаў.

Літаратура

1. Багушэвіч, А. М. Вобраз свінні ў беларускай фразеалогіі / А. М. Багушэвіч, А. Л. Садоўская // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы. — Мінск: РІВШ, 2008. — Вып. 7. — С. 16−19.
2. Гюлумянц, К. Польско-русский фразеологический словарь: в 2 т. / К. Гюлумянц. — Минск: Экономпресс, 2004. — Т. 1: А — М. — 688 с.
3. Гюлумянц, К. Польско-русский фразеологический словарь: в 2 т. / К. Гюлумянц. — Минск: Экономпресс, 2004. — Т. 2: Н — Я. — 719 с.
4. Коваль, У. І. Народныя ўяўленні, павер’і і прыкметы: давед. па ўсходнеславянскай міфалогіі / У. І. Коваль. — Гомель, 1995. — 180 с.
5. Красных, В. В. Свой среди чужих: Миф или реальность? / В. В. Красных. — М.: Гнозис, 2003. — 375 с.
6. Лепешаў, І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў: у 2 т. / І. Я. Лепешаў. — Мінск: Беларуск. энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. — Т. 1: А — Л. — 672 с.

7. Лепешаў, І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў: у 2 т. / І. Я. Лепешаў. — Мінск: Мінск: Беларуск. энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. — Т. 2: М — Я. — 704 с.
8. Лепешаў, І. Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я. Лепешаў. — Мінск: Беларуск. энцыкл. імя П. Броўкі, 2004. — 443 с.
9. Якшук, Л. М. З этымалагічных нататак па фразеалогіі / Л. М. Якшук // Славянская фразеология в ареальном, историческом и этнокультурном аспектах. — Гомель, 2005. — С. 75−79.
10. Grybosiowa, A. Jak historyk języka polskiego rozumie opozycje homo-animal / A. Grybosiowa // Język a kultura. — Wrocław, 2003. — Tom 15. — C. 9−15.
11. Dąbrowska, A. Wężem pożądań wejdę do twej duszy — nazwy zwierząt w polskim słownictwie erotycznym / A. Dąbrowska // Język a kultura. — Wrocław, 2003. — Tom 15. — C. 157−188.
12. Mosiołek-Kłosińska, K. Motywacja związków frazeologicznych zawierających wyrazy pies i kot / K. Mosiołek-Kłosińska / Etnolingwistyka. — Lublin, 1995. — Tom 7. — C. 21−31.

Ларыса Кныш (Мінск)

НЕВЕРБАЛЬНЫЯ СРОДКІ Ў МАСТАЦКІМ ДЫЯЛОГУ: ТЭМБР І ТЭМП МАЎЛЕННЯ Ў СКЛАДЗЕ АЎТАРСКАЙ РЭМАРКІ (ПАВОДЛЕ ПРОЗЫ М. ГАРЭЦКАГА)

Існуе вялікая колькасць сродкаў, якія садзейнічаюць раскрыццю і разуменню маўленчых зносін. Жэсты, міміка, праксеміка, акулістыка, прычоскі, асабістыя прадметы, адзенне, дзеянні — усё гэта тыя кампаненты камунікацыі, на долю якіх прыпадае добрая частка перадачы самай разнастайнай інфармацыі. Яны не толькі адлюстроўваюць індывідуальную спецыфіку маўлення той ці іншай асобы, але перадаюць эмацыянальны стан і душэўную энергію, дазваляюць меркаваць пра маўленчую культуру моўцы ўцэлым. Не менш важную ролю адыгрываюць тыя складнікі, якія непасрэдна ўласцівы вуснаму маўленню: тэмп, тэмбр, інтанацыя, сіла голасу і інш. — сэнс выказвання часам знаходзіцца ў поўнай залежнасці ад іх.

Усе названыя сродкі ў адпаведнасці з уласна лінгвістычнай трактоўкай даследчыкі разглядаюць як невербальныя (паралінгвістычныя), з ліку якіх вылучаюць:

— фанацыйныя (сіла голасу, тэмп, тэмбр, рытм, розныя меладычныя з'явы і г. д.);
— кінетычныя (жэсты, рухі цела, міміка);
— праксемічныя — камунікатыўна значныя прасторавыя параметры чалавечых паводзін (адлегласць паміж моўцамі, палажэнне корпуса ў адносінах адзін да аднаго);
— графічныя (тып напісання літар і пунктуацыйных знакаў (почырк), графічныя знакі і інш.);
— змешаныя.

Паралінгвістычныя сродкі суправаджаюць вуснае гутарковае маўленне і разам з уласна лінгвістычнымі дапамагаюць раскрыць камунікатыўную сітуацыю ў цэлым. «Усякае выказванне, — слушна заўважае А. Л. Васільева, — можа быць двухслойным, складацца з асноўнага, прадметна-лагічнага зместу і ацэначна-эмацыянальнай канатацыі. Калі першае перадае пэўную інфармацыю,

то другое выражае адносіны моўцы да гэтай інфармацыі. Для перадачы разнастайных відаў эмацыянальнага зместу і прыцягваюцца ўсе дадатковыя, невербальныя, кампаненты» [2, с. 19].

Невербальныя сродкі сталі неад'емным складнікам мастацкага дыялогу, тут яны маюць большую функцыянальную нагрузку, чым у вусным гутарковым маўленні, і атрымліваюць экспліцытнае выражэнне. Пры адлюстраванні невербальных кампанентаў у маўленні дзейных асоб асноўную ролю выконвае аўтарская рэмарка (каментарый) — элемент канструкцый з простай мовай.

Ва ўмовах мастацкага дыялогу роля аўтарскай рэмаркі надзвычай вялікая: яна выконвае функцыю ўводу моўных хадоў і характарызуе індывідуальнасць моўцы, яго эмацыянальны стан, манеру маўлення, раскрывае пачуцці і эмоцыі падчас гутаркі, стаўленне да прадмета гаворкі, а таксама перадае адметныя асаблівасці голасу кожнага персанажа. У цэнтры нашай увагі апынуліся рэплікі персанажаў, якія ўтрымліваюць фанацыйны кампанент: тэмбр голасу і тэмп.

Т э м б р (англ. speech timbre, suprasyntactic timbre) — спецыфічная звышсегментная афарбоўка маўлення, якая надае яму тыя ці іншыя экспрэсіўна-эмацыянальныя якасці [1, с. 472]. Тып голасу можа быць агульным, але ў кожнага чалавека свой тэмбр, як свой адбітак пальцаў.

Характар тэмбравай афарбоўкі вельмі складаны, таму лінгвісты і пісьменнікі ў апісаннях падкрэсліваюць самае рознае (зрокавае, слыхавое, асязальнае, эмацыянальнае і інш.) успрыняцце тэмбру: *звонкі, мяккі, светлы, сухі, сярдзіты, цвёрды, цёмны, хмуры* і інш. У творах М. Гарэцкага сустракаем *абурлівы, афіцыяльны, апаўшы, высокі, вугнавы, дрыжачы, глухі, гняўлівы, грубы, грэблівы, густы, звінячы, звяглівы, зласмешны, жалобны, іранічны, какетлівы, капрызны, ласкавы, ліслівы, масляны, мяккі, насмешлівы, нутраны, паважаны, пазяблы, парушаны, прастудны, роўны, рыпучы, сіпаты, скрыпучы, спакойны, трапяткі, хваравіты, хрыпаты, хрыплы*. Аўтарскі каментарый выконвае важную ролю пры адлюстраванні тэмбравай афарбоўкі голасу: ён дапамагае «пачуць» голас кожнай асобы, улавіць самыя тонкія змяненні і вібрацыі голасу: *— Максім! —* ***кажа*** *Адарка мужу* ***хрыплым, прастудным голасам****, —* *няго ты слеп, хоць бы якую асіну з лесу звёз, жолаб выдаўбаў; зірні — уся жыжка выцякае, калі гэтыя свіначкі, ваўкі іх парэж, усё з нагамі ды з нагамі ў яду* [3, т. 1, с. 193]. *— І цяпер вам кажуць: у вас няма змагання класаў перад агульным ворагам… О, не! Яно ёсць!! —* ***высокай, хваравітай, звінячай нотаю крыкнуў ён****...* [4, с. 19].

Тэмбр голасу перш за ўсё паведамляе пра настрой героя і ўнутраны эмацыянальны стан: *— Б ы в а й ц е з д а р о в ы , Аля… Так? —* ***апаўшым голасам, абезнадзееўшы, спытаўся*** *ён* [4, с. 23]. *— Калі ласка, і мне скруціце, —* ***папрасіў я такім капрызным, хворым голасам, што аж самому было сорамна*** [3. т. 3, с. 105]. *— Што ты кажаш?! —* ***спытаўся Абдзіраловіч парушаным, але такім голасам, у якім сам помала чуў патрэбнага пачуцця****, і зганіў сябе за тое* [4, с. 87]. *— А лістоў, дзядзька, няма? —* ***нібы зусім роўным і спакойным голасам пытаецца*** *нявестка* [3. т. 3, с. 125]. *А ён разгладзіў сваю чорненькую бародку, пабалаваўся залатым ланцужком каля верхняе кішэні ў*

камізэльцы і потым ***спакойным, роўным, чыстым голасам сказаў****: — Вот что, друг любезный…* [3. т. 3, с. 182].

Тэмбр голасу можа раскрываюць адносіны паміж субяседнікамі. У залежнасці ад пэўнай сітуацыі ці абставін, адносіны могуць быць шчырыя, няшчырыя, прыхільныя, непрыхільныя, пагардлівыя, грэблівыя, наўмысна ліслівыя і інш.: *Ізвініце! —* ***далікатна, але грэбліва сказала*** *паненка за Лявонаваю спіною і разам з студэнцікам увайшла ў канцылярыю. — Ці няможна паслаць грошы? —* ***зусім іншым, прыяцельскім і какетліва-жартлівым тонам звярнулася*** *яна да паштмейстара: — Дзень добры, пане начальнік!* [3, т. 2, с. 70]. — *Што табе, дурню? — ізноў* ***спытаўся ён грэблівым голасам*** [3, т. 1, с. 262]. — *Пяхцер пад паветку занясі, а каня гунькаю накрый, —* ***гаворыць той ласкавым голасам*** [3, т. 1, с. 235].

Тэмбравая характарыстыка можа быць пастаяннай ці адметнай прыкметай маўлення пэўнай асобы, што перадаецца ў рэмарцы праз прыналежны займеннік *свой;* прыслоўе + займеннік *заўсёды свой*: *— Міласці просім, міласці просім, Рыгоравіч, —* ***адказаў*** *яму за ўсіх* ***Мікіта сваім заўсёды жартаўліва-ласкавым голасам*** [3, т. 2, с. 18]. *— Да вас, да вас, Мікола Навумавіч, даруйце, што так спазнілісь у дарозе, —* ***сваім мяккім і крыху дрыжачым, густым нутраным голасам кажа Іра****, — да вас і ў важнай справе* [4, с. 63].

6. Ацэньванне	Ацэнка работ згодна з распрацаванымі крытэрыямі	Удзел у ацэнцы шляхам калектыўнага абмеркавання і самаацэньвання	Сумеснае з экспертнай групай ацэньванне, выяўленне нявыкарыстаных магчымасцей, патэнцыялу працягу працы

Каб праектная дзейнасць была паспяховай, патрэбна прытрымлівацца некаторых правіл:

1. У камандзе няма лідараў. Усе члены каманды роўныя.

2. Каманды не спаборнічаюць.

3. Усе члены каманды павінны атрымліваць задавальненне ад зносін адзін з адным і ад таго, што яны разам выконваюць праектнае заданне.

4. Кожны павінен атрымліваць задавальненне ад пачуцця ўпэўненасці ў сабе.

5. Усе праяўляць актыўнасць і ўносяць свой уклад у агульную справу.

6. Адказнасць за канчатковы вынік нясуць усе члены каманды, якія выконваюць праектнае заданне.

Агульнымі падыходамі да структуравання праекта з'яўлюцца наступныя:

1. Пачынаць варта заўсёды з выбару тэмы праекта, яго тыпу, колькасці ўдзельнікаў.

2. Далей неабходна прадумаць магчымыя варыянты праблем, якія важна даследаваць у рамках вызначанай тэматыкі. Самі ж праблемы вылучаюцца навучэнцамі з падачы настаўніка (навадныя пытанні, сітуацыі, якія спрыяюць вызначэнню праблем, відэашэраг з той жа мэтай і г. д.). Тут дарэчная «мазгавая атака» з наступным калектыўным абмеркаваннем.

3. Размеркаванне задач па групах, абмеркаванне магчымых метадаў даследавання, пошуку інфармацыі, творчых рашэнняў.

4. Самастойная праца ўдзельнікаў праекта па сваіх індывідуальных ці групавых даследчых, творчых задачах.

5. Прамежкавыя абмеркаванні атрыманай інфармацыі ў групах (на ўроках або на факультатыўных занятках, у навуковых гуртках, у групавой працы ў бібліятэцы, медыятэцы і інш.)

6. Абарона праектаў, апаніраванне.

7. Калектыўнае абмеркаванне, экспертыза, вынікі ацэнкі.

Кожная група, якая ўдзельнічае ў праекце, атрымлівае «План дзеянняў навучэнцаў у праекце», які ўключае ў сябе:

1. Выбар тэмы праекта (даследавання).

2. Ставіцца мэта. (Для чаго я гэта раблю? Якога выніку я хачу дасягнуць?) Запісаць адказы.

3. Калі гэта даследаванне, то затым трэба выказаць здагадку — гіпотэзу. (Выкажы сваё меркаванне аб тым, якім будзе вынік і чаму?). Адказы запісваюцца.

4. Выбіраецца метад. (Што трэба зрабіць, каб атрымаць вынік?) Запісваецца план дзеянняў, час выканання кожнага кроку.

5. Збіраюцца дадзеныя (збіраецца неабходная інфармацыя, матэрыял, афармляецца, звяраюцца дзеянні па тэрмінах, якія вызначылі для кожнага кроку).

6. Атрымліваем вынікі. (Калі нешта не атрымалася — гэта таксама вынік).

7. Аналізуем вынікі. (Параўноўваем атрыманыя вынікі з гіпотэзай).

8. Робім высновы. (Плануем далейшую дзейнасць). Даем ацэнку дзеянням у групе.

9. Абараняем вынік у калектыве. Атрымліваем агульную ацэнку вынікаў.

Гэтыя памяткі дапамагаюць навучэнцам паспяхова рухацца да дасягнення мэты — стварэння праекта.

У работах навучэнцаў ацэньваюцца ступень самастойнасці ў выкананні розных этапаў працы над праектам і ступень уключанасці ў групавую працу; дакладнасць выканання адведзенай ролі; практычнае выкарыстанне прадметных і агульнашкольных ведаў, уменняў і навыкаў; колькасць новай інфармацыі і ступень яе асэнсавання; узроўні складанасці і ступень валодання выкарыстанымі методыкамі; арыгінальнасць ідэі, спосабу вырашэння праблемы; асэнсаванне праблемы праекта і фармулёўка мэты праекта або даследавання; узровень арганізацыі і правядзення прэзентацыі: вуснага паведамлення, пісьмовай справаздачы, забеспячэння аб'ектамі нагляднасці; валоданне рэфлексіяй; творчы падыход у падрыхтоўцы аб'ектаў нагляднасці прэзентацыі; сацыяльнае і прыкладное значэнне атрыманых вынікаў.

Алгарытм падрыхтоўкі да запуску навучальнага праекта па літаратуры «Кірыла Тураўскі» можна прадставіць у выглядзе схемы:

Праблема праекта	**«Чаму?»**	**Актуальнасць праблемы — матывацыя**
Мэта праекта	«Навошта?» (мы выконваем праект)	Мэтамеркаванне
Задачы праекта	«Што?» (для гэтага мы робім)	Пастаноўка задач
Метады і спосабы	«Як?» (мы гэта можам рабіць)	Выбар спосабу і метадаў, планаванне
Вынік	«Што атрымаецца?» (як вырашэнне праблемы)	Чакаемы вынік

Праблема	Жыццё і творчасць Кірылы Тураўскага — **манаха-аскета, ахвярнага пастыра, таленавітага пісьменніка і прапаведніка, «другога Залатавуснага», аднаго з найбольш вядомых усходне-славянскіх духоўных дзеячаў XII стагоддзя —** недастаткова глыбока ўспрымаецца навучэнцамі, не заўсёды знаходзіць эмацыянальны водгук у іх душах
Чаму?	Недастаткова ведаў пра эпоху, у якой жыў асветнік, пра яго жыццё і творчасць Творчасць Златавуста Кірылы Тураўскага складаная для ўспрымання навучэнцамі 15–16 гадоў Старажытнабеларускі пісьменнік і прамоўца, дзеяч хрысціянскай царквы эпохі Кіеўскай Русі Кірыла Тураўскі недастаткова вывучаецца ва ўстановах адукацыі
Што рабіць?	Больш падрабязна асвятліць эпоху Кіеўскай Русі Вывучыць жыццё і творчасць Златавуста Кірылы Тураўскага ў даступнай, прывабнай для навуэнцаў форме
Як?	З выкарыстаннем дыферэнцыраваных групавых заданняў З выкарыстаннем разнастайных сродкаў нагляднасці (відэаматэрыялы, ілюстрацыі твораў мастацтва, аўдыёзапісы музычных твораў і інш.) і сучасных педагагічных тэхналогій (напрыклад, ролевая гульня)

Што атрымаць? (вынік)	Зборнік прац навучэнцаў, відэа- і аўдыяматэрыялаў для кабінета беларускай мовы і літаратуры Пазнавальны (веды пра старажытнабеларускага пісьменніка і прамоўцу, дзеяча хрысціянскай царквы эпохі Кіеўскай Русі Кірылу Тураўскага) Выхаваўчы (эстэтычнае, патрыятычнае выхаванне) Развіццёвы (камунікатыўны, інфармацыйная кампетэнтнасць, агульнавучэбныя, спецыяльныя навыкі, даследчыцкія ўменні)

Каб прадставіць матэрыял па разглядаемай тэме клас дзеліцца на групы: «Гісторыкі», «Біёграфы», «Рытары», «Экскурсаводы», «Рэжысёры», «Мастацтвазнаўцы» і інш. Настаўнік прапануе першапачатковы спіс крыніц для кожнай групы, які папаўняецца самімі навучэнцамі [9–18 і інш.].

Для паспяховай працы на этапе прэзентацыі патрэбна навучыць школьнікаў сцісла выкладаць свае думкі, лагічна і звязна выбудоўваць паведамленне, рыхтаваць нагляднасць, выпрацоўваць структураваную манеру выкладу матэрыялу. Тут спатрэбяцца прыёмы самааналізу і рэфлексіі. У сувязі з гэтым значна ўзрастае роля настаўніка, які абагульняе, рэзюмуе, дае ацэнку. Несумненна, важным вынікам працы навучэнцаў з'яўляецца ацэнка вынікаў, дзе ўдзельнікі праекта дзеляцца думкамі, настаўнік ацэньвае актыўнасць навучэнцаў, крэатыўнасць, якасць і аб'ём выкарыстання крыніц.

Літаратура

1. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура V–XI класы. — Мінск: Нац. інст. адукацыі, 2008. — 152 с.
2. Верціхоўская, М. І. Беларуская літаратура: Школьныя творы: кароткі пераказ і аналіз / М. І. Верціхоўская. — Мінск: Тетра Системс, 2007.
3. Альбеткова, Р. И. Игра на уроках словесности в 7 классе / Р. И. Альбеткова //Русская словесность. — 2000. — № 4. — С. 67–71.
4. Бедерханова, В. П. Педагогическое проектирование в инновационной деятельности: учеб. пособие / В. П. Бедерханова, Б. П. Бондарев. — Краснодар, 2000. — 54 с.
5. Бондаревская, Е. В. Теория и практика личностно-ориентированного образования / Е. В. Бондаревская. — Ростов н/Д., 2000. — 352 с.
6. Гин, А. Приемы педагогической техники / А. Гин. — М.: Вита — Пресс, 1999. — 125 с.
7. Кульневич, С. В. Совсем необычный урок. Практическое пособие / С. В. Кульневич, Т. П. Лакоценина. — Ростов н/Д., 2001. —160 с.
8. Літаратура Старажытнай Русі. Асветніцкая дзейнасць Кірылы Тураўскага і Еўфрасінні Подацкай [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://65-k.com/publications.php?category=14&mode= show&id=381. — Дата доступу: 10.10.2013 г.
9. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://minds.by/stupeny/nomera/18/st18_19.html. — Дата доступу: 10.10.2013 г.
10. На радзіме Кірылы Тураўскага // Пачатковая школа. — 2010. — № 8.
11. Крот, А. Святы Кірыла Тураўскі — жыццё і галоўныя матывы творчасці [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.svja zep.org/index.php?do=static&page=turauski— Дата доступу: 10.10.2013 г.
12. Грыневіч, В. Пасхальныя матывы ў творах сьв. Кірылы Тураўскага. — Ворша — Lublin — Харків, 1997.
13. Надсан, А. Сьвяты Кірыла Тураўскі. Выданне другое, дапоўненае і папраўленае. — Лёндан: Божым шляхам, 2001.
14. Чаропка, В. Імя ў летапісе. — Мінск: Полымя, 1994.

15. Кірыла Тураўскі [Электроны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://svjazep.org/index.php?do=static&page=turauskihttp://www.belsoch.by/?p=spadch&spid=37. — Дата доступу: 10.10.2013 г.
16. [Электроны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://mikashevichi.ru/belarus/person/1046-kiril.html. — Дата доступу: 10.10.2013 г.
17. Электроны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.veselka.by/?p=2569 http://www.youtube.com/watch?v=GAZcdoNmNm4&feature=player_detailpage— Дата доступу: 10.10.2013 г.
18. Сяліцкі, В. Кірыл Тураўскі і сучаснасць / В. Сяліцкі // Тураў. Тураўскае Евангелле. — Мінск, 2004.

Алесь Макарэвіч (Магілёў)

ВЫВУЧЭННЕ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ: УРОКІ ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ І ТВОРЧЫЯ РАБОТЫ Ў VII КЛАСЕ (ЧАЦВЁРТЫ БЛОК УРОКАЎ)

Арганізацыя працы настаўніка і вучняў па сістэме перспектыўных ліній адпавядае сучасным інавацыйным працэсам у галіне сярэдняй адукацыі. Прапанаваная намі раней методыка працы па гэтай сістэме [8] грунтуецца на вывучэнні літаратурных твораў у кантэксце блокаў урокаў, калі паралельна з вывучэннем твораў для чытання і вывучэння, для чытання і абмеркавання здзяйсняецца паралельная падрыхтоўка вучняў да ўспрымання і характарыстыкі твораў для дадатковага чытання, а таксама падрыхтоўка школьнікаў да выканання імі творчых работ. На падставе такіх дыдактычных зыходных можна весці гутарку пра стварэнне метадычнага комплексу для настаўнікаў — такой метадычнай крыніцы, у якой змест, формы, метады і прыёмы вывучэння літаратуры ў адпаведным класе прадстаўлены не манаграфічна (напрыклад, вывучэнне творчасці пэўнага пісьменніка, твораў для дадатковага чытання і інш.), а цэласна. Такі падыход да працэсу выкладання літаратуры спрыяе эфектыўнай і рацыянальнай арганізацыі метадычнай працы настаўніка, калі ён выразна бачыць, асэнсоўвае і, адпаведна, плануе навучальныя перспектывы, а таксама паэтапна і комплексна арганізуе іх здзяйсненне.

У ранейшых публікацыях аўтара гэтых матэрыялаў прадстаўлена характарыстыка зместу і некаторых форм падрыхтоўчай і непасрэднай працы настаўніка і вучняў пры вывучэнні твораў беларускай літаратуры ў сёмым класе (першы — трэці блок урокаў [5–7]). У дадзеным выпадку вызначым структуру і змест чацвёртага блока, коратка ахарактарызуем формы працы ў яго межах.

Структура блока: а) урокі па творах для чытання, чытання і абмеркавання (№№ 25–39); б) урок па творы для дадатковага чытання (Павел Міско «Эрпіды на планеце Зямля»); в) урок, на якім здзяйсняецца творчая работа (водгук на аповесць Паўла Міско «Эрпіды на планеце Зямля»).

Змест блока і некаторыя формы працы. Паколькі асноўны метадычны прадмет дадзеных матэрыялаў — урок па творы для дадатковага чытання (далей — УДЧ) і ўрок, на якім здзяйсняецца творчая работа (далей — УТР), то звернем увагу найперш на тыя творы для чытання і вывучэння, матэрыял якіх спрыяе перспектыўнаму выхаду на УДЧ і УТР. Адзначым, што змест гэтага

блока вызначаецца выхадам на тэарэтычныя паняцці, адпаведныя ім мастацкія з'явы, характарыстыка якіх на адпаведных уроках дазваляе рыхтаваць і праводзіць абгрунтаваны і доказны водгук на прачытаны твор, а таксама здзяйсняць выхад на элементы параўнальнай характарыстыкі літаратурных вобразаў, мастацкіх асаблівасцей твораў. Вызначанае вышэй садзейнічае ў сваю чаргу фарміраванню эстэтычнага густу сямікласнікаў у працэсе ўспрымання імі мастацкага твора і яго ацэнкі.

Урокі №№ 25–27[*]: апавяданне З. Бядулі «На каляды к сыну».

Урок № 25. *Уступ да чацвёртага блока. Ён можа складацца з дзвюх частак. Першая частка*: характарыстыка структуры блока з перспектыўным выхадам на УДЧ і УТР. *Другая частка*: знаёмства з артыкулам «Цікавае і захапляючае ў звычайным і паўсядзённым»; абмеркаванне яго ў праекцыі на апавяданне Змітрака Бядулі «На каляды к сыну», на аповесць Паўла Місько «Эрпіды на планеце Зямля» і водгук на гэты твор.

Прыкладны змест першай часткі ўступа і формы працы: а) аб'яўленне даты абмеркавання аповесці і, адпаведна, найбольш эфектыўнага тэрміну яе чытання; б) вызначэнне найбольш прыдатнай крыніцы, у якой змешчаны тэкст аповесці, — інтэрнэт-старонка knihi.com [9]; успрыманне твора па гэтай крыніцы дазволіць, акрамя іншага, «выразЬць» цытаты з той мэтай, каб, раздрукаваўшы і адпаведным чынам скампанаваўшы, выкарыстаць іх пры характарыстыцы вобразаў аповесці, у працэсе падрыхтоўкі адказаў на пытанні па ёй, а таксама падчас падрыхтоўкі і рэпрэзентацыі водгуку на гэты твор; в) размеркаванне пытанняў і заданняў да аповесці (ксеракопіі)[**]; змест і форма

---

[*]Прапанаваная ў дадзеных матэрыялах нумарацыя ўрокаў адрозніваецца ад той, якая вызначана ў дапаможніку для настаўнікаў па прыкладным каляндарна-тэматычным планаванні; гэта выклікана спецыфікай кампаноўкі ўрокаў па творах для дадатковага чытання і ўрокаў, на якіх выконваюцца творчыя работы: яны ўтвараюць своеасаблівыя «пары» ў кантэксце кожнага блока, адбываюцца адзін за адным.

[**]*Напрыклад*. 1) Вызначыць вымышленае, фантастычнае ў аповесці «Эрпіды на планеце Зямля»; праілюстраваць яго прыкладамі з гэтага твора. 2) Як пры дапамозе вымыслу і фантазіі аўтару ўдалося раскрыць характары рэальных і фантастычных герояў аповесці (напрыклад, пераканальна, доказна і інш); пацвердзіць гэта прыкладамі, доказамі. 3) Знайсці ў творы прыкметы псіхалагізму (псіхалагічнай характарыстыкі дзеючых асоб, псіхалагічнай матывацыі іх учынкаў, псіхалагічнага напружання, якое перадаецца чытачу і інш.), падрыхтаваць характарыстыку гэтых прыкмет, вызначыць значэнне іх уздзеяння на чытачоў: вашых бацькоў, аднакласнікаў; асабіста вас. 4) Ці пераканальныя для вас падзеі, адлюстраваныя ў аповесці, учынкі герояў гэтага твора? 5) Вызначыць такія мастацкія дэталі, якія спрыяюць раскрыццю характару дзеючых асоб аповесці, іх схільнасцей, памкненняў, перажыванняў. 6) Перачытаць тыя з дыялогаў аповесці, якія, на вашу думку, спрыяюць раскрыццю характару дзеючых асоб твора. Выкарыстаць некаторыя часткі з гэтых дыялогаў для падмацавання характарыстыкі герояў аповесці. 7) Вызначыць такія эпізоды, якія, на вашу думку, будуць цікавыя вашым аднагодкам, сябрам. Паспрабуйце сфармуляваць на іх падставе тэкст «рэкламы» гэтага твора з той мэтай, каб выклікаць цікавасць да аповесці і жаданне прачытаць яе. 8) Скласці кароткі план твора. 9) У адпаведнасці са складзеным планам ахарактарызаваць змест і вобразы аповесці. 10) Вызначаць ролю таямнічага і незвычайнага ў далейшым выбары жыццёвага шляху герояў-падлеткаў. 11) Вызначыць эпізоды, якія пашы-

пытанняў і заданняў павінны спрыяць эфектыўнай падрыхтоўцы вучнямі водгуку на гэты твор; г) вызначэнне формы, структуры водгуку з той мэтай, каб у працэсе ўспрымання твора вучні змаглі назапашваць адпаведны матэрыял да водгуку на яго. *Прыкладны змест другой часткі ўступа і формы працы*: а) вызначэнне на падставе зместу апавядання З. Бядулі, прачытанага вучнямі дома, ролі падзей гэтага твора ў пазнанні асаблівасцей сямейных узаемаадносін; разважанні адносна таго, ці мог пісьменнік назіраць усе тыя падзеі, што адлюстраваны ім у апавяданні, у рэальным жыцці; б) агучванне заданняў на далейшы этап урока: у працэсе чытання настаўнікам артыкула «Цікавае і захапляючае ў звычайным і паўсядзённым» з вучэбнага дапаможніка вызначыць ролю вымыслу і фантазіі ў паказе жыцця ў мастацкіх творах і значэнне празаічных тэкстаў у пазнанні жыцця; в) чытанне настаўнікам уголас артыкула; г) калектыўнае выкананне вучнямі названых вышэй заданняў і разважанні па іх; д) падагульненні настаўніка па другой частцы ўступа: *аналіз адказаў вучняў, *падагульненая фармулёўка эстэтычнага значэння вымыслу і фантазіі, ролі літаратурных твораў у пазнанні жыцця, *праекцыя зробленых настаўнікам падагульненняў на змест апавядання З. Бядулі «На каляды к сыну» і фантастычную аповесць П. Місько «Эрпіды на планеце Зямля».

Урок № 26. Яго можна пабудаваць такім чынам, каб раскрыць наступныя вызначаныя вучэбнай праграмай пытанні: «*Псіхалагізм апавядання, майстэрства пісьменніка ў раскрыцці думак і перажыванняў старой Тэклі*», «*характарыстыка Лаўрука праз канкрэтныя выразныя дэталі*» [2, с. 40]. Асноўнай формай працы пры гэтым можа быць наступная: тлумачэнне настаўнікам пры дапамозе адпаведных артыкулаў з вучэбнага дапаможніка паняццяў «псіхалагізм», «мастацкая дэталь», а таксама адпаведных ім з'яў з апавядання «На каляды к сыну», ілюстрацыя тэарэтычных паняццяў фактамі мастацкага твора. У фінале гэтага этапу характарыстыкі твора можна здзейсніць перспектыўны выхад на ўспрыманне вучнямі аповесці П. Місько «Эрпіды на планеце Зямля» — твора, у якім учынкі дзяцей пададзены ў іх псіхалагічнай матываванасці, успрымаюцца як доказныя і верагодныя ў кантэксце падзей твора.

Урок № 34. У працэсе характарыстыкі «*мастацкіх асаблівасцей аповесці Янкі Брыля "Сірочы хлеб"*» [1, с. 38], дыялогу як «*спосабу раскрыцця зместу ў апавядальных творах*» [2, с. 41] можна таксама здзейсніць перспектыўны выхад на ўспрыманне і характарыстыку вучнямі аповесці П. Місько «Эрпіды на планеце Зямля»: а) пракаменціраваць адпаведныя заданні да гэтага твора, б) сарыентаваць вучняў на форму выкарыстання характарыстыкі дыялогаў з аповесці ў водгуках на гэты твор.

Урокі № 35–37. Характарыстыка апавядання І. Навуменкі «Жуль Верн». Урок № 36. «*Фарміраванне ўменняў складаць план твора і па ім характарызаваць змест і вобразы, вызначаць ролю таямнічага і незвычайнага ў далейшым выбары жыццёвага шляху герояў-падлеткаў*» на прыкладзе

раюць вашы ўяўленні пра свет (г.зн. вызначыць пазнавальную ролю твора). 12) Зрабіць ілюстрацыі да тых эпізодаў, якія найбольш Вам спадабаліся.

характарыстыкі дадзенага твора — усё гэта таксама садзейнічае эфектыўнаму выкананню заданняў па аповесці П. Місько «Эрпіды на планеце Зямля», а таксама паралельнай падрыхтоўцы вучнямі водзыву на гэты твор.

Урок № 38 (УДЧ): характарыстыку аповесці П. Місько «Эрпіды на планеце Зямля» мэтазгодна праводзіць у адпаведнасці з прапанаванымі сямікласнікам на ўступным уроку да гэтага блока заданнямі і пытаннямі. Пажадана зрабіць невялікую выставу, а на ўроку правесці конкурс ілюстрацый да аповесці, якія сямікласнікі павінны былі падрыхтаваць да гэтага ўрока. У якасці перспектыўных (у праекцыі на УТР) высноў на гэтым уроку, якія вучні могуць выкарыстаць у водгуках на УТР, могуць быць наступныя.

У *«Эрпідах на планеце Зямля»* вельмі важную сэнсаўтваральную ролю выконваюць мастацкія дэталі (можна прыгадаць тэарэтычныя высновы з характарызаваных раней артыкулаў «Цікавае і захапляючае ў звычайным і паўсядзённым», «Мастацкая дэталь»). Гэты твор напоўнены загадкавым і таямнічым (з'яўленне Эрпіда-адзін менавіта каля вёскі Клінцы, запланаваная сустрэча яго менавіта з Ванем, уздзеянне Эрпіда на навакольны свет і інш.), глыбокім пазнавальным зместам лінгвістычнага кшталту (выкарыстанне Ванем фразеалагізмаў і тлумачэнне іх Эрпідам), маральным патэнцыялам выхаваўчага зместу, які пераканальны для чытачоў-сямікласнікаў (клопат і адпаведныя ўчынкі Вані ў адносінах да намаганняў Эрпіда рэалізаваць схаваныя жаданні Ваневых бацькоў, настаўніка Алега Максімавіча; імкненні Вані дапамагчы Эрпіду выканаць яго місію ў ваколіцах Клінцоў і ў Мінску, дапамога пры гэтым дзяцей і інш.). Мэтазгодна правесці адпаведныя паралелі з апавяданнем І. Навуменкі «Жуль Верн» (для прыкладу: імкненні апавядальніка да таямніц «*вялікага неба*» [3, с. 166–167]; яго «*нястрымная прага да новага, нязведанага, неапісанага*» [3, с. 168–169, 171, 179], захапленні геаграфіяй; характарыстыка апавядальнікам маці [3, с. 168], яе памкненняў), апавяданнем З. Бядулі «На каляды к сыну» (вобраз маці, яе перажыванні, клопат пра сына, імкненне даказаць, што ён добры, варты павагі) і аповесцю П. Місько (рэалізацыя маці пад уздзеяннем Эрпіда жадання сабраць разам усю сям'ю, зрабіць снеданне для усіх адначасова: раздзел № 10). Такія паралелі даюць падставы для комплекснага выхаваўчага ўздзеяння на сямікласнікаў у кантэксце гэтага блока ўрокаў.

Дамашняе заданне да наступнага ўрока. **1**. Падрыхтаваць пісьмовы варыянт водгуку на аповесць П. Місько «Эрпіды на планеце Зямля», выкарыстаўшы парады адносна яго структуры і зместу. Пісьмовы варыянт спрыяе, па-першае, больш адказным адносінам вучняў да граматычнага, моўнага афармлення водгуку, па-другое, — развіццю ўменняў лагічнага і аргументаванага выказвання. **2**. Навучыцца вусна пераказваць падрыхтаваны водгук.

Урок № 39 (УТР): у сувязі з вывучэннем разгледжаных вышэй твораў яго можна правесці па наступнай тэме: «Мае ўражанні і вывады па аповесці П. Місько «Эрпіды на планеце Зямля» — водгук на самастойна прачытаны твор». Гэта адпавядае вызначаным вучэбнай праграмай «*асноўным відам работ па літаратуры ў VII класе*» [2, с. 44]. Пры гэтым варта мець на ўвазе, што падрыхтоўка і вусная рэпрэзентацыя вучнямі водгуку на прачытаны твор

павінны спрыяць не толькі фарміраванню маўленчых уменняў характарыстыкі пэўных мастацкіх з'яў, а і ўменняў доказнай эстэтычнай іх характарыстыкі, рэкламавання. Магчымыя формы рэпрэзентацыі высноў з водгукаў: падрыхтаваныя вучнямі ілюстрацыі да аповесці; плакаты (карткі) з цытатамі; фотаздымкі пісьменніка, вокладак яго кніг і інш. Усё гэта спрыяе арганізацыі дадзенага ўрока ў форме чытацкай канферэнцыі.

Такім чынам, прапанаваныя тут этапы і формы працы па сістэме перспектыўных ліній спрыяюць: а) паэтапнаму назапашванню неабходных для выканання творчых работ фактаў з мастацкай літаратуры — гэта адна з галоўных умоў падрыхтоўкі да УТР; б) фарміраванню ўменняў вобразных выказванняў, прыўнясенне ў іх суб'ектыўна-ацэначных элементаў на падставе ўспрымання мастацкіх твораў і суаднясення іх з іншымі мастацкімі творамі, а таксама тэарэтычнымі крыніцамі. Усё адзначанае садзейнічае фарміраванню ў сямікласнікаў уменняў і навыкаў рацыянальнай арганізацыі працы (самастойнай і на ўроку) па сістэме перспектыўных ліній.

Літаратура

1. Валочка, Г. М. Беларуская мова і літаратура. 7 кл.: прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / Г. М. Валочка, С. А. Язерская, Т. У. Логінава. — Мінск: НІА Аверсэв, 2012. — 46 с.
2. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура V–XI класы / Зацв. Міністэрствам адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012. — 127 с.
3. Лазарук, М. А. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, Т. У. Логінава. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. — 304 с.
4. Логінава, Т. У. Беларуская літаратура ў 7-м класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Т. У. Логінава, Т. І. Мароз. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012. — 200 с.
5. Макарэвіч, А. М. Творы для дзіцячага чытання Янкі Купалы і Якуба Коласа ў кантэксце падрыхтоўкі настаўніка і вучняў да ўрокаў развіцця маўлення (сёмы клас, першы блок урокаў) / А. М. Макарэвіч // Мова — літаратура — культура: VII Міжнар. нав. канф., прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, 27–28 верас. 2012 г., Мінск, БДУ: зб. нав. арт. / пад аг. рэд. Т. І. Шамякінай. — Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2012. — С. 431–437.
6. Макарэвіч, А. М. Творы Я. Коласа, В. Быкава, У. Караткевіча ў кантэксце падрыхтоўкі да ўрокаў пазакласнага чытання і развіцця маўлення (сёмы клас, другі блок урокаў) / А. М. Макарэвіч // Беларусь на скрыжаванні стагоддзяў: ад класікі да сучаснасці: матэрыялы Міжнар. навук. канф., г. Мінск, 1–2 лістап. 2012 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М.Танка. — Мінск: БДПУ, 2012. — С. 155–158.
7. Макарэвіч, А. М. Творы для дзіцячага чытання Якуба Коласа, паэтаў-сучаснікаў у кантэксце падрыхтоўкі да ўрока развіцця маўлення (сёмы клас, трэці блок урокаў) / А. М. Макарэвіч // Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа ў сістэме дзяржаўна-культурных і духоўна-эстэтычных прыярытэтаў XXI стагоддзя: Матэрыялы Міжнар. Навук. канферэнцыі (да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа), Мінск, 25–26 верас. 2012 г. / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нац. акадэміі навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. — Мінск: Права і эканоміка, 2012. — С. 142–148.

8. Макарэвіч, А. М. Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры: урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V — VI класах / А. М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. — 2013. — № 7. — С. 9 — 16.
9. Міcько, П. Эрпіды на планеце Зямля / П. Міcько [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://knihi.com/Paval_Misko/Erpidy_na_planiecie_Ziamla.html. — Дата доступу: 22.10.2013 г.

Валянціна Дылеўская (Мінск)

АСАБЛІВАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ ТВОРЧАСЦІ ТАРАСА ШАЎЧЭНКІ ВА ЎСТАНОВАХ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

Творчасць Тараса Шаўчэнкі вывучаецца ў 9 класе ў раздзеле «Па шляху сінтэзу: сентыменталізм, рамантызм, рэалізм». Рэкамендуецца звярнуць увагу на сувязь яго паэзіі з фальклорам, песеннай творчасцю ўкраінскага народа, глыбокую грамадзянскасць, патрыятычны пафас («Думка», «Садок вішнёвы каля хаты»), мастацкую інтэрпрэтацыю падзей беларускай гісторыі ў паэме «Цары». Для самастойнага чытання — «Не грэе сонца на чужыне». На жаль, на гэта адведзена ўсяго адна гадзіна. Наўрад ці можна разлічваць на грунтоўны разгляд вызначаных пытанняў.

Пры арганізацыі працы па вывучэнні творчасці Тараса Шаўчэнкі якую б форму ўрока не абраў настаўнік, важна, каб усім яго зместам, строга прадуманымі вучэбнымі сітуацыямі, выкарыстанымі метадамі і прыёмамі ён мог захапіць вучняў жыццём і творчасцю паэта, выклікаў жаданне спазнаць не толькі асобныя старонкі біяграфіі, але і мастацкі свет яго твораў. Віды дзейнасці вучняў: работа з манаграфічнымі працамі, прысвечанымі Тарасу Шаўчэнку, эпіграфам, удзел у рэпрадуктыўнай і эўрыстычнай гутарках, у каментары апераджальных заданняў, выступленне з вуснымі паведамленнямі, выразнае чытанне твораў, удзел у паэтычным міні-вернісажы. Вучням патрэбна ведаць асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху Т. Шаўчэнкі, асаблівасці фарміравання светапогляду, ацэнку яго дзейнасці крытыкай і літаратуразнаўствам. Яны павінны ўмець вылучаць у біяграфічным матэрыяле самае істотнае, тлумачыць заканамернасці часу, эпохі, у якую жыў і працаваў Тарас Шаўчэнка, раскрыць адметнасць творчага таленту. Для падрыхтоўкі апераджальнага задання пошукавага характару можна параіць выкарыстаць наступную літаратуру: *Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей / навук. рэд.: М. А. Тычына, У. І. Мархель. — Мінск, 2002; Шамякіна, Т. І., Праскаловіч, В. У. Беларуская літаратура ў 9 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў. — Мінск, 2012.*

Прыступаючы да вывуэння творчасці Т. Шаўчэнкі, перш за ўсё трэба раскрыць асобу аўтара, своеасаблівасць мастацкага свету, паказаць духоўную, унутраную біяграфію творцы, якая напаўняе змест яго твораў, гарманізуе ўсе іх кампаненты, выяўляецца ў мастацкай цэласнасці. Лекцыю настаўніка могуць дапаўняць кароткія інфармацыйныя паведамленні вучняў, якія ўтрымліваюць не толькі летапіс жыцця, але і інтэрпрэтацыю творчасці. Такая форма працы дазволіць данесці да школьнікаў не толькі патрэбную інфармацыю пра жыццёвы і творчы шлях, але стане аглядам навуковай і навукова-папулярнай літарату-

ры па вывучаемым раздзеле. Ва ўмовах мінімальнага праграмнага часу, адведзенага на азнаямленне з жыццём і творчасцю Шаўчэнкі, можна прапанаваць апераджальныя заданні рэпрадуктыўнага і пошукавага характару. Франтальныя: пазнаёміцца з жыццём і запісаць значныя факты біяграфіі паэта з даведачнай літаратуры (энцыклапедыі, біяграфічнага слоўніка, артыкула падручніка), вылучыць найбольш яркія эпізоды з жыцця паэта, якія дапамогуць лепш зразмець яго творчасць. Індывідуальныя: напісаць (можна і вусна) каменарый да «Аўтапартрэта» Тараса Шаўчэнкі.

Багацце творчай спадчыны вялікага ўкраінскага паэта адкрывае магчымасці да супастаўлення, дазваляе паставіць праблему ўплыву яго творчасці на беларускую паэзію. Мэтазгодным будзе абмеркаванне падрыхтаваных вучнямі паведамленняў. Тэмы могуць наступныя: «Т. Шаўчэнка і Беларусь», «Творы Я. Купалы, прысвечаныя Т. Шаўчэнку (“Памяці Т. Шаўчэнкі”, “Памяці Шаўчэнкі” (1909), паэма “Тарасова доля” (1939)», «Сувязі класіка беларускай літаратуры Я. Купалы з творчасцю вялікага Кабзара». Дарэчы будзе выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу. У паведамленні «Т. Шаўчэнка і Беларусь» вучань адзначыць цікавасць Т. Шаўчэнкі да Беларусі, а таксама цікавасць беларусаў да слова Т. Шаўчэнкі, Кансультуючы па гэтай тэме, настаўнік завострыць увагу на тым, што цікавасць Шаўчэнкі да беларусаў невыпадковая. Паэт праязджаў некалькі разоў праз Беларусь (1829, 1843, 1847 гг.). Асаблівае ўражанне аказала на яго падарожжа восенню 1829 г., калі ён быў прыгонным пана Энгельгардта. Беларусь назаве «краінай жалю і смутку», а ў творы «Музыкант» раскажа аб братнім народзе. Т. Шаўчэнка цікавіўся беларускімі песнямі і нават пад іх уздзеяннем напісаў некаторыя вершы. Меў намер з’ездзіць на Случчыну да свайго сябра, беларускага мастака В. Залескага, з якім пазнаёміўся ў ссылцы. Зварот да такога факта біяграфіі ўкраінскага паэта дазволіць сфарміраваць правільныя чытацкія навыкі.

У наступным паведамленні будзе адзначана, што да 120-годдзя (1934) і 125-годдзя (1939) з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі Янка Купала пераклаў больш за 20 яго вершаў і паэм («Сон», «Думка», «Кацярына», «Гайдамакі», «Тарасова ноч» і інш.). Пераклады садейнічалі знаёмству беларускага чытача з украінскай паэзіяй, узбагацілі беларускую літаратуру новымі мастацкімі каштоўнасцямі. У складзе дэлегацыі беларускіх пісьменнікаў Янка Купала быў на святкаванні 125-годдзя з дня нараджэння Кабзара на Ўкраіне, прачытаў над яго магілай верш «Запаведзь» у сваім перакладзе. Напрыканцы настаўнік паведаміць, як Я. Купала сам характарызаваў уплыў Т. Шаўчэнкі на сваю творчасць: «Як рана я пазнаў Шаўчэнку? Дакладна не памятаю. Ці ўплываў Шаўчэнка на маю творчасць — цяжка сказаць… Магчыма, у некаторых маіх вершах і ёсць адгалоскі яго паэзіі, але ў якіх іменна — не ведаю. Украінскую літаратуру, відаць, я люблю больш, чым якую-небудзь іншую. Я думаю, гэта тлумачыцца аднолькавым сацыяльным і нацыянальным становішчам беларускага і ўкраінскага народаў у мінулым і цяпер. Да таго ж украінская літаратура лепш за іншыя змагла выказаць у мінулым і зараз думы і настроі свайго народа. З украінскіх паэтаў больш за ўсё, безумоўна, люблю Шаўчэнку» [1, с. 458].

Самастойная праца вучняў з разнастайным біяграфічным матэрыялам, з крытычнымі артыкуламі, успамінамі пра пісьменнікаў, апераджальныя заданні, накіраваныя на паглыбленае ўспрыманне праграмнага матэрыялу, — ўсё гэта надзвычай важна ў вучэбна-выхаваўчым і моўна-развіццёвым плане. Галоўнае, яны вучацца працаваць творча, выконваюць такія апераджальныя заданні з ахвотай, уносяць у іх элементы навізны, пошуку. Больш таго, праца з літаратурнымі першакрыніцамі, навуковымі і крытычнымі артыкуламі, манаграфіямі, біяграфіямі пісьменнікаў падчас выканання самастойных заданняў павышае цікавасць да прадмета, развівае агульную эстэтычную культуру вучняў.

Літаратура

1. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала; рэдкал.: С. А. Андраюк [і інш.]. — Мінск: Маст. літ., 1995–2001.
2. Курдзюмова, Т. Ф. Урок в системе уроков / Т. Ф. Курдзюмова // Урок литературы в средней школе / под ред. Т. Ф. Курдзюмовой. — М., 1984. — 120 с.

Майя Пухальская (Минск)

ХРИСТИАНСКИЕ ЦЕННОСТИ В СОДЕРЖАНИИ ХРЕСТОМАТИИ ПО ИСТОРИИ СЛОВЕСТНОСТИ В ГИМНАЗИЯХ И РЕАЛЬНЫХ УЧИЛИЩАХ БЕЛАРУСИ НАЧАЛА XX-ГО ВЕКА (1900–1917 гг.)

В начале XX в. (1900–1917 гг.) в гимназиях и реальных училищах на территории дореволюционной Беларуси содержание предметов гуманитарного цикла (истории, словестности, литературы, русского языка, психологии и пр.) было проникнуто христианскими ценностями. Нравственные проблемы, которые существовали в начале XX в., решались на уровне общественности, педагогической сообщности и на уровне государства. Поэтому содержание предметов гуманитарного цикла носило нравоучительный и христоцентричный характер (понятие «христоцентричный» Е. Л. Евдокимовой).

Программы по изучению словестности [1] включали разделы и по истории русской словестности. В архивных материалах имеется краткое описание содержания «Исторической хрестоматии по истории русской словестности» [3].

Материалы хрестоматия состоят их нескольких разделов: «Киевская Русь до половины XIII в.», «Период северовосточной Руси в переходный период от Киева к Москве (XIII–XV вв.)», «Период Московской … (от XV до XVII в.)», «Культурный перелом в исторической жизни Московской Руси (XVIII в.)». Причем, первый раздел разделен на два подраздела: «Переводная литература киевского периода» и «Самостоятельное русское творчество киевского периода» [3].

Христианские ценности можно проследить при изучении таких тем, как «Евангелие по Остоумовскому списку», «Хождение Богородицы по мукам», «Сказание о Вавилонском царстве». Жизнеописанию религиозных деятелей и сподвижников церкви посвящены темы: «Житие Варлаама и Иоасафара» (пересказ), «Деяние Павла и Феклы» и пр.

Содержание второй части первого раздела включает темы, которые показывают богатство христианских ценностей и христианских традиций в жизни сподвижников: «Из жития св. Феодосия Печерского», «Хождение игумена Даниила в св. Землю» и пр. В содержательном плане христианских ценностей интерес представляют такие темы как «Из «Киевопечерского патерика», Митрополита Иллариона «О Ветхом и Новом Завете», здесь же включена тема «Из проповедей св. Кирилла, епископа Туровского», «Поучение Владимира Мономаха» и его перевод на русский язык.

Второй раздел хрестоматии начинается с проповедей Серапиона (тема «Проповеди Серапиона, епископа Владимира»). Обособленно выглядит тема «Моление Даниила Заточника». Следующие две темы посвящены описанию жизнедеятельности двух известных личностей, канонизированных церковью: «Повесть о житии и храбрости благоверного и великого князя св. Александра Невского» и «Житие преподобного Сергея Радонежского», а также тема «Повесть о Муромском кн. Петре и супруге его Февронии».

Третий раздел посвящен в основном историческим событиям, с точки зрения богатства христианских ценностей интерес представляет «Стоглава» из «Домостроя».

В четвертом разделе вышеуказанной проблематике посвящены темы: «Из сочинений протопопа Аввакума»: из «Жития», из «Посланий» его», а также стихотворения и комедия Симеона Полоцкого «Притча о блудном сыне». Полезны и примечания к отдельным текстам [3].

Описание жизнедеятельности, «жития» святых и подвижников церкви показывают реализацию христианских ценностей в жизни великих людей, возможность использования христианских ценностей в повседневной жизни для совершения подвигов.

Поучения, проповеди, моления — это религиозная составляющая христианского вероучения, которые представляют собой нравственные наставления по следованию христианским принципам и заповедям в решении разнообразных вопросов человеческой жизни. По сути дела вышеперечисленные материалы, содержание которых изучалось гимназистами и учащимися реальных училищ в дореволюционной Беларуси, являются не чем иным как непосредственным содержанием христианских ценностей и христианских традиций. Следует отметить, что отдельные темы выносились в переводные экзамены [2].

Таким образом, краткое описание содержания «Исторической хрестоматии по истории русской словестности» (1917) показывает богатое наполнение христианскими ценностями содержания гуманитарного, в том числе литературного образования исследуемого периода.

Литература

1. Курс словестности восьмого класса в 1914–1915 уч. г. / Национальный исторический архив Республики Беларусь (НИА РБ). — Ф. 466. — Оп. 253. — Л. 79.
2. Малаба, О. Программа по русскому языку для испытания учеников VI класса Оршанского реального училища за 1916–1917 уч. год. / Национальный исторический архив Республики Беларусь (НИА РБ). — Ф. 2269. — Оп.1. — Л. 30–35.
3. Национальный исторический архив Республики Беларусь (НИА РБ) — Ф. 13496. Историческая хрестоматия по истории русской словестности: в неск. томах / Сост. В. В. Си-

повский. — Вып. 2-ой: русск. Лит. с XI до XVIII в. — Петроград: изд. Я Башмакова и К., 1917 г.

Алена Шарапава (Магілёў)

ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ АЛЕСЯ ЯКІМОВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «СУСВЕТНАЯ І АЙЧЫННАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА»: ТЭАРЭТЫЧНА-ЖАНРАВЫ АСПЕКТ

Адукацыйныя стандарты Рэспублікі Беларусь другога пакалення па спецыяльнасцях 1–1 01 01 Дашкольная адукацыя; 1–01 01 02 Дашкольная адукацыя. Дадатковая спецыяльнасць арыентуюць выкладчыка на фарміраванне такіх кампетэнцый пры вывучэнні дысцыпліны «Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура», як **веданне** «… спецыфічных якасцяў дзіцячай кнігі, што грунтуюцца на ўліку ўзроставай спецыфікі чытача; заканамернасцяў развіцця … дзіцячай літаратуры; характэрных прыкметаў розных жанраў дзіцячай кнігі; відаў работ з канкрэтным тэкстам у дзіцячым садзе; артыкулаў крытыкаў і педагогаў па пытаннях развіцця дзіцячай кнігі; формы прапаганды дзіцячай кнігі ў асяродку выхавацеляў і бацькоў», **уменне** «… выкарыстоўваць першакрыніцы пры вывучэнні гісторыі і тэорыі дзіцячай літаратуры; улічваць узроставыя і індывідуальныя асаблівасці дзяцей у працэсе арганізацыі работы з дзіцячай кнігай; … зрабіць крытычны аналіз твораў, адбор кніг для дашкольнай установы; прапагандаваць кнігі ў дашкольнай установе» [1, с. 19]. Адзначым, што вывучэнне дысцыпліны «Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура» праводзіцца па жанравым прынцыпе. Зыходзячы з гэтага, студэнты мусяць апеляваць такімі паняццямі, як «літаратурны род», «эпас», «лірыка», «драматургія», «літаратурны жанр», «аповесць», «апавяданне», «казка», «літаратурная казка» і інш.

У такім кантэксце важным элементам педагагічнай стратэгіі з’яўляецца вывучэнне літаратурнай спадчыны Алеся Якімовіча. На гэта тыпавой вучэбнай праграмай ТД–А. 256 / тип. адводзіцца чатыры аўдыторныя гадзіны: дзве лекцыйныя і дзве практычныя. Лепшаму асэнсаванню творчасці пісьменніка спрыяюць таксама і заданні для самастойнай работы, што прапануюцца студэнтам з самага пачатку вывучэння дысцыпліны. Такім чынам, усе пытанні і заданні па тэме могуць быць умоўна падзелены на тры блокі: 1) для лекцыі; 2) для практычных заняткаў; 3) для самастойнай работы.

Першы блок прадугледжвае знаёмства з такімі пытаннямі: 1. Звесткі з біяграфіі Алеся Якімовіча (1904–1979). 2. Праца пісьменніка ў рэдакцыі часопісаў «Беларускі піянер», «Іскры Ільіча», «Бярозка». Пытанні тэорыі дзіцячай літаратуры ў творчай спадчыне А. Якімовіча. 3. Услаўленне савецкай рэчаіснасці ў ранніх апавяданнях («Гул бубна», «Юзік», «Залаты зуб» і інш.) і аповесцях («Перамога», «Незвычайны мядзведзь»). Спрошчанасць сюжэта гэтых твораў, сацыялагізацыя падзей, псіхалагічная нераспрацаванасць вобразаў. 4. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці А. Якімовіча (аповесць «Смелыя людзі», апавяданні «Піянер Геня», «Аладкі», «Аўтамат», «Чарнавочка» і інш.).

Пры асэнсаванні першага пытання студэнты, слухаючы выкладчыка, запаўняюць на лекцыі стандартныя формы храналагічных табліц*, пры гэтым абавязкова актуалізаванымі павінны быць наступныя даты: 17 студзеня 1904 г., 1921 г., 1923 г., 1924 г., 1925 г., 1930 г., 1943 г., 1944–1945 гг., 1945 г., 1948–1954 гг., 1955–1960 гг., 1960 г., 1967 г., 1971–1980 гг., 15 студзеня 1979 г. У слупку «Заўвагі» неабходна будзе пазначыць, якія факты біяграфіі асабліва паўплывалі на стварэнне таго ці іншага тэксту альбо вызначылі прыярытэты творчай ці навуковай дзейнасці Алеся Якімовіча.

Пры характарыстыцы другога пытання неабходна не проста вызначыць час, калі выходзілі часопісы «Беларускі піянер», «Іскры Ільіча», «Бярозка», але і паказаць, якія грамадска-палітычныя падзеі, літаратурна-эстэтычныя погляды ўплывалі на канцэпцыю часопісаў. З боку выкладчыка важна падвесці студэнтаў да высновы адносна значэння названых перыядычных выданняў у кантэксце дзіцячага перыядычнага друку Беларусі.

Трэцяе пытанне патрабуе ўзгадаць, што значыць паняцце «тэорыя бесканфліктнасці», а таксама вызначыць, у якіх з названых твораў найбольш паказальна адлюстраваліся наступствы гэтай з'явы.

Пры аналізе ранніх аповесцяў А. Якімовіча мэтазгодна засяродзіцца на аналізе твора «Незвычайны мядзведзь». Лепшаму яго асэнсаванню дапаможа параўнальна-псіхалагічны аналіз вобразаў хлопчыкаў Алёшы і Грышы. Такія спецыфічныя рысы тэксту, як лірызм, біяграфізм, апісальнасць і інш. дапамогуць на канкрэтным прыкладзе асэнсаваць асаблівасці жанру аповесці.

Чацвёртае пытанне лекцыі акрамя непасрэднай характарыстыкі змястоўнага ўзроўню арганізацыі названых мастацкіх тэкстаў, дае выдатныя магчымасці для характарыстыкі асаблівасцяў жанру апавядання. Найбольш паказальнае ў гэтым кантэксце апавяданне «Чарнавочка», што «… уяўляе сабой невялікі твор, у якім расказваецца, як правіла, пра нейкі адзін вызначальны выпадак, здарэнне ў жыцці чалавека. У апавяданні адна сюжэтная лінія з абмежаванай колькасцю дзеючых асоб, характары якіх ужо дастаткова сфарміраваныя. Апісанні ў апавяданні, як правіла, адсутнічаюць, а калі і маюць усё-такі месца, дык характарызуюцца пры гэтым надзвычайнай сцісласцю» [2, с. 181]. Важнымі асаблівасцямі названага жанру з'яўляюцца сітуацыя расказвання і выяўлены дыегетычны наратар. У дадзеным выпадку гэта вобраз настаўніка, што расказвае пэўную гісторыю з мінулага жыцця. У сувязі з названым неабходна прапанаваць студэнтам запісаць у рабочы сшытак азначэнне тэрміну «рэтраспекцыя».

Для тых студэнтаў, што здольныя выканаць заданне высокага (прадуктыўнага творчага) узроўню, можна прапанаваць падрыхтаваць рэфератыўнае паведамленне пра падпольную барацьбу беларусаў у час Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі «малой» радзімы. Як паказвае практыка, падобнае заданне выконваецца студэнтамі з энтузіязмам, а значыць аказвае неабходнае псіхолага-педагагічнае ўздзеянне.

---

* ДАТА	ФАКТЫ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ	ЗАЎВАГІ

У нашай практыцы выкладання дысцыпліны «Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура» выпрацавана сістэма работы, што прадугледжвае пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў выкананне пэўнага комплексу заданняў, якія садзейнічаюць фарміраванню і развіццю вызначаных вышэй кампетэнцый. Студэнты працуюць самастойна, звяртаюцца да пэўных крыніц з тым, каб пацвердзіць ці абвергнуць свае думкі і гіпотэзы.

На практычных занятках студэнтам прапануюцца наступныя пытанні для вывучэння і абмеркавання, а таксама практыкаванні.

1. **Праблемы маральна-этычнага выхавання школьнікаў у творчасці А. Якімовіча** (апавяданні «Залатыя рукі», «Пад Новы год (Незвычайная прыгода з Віцем Сінічкіным)», «Слабая воля», «Цяжкая хвароба» і інш.).

Практыкаванне 1. Прачытайце мастацкія тэксты, прааналізуйце іх па прапанаванай схеме*. Вызначце выхаваўчы і пазнавальны патэнцыял гэтых твораў.

Практыкаванне 2. Назавіце мастацкія сродкі, якімі карыстаецца апавядальнік пры адлюстраванні адмоўных вобразаў названых твораў. Запішыце ў рабочы сшытак азначэнні паняццяў «іронія», «гіпербала», «эўфемізм».

Практыкаванне 3. Зрабіце параўнальны аналіз названых твораў А. Якімовіча (1–2 на выбар) і твораў сусветнай дзіцячай літаратуры, што закранаюць падобныя праблемы. Рэкамендуецца ўзнавіць у памяці або з дапамогай чытацкага дзённіка тэксты, што асэнсоўваліся ў папярэдніх семестрах, — А. Гайдара, В. Асеевай, У. Крапівіна, В. Драгунскага, М. Носава і інш.

2. **Спецыфіка адлюстравання гістарычнага мінулага Беларусі ў Галынаўскай хроніцы** («Адкуль ліха на свеце», «Канец сервітуту», «Кастусь Каліноўскі», «Цяжкі год») і аповесці «Базылёў курган».

Практыкаванне 1. Для асэнсавання «Галынаўскай хронікі» рэкамендуецца падзяліць студэнтаў на 4 міні-групы, кожная з якіх павінна правесці поўны пісьмовы літаратуразнаўчы аналіз адной з аповесцяў тэтралогіі. Асаблівая ўвага павінна быць нададзена праблеме мастацкай версіі гістарычнага факта.

Практыкаванне 2. Прачытайце і асэнсуйце артыкул Якімовіч, А. Як я працаваў над аповесцю «Кастусь Каліноўскі» / А. Якімовіч // Роднае слова. — 2004. — № 1. — С. 9.

Практыкаванне 3. У аповесці «Базылёў курган» вызначце значэнне адлюстравання двух часавых пластоў, а таксама зрабіце супастаўляльны аналіз манеры аповеду ў кожным з іх.

Практыкаванне 4. Напішыце невялікую нататку пра цікавыя тапонімы і мікратапонімы свайго населенага пункта.

3. **Майстэрства Якімовіча-казачніка. Асаблівасці апрацовак народных казак А. Якімовічам** (зборнікі «Каток — залаты лабок» (1955), «Бацькаў дар» (1959), «З рога ўсяго многа» (1959), «Людзей слухай, а свой

*У пачатку вывучэння дысцыпліны студэнты атрымліваюць метадычныя матэрыялы, сярод якіх і схема літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту.

розум май» (1980), «Андрэй за ўсіх мудрэй» (1983)). Арыентацыя на вопыт Якуба Коласа і А. Талстога.

Практыкаванне 1. Параўнайце названыя зборнікі апрацовак народных казак А. Якімовіча па наступных прыкметах:

1) знешняе афармленне;
2) колькаснае напаўненне;
3) якія тэматычныя групы казак (пра жывёл, чарадзейныя, сацыяльна-бытавыя) пераважаюць і чаму.

Практыкаванне 2. З кожнага зборніка выберыце па 3 казкі з кожнай тэматычнай групы і знайдзіце ім фальклорныя адпаведнікі. Зрабіце вывад, па якім шляху ішоў пісьменнік пры апрацоўцы народных твораў: апрошчванне ці ўскладненне фабулы, сэнсавага напаўнення твораў, насычэнне новымі персанажамі і падзеямі альбо, наадварот, адмаўленне ад залішняй перыпетыйнасці і інш. Вывады запішыце ў сшытку.

4. **Літаратурныя казкі ў творчасці А. Якімовіча, выкарыстанне ў іх традыцый фальклорнага матэрыялу** («Каваль Вярнідуб», «Лянота», «Казка пра смелага вожыка» і інш.).

Практыкаванне 1. Прачытайце мастацкія тэксты, прааналізуйце іх па схеме. Выпішыце са слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў азначэнне жанру «літаратурная казка».

Практыкаванне 2. Вызначце шляхі стварэння літаратурнай казкі (на аснове арыгінальнай аўтарскай фабулы альбо на аснове традыцыйных фабульных схем). Размяркуйце казкі А.Якімовіча ў залежнасці ад тыпу стварэння, а таксама вызначце магчымыя фальклорныя першакрыніцы.

Практыкаванне 3. Вызначце асаблівасці выкарыстання вуснай народнай творчасці на розных узроўнях арганізацыі мастацкага тэксту — змястоўным (тэма, фабула, характар, пафас, ідэя) і фармальным (мастацкае маўленне, сюжэт і кампазіцыя, сістэма вобразаў). Свае вывады занатуйце ў табліцы.

Назва казкі	Асаблівасці зместу	Асаблівасці формы
«Казка пра смелага вожыка»		
«Каваль Вярнідуб»		
«Лянота»		

Самастойная работа студэнтаў выконваецца па наступным алгарытме: выкананне практыкаванняў, пісьмовае іх афармленне ў сшытку для самастойнай работы, праверка выкладчыкам гэтых практыкаванняў (франтальная або выбарачная). Неабходна адзначыць, што змест самастойнай работы вядомы студэнтам ужо з самых першых этапаў вывучэння дысцыпліны. Па тэме «Алесь Якімовіч» прапануюцца наступныя практыкаванні.

1. Вызначце, на якой аснове адбываецца аб'яднанне цыклу аповесцяў Галынаўскай хронікі, у чым яго адрозненне ад «Палескай хронікі» І.Мележа. Супастаўце азначэнне жанру В.І. Яцухны *«Аповесць прадстаўляе сярэднюю форму ў эпічным родзе літаратуры. У ёй звычайна прысутнічае адна сюжэтная лінія, у выніку чаго, у параўнанні з раманам, мае месца значна меншы ахоп жыццёвых падзей, сітуацый»* [2, с. 181] з іншымі азначэннямі айчынных і замежных літаратуразнаўцаў. Вывады занатуйце ў сшытку.

2. Для лепшага асэнсавання гістарычных перыядаў, адлюстраваных у Галынаўскай хроніцы, запоўніце табліцу:

	«Адкуль ліха на свеце» 1962	«Кастусь Каліноўскі» 1971	«Канец сервітуту» 1968	«Цяжкі год» 1977
Адлюстраваны гістарычны перыяд, сапраўдныя гістарычныя падзеі				
Рэальныя гістарычныя асобы і мясціны				
Характарыстыка вобраза Язэпа Валовіча (у апошняй аповесці — яго нашчадка Петруся Валовіча)				
Спецыфіка аповеду і мэтазгоднасць такога выбару				

3. Вызначце, які перыяд творчасці А. Якімовіча быў найбольш спрыяльны для апрацоўкі фальклорных твораў, а які стымуляваў асабістую аўтарскую фантазію. Свае разважанні падмацуйце фактамі з біяграфіі пісьменніка.

4. Падрыхтуйце рэфератыўнае паведамленне па тэме «А. Якімовіч як перакладчык казак Аляксандра Пушкіна, Пятра Яршова, твораў для дзяцей Уладзіміра Маякоўскага, Карнея Чукоўскага, Самуіла Маршака».

Такім чынам, вывучэнне твораў А. Якімовіча ў кантэксце праграмы дашкольнай адукацыі і ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі дае багатыя магчымасці для набыцця адпаведных кампетэнцый, рэалізацыі разнастайных псіхолага-педагагічных задач. Разам з тым, студэнты атрымліваюць належныя веды тэарэтычнага характару, асэнсоўваюць жанравую разнастайнасць айчыннай літаратуры, вобразна-выяўленчае багацце беларускай мовы. Выкарыстаныя пры вывучэнні тэмы «Алесь Якімовіч» метады і прыёмы, заданні могуць стаць метадычным падмуркам будучай прафесійнай дзейнасці сённяшніх студэнтаў.

Літаратура

1. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Высшее образование. Первая ступень: Специальность — 1–01 01 01 Дошкольное образование: Квалификация — педагог = Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень: Спецыяльнасць — 1–01 01 01 Дашкольная адукацыя: Кваліфікацыя — педагог.
2. Яцухна, В. І. Тэорыя літаратуры: дап. для студ. філал. спец. ВНУ / В. І. Яцухна. — Гомель: ГДУ імя Францыска Скарыны, 2006. — 279 с.

Ірына Шматкова (Мінск)

МОЎНА-СТЫЛЁВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЎВАСАБЛЕННЯ ВОБРАЗАЎ МАЦІ І ДЗІЦЯЦІ Ў ЛІРЫЦЫ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТЭС ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

Вобразы маці і дзіцяці, традыцыйныя для вуснай народнай творчасці, з’яўляюцца ідэяўтваральнымі ў творчасці беларускіх паэтэс другой паловы XX ст. Між іншым, вобраз маці шырока выкарыстоўваецца ва ўсёй беларускай

паэзіі. Напрыклад, у М. Багдановіча гэты вобраз праходзіць скразной ніткай праз усю творчасць, набываючы арэол святасці: *«Прычасціўся целу мацеры, // Малаком яе грудзей…»* [1, с. 367].

Своеасаблівы культ мацярынства ствараецца ў творах беларускіх паэтэс. Менавіта ў «жаночай» лірыцы прыродны мацярынскі пачатак увасобіўся з найбольшай сілай. Гэты факт не можа быць аспрэчаны нават тымі, хто адмаўляе гендарную тэорыю. «Жаночыя» вершы — гімн любові паміж маці і дзіцём, увасабленне мацярынства як боскага наканавання, сімвал будучага жыцця, — усяго таго, што адлюстроўваецца спрадвечна на хрысціянскіх абразах з выявай Багародзіцы. Г. Каржанеўская ўсведамляе ўсю прыгажосць жанчыны-маці і без лішняй сціпласці зазначае: *«Мастачкаю была б — // намалявала б // жанчыну маладую. // На каленях // ляжыць дзіця — ружовенькі галыш. // (Яго б я запазычыла знарок // з палотнаў Рафаэля, // а жанчыну // з суседкі змалявала б // ці з сябе.)»* [2, с. 80]. У Я. Янішчыц вобраз маці надзелены эпітэтамі «светлы»: *«Світаць мне будзе з-пад рукі // Пагляд матулі шчыры»* [3, с. 141], і «святы»: *«Ты, мама, да канца // Пакорліва-святая...»* [3, с. 309]. У паэзіі В. Вярбы вобраз маці-святыня ўвасабляецца праз метафару «храм»: *«Абцасікі скіну звонкія, // Прыйду да матчынага храма. // Рукі ў цябе добрыя, тонкія, // Літасцівая мама!»* [4, с. 58]).

Абагульнены вобраз маці стварае Я. Янішчыц у вершы «Я вас люблю», сваю заклапочанасць будучым паэтэса перадае, выкарыстоўваючы для гіпербалічнага параўнання са словам «мацяркі» паронім «мацерыкі»: *«Люблю я вас, сівыя мацяркі, // Што аж дагэтуль гояць боль па дзецях, // Што вы мне ўсе — нібы мацерыкі, // Якія хочуць міру на планеце»* [3, с. 123]. У гэтай сувязі бачыцца слушным меркаванне Т. Чабан, якая выказвае думку: «У процівагу выдаткам «эмансіпацыі» і «фемінізацыі» ўвагу паэтэс прыцягвае матыў традыцыйнай жаночай долі — долі маці, жонкі, самаахвярнай захавальніцы дому, роду, ачага. Гэты матыў звязваецца паэтэсамі з праблемамі захавання і зберажэння нашага агульнага зямнога дому, міру на планеце, з мацярынскай любоўю да ўсяго жывога (спрадвечны архетып — Маці свету)» [5, с. 12].

З усведамленнем свайго мацярынскага прызначэння беларускімі паэтэсамі пераасэнсоўваецца любоў да сваёй маці, якая стала залогам пераемнасці пакаленняў, калі вытокі жыцця — у бацьках, а працяг — у дзецях. Г. Каржанеўская з уласцівай яе паэтычнаму стылю лаканічнасцю ў вершы-прысвячэнні маці «Мы выязджалі з Ягоднага ранкам…» падсумоўвае: *«Яе калыска — значыцца пачатак // Мяне самой»* [6, с. 12]. Такім чынам, праз вобраз маці прыходзіць яшчэ і асэнсаванне вобразу Радзімы. Калі паглыбіцца ў этымалогію гэтага слова, то ўбачым, што яно складаецца з дзвюх частак: «Род (тварэц, бог Святла і ўсяго Сусвету ва ўсходніх славян) + ма (у санскр. Маці), парадзіха — тая, што нараджае, дае жыццё, з'яўляецца працягам Рода-творцы. У далейшым гэта паняцце трывала замацоўваецца за месцам, дзе адбываецца акт Боскага тварэння, з'яўленне чалавека на свет» [7, с. 28].

Пры ўвасабленні вобраза маці ў лірыцы беларускіх паэтэс характэрнымі сталі матывы настальгіі не толькі па малой радзіме, але і ўвогуле па дзяцінству, матчынай калыханцы, матывы памяці, віны і пакаяння. Мама стала для

Я. Янішчыц настаўнікам, самым лепшым: *«Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён // І цярплівасці вечнай — уголас не плакаць»* [3, с. 59], — і самым строгім: *«А вершы баюся чытаць, // каб мяне // На глухой не злавіла ноце // Мама — мая паэтэса»* [3, с. 69]. Спрадвечную народную мудрасць перадала маці сваёй дачцэ, і навучыла спяваць — у маці з дачкой агульная песня, адна на дваіх: *«Бачыш, як высока ўзняліся // Нашы песні — нашы журавы»* [3, с. 260]. Сэнс народнага выхавання перададзены ў вершы формамі адмаўлення, уласцівымі фальклорным творам: *«Не дакарала, не журыла // Ні ў цішыні, ні пры гасцях…»*, мацярынскае бласлаўленне ўвасоблена таксама праз народна-казачны вобраз клубочка: *«Клубочак з лёну ўпусціла // Матуля ціха мне на шлях»* [3, с. 40]. Вобраз маці ў лірыцы Я. Янішчыц перадаецца праз народна-паэтычныя метафары, гэта і кветка: *«Прыеду. Кветка чакання ў акне // Міргае-цвіце ў адзіноце»* [3, с. 69], і птушкі — паэтэса ўвасабляе маці праз вобразы розных птушак: *«ластаўка нястомнае надзеі», «горлінка нязмераных клапот», «сойка скрухі», «перапёлка жалю», «кнігаўка маіх лірычных кніг»* (верш «Мама і птушкі» [3, с. 254].

Калі маці Я. Янішчыц захварэла — у дачкі баліць усё: *«Так мне рукі твае не балелі ніколі ..., Так ніколі тваё не шчымела мне сэрца .., Так ніколі твая не балела мне доля ..., Так ніколі, як сёння, // Тваё // Не балела мне слова»* (верш «Ля ложка хворай маці») [3, с. 21]. Анафарычны паўтор узмацняльнай часціцы «так» праз увесь верш нагадвае ўсхваляванае сэрцабіццё. Навідавоку еднасць маці з дачкой, прычым як духоўная, так і цялесная. Вобразы-метафары ў форме адмаўлення *(«не ложак, а жытнёвае поле», «не ходнікі, а саматканыя сцежкі-дарожкі»…)* перамяжоўваюцца пяцікратным паўторам слова *«Мама!»*, клічнік пасля якога — вышэйшая ступень эмацыянальнага напружання. Велічыня перажыванняў дачкі за хворую маці па-народнаму гіпербалізуецца: *«ты на ложку ляжыш — // і прыціхла за хатай дуброва»* (дарэчы, такі ж фальклорны прыём выкарыстоўвае і Г. Каржанеўская ў «Былі пра бабку Паўліну» [2, с. 95], у якой распавядаецца пра гора дачкі пасля смерці маці — у гэты час увесь акаляючы свет ёй спачуваў: кветка завяла, антонаўкі асыпаліся, асела павуціна, парсючок збег у лес і інш.).

Але ж жыццё мае працяг — у сыне, якому Я. Янішчыц прысвяціла шмат вершаў («У калыханку сыну», «Сынок і маці», «На ўсякі выпадак…» і інш.). Гэтая ж тэма раскрываецца і ў лірыцы Е. Лось («Маці і сын», «Сынок, сынок...», «Сынку», «Сынава доля» і інш.). Прычым неабходна зазначыць агульнасць у перадачы мацярынскага пачуцця (абедзве жанчыны мелі па аднаму сыну, якіх давялося гадаваць ім у адзіночку), выяўленую не толькі праз падобныя назвы твораў, праз агульны пафас, але і нават аднолькавыя метафары: *«Сынок, сынок, // бялюткі бацянок!..»* [8, с. 136] (Е. Лось) і «*Свет мой — голенькі ды босы, // Мой бялюткі бацянок...»* [3, с. 57] (Я. Янішчыц). Агульнасць паэтычных вобразаў яшчэ раз пераконвае ў апоры лірыкі беларускіх паэтэс на народную традыцыю. Метафары «зерне і ралля» у вершы Я. Янішчыц «Сынок і маці» ўвасобілі народны жыццясцвярджальны пачатак: *«Покуль яшчэ зялёная зямля // Трымае нас па міласці закона, // Сынок і Маці — зерне і ралля. // Сынок і маці — мудрая ікона»* [3, с. 206]. Уражвае сваім

балючым прароцтвам верш-наказ Я. Янішчыц сыну «На ўсякі выпадак…», у якім нібы ў прадчуванні трагедыі, лірычная гераіня дае парады свайму дзіцяці — і акуратна рабіць урокі, і паважліва адносіцца да суседзяў, і наказ, выражаны ў амоніме «здача»: *«Сыночак, чэсна, бы ўчора, // Прынось грашовую здачу // З прадуктовага магазіна... // Ды, на ўсякі выпадак, // Умей даць здачы // Подласці і няпраўдзе! … Бо можа так здарыцца, // Што заўтра — // Не выйду табе насутрэчу. // Мама»* [3, с. 312].

Вобраз роднай матулі прысутнічае ў многіх вершах Н. Мацяш розных перыядаў творчасці. У маладой паэтэсы — гэта вершы-песні, вершы-гімны самаму роднаму чалавеку на свеце. У верш «Песня матчынай маладосці» аўтарка уводзіць народную заручальную песню, якую спявала яе маці, а ў вершы «Калыханка маме» паэтэса ўжо сама «спявае» калыханку маме, як некалі яна спявала ёй. Вобраз маці надзелены самымі цёплымі эпітэтамі: *«натомленая», «даверлівая», «усмешлівая»* і інш., а рэфрэн-пяшчотны зварот да маці *«Сустрэнься ў сне з сабой, мая ласкавая, // З вясной сваёю, любая мая…»* [9, с. 72–73], як і патрабуе таго фальклорны жанр калыханкі, тройчы паўтараецца напрыканцы кожнай страфы.

Верш «Рукі маці» Н. Мацяш успрымаецца як гімн маці, услаўленне яе вобразу, ён будуецца са строф-захапленняў, выражаных сінтаксічнымі формамі «часціца як + прыслоўе + дзеяслоў» *(«як соладка спіцца», «як хораша прачынацца», «як рупна прыпякае [сонца]»*, і ўсё гэта сімвалы шчасця — *«калі побач мама»* [9, с. 89]. Вобраз магутнай маці надзяляецца жыццятворчай сілай.

Фальклорная традыцыя прадвызначае і змест «Паэмы жніва» Н. Мацяш. Смерць маці спарадзіла ў творы паэтэсы глыбока трагедыйныя матывы. У адпаведнасці з народнай традыцыяй аўтарка выкарыстоўвае ва ўступным маналогу паэмы класічнае галашэнне*: «Дажала, матулечка, вось ты, матулька, й дажала // Усе свае болі, маркоты і ўцехі свае»* [9, с. 265]. Твор пабудаваны ў форме звароту да памерлага роднага чалавека, успамін аб яе жыццёвым шляху, дзеяслоў *«дажыла»* замяняецца паранімічным *«дажала».* Незваротнасць трагедыі ўзмацняюць кароткія сказы-найменні, якія заканчваюцца шматкроп'ем: *«Лапкі яліны… Вякі… Каснікі… Дамавіна… <…> Вясковая чорная вуліца… Людзі… Літанні… Магіла… Аркестр… Пахаванне… <…> Памінанне… Кароткія пацеры…»* [9, с. 265]. Паэтэса развітваецца з дарагім і родным чалавекам словамі народнай сірочай песні: *«Ой, нашто мне жыць на свеце, як маці не маю»* [9, с. 266]. Сапраўдным сродкам ратавання і гарманізацыі разладжанай душы робіцца песня: *«Памажы мне, песня, акрыяць…»* [9, с. 268]. У трыпціх «Тры каласкі любові і смутку» ўключаны жніўныя народныя песні, у якіх хлеб выступае сімвалам жыцця, і ў гэтым творы паэтэса просіць прабачэння ў маці, што не ля яе магілы, што *«не адпускае хлебны клопат»* — што ж, *«жывым — жывое…»* [9, с. 274].

Але напрыканцы зямнога шляху Н. Мацяш вобраз маці паўстае перад паэтэсай усё часцей: *«Скуль ведаеш пра смутак мой чарговы? // А ведаеш, бо йдзеш яго разважыць»* [10, с. 22]. Лірычная гераіня скардзіцца роднай матулі: *«Жыццё стамляе, МАМА».* Маці ў гэтым творы ўвасабляецца праз метафару *«бяссоннай Берагіні»* (аўтарскі неалагізм, які можа мець этымалогію і як формы

жаночага роду ад назоўніка мужчынскага роду «бераг», да якога хочацца лірычнай гераіні нарэшце прымкнуць, так і як формы назоўніка, утворанага ад дзеяслова «зберагаць, берагчы»). У вершы «На дзяды» гучаць цёмныя прадчуванні паэтэсы *«мусова і мне туды»*, але *«страху няма і на валос»,* таму што вобраз маці суправаджае яе на працягу ўсяго жыцця — ад нараджэння да самага канца: *«Дотык рукі, мамін голас: // Ступай у мае сляды…»* [10, с. 18]. Уся трагедыя жанчыны, якой не давялося спазнаць шчасце мацярынства, увасобілася ў паэтычных тропах верша «Белая поўня»: *«Сівая жанчына, // якую так ніхто й не паклікаў: // «Мама!» … <…> Апеклівая сляза // на шчацэ старасці адзінокай…»* [10, с. 51–52].

Вобраз жанчыны-маці, мацярынскага ўспрымання свету з асаблівай выразнасцю ўвасоблены ў паэзіі В. Вярбы і Г. Каржанеўскай. Шчасце, будучы лёс і доля дзяцей — тая найвышэйшая мерка, паводле якой паэтэсы вымяраюць усе іншыя каштоўнасці жыцця. В. Вярба падбірае самую цёплую метафару для вобразаў дзяцей: «*Ў холадзе снежнай завеі // Сонечным промнем — дзеці»* [4, с. 121]. Паэтэса піша цэлую нізку вершаў пра сына «Мая маленькая планета», у якой лірычная гераіня раскрывае маштабнасць мацярынскага пачуцця, выкарыстоўваючы народныя сродкі гіпербалізацыі, калі дзіця для маці — цэлы сусвет, калі маці за дзіця гатова ахвяраваць усім, нават уласным жыццём: *«Я б сэрца пад тапор паклала // За першы дзень твайго быцця»* [4, с. 133]. Шчасце жанчыны-маці для лірычнай гераіні Г. Каржанеўскай раўназначнае такім з’явам-паняццям, як гармонія ці паэзія: *«Бэз адцвіце — адпяе салавей, // Тэрмін на ўсё вызначае прырода. // Трэба дзяцей гадаваць. За дзяцей // Самае лепшае песні не шкода»* [11, с. 24]. Вобраз дзіцяці, як правіла, заўсёды прысутнічае ў тых вершах Г. Каржанеўскай, дзе яна асэнсоўвае самыя важныя, балючыя пытанні, вызначальныя праблемы сучаснасці. Звяртаючыся да сваіх дачок, Алены і Настассі, пісьменніца, выкарыстоўваючы ўсё тую ж народную метафару «дзеці — зерне, калоссе», выказвае жаданне: *«Хай не пустымі будуць каласкі, // Узрошчаныя ласкаю і працаю»* [12, с. 159].

Такім чынам, маці і дзіця ў лірыцы беларускіх паэтэс сталі вядучымі складнікамі канцэпцыі лёсу жанчыны. Увасабленне вобразаў маці і дзіцяці ў іх творчасці заснавана на метафарызацыі, паэтэсы па-майстэрску спалучаюць фальклорную сімволіку з «жаночым» метафарычным светабачаннем. Беларускія паэтэсы, глыбока засвоіўшы дух мовы, механізм народнай словатворчасці, прынеслі ў літаратуру «свой слоўнік», свае моўныя канструкцыі, сваю паэтычную музыку. Іх лірыка «гаворыць» вуснамі жанчыны-беларускі. Аб’ядноўвае творчасць Е. Лось, В. Вярбы, Я. Янішчыц, Н. Мацяш, Г. Каржанеўскай нацыянальны моўны каларыт, вытокі якога ў беларускай песеннай прасодыі.

Літаратура

1. Багдановіч, М. Інтымны дзённік: выбр. тв. / Максім Багдановіч. — Мінск: Радыёла-плюс, 2006. — 528 с.
2. Каржанеўская, Г. Асенні мёд: вершы розных гадоў / Г. Каржанеўская. — Мінск: Маст. літ., 1999. — 159 с.
3. Янішчыц, Я. Пачынаецца ўсё з любві...: вершы, паэмы / Я. Янішчыц. — Мінск: Маст. літ., 2008. — 339 с.

4. Вярба, В. Апошні верасень. Выбранае: вершы і паэмы / В. Вярба. — Мінск: Маст. літ., 1995. — 270 с.
5. Чабан, Т. К. Сучасная паэзія і фальклор / Т. К. Чабан, Я. А. Гарадніцкі // АН БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мінск: Навука і тэхніка, 1988. — 128 с.
6. Каржанеўская, Г. «Што варта радасці і слёз…»: біяграфія ў вершах і нарысах / Г. Каржанеўская. — Мінск: Кнігазбор, 2013. — 100 с.
7. Таленавітыя жанчыны Беларусі ў культурнай, навуковай і мастацкай прасторы свету: зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-практ. канф., Мазыр, 24–25 мая 2007 г. / Мазырскі пед. ун-т імя І. П. Шамякіна; адк. рэд. А.У. Сузько. — Мазыр: УА МДПУ, 2007. — 251 с.
8. Лось, Е. І каласуе даўгалецце / Е. Лось. — Мінск: Маст. літ., 1998. — 367 с.
9. Мацяш, Н. Паміж усмешкай і слязой: вершы і паэмы (1962 — 1992) / Н. Мацяш. — Мінск: Маст. літ., 1993. — 301 с.
10. Мацяш, Н. У прыгаршчах ветру: вершы, пераклады, эсэ / Н. Мацяш. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. — 144 с.
11. Каржанеўская, Г. Жыла-была: лірыка / Г. Каржанеўская. — Мінск: Маст. літ., 1983. — 95 с.
12. Каржанеўская, Г. Невымоўнае: вершы / Г. Каржанеўская. — Мінск: Маст. літ., 1991. — 287 с.

Екатерина Хальпукова (Минск)

«ЛИТЕРАТУРА НА ЭКРАНЕ» В ИНОСТРАННОЙ АУДИТОРИИ (ИЗ ОПЫТА ПРЕПОДАВАНИЯ)

Видеокурс «Литература на экране» является частным направлением в системе коммуникативного культуроориентированного обучения русскому языку как иностранному. Нацеленность на совершенствование свободного владения языком определяет такие задачи в преподавании, как обучение пониманию иноязычной речи на слух, лексическое обогащение речи, развитие навыков спонтанной речи. Разработанный в рамках «Практики русской устной и письменной речи», этот курс предполагает интерактивную работу, основанную на сопоставлении литературных и кинематографических текстов, что заканчивается, как правило, интересной дискуссией об особенностях экранизации, об отношении к классике и о роли режиссера в киноинтерпретации.

Безусловно, любой художественный фильм предоставляет широкие возможности для общения, однако «экранизации всегда вызывают нас на спор» [6, с. 5]. Это связано с отношением к изменениям, произошедшим при переводе с одного языка искусства на другой. Вследствие этого видеоматериал, используемый на занятиях, воспринимается не как развлечение, а как основа для серьезной аналитической работы.

Далеко не всякую экранизацию можно назвать удачной. Как пишет В. Мильдон, «экранизацию следует считать успешной, когда средствами кино удалось выразить не выразимое средствами слова, поскольку же у кино свои средства, можно ожидать, что на экране в литературном произведении откроется нечто, о чем не догадывались при чтении, что могло не приходить на ум даже самому автору» [5, с. 37]. А Л. Славин утверждает, что «особенного успеха экранизация достигает тогда, когда на экран перенесено не только

данное произведение писателя, но и общий дух его творчества, его стиль, его мир — мир Толстого, мир Чехова, мир Тургенева, мир Салтыкова-Щедрина» [7, с. 4]. Курс «Литература на экране» предполагает работу с экранизациями не только русской литературы (но обязательно на русском языке, а в идеале — с субтитрами), поэтому он может быть расширен и уточнен. Вопрос о выборе фильмов в большой степени зависит от конкретной аудитории: от уровня ее подготовленности, художественных предпочтений и даже от национальности. Иногда просмотр фильма приурочен к историческим датам. Так, например, накануне Дня Победы несколько занятий отводится экранизациям на военную тему («А зори здесь тихие…», «Они сражались за Родину», «Летят журавли»).

Несмотря на то, что курс рассчитан на иностранных стажеров, студентов и магистрантов, владеющих языком в объеме уровней В 2, С 1, при просмотре фильма многое для них остается непонятным или понятым неверно. В связи с этим на занятиях уделяется большое внимание комментариям преподавателя, краткому пересказу сюжетной линии и разбору наиболее трудных выражений. Просмотр экранизаций может осуществляться во внеаудиторное время, тогда на занятиях проводится работа только с кинокадрами и киноэпизодами.

Конечно, *«литературное произведение на киноэкране упрощается»* [5, с. 185] и не всегда можно найти достойное воплощение литературного языка в кинематографическом, однако роль преподавателя как раз и заключается в умении так заинтересовать, чтобы возникло желание перечитать или прочитать первичный текст, т.е. был намечен переход от зрительской аудитории к читательской [2, с. 135]. Чтение подлинных образцов художественной прозы является обязательным в этом курсе.

Как говорилось ранее, экранизации всегда вызывают живой отклик, поэтому после просмотра фильма всегда проводится беседа, которая может сводиться не только к анализу сюжета и характеристике героев. Бесспорно, иностранные студенты должны уметь давать ответы на вопросы, поставленные по материалу художественного фильма, рассказывать отдельные эпизоды, выражать оценочные интенции в трактовке тех или иных поступков героев. Если есть возможность познакомиться с разными экранизациями одного произведения, то может быть очень интересной их сравнительная характеристика на основе идейных установок времени, когда были созданы фильмы. Так, например, при сопоставлении советской экранизации «Анны Карениной» режиссера А. Зархи с зарубежными киноадаптациями отмечается разница в передаче духа эпохи второй половины XIX в., что связано, с одной стороны, с проблемой взаимодействия национальных культур, а с другой — со спецификой интерпретации произведений прошлого с точки зрения современности. Л. Белова об особенностях зарубежных экранизаций «Анны Карениной» пишет следующее: «Это разные женщины в обстоятельствах, близких тем, в которых оказалась Анна, в окружении, пространстве и времени достаточно условном, искусственном, не толстовском» [3, с. 13]. О подмене романного образа главной героини говорит и Л. Аннинский: «В экранизациях — это женщина прекрасная в любви, свободная натура, которой ханжи помешали и которой партнер оказался недостоин. В романе — это одержимая. Это

прекрасная когда-то натура, внутри которой «бес пустоты» выел все, исказил все, подменил» [1, с. 238]. Разумеется, без комментариев преподавателя на таких занятиях не обойтись.

Следует акцентировать внимание на художественной условности изучаемых произведений, чтобы авторский взгляд не был заглушен сформированными ранее знаниями, что иногда случается при характеристике образа Иешуа в «Мастере и Маргарите» М. Булгакова.

Отдельного разговора всегда заслуживает символика в киноверсии. Обращать внимание зрителей необходимо на все, что становится носителем значения, вплоть до цвета пленки, на которой снят фильм. К примеру, в знаменитой экранизации булгаковской повести «Собачье сердце» режиссера В. Бортко для усиления оппозиции «Москва старая» — «Москва новая» используется черно-белое изображение. А фильм А. Михалкова-Кончаловского «Дядя Ваня» по банальнейшей причине (нехватка цветного «Кодака») был снят на цветной и черно-белой пленке, чему впоследствии нашли символическое обоснование. И это тоже отдельная тема для разговора, так как «режиссер может связывать цвет с определенным героем, создавая подобие музыкальной темы или идентифицируя определенные окрашенности с «точками зрения» или эмоциональной напряженностью (коррелят интонации), создавать дополнительную информацию» [4, с. 340–341].

Пусть не в каждой аудитории можно провести сопоставление литературных и кинематографических текстов, однако всегда можно обсудить с иностранными студентами темы и проблемы, поднятые фильмом. В частности, просмотр «Анны Карениной» может завершиться дискуссией о гендерном неравенстве или о роли семьи, просмотр современной экранизации романа Д. Мирпольского «18’14» — беседой об элитных учебных заведениях и об образовании в целом, просмотр «Дяди Вани» — размышлениями о нереализованных возможностях и о том, что значит талантливо прожить жизнь. В любом случае фильмы по литературным произведениям являются действенным стимулом к речевому общению в иностранной аудитории, что приводит к достижению поставленной цели.

Литература

1. Аннинский, Л. А. Лев Толстой и кинематограф / Л. А. Аннинский. — М.: Искусство, 1980. — 288 с.
2. Базен, А. За «нечистое» кино (В защиту экранизации) / А. Базен // Что такое кино? Сборник статей / А. Базен. — М.: Искусство, 1972. — С. 122–146.
3. Белова, Л. И. Русское слово на зарубежном экране / Л. И. Белова. — М.: Знание, 1980. — 56 с.
4. Лотман, Ю. М. Структура художественного текста / Ю. М. Лотман. — М: Искусство, 1970. — 384 с.
5. Мильдон, В. И. Другой Лаокоон, или О границах кино и литературы. Эстетика экранизации / В. И. Мильдон. — М.: Росспэн, 2007. — 224 с.
6. Рыбак, Л. А. Прочитано экраном / Л. А. Рыбак. — Вып. 1: Об экранизации литературных произведений. — М.: Бюро пропаганды сов. киноискусства, 1975. — 49 с.
7. Славин, Л. Экран и писатель / Л. Славин // Второе рождение. Некоторые вопросы экранизации / Л. З. Фрадкин. — М.: Искусство, 1967. — С. 3–6.

Аляксандр Барковіч (Мінск)

КОРПУС ТЭКСТАЎ У ФІЛАЛАГІЧНЫМ ДЫСКУРСЕ

Дзейнасць па арганізацыі корпуса тэкстаў можа быць дастаткова разнастайнай. Крытэрыі адбору тэкстаў для свайго корпуса стваральнік задае адпаведна скіраванасці сваёй практычнай ці навуковай дзейнасці: парог адлюстравання будзе вызначацца патрабаваннем прадставіць у корпусе запланаваны моўны аб'ект. Нават аб'яднанне ў адным файле адабраных па пэўных крытэрыях тэкстаў адбываецца, як правіла, з улікам папярэдне вызначанай мэты, што немагчыма без усведамлення металінгвістычных умоў стварэння і фунцыянавання абранага матэрыялу. Разам з тым, пачынаючы з Браўнаўскага корпуса — амаль адразу выкарыстанага для філасофскіх даследаванняў, — практычная вартасць створанага корпуснага рэсурса, як правіла, перавышае запланаваныя вынікі [3].

Тым не менш, да гэтага часу недаацэнена магчымасць выкарыстання корпусных рэсурсаў для дыскурсіўных практык, кантэнт-аналізу, экспертных сістэм і многіх іншых прыкладных даследаванняў. Іннавацыйны патэнцыял корпусных даследаванняў з цягам часу будзе толькі ўзрастаць.

Паўвекавы тэрмін корпуснай дзейнасці абумовіў цікавую асаблівасць адпаведнай дыскурсіўнай практыкі: узнаўленне раней створаных рэсурсаў. Корпусы, якія працуюць на базе маральна састарэлага праграмнага забеспячэння, нярэдка перарабляюцца пад новыя тэхналагічныя магчымасці. Напрыклад, стварэнне «Цюбінгенскіх корпусаў рускіх тэкстаў» на базе «Упсальскага корпуса сучасных рускіх тэкстаў», сведчаць аб дастаткова высокай філалагічнай вартасці тэкстаў, як самадастатковай і ўнікальнай сукупнасці [2].

Дыскурсіўны аспект корпусных распрацовак мае важнае значэнне, аказваючы сур'ёзны ўплыў на даследчы працэс у корпусным рэчышчы. Паводле крытэрыяў адбору тэкстаў і рэпрэзентатыўнасці корпусы прынята дзяліць на два класы. У першы клас уваходзяць універсальныя корпусы тэкстаў, мэта якіх — аб'ектыўна адлюстроўваць шырокую плынь маўленчай дзейнасці. Толькі суцэльны, без суб'ектыўнага адбору корпус, напрыклад, нацыянальны корпус, дазваляе атрымаць поўную, сістэмную карціну стану мовы. Прычым, на практыцы корпусныя даследаванні могуць насіць лакальны па пэўных паказчыках характар. Метадалогія пабудовы корпусаў першага тыпу так ці інакш грунтуецца на прынцыпе дэдукцыі — ад агульнага (аб'ектыўнай маўленчай практыкі) да канкрэтных тэкстаў, якія адлюстроўваюць гэта агульнае.

Здольнасць корпуса тэкстаў адэкватна адлюстроўваць уласцівасці праблемнай вобласці, рэлевантныя для вызначанага тыпу лінгвістычнага даследавання, вызначаецца яго рэпрэзентатыўнасцю. Ва ўніверсальных корпусах высокая дакладнасць вынікаў забяспечваецца высокімі колькаснымі паказчыкамі. Неабходнасць улічваць пэўную прапорцыянальнасць і структураванасць тэкстаў абумоўлена частотнасцю той ці іншай з'явы ў праблемнай вобласці. Гэта патрабаванне арыентуе «збіральнікаў» корпусаў тэкстаў на папярэднюю спецыялізацыю ствараемага рэсурса па ўзроўневым прынцыпе: фанетычную, марфалагічную, сінтаксічную, лексічную, семантычную, дыскурсіўную і г. д.,

што, дарэчы, не выключае ўніверсальную арыентацыю моўнага матэрыялу згодна вызначаным мэтам.

У другі клас уваходзяць ілюстратыўныя корпусы, пабудаваныя для адлюстравання пэўнай з'явы. У гэтым выпадку прыходзіцца задаволіцца тымі ці іншымі выбаркамі з агульнай сукупнасці моўных дадзеных і ў рэчышчы індукцыі рухацца да абагульненняў. Але гэтыя выбаркі павінны адпавядаць крытэрыям якаснай прадстаўнічасці выбаркі для лінгвістычнага даследавання. Менавіта разгляд праблемнай вобласці з улікам дыскурсіўнага аспекту дазваляе паспяхова вырашаць многія лінгвістычныя задачы на аснове кампактнага прадстаўнічага матэрыялу. Па гэтай прычыне метадалогія пабудовы корпусаў другога класа павінна мець высокую ступень карэктнасці адлюстравання асобнага лінгвістычнага феномена.

Сучасны трэнд лінгвістыкі, эмпірычныя даследаванні, абумоўліваюць цікавасць да збору і сістэматызацыі вялізных корпусных масіваў, у якіх парадак лічбаў словаўжыванняў — сотні мільёнаў. Напрыклад у «Нацыянальным корпусе рускай мовы» — прыкладна паўмільярда лексічных адзінак [1]. Найлепей такой тэндэнцыі адпавядаюць корпусы першага тыпу — універсальныя, нацыянальныя. Але і спіс корпусаў, створаных замежнымі лінгвістамі для пэўнай прагматычнай мэты, проста бясконцы, прычым большая частка з іх, што характэрна, пазней выкарыстоўваецца для мэтаў, больш шырокіх за першапачатковыя.

Поўныя ці рэпрэзентатыўныя моўныя корпусы і корпусы, якія ствараюцца для прыватных лінгвістычных задач, як правіла, маюць сінкрэтычныя мэты. З гэтага лагічна вынікае відавочная і важная выснова аб эфектыўным выкарыстанні ўжо акумуляваных рэсурсаў. Нават калі для пэўнай мовы (напрыклад, беларускай) яшчэ не створаны ўніверсальны ці, нават, нацыянальны корпус, то прыватныя даследчыя корпусы ёсць сэнс рабіць агульнадаступнымі: найлепшы для гэтага сродак сёння — Інтэрнэт. Даступнасць корпусных дадзеных у Інтэрнэце будзе садзейнічаць іх верыфікацыі.

Экстралінгвістычныя асаблівасці корпуснай дзейнасці экстрапаліруюцца і на самі корпусы. Рэпрэзентатыўнасць любога корпуса, у прынцыпе, не абмяжоўваецца ўласналінгвістычнымі параметрамі. Так, у кожным канкрэтным выпадку можа ўзнікнуць патрэба ўлічыць стылістычны, часавы, аўтарскі і іншыя элементы тэкставага масіву праблемнай вобласці. Наяўнасць экстралінгвістычнай разметкі тэкстаў корпуса — своеасаблівай абалонкі корпусных дадзеных — дазваляе падпарадкаваць працу даследчыкаў вопыту і кампетэнцыі яго складальнікаў.

Успрыманне корпуснай сукупнасці дадзеных ў кантэксце, з улікам дыскурсіўных якасцей, стварае аснову для сістэмнага даследавання маўленчай дзейнасці. І такая парадыгматычная абумоўленасць корпусных рэсурсаў ператварае сукупнасць тэкстаў у шматузроўневы культурны феномен.

Літаратура

1. Национальный корпус русского языка [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.ruscorpora.ru. — Дата доступу: 29.08.2013.
2. Тюбингенские корпусы русских текстов [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.sfb441.uni-tuebingen.de/b1/rus/korpora.html. — Дата доступу: 29.08.2013.
3. Brown Corpus Manual [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://khnt.aksis.uib.no/icame/manuals/brown. — Дата доступу: 29.08.2013.

ЗМЕСТ

СЕКЦЫЯ 5

Руская літаратура ў міжкультурным дыялогу

Ивинский А. Литературная политика Екатерины II: к вопросу о французских подтекстах журнала «Всякая всячина» 3

Йолкіна Л. Проблема впливу української літератури й фольклору на розвиток словесного мистецтва Росії у XVI–XVIII століттях в науковій рецепції В. Перетца 8

Яницкая С. Ю. Н. Тынянов о жанре романса в русской поэзии 14

Кистанова А. Жанровые диффузии одической поэзии М. Муравьева 18

Зіневич Л., Красавіна В. Образ українського козацтва в історичному дискурсі XIX століття (на матеріалі історичної прози М. Гоголя та П. Куліша) 23

Пілат К. Смехавая культура і яе выяўленне ў прозе Якуба Коласа і Мікалая Гогаля 29

Кузнецова Д. Лунный код в изображении А. Блока в очерке З. Гиппиус «Мой лунный друг» 31

Глазман Л. Созидание человеком себя и мира в рассказах Л. Н. Андреева 34

Горбачев А. Конфликт в «Маленькой трагедии» А. С. Пушкина «Скупой рыцарь» 39

Шпаковский И. Рассказ «Иоанн Рыдалец» И. Бунина в контексте агиографических традиций 44

Крикливец Е. Категория художественного времени в прозе В. Астафьева и В. Козько 48

Барысюк Т. Нацыянальныя вобразы свету і чалавека ў паэзіі Яўгенія Еўтушэнкі (1986–1995 гады) 52

Симонова Т. Новые тенденции в современной художественной документалистике 58

Тверитинова Т. Усадебный текст в творчестве Б. Акунина 63

Скоропанова И. Полинациональный дискурс в цикле романов Хольма Ван Зайчика «Плохих людей нет (Евразийская симфония)» 67

Кабылкова А. Проблема личной ответственности в рассказах В. Н. Крупина «Женя Касаткин» и Лян Сяошэна «Лейка» 72

Толчикова Л. Философские аспекты бытия в поэзии И. Журбина 75

Середа И. Творчество В. Маканина за рубежом 80

СЕКЦЫЯ 6

Актуальныя праблемы развіцця замежнай літаратуры

Комаровская Т. Истоки феминизма: роман Джейн Смайли «Частная жизнь» 86

Гронская В. Новая інтэрпрэтацыя жаночых персанажаў сярэднявечнага эпасу ў «Нібелунгах» Морыца Рынке 89

Сенькова О. Чеховские традиции в «Новой Драме» Гарольда Пинтера 92

Халипов В. Образ советского Минска в романе Стивена Кинга «22/11/63» 97

Ламеко Н. Художественное своеобразие сборника рассказов Леонгарда Франка «Человек добр» 100

Первушина Л. Музыкальный компонент в творчестве Дойны Галич Барр: романы «Колокола и ветер», «Дом разбитых зеркал» 105

Позняк Е. История России в творчестве Ярослава Гашека 110

Хайдер А.-Г. Х. М. Сравнительный анализ пьес А. П. Чехова «Вишневый Сад» и Б. Шоу «Дом, где разбиваются сердца» 113

Гинак Е. Проблема художественного освоения действительности в романе У. Эко «Баудолино» 117

Велюго О. Гендерная идентичность субъекта любовного дискурса в романе И. Макьюэна «Сладкоежка» 122

Шахназарян Н. Интерпретации классического текста («Кристабель» С. Т. Колриджа) 127

Разумовская О. Ревизионистское прочтение романа Шарлотты Бронте «Джейн Эйр» в современной англоязычной прозе 132

Хоха С. Гипотеза о трагическом будущем человечества в повести Уильяма Голдинга «Повелитель мух» 136

Кучеровская-Марцевая В. Образ писателя в творчестве Антонио Табукки 141

Барысеева А. Феномен «рэальнага вымыслу» ў раманах Э.-Э. Шміта «Евангелле паводле Пілата» і Л. Рублеўскай «Сутарэнні Ромула» 146

Завадская А. Межтекстовые отношения фрагментов Библии и романа М. Турнье «Каспар, Мельхиор и Бальтазар» 150

Климович Е. Ограничение и клинамен в эстетике УЛИПО 153

Ленькова О. Эпистолярный роман в белорусской и французской прозе рубежа XX–XXI веков: попытка типологического анализа 156

Абрасім Д. Апавядальная спецыфіка празаічнага цыкла Бруна Шульца «Цынамонавыя крамы» 161

Вострыкава А. Адметнасць гістарычнай прозы Ёзафа Томана (на прыкладзе рамана «Пасля нас хоць патоп») 166

СЕКЦЫЯ 7

Праблемы рэцэпцыі і інтэрпрэтацыі літаратурнага тэксту

Просалова В. Українські поетичні версії картини Арнольда Бекліна «Острів мертвих» 171

Рагачэўская М. «Ацялесненая свядомасць» у творах пра вайну: новыя магчымасці рэцэптыўнага аналізу тэкста (на прыкладзе «Дарогі прывідаў» П. Баркер і «Цынкавыя хлопчыкі» С. Алексіевіч) 175

Ліпницька І. Рецепція мандрівного сюжету про запродаж душі чортові у баладі П. Гулака-Артемовського «Твардовський» 181

Ягушкіна В. Художня рецепція історичних балад у ліроепосі М. Костомарова 186

Кавальчук В. Рэалізацыя культурна-ментальнай апазіцыі «Свой – чужы» ў аповесці В. Быкава «Трэцяя ракета» 190

Забалотная І. Янка Брыль і Алесь Адамовіч у выяўленні канцэпту «вайна»: універсальны і нацыянальны кантэкст 194

Гук Е. Концепция автора и героя в романе Веслава Мысливского «Голый сад» 198

Лынша В. Аповесць Васіля Быкава «У тумане» і яе экранізацыя 203

Часнок І. Раман М. Гарэцкага «Віленскія камунары» ў асэнсаванні даследчыкаў беларускай літаратуры 207

Хмяльніцкі М. Рэцэпцыя асобы і творчасці С. Пясецкага ў Беларусі: праз межы і ідэалагічныя кардоны 212

Рашэтнікава Н. Чалавек у эстэтычнай сістэме Карэла Кластэрмана 216

Шода М. Януш Корчак «Кароль Мацюсь Першы»: праблемы пераствараэння і адаптацыі 219

Гуцько В. Мастацкі вобраз здрадніцтва ў творах Уладзіміра Караткевіча 224

Супранкова Т. Фаўсціяна ў творчасці У. Караткевіча 228

Сединина-Барковская Ю. Античные мифологические реминисценции и экологическая проблематика современной фантастической литературы (на материале произведений Т. Пратчетта, А. Сапковского и О. Громыко) 233

Покало А. Модель героя в монодрамах Н. Коляды («Родимое пятно», «Американка») и Д. Балыко («Pine bar») 238

СЕКЦЫЯ 8

Традыцыі і наватарства ў сучасным літаратурным працэсе

Лявонава Е. Мастацкія пошукі В. Някрасава і В. Быкава ў святле творчасці Э. М. Рэмарка 243

Воінава-Страха М. Дыялагічная сувязь жанравых традыцый і наватарства ў сучаснай беларускай навеле (на прыкладзе творчасці У. Сцяпана) 248

Логуновская Е. Вампирическая парадигма в современной культуре: обусловленность популярности произведений вампирской тематики спецификой человеческой психики 252

Бабенко М. Образ любові в сучасній українській філософській лірициі: специфіка модифікацій 255

Алейнік Л. Сучасная літаратура для дзяцей і юнацтва як сродак сацыялізацыі (на прыкладзе твораў Валерыя Гапеева) 259

Караткевіч В. Спецыфіка вобразнай сістэмы драматургічных твораў Пятра Васючэнкі для дзяцей (на матэрыяле зборніка «Маленькі збраяносец») 264

Марозава С. Сакралізацыя выявы як асаблівасць экфрасіса ў аповесці Віктара Карамазава «Брама» 269

Погорєлова О. Особливості «Чужого слова» в поезії О. Ірванця 269

Масарэнка Ю. Сучасны беларускамоўны тэкст як аснова літаратурна-мастацкага твора 278

Біруля К. Мастацкія асаблівасці жанру дэтэктыва ў творах Людмілы Рублеўскай 283

Гончарова-Грабовская С. Интерпретация «чужого сюжета» в пьесах А. Курейчика и Н. Рудковского 288

Карпава Л. Кузьма Чорны і Іван Пташнікаў: канцэпцыя часу 293

Мятліцкая Г. Архетып святла ў лірыцы Яўгеніі Янішчыц 297

Козіч В. Псіхалагічныя аспекты быцця чалавека (па старонках твораў Андрэя Федарэнкі) 302

Трунін С. Постмадэрнізм у сучаснай беларускай літаратуры: раман А. Бахарэвіча «Сарока на шыбеніцы» 306

Урись Т. Тенденції розвитку сучасної української літератури періоду 90-х років XX — початку XXI століття 310

Зайцева К. Сучасна білоруська проза для підлітків: конструювання наративної моделі 313

Лепишева Е. «Некритическая» экзистенциальная ситуация в пьесах конца XX — начала XXI века (русско-белорусские литературные взаимосвязи) 318

Полукошко О. Национальная история в прозе белорусских русскоязычных писателей второй половины XX века 323

Чернишова М. Ціннісний аспект прози М. Матіос (на матеріалі творів «Життя коротке, щоб казати “Ні”», «Щоденник страченої» та «Майже ніколи не навпаки») 327

Секцыя 9
Мастацкі тэкст у лінгвістычным і метадалагічным дыскурсах

Зыкова Г. Машинопись и компьютерный набор как способы авторской фиксации текста: какие текстологические проблемы они могут порождать? (из опыта посмертных изданий стихов Вс. Н. Некрасова) 332

Бадзевіч З. Дзеяслоў у мове паэтычных твораў Цёткі 334

Ніжнік Г., Якуба С. Назоўнікавыя і прыметнікавыя фразеалагізмы з негатыўнай характарыстыкай чалавека ў беларускай і польскай мовах: анімалістычны код 337

Кныш Л. Невербальныя сродкі ў мастацкім дыялогу: тэмбр і тэмп маўлення ў складзе аўтарскай рэмаркі 342

Маюк Е. Лексико-семантические характеристики имплицитной объективации полной мощности множества в белорусских и английских паремиях 346

Квачек А. Способы выражения авторской позиции в романе Ж.-М. Г. Леклезио «Пустыня» 349

Любецкая К. Аб зменах у беларускай тэрміналогіі 352

Дорогокупец О. Белорусская историческая проза XX–XXI веков (на занятиях по белорусоведению для иностранных стажеров) 355

Светашёва Т. Новые возможности игры в интернет-пространстве в русской поэзии конца XX века 359

Антипова А. Изучение русской литературы и предметный учебник в современном информационно-образовательном пространстве 364

Лявонава П. Асаблівасці вывучэння роднай літаратуры студэнтамі-культуролагамі 369

Белакурская Ж., Белакурскі В. Роля мастацкага тэксту ў фарміраванні нацыянальна арыентаванай асобы 371

Саматыя І., Саматыя Р. Арганізацыя праектнай дзейнасці на ўроках мовы і літаратуры 374

Макарэвіч А. Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры: урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў VII класе (чацвёрты блок урокаў) 380

Дылеўская В. Асаблівасці вывучэння творчасці Тараса Шаўчэнкі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі 385

Пухальская М. Христианские ценности в содержании хрестоматии по истории словестности в гимназиях и реальных училищах Беларуси начала XX века (1900–1917 годы) 387
Шарапава А. Вывучэнне творчасці Алеся Якімовіча ў кантэксце вучэбнай дысцыпліны «Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура»: тэарэтычна-жанравы аспект 389
Шматкова І. Моўна-стылёвыя асаблівасці ўвасаблення вобразаў маці і дзіцяці ў лірыцы беларускіх паэтэс другой паловы XX стагоддзя 393
Хальпукова Е. «Литература на экране» в иностранной аудитории (из опыта преподавания) 398
Барковіч А. Корпус тэкстаў у філалагічным дыскурсе 401

Навуковае выданне

СЛАВЯНСКІЯ ЛІТАРАТУРЫ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ: да 900-годдзя Кірыла Тураўскага і 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі

Матэрыялы XI Міжнароднай навуковай канферэнцыі
Мінск, 24–26 кастрычніка 2013 г.

У дзвюх частках
Частка 2

У аўтарскай рэдакцыі

Адказны за выпуск *Т. П. Казакова*
Камп'ютарная вёрстка *Г. К. Карпава, Т. С. Кохан*
Дызайн вокладкі *В. П. Крычко*

Падпісана да друку 30.12.2013. Фармат 60×84/16.
Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 23,72. Ул.-выд. арк. 35,19. Тыраж 98 экз. Заказ 109.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы».
ЛВ № 02330/0548535 ад 16.06.2009.
Вул. Маскоўская, 15, 220007, г. Мінск.